**Г.П. Арлова, С.Р. Туболец**

# ТРАДЫЦЫІ ЭСТЭТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ Ў БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ ПЕДАГОГІЦЫ

***Манаграфія***

*Пад агульнай рэдакцыяй*
*Г.П. Арловай*

Репозиторий ВГУ

УДК 37.036(476)
ББК 74.200.55
А82

Адобрана саветам па навукова-даследчай і творчай рабоце ўстановы адукацыі “Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя П.М. Машэрава”. Пратакол № 8 ад 14.10.2008 г.

Аўтары: загадчык кафедры сацыяльна-педагагічнай работы УА “ВДУ імя П.М. Машэрава”, доктар педагагічных навук, прафесар **Г.П. Арлова**; выкладчык кафедры сацыяльна-педагагічнай работы УА “ВДУ імя П.М. Машэрава” **С.Р. Туболец**

Пад агульнай рэдакцыяй Г.П. Арловай

Р э ц э н з е н т ы:
дэкан гістарычнага факультэта УА “ВДУ імя П.М. Машэрава”, доктар гістарычных навук, прафесар *В.А. Космач*; дэкан факультэта перападрыхтоўкі кадраў па педагогіцы і псіхалогіі УА “ВДМУ”, доктар педагагічных навук, прафесар *З.С. Кунцэвіч*

У манаграфіі распрацаваны тэарэтыка-метадалагічныя асновы праблемы эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы: удакладнена сутнасць традыцый эстэтычнага выхавання ў народнай педагогіцы; асноўныя прынцыпы даследавання традыцый эстэтычнага выхавання спраецыраваны на сферу беларускай народнай педагогікі. Раскрыты ўмовы рэалізацыі эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы. Вылучаны асноўныя перадумовы фарміравання эстэтычнага ідэалу і прапанавана яго характарыстыка. Вызначаны змест эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы праз сістэму сродкаў.

Матэрыялы адрасаваны выкладчыкам, настаўнікам, выхавальнікам, студэнтам.

**УДК 37.036(476)**
**ББК 74.200.55**

Репозиторий ВГУ

# З М Е С Т


УВОДЗІНЫ ……………………………………………….. 4

1. ТЭАРЭТЫКА-МЕТАДАЛАГІЧНЫЯ АСНОВЫ ДАСЛЕДАВАННЯ ТРАДЫЦЫЙ ЭСТЭТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ Ў БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ ПЕДАГОГІЦЫ ……………………………… 17

1.1. Асноўныя прынцыпы даследавання традыцый эстэтычнага выхавання ў народнай педагогіцы ……………………………………… 17

1.2. Асноўныя ўмовы здзяйснення (рэалізацыі) эстэтычнага выхавання ў народнай педагогіцы 38

1.3. Сутнасць эстэтычнага ідэала ў беларускай народнай педагогіцы ………………………... 75

2. ЗМЕСТ ЭСТЭТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ Ў БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ ПЕДАГОГІЦЫ …....... 98

2.1. Сістэма сродкаў і метадаў эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы ……. 98

2.2. Рэалізацыя метадаў эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы …………... 131

ЛІТАРАТУРА ………………………………………... 146


Репозиторий ВГУ

# У В О Д З І Н Ы

Праблема вывучэння народнай спадчыны, актыўнага ўвядзення яе ў жыццё сучаснага чалавека з'яўляецца на сённяшні дзень прыярытэтнай. Гэта актуалізуе даследаванні, што звязаны з вывучэннем розных галін жыцця этнасаў: этнапедагагічныя, этнапсіхалагічныя, этналагічныя і г.д. Гістарычны вопыт развіцця чалавецтва сведчыць, што чым вышэй культура этнасу, тым часцей народ звяртаецца да гістарычных вытокаў творчасці, у якой сканцэнтраваны вопыт дзейнасці многіх пакаленняў і захавалася самае каштоўнае – мудрасць у галіне выхавання, так званая народная педагогіка. Прапанаваная праца разглядае змест эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы праз вылучэнне традыцыйных сродкаў і метадаў, асэнсаванне іх рэалізацыі ў жыцці беларускага сялянства канца XIX – пач. XX ст. Даследаванне абапіраецца на вылучэнне і разгляд галоўных умоў уздзеяння эстэтычнага выхавання на сутнасць эстэтычнага ідэала.

Народная педагогіка на працягу вякоў станоўча вырашала задачы эстэтычнага выхавання маладога пакалення. Аднак сёння яе выхаваўчыя магчымасці не выкарыстоўваюцца належным чынам. Эканамічныя і сацыяльныя катаклізмы, што напаткалі нашу краіну на працягу жыцця апошніх трох пакаленняў, прывялі да змянення, змяншэння і нават да страт эстэтычных каштоўнасцей, разрыву ў пераемнасці паміж пакаленнямі ў сферы культуры і маралі. Умовы жыцця ставяць матэрыяльныя праблемы на першае месца, а духоўная сутнасць, якая заключана ў эстэтычным успрыняцці і пераўтварэнні свету, застаецца незапатрабаванай. Аднак кожнаму чалавеку неабходны канкрэтныя арыенціры жыцця, падтрымка яго духоўнага свету агульначалавечымі і нацыянальнымі каштоўнасцямі, бо дачыненне да эстэтычных дасягненняў народа здольна забяспечыць своеасаблівае непарушнае адзінства продкаў і нашчадкаў. Эфектыўнасць эстэтычнага выхавання забяспечваецца зладжанасцю прафесійнай падрыхтоўкі педагога і вырашэннем актуальных задач сучаснасці. Закон аб адукацыі, канцэпцыі адукацыі і выхавання вядуць размову аб неабходнасці фарміравання асобы на этнакультурных асновах, асобы, што ведае і павялічвае каштоўнасці свайго народа і ў той жа час адкрытая для каштоўнасцей сусветнай культуры і цывілізацыі.

Актуальнасць звароту да вывучэння традыцый народнай педагогікі беларусаў вынікае з існавання шэрага супярэчнасцей,

Репозиторий ВГУ

якія рэальна прысутнічаюць і патрабуюць не толькі пільнай увагі, але і дзейснага вырашэння.

- Міжнацыянальныя канфлікты, маральная галеча, перагляд духоўных здабыткаў у сусветным маштабе ў сённяшні час вылучаюць жыццёвую неабходнасць звароту грамадства да агульначалавечых каштоўнасных арыенціраў. Аднак вядома, што на працягу стагоддзяў грамадства вырашала шматлікія супярэчнасці з дапамогай народнай педагогікі. Магутны педагагічны патэнцыял народа спрыяў пастаноўцы і здзяйсненню маральных, эстэтычных, сацыяльных мэт, фарміраванню ідэалаў і даваў шляхі іх дасягнення.

- Існуе пэўнае непаразуменне паміж “бацькамі і дзецьмі”, якое адбылося ў сувязі са зменамі дзяржаўнай улады, схільнасці часткі насельніцтва да негатыўных адносін да гістарычнай спадчыны. Грамадства прыкладае вялікія намаганні з мэтай вырашэння гэтай супярэчнасці. Нягледзячы на гэта, застаюцца незапатрабаванымі традыцыі народнай педагогікі, у якіх спрадвечна прадугледжана захаванне непарыўнай сувязі паміж пакаленнямі, а пераемнасць у іх жыцці разглядаецца як галоўная ўмова чалавечага існавання.

- Сёння становіцца прыярытэтнай задача духоўнага, у тым ліку эстэтычнага выхавання моладзі. Ствараюцца праграмы эстэтычнага выхавання, эстэтычнае выхаванне ўваходзіць у Канцэпцыю непарыўнага выхавання дзяцей і навучэнцаў. Сістэма адукацыі шукае новыя шляхі работы, каб сфарміраваць у асобы разуменне самой сябе, свайго прызначэння, ролі ў жыцці грамадства, у далучэнні да свайго этнасу. У той жа час не існуе цэласная сістэма эстэтычнага выхавання, заснаваная на этнакультурных традыцыях народа, што абумоўлена адсутнасцю грунтоўнага тэарэтыка-метадалагічнага падыходу да вывучэння традыцый эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы.

- Асаблівасці існавання інстытута сям’і на сучасным этапе развіцця грамадства сведчаць аб яе крызісным стане і патрабуюць звароту да механізмаў яе захавання і развіцця, што правераны часам. Між тым, традыцыі народнай педагогікі беларусаў даюць напрамкі руху да паляпшэння выхаваўчай сітуацыі ў сям’і, больш поўнага і мэтанакіраванага выкарыстання яе выхаваўчага патэнцыялу, скіроўваючы ўвагу на асновы эстэтычнага выхавання асобы менавіта ў сямейным асяроддзі.

- Сучаснае грамадства мае неакрэслены, аморфны эстэтычны ідэал, што ў значнай ступені звязаны з адмоўным уплывам заходняй масавай культуры, які ідзе праз друкаваныя і аўдыёвізуальныя сродкі інфармацыі. У той жа час у беларусаў



Репозиторий ВГУ

на працягу стагоддзяў склаліся свае ўяўленні пра эстэтычную дасканаласць, свой ідэал, які паўплываў на фарміраванне ўстойлівых традыцый эстэтычнага выхавання.

• Усвядомлена неабходнасць выкарыстання станоўчых традыцый беларускай народнай педагогікі ў тэорыі і практыцы выхавання, эстэтычнага ў тым ліку. Гэта свядомасць грунтуецца на разуменні таго, што традыцыі беларускай народнай педагогікі маюць станоўчы патэнцыял, які спрыяе раскрыццю чалавечых здольнасцей. Між тым адсутнасць дастатковых навуковых даследаванняў па адзначанай праблеме, нераспрацаванасць шляхоў яе рэалізацыі перашкаджаюць увасабленню ў жыццё народнай мудрасці. Фактычна патэнцыял беларускай народнай педагогікі застаецца малазапатрабаваным.

Усё вышэйадзначанае сведчыць аб актуальнасці звароту да тэмы "Традыцыі эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы канца XIX – пачатку XX стагоддзя". Звяртаннне да азначанага перыяду абумоўлена найбольшай пашыранасцю традыцый беларускай педагогікі ў жыцці грамадства (патрыярхальная сям'я, сялянскае насельніцтва), што зафіксавана ў спробах яе грунтоўнага вывучэння, якімі з'яўляюцца працы М. Анімелі, Я.Ф. Арлоўскага, М. Доўнар-Запольскага, Я.Ф. Карскага, А. Кіркора, Ю.Ф. Крачкоўскага, І.І. Насовіча, М.Я. Нікіфароўскага, А.М. Пыпіна, Е.Р. Раманава, А.К. Сержпутоўскага, П.М. Шпілеўскага, П.В. Шэйна.

Аб'ект даследавання: беларуская народная педагогіка.

Прадмет даследавання: традыцыі эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы канца XIX – пачатку XX стагоддзя.

Мэта: вылучыць і ахарактарызаваць традыцыі эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы (канец XIX – пачатак XX стагоддзя), распрацаваць класіфікацыю метадаў эстэтычнага выхавання асобы.

Гіпотэза: асноўныя ўмовы рэалізацыі эстэтычнага выхавання асобы:

– прыроднае ўздзеянне (на дзяцей і дарослых праз асаблівасці сезонных змен і звязаных з гэтым пераменамі ў працоўных дзеяннях; прыстасаванасць абраднасці да прыродна-кліматычных умоў; існаванне міфалагічных апекуноў прасторы, вонкавы выгляд якіх і адносіны да чалавека адпавядаюць эстэтычнаму ўражанню ад асяроддзя іх пражывання і г.д.);

– выхаванне ў працы (упрыгожванне бытавых рэчаў; эстэтызацыя быту; суправаджэнне працы элементамі вуснай народ-

най творчасці; уплыў на працу каляндарна-абрадавага цыкла беларусаў і г.д);

– выкарыстанне патэнцыялу народнай творчасці (народныя майстры давалі ўзоры эстэтызацыі быту і жыццядзейнасці беларуса, прапаноўвалі прыклады дасканалага валодання прыладамі працы, голасам, целам, словам);

– шырокае распаўсюджванне ў паўсядзённым жыцці беларускага сялянства трыяды: мары, народныя вераванні, успаміны (інтэнсіфікатары духоўнага жыцця народа – калектыўныя ўяўленні аб ідэальным жыцці – ператвараюцца ў пэўныя абрадавыя дзеянні ці забарону нейкіх дзеянняў; успаміны становяцца адраджэннем мінулага, накіраваным у будучыню; адухаўленне і эстэтызацыя жыцця) паўплывалі на фарміраванне эстэтычнага ідэала беларуса, што абумовіла станаўленне і развіццё традыцый эстэтычнага выхавання ў народнай педагогіцы беларусаў.

Трывалыя веды па гісторыі краіны, пра культуру продкаў дапамагаюць у фарміраванні гарманічнай асобы, у разуменні асаблівасці светаўспрымання і ментальнасці беларусаў, асэнсаванні іх гісторыка-культурнага месца і ролі ў прыродзе і сусвеце. Менавіта аб гэтым гавораць многія даследчыкі беларускай народнай культуры: В.С. Болбас, У.А. Васілевіч, Э.С. Дубянецкі, У.М. Конан, Я.І. Крук, Я.М. Сахута, В.С. Цітоў і інш. Менавіта культура паўстае найважнейшым фактарам руху наперад нашага грамадства, аднаўлення страчаных маральна-эстэтычных ідэалаў і духоўных каштоўнасцей, пераадолення тэндэнцыі да дэкультурызацыі жыцця значнай часткі насельніцтва рэспублікі. Народныя культурныя здабыткі – той падмурак нацыянальнай сістэмы адукацыі, што садзейнічае процідзеянню негатыўнаму ўплыву працэсу глабалізацыі. Актуальна гучаць словы заснавальніка этнапедагогікі як навукі Г.Н. Волкава аб тым, што “стварэнне сапраўды нацыянальнай школы… магчыма толькі на этнапедагагічнай аснове. Народная культура выхавання ўяўляе сабой аснову ўсялякай культуры. Ніякае нацыянальнае адраджэнне, ніякае аднаўленне прагрэсіўных народных традыцый немагчыма без прывядзення ў дзеянне адвечных народных традыцый выхавання, народнай педагогікі” [39].

Народная педагогіка як шматгранная з’ява, у аснове якой ляжаць развіццё фальклору, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, традыцый этнасу, узнікае ў грамадстве. Яна функцыянуе ў рамках пэўнай нацыянальнай, сацыяльнай сістэмы, акумулюе духоўны вопыт чалавецтва і валодае здольнасцю выхоўваць тыя якасці і рысы асобы, што найбольшым чынам адпавядаюць ідэальным уяўленням народа пра дасканалага чалавека. Менавіта



Рэпазіторый ВДУ

народная педагогіка з'яўляецца падмуркам, на якім узнікла і расквітнела ўсё багацце сучаснай культуры і яе дасягненні.

Вядома, што прыгажосці належыць галоўная роля ў працэсе фарміравання ўнутранага свету асобы, менавіта яна тая глыбінная сутнасць, што напаўняе сэнсам і святлом чалавечае жыццё. Прадстаўнікі навукі падкрэсліваюць неабходнасць пераасэнсавання ролі чалавека, здзяйснення свайго роду культурнай рэвалюцыі, у выніку якой адбудзецца паляпшэнне духоўных і разумовых здольнасцей людзей. Менавіта эстэтычная адукацыя садзейнічае пераходу ад педагогікі ведаў, уменняў, навыкаў да педагогікі развіцця. Заўважаныя акалічнасці актуалізуюць задачу пошукаў эфектыўных сродкаў фарміравання духоўных асноў моладзі. Адным з рэальных накірункаў, на наш погляд, з'яўляецца засваенне і творчае выкарыстанне народных традыцый, забеспячэнне пераемнасці ў развіцці айчыннай культуры.

Традыцыі – той механізм надзейнай перадачы нашчадкам комплексу культурных каштоўнасцей, што здабыты папярэднімі пакаленнямі. Да праблем выкарыстання народнай педагогікі ў выхаванні, яе гуманістычных традыцый звяртаюцца класікі сусветнай педагогікі: Я.А. Каменскі, І.Г. Песталоцы, К.Д. Ушынскі, Л.М. Талстой, В.А. Сухамлінскі.

Зыходзячы з гэтага, мы прытрымліваемся тэзіса гісторыка В.С. Цітова аб тым, што ўстойлівыя этнакультурныя традыцыі беларусаў – гэта свайго роду рэсурс, зыходны "капітал" для адраджэння гаспадаркі, культуры, наладжвання нармальнага жыцця, выжывання ў экстрэмальных умовах і захавання сябе як этнасу. Менавіта такі падыход патрабуе ад нас звароту да этнакультурных традыцый беларусаў, вывучэння і выкарыстання іх у выхаванні. Гэта дазволіць грамадству абудзіць нацыянальную памяць, усвядоміць пераемнасць развіцця краіны ў гісторыка-культурным ракурсе. Багацце традыцыйнай культуры робіць народ народам у поўным сэнсе слова, станоўча ўздзейнічае, напаўняе духоўнае жыццё асобы.

Такім чынам, наша даследаванне выканана ў рэчышчы этнапедагагічнай тэматыкі, вылучанай Г.Н. Волкавым. У прыватнасці, ім вырашаны наступныя праблемы: асноўныя педагагічныя правілы народаў; дзіця як аб'ект і суб'ект выхавання; функцыі, фактары, сродкі і метады выхавання; арганізацыя выхавання.

Гісторыкі педагогікі (І.Т. Агароднікаў, М.К. Ганчароў, Ф.Ф. Каралёў, Я.М. Мядынскі) неаднаразова, але толькі апасродкавана закранаюць у сваіх даследаваннях пытанні народнай педагогікі, яе ўплыву на развіццё педагогікі як навукі. Спецыяль-

ныя даследаванні, якія вывучаюць народную педагогіку, – этнапедагагічныя, што разглядаюць асаблівасці ўздзеяння народнай педагогікі розных народаў і народнасцей на членаў этнасу, адсутнічаюць.

У большасці тэарэтычных пошукаў прасочваецца ідэя аб неабходнасці ўвядзення традыцый народнай педагогікі ў практыку выхавання падрастаючага пакалення, выказваюцца ідэі аб неабходнасці таго, каб настаўнікі былі патрыётамі роднай культуры, мовы, выкарыстання прынцыпу народнасці; аб вывучэнні, пераасэнсаванні народных традыцый і рэалізацыі іх у педагагічнай практыцы, пераемнасці навуковай і народнай педагогікі.

Сёння шэраг вядомых навукоўцаў розных краін (В.Ф. Афанасьеў, В.М. Грыгор’еў, Ю.А. Рудзь, Ш.А. Мірзоеў, Я.І. Ханбікаў – Расіі, Ж.М. Аразбаеў – Кіргізіі, А.І. Гашымаў – Азербайджана, А.Л. Хрыстава – Балгарыі) даследуюць народную педагогіку, вывучаюць гісторыю этнапедагогікі, яе метадалогію, структуру, сучаснае функцыянаванне. Апошнія дзесяцігоддзі адметныя ўсплескам цікавасці да этнапедагагічных тэм, асабліва ў Расіі. Да вывучэння пытанняў гістарычнай этнапедагогікі далучаецца Т.М. Пятрова, дашкольнай – Н.С. Аляксандрава, сям’і – Э.І. Сакольнікава, этнапедагагічнай антрапалогіі – Л.К. Рахлеўская, этнапедагогіку гульні вывучае В.М. Грыгор’ева, афарыстычную этнапедагогіку – З.Б. Цалаграва, этнапедагагічную адукацыю – М.Г. Харытонаў, этнасацыяльную педагогіку – А.А. Грыгор’ева-Шадрына, Д.Я. Іваноў, параўнальную этнапедагогіку – У.А. Іваноў, Л.І. Фёдарава, субэтнічную педагогіку – А.М. Лявонаў.

Наша даследаванне прысвечана праблемам эстэтычнага выхавання чалавека, якое асабліва цікавіць філосафаў і педагогаў Расіі (Б.Т. Ліхачоў, П.І. Підкасісты, І.В. Сласценін і інш.) і Беларусі (В.М. Іўчанка, У.М. Конан, Я. Квяткоўскі, В.П. Коцікава, В.А. Салееў і інш.). Філасофска-метадалагічны аспект эстэтычнага выхавання разгледжаны ў навуковых працах М.І. Кіяшчанкі, М.Л. Лейзерава, М.С. Кагана, П.І. Пастухова, У.М. Разава, Г. Шырматава і інш. Апошнім часам айчынныя філосафы вядуць гутарку аб змене навуковай парадыгмы эстэтыкі, што сведчыць аб узнікненні новага разумення суадносін чалавека і прыроды. Новы погляд заключаецца ў тым, што чалавек разглядаецца не ў якасці “цара прыроды”, а яе часткі, і ён павінен падпарадкоўвацца прыродным законам, улічваць іх у сваіх дзеяннях [232]. Сучаснае бачанне сутнасці эстэтыкі, эстэтычнага выхавання прымушае нас звярнуцца да педагагічнай спадчыны Я.А. Каменскага, які вывеў прынцып



Рэпазіторый ВДУ

прыродаадпаведнасці. Актуалізацыя названага падыходу невыпадковая: менавіта такія погляды былі характэрны для эстэтыкі нашых продкаў, і на гэтай выснове будавалася сістэма ўсяго выхавання, эстэтычнага ў прыватнасці. Азначаная акалічнасць, на наш погляд, дазваляе меркаваць аб неабходнасці звярнуцца да традыцый беларусаў у эстэтычным выхаванні, узяць з іх самае каштоўнае для вырашэння сённяшніх праблем адраджэння духоўнасці, выхавання асобы. Асновай здзяйснення гэтага працэсу становіцца народнасць, народнае выхаванне, традыцыйныя падыходы да яго. Паколькі прыгажосць займае галоўную ролю ў самарэгуляцыі ўнутранага свету асобы, аказвае арганізуючае ўздзеянне на фарміраванне аптымістычнага светаўспрынящця, то назапашаныя продкамі эстэтычныя каштоўнасці дапамогуць сучаснаму чалавеку стаць больш дасканалым, гарманічным і адказным.

Сёння існуе неабходнасць у распрацоўцы выхаваўчага патэнцыялу на падставе дзейнаснага падыходу, разгледжанага ў працах вядомых псіхолагаў Л.С. Выгоцкага, С.Л. Рубінштэйна, А.М. Лявонцьева. Менавіта народная педагогіка дае эмпірычныя варыянты яго здзяйснення. Гэта з’ява і зараз не да канца асэнсавана даследчыкамі, і мы бачым задачу навукова абгрунтаваць і паказаць узаемасувязь навуковай педагогікі з педагагічнымі дасягненнямі народа. Сучасны беларускі даследчык С.У. Снапкоўская падкрэслівае, што актуалізаваны дзейнасны прынцып бярэ пачатак у народнай педагогіцы. У навуковай педагогіцы ён з’явіўся “дзякуючы таму, што ў апошнія часы была, нарэшце, звернута ўвага на гэты “забыты шлях” у развіцці педагагічнай дзейнасці і навукі. Амаль усім інавацыям сучаснай педагагічнай навукі можна адшукаць аналагі, “вытокі” ў народнай педагогіцы, што ўсё гэта там ужо было, хоць і ў зародкавым стане” [186, с. 143]. Адраджэнне нацыянальнай культуры павінна ісці згодна з выхаваўчымі традыцыямі этнасу, з сістэмай узаемаадносін “чалавек – прырода”, “чалавек – рэчы”, “чалавек – грамадства” і асабліва – “дарослыя – дзеці”.

На асобныя аспекты народнай педагогікі, рэалізацыі ў ёй эстэтычнага выхавання скіроўваюць увагу ў сваіх прамовах, працах творцы савецкай педагагічнай сістэмы Н.К. Крупская, А.У. Луначарскі, А.С. Макаранка, С. Шацкі. У даследаваннях вядомых дзеячаў савецкай навукі І.Т. Агароднікава, М.І. Болдырава, М.К. Канстанцінава, З.І. Раўкіна, М.Ф. Шабаевай аналізуецца ўплыў народна-педагагічнага вопыту, ідэй на дзейнасць педагогаў розных народаў і гістарычных часоў. Вучоныя ставяцца да спадчыны вядомых педагогаў як да крыніцы педагагічных ідэй.



Рэпазіторый ВДУ

Актуальнасць звароту да абранай тэмы абумоўлена таксама наяўнасцю шэрага даследаванняў, якія разглядаюць пытанні эстэтычнага выхавання праз прызму народнай педагогікі. У прыватнасці, Г.Н. Волкаў у свой час правёў тэарэтычны аналіз магчымасцей народнай творчасці ў выхаванні і прыйшоў да высновы, што ўсе народы адрозніваюцца высокім узроўнем эстэтычнай культуры і маюць вялікія магчымасці для паляпшэння эстэтычнага выхавання праз выкарыстанне сродкаў народнага мастацтва.

Сёння праблемамі сутнасці народнага мастацтва і яго законаў у галіне мастацкай культуры цікавяцца філосафы, культуролагі, мастацтвазнаўцы: Г.К. Вагнер, М.С. Каган, М.А. Някрасава і інш. Скіроўваюць увагу на пытанні эстэтычнага выхавання сродкамі народнага мастацтва педагогі (Л.С. Аляксеева, В.Ф. Афанасьеў, А.Г. Гашымаў, З.Г. Нігматаў, Я.І. Ханбікаў, Ф.Ф. Харысаў). Вучоныя звяртаюцца да ідэй каштоўнасці выкарыстання фальклору і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў эстэтычным выхаванні падрастаючых пакаленняў. Даследуюць музычны фальклор і яго ролю ў эстэтычным выхаванні дзяцей (В.А. Аляксеева, Л.І. Баравікова, В.А. Дышлеўская, Т.Т. Турсунава, В.Д. Халілава, В.І. Юцэвіч), магчымасці прымянення педагагічнага вопыту народа ў эстэтычным выхаванні малодшых школьнікаў (С.С. Гарбаценка, Ф.Г. Нікіціна), праблему выкарыстання фальклору ў эстэтычным і маральным выхаванні навучэнцаў (М.А. Нікіціна), рэалізацыю ідэй нацыянальнага выхавання ў сістэме адукацыі сродкамі народнага мастацтва (Н.І. Панамарова) і г.д.

Увагу на эстэтыку, эстэтычнае выхаванне скіроўваюць беларускія педагогі (Г.П. Арлова, В.С. Болбас, В.У. Будкевіч, Д.І. Вадзінскі, Т.В. Валодзіна, Л.М. Варанецкая, А.А. Грымаць, К.В. Гаўрылавец, В.М. Іўчанка, І.І. Казімірская, В.П. Коцікава, Н.П. Кулікова, Ю.С. Любімава, У.В. Пашкевіч, І.І. Калачова, Л.В. Ракава, І.І. Сучкоў), фалькларысты і мастацтвазнаўцы (Г.А. Барташэвіч, Н.С. Гілевіч, А.С. Ліс, А.І. Лозка, А.Ю. Лозка, М.Ф. Піліпчанка, Я.М. Сахута), філосафы (В.К. Бандарчык, У.М. Конан, М.Ф. Мартынаў, В.К. Салееў і інш.). Дзякуючы іх намаганням каштоўнасці этнасу, створаныя продкамі ў галіне выхавання і навучання, вяртаюцца сучаснасці. Набыццё рэспублікай суверэнітэту дало магутны імпульс вывучэнню народнай спадчыны, нацыянальных традыцый, бо культура краіны з’яўляецца своеасаблівым духоўным каталізатарам, які садзейнічае станаўленню дзяржаўнасці. Гістарычнае месцазнаходжанне краіны на мяжы з братнімі славянскімі дзяржавамі – Расіяй, Украінай – актуалізуе даследаванні, што спрыяюць разуменню індывідуальнага

Репозиторий ВГУ

і агульнага ў ментальнасці народа. Так мінулае падказвае сучасным педагогам адказы на шматлікія надзённыя пытанні.

Разглядаючы розныя аспекты народнай педагогікі беларусаў, трэба засяродзіць увагу на даследаваннях Г.П. Арловай, якія ставяць пытанне аб эстэтычным выхаванні ў беларускай народнай педагогіцы. В.К. Салееў уводзіць паняцце “этнаэстэтыка”, распрацоўвае метадалогію эстэтычнага выхавання, дае аналіз эстэтычных адносін славян да акаляючага свету, уздымае пытанні эстэтычнага ўспрыняцця, гульні і фантазіі дашкольніка. Да асобных праблем эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы звяртаюцца А.А. Грымаць, Л.М. Варанецкая, У.В. Пашкевіч. Іх навуковыя распрацоўкі па гэтых пытаннях маюць як тэарэтычнае, так і прыкладное значэнне, цікавыя для даследчыкаў, бацькоў, настаўнікаў і выхавальнікаў. У галіне этнапедагогікі творча працуюць навукоўцы розных куткоў краіны. Ролю этнічных традыцый у духоўнай культуры беларусаў вывучае І.В. Казакова. І.І. Калачова вылучае народныя традыцыі і звычаі выхавання, прапануе цэласны погляд на асноўныя навукова-педагагічныя ідэі ў XIX–XX стагоддзях, даследуе традыцыі і звычаі беларусаў і прадстаўнікоў іншых этнасаў, што жылі на Беларусі. Л.В. Ракава скіроўвае ўвагу на вырашэнне праблемы сямейнага выхавання ў народнай педагогіцы. Т.І. Кухаронак разглядае радзінныя звычаі і абрады беларусаў, В.С. Болбас, А.Э. Крываносава цікавяцца маральным выхаваннем, В.У. Буткевіч, Ю.С. Любімава займаюцца праблемай эстэтычнага выхавання сродкамі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. І.С. Сычова даследуе прынцыпы эстэтычнага выхавання, іх вытокі і рэалізацыю ў народнай педагогіцы, А.Л. Міхайлава разглядае фарміраванне здаровага ладу жыцця сродкамі народнай педагогікі беларусаў, Т.Дз. Вакушэнка – сацыялізацыю асобы беларуса і г.д.

Такім чынам, этнапедагагічныя, культуралагічныя, педагагічныя даследаванні пацвярджаюць актуальнасць, значнасць праблемы звароту да народна-педагагічных традыцый у выхаванні, асвятляюць асобныя аспекты пытання. Мы бачым, што наспела патрэба ў комплексным і ўсебаковым асвятленні традыцый эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы, цэласнага, сістэмнага падыходу з вызначэннем мэты, зместу, сродкаў, метадаў эстэтычнага выхавання, акрэсленнем галоўных ўмоў яго здзяйснення і вынікаў. Правядзенне такіх пошукаў аб’ектыўна неабходна, бо эстэтычнае выхаванне ў беларускай народнай педагогіцы з’яўляецца прадуктам гістарычнага развіцця сацыяльна-тэрытарыяльнага вопыту народа. Традыцыі

Рэпазіторый ВДУ

эстэтычнага выхавання ў народнай педагогіцы беларусаў выступаюць самадзейнай творчасцю народа ў дасавецкі перыяд.

На падставе шматаспектнага вывучэння, аналізу, абагульнення этнапедагагічных, этнаграфічных і фальклорных крыніц мы імкнёмся раскрыць традыцыі эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы.

Даследаванне выканана з выкарыстаннем метадаў:

- аналіз прац класікаў педагогікі, філасофскіх даследаванняў, што прысвечаны пытанням традыцый, ідэала; напрацовак па праблемах эстэтыкі і эстэтычнага выхавання; этнаграфічных і этнапедагагічных даследаванняў; матэрыялаў народнай творчасці, якія раскрываюць традыцыйныя падыходы да эстэтычнага выхавання;
- аналіз традыцый эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы на падставе вывучэння этнапедагагічнага і этнаграфічнага матэрыялаў і яго сістэматызацыі;
- аналіз і падбор матэрыялаў народнай творчасці (пераважна вуснай) у цеснай сувязі з тэмай даследавання;
- абагульненне атрыманых вынікаў.

У манаграфіі распрацаваны тэарэтыка-метадалагічныя асновы праблемы эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы, што выяўляецца праз:

***– удакладнена сутнасць традыцый эстэтычнага выхавання ў народнай педагогіцы***. Эстэтычнае выхаванне ў народнай педагогіцы – выхаванне ў асобе жадання, здольнасці ўспрыняцця і разумення таго прыгожага ў жыцці, якое з’яўляецца жыццёва неабходным; фарміраванне на гэтай глебе эстэтычных густаў, эмацыянальных адносін да акаляючага свету і сацыяльнага жыцця праз авалоданне культурай продкаў. Эстэтычнае выхаванне ў народнай педагогіцы – працэс, які ахоплівае ўсе ўзроставыя групы, характарызуецца працягласцю (ад нараджэння дзіцяці на працягу ўсяго жыцця), мэтанакіраванасцю (фарміраванне эстэтычна дасканалай асобы), бесперапыннасцю (выхоўваюць людзі, прыродная рэчаіснасць, побыт, як у працоўнай дзейнасці, так і ў вольны час). Традыцыі эстэтычнага выхавання ў народнай педагогіцы – гістарычна аформленая на працягу стагоддзяў сістэма перадачы эстэтычных ведаў, каштоўнасцей, поглядаў, густаў народа ў працэсе выхаваўчага ўзаемадзеяння пакаленняў;

***– асноўныя прынцыпы даследавання традыцый эстэтычнага выхавання спраецыраваны на сферу беларускай народнай педагогікі*** (прынцып адзінства жыцця і выхавання (выхаванне ў жыцці і праз жыццё); цэласнасць выхаваўчага працэсу, непарыўнасць і ўзаемадапаўняльнасць выхаваўчых уздзеянняў



Репозиторий ВГУ

(падзел выхавання на аспекты даволі ўмоўны, бо кожны накірунак мае цесныя сувязі з усімі іншымі); прынцып народнасці (у аснове выхавання – родная культура, мова і народная творчасць); прынцып натуральнасці выхаваўчых падыходаў народа (натуральнасць – універсальная асаблівасць і сродак народнага выхавання); прынцып культураадпаведнасці (апора на айчынныя ідэі творчага самаразвіцця); прынцып прыродаадпаведнасці (выхаванне ў строгай адпаведнасці з узроставай перыядызацыяй, якая адбывалася ў адпаведнасці з порамі года); прынцып прыярытэту народнай педагогікі ў выхаванні (выхаванне пачынаецца ў сямейным побыце, дзе пануюць народныя выхаваўчыя традыцыі); прынцып уліку асаблівасцей нацыянальнай культуры ў выхаванні (народныя традыцыі і асаблівасці выхавання далучаюць асобу да пэўнага этнасу);

***– раскрыты ўмовы рэалізацыі эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы, асноўнымі з якіх выступаюць***: прыроднае ўздзеянне, выхаванне ў працы, выкарыстанне патэнцыялу народнай творчасці, распаўсюджванне ў паўсядзённым жыцці беларускага селяніна трыяды: мары, народныя вераванні, успаміны (інтэнсіфікатары народнага духоўнага жыцця);

***– вылучаны асноўныя перадумовы фарміравання эстэтычнага ідэалу і прапанавана яго характарыстыка***. На фарміраванне эстэтычнага ідэалу значны ўплыў аказалі аб'ектыўныя (геаграфічныя (як асаблівасці прыродна-кліматычнай зоны з бесперапыннымі выразнымі сезоннымі зменамі), біялагічныя (існаванне пэўнага тыповага вонкавага выгляду чалавека, які прыстасаваны для тыповага прыроднага асяроддзя), класавыя (у беларускай народнай педагогіцы замацаваны эстэтычны ідэал сялянства – чалавека, здольнага да працы, працаўніка, які эстэтычна пераўтварае і ўпрыгожвае жыццё) і суб'ектыўныя – нацыянальныя (выхаванне з пазіцый талерантных адносін да іншых нацыянальнасцей), рэлігійныя (бесканфліктнае суіснаванне ў адных межах некалькіх канфесій, якія не толькі не супрацьпастаўляліся, але і пашыралі дыяпазон прымальнасці эстэтычных з'яў), працоўныя (прыгожае тое, што мае утылітарна-практычны сэнс, што дапамагае чалавеку), маральныя (аб'яднанасць прыгожага і маральнага), міжнацыянальныя (уплыў эстэтычных ідэалаў іншых народаў) перадумовы.

Для эстэтычнага ідэалу беларускага народа ўласцівы наступныя характарыстыкі: дынамізм (існаванне шматварыянтнасці адной з'явы – казак, загадак, песень, узораў адзення, спосабаў упрыгожвання рэчаў), дэмакратызм (кожны чалавек валодае майстэрствам, можа праявіць яго ў працоўнай, або ў мастацкай

Рэпазіторый ВДУ

дзейнасці), кансерватызм (вельмі маруднае з'яўленне ці знікненне фальклорных формаў, формаў мастацкай выразнасці, якія трансфармуюцца, набываюць іншы сэнс, характар, але застаюцца ў народным жыцці), якія дазваляюць кожнаму чалавеку тварыць прыгажосць суадносна з уласным яе бачаннем, але ў агульным нацыянальным накірунку. Пры гэтым, замацаванню належаць найлепшыя ўзоры, свайго роду эстэтычныя эталоны;

***– вызначаны змест эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы праз сістэму сродкаў*** (усе віды народнай творчасці, мова, прырода, праца).

Метады эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы разгледжаны згодна з іх накіраванасцю на ўнутраны свет асобы (інтравертаваныя) альбо накіраванасцю ад асобы на знешні духоўны ці матэрыяльны свет (экстравертаваныя). Гэтыя метады рэалізуюцца праз сям'ю, мясцовую суполку жыхароў, калектыў аднагодкаў і ў працэсе самавыхавання.

Першая група метадаў – інтравертаваных – спрыяе далучэнню асобы да свету прыгажосці: фарміраванне і развіццё ўменне бачыць, адчуваць, успрымаць, разумець, ацэньваць прыгожае, эстэтычна перажываць з'явы прыгажосці (непрыгажосці). Рэалізацыя ідзе праз такія метады, як перакананне, праца, прыклад і аўтарытэт, назіранне, прывучанне, унушэнне, гутарка, тлумачэнне, заахвочванне, запалохванне, ухваленне, вымова, зварот да эстэтычных пачуццяў, павага да старэйшых, грамадская думка, асуджэнне, ухваленне, прыклад і аўтарытэт, расповед, узаемная павага, гульня, практыкаванне, выкарыстанне звароту да пачуццяў страху, брузглівасці, саманазіранне і г.д.

Другая група метадаў – экстравертаваных – скіравана на фарміраванне і развіццё уменняў ствараць і захоўваць прыгажосць паводзін, зносін, працы, творчасці, прыроды і г.д. Мы характарызуем наступныя метады: практыкаванні, ухваленні, праца, вымова, прывучэнне, іспыт, спаборніцтва, грамадская думка, сумеснае правядзенне вольнага часу, гульні, пастаноўка далейшай перспектывы, супарадкі, вячоркі і г.д.

Прыгажосць унутранага свету асобы, багацце і напоўненасць яе жыцця залежаць ад глыбіні і сілы эстэтычных перажыванняў. Далучэнне да эстэтычных каштоўнасцей народа здольна забяспечыць духоўнае адзінства людзей, узмацніць эмацыянальную памяць. Імкненне да прыгажосці, дасканаласці, максімальнага раскрыцця сваіх унутраных сіл і магчымасцей, пераўтварэння як сябе, так і наваколля з'яўляюцца аднымі з вядучых патрэбнасцей чалавека і адначасова складаюць самую сутнасць эстэтычнага выхавання.



Репозиторий ВГУ

Манаграфія мае на мэце прапанаваць педагогам навуковае асэнсаванне праблемы эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы, што дазваляе дэталёва разглядаць традыцыі ў якасці кампанента выхаваўчай дзейнасці.

Вызначэнне тэарэтыка-метадалагічных асноў даследавання праблемы і акрэсленне зместу эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы можа паспрыяць правядзенню практычных даследаванняў, накіраваных на вывучэнне эфектыўнага выкарыстання традыцый эстэтычнага выхавання ў практыцы работы дзіцячых устаноў рознага тыпу.

Матэрыялы даследавання могуць быць запатрабаваны практыкай сямейнага выхавання, самавыхавання, у вучэбна-выхаваўчым працэсе дзіцячых садкоў, агульнаадукацыйных і спецыялізаваных мастацкіх школ, гурткоў народнай творчасці; у лекцыйных курсах, семінарскіх занятках, спецкурсах па гісторыі педагогікі, этнапедагогікі; на занятках са слухачамі ў сістэме павышэння кваліфікацыі педагогаў, прафесійнай і вышэйшай адукацыі.

Репозиторий ВГУ

# 1. ТЭАРЭТЫКА-МЕТАДАЛАГІЧНЫЯ АСНОВЫ ДАСЛЕДАВАННЯ ТРАДЫЦЫЙ ЭСТЭТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ Ў БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ ПЕДАГОГІЦЫ

## 1.1. Асноўныя прынцыпы даследавання традыцый эстэтычнага выхавання ў народнай педагогіцы

Канцэптуальная аснова этнапедагогікі будуецца на катэгорыях “культура”, “этнас”, “нацыя”, “выхаванне”, “традыцыі”.

Дэфініцыя “этнас” гістарычна ўказвала на ўсялякую сукупнасць жывых істот, якія валодаюць пэўнымі агульнымі ўласцівасцямі. Сучасны тэрмін функцыянуе з другой паловы XIX ст., аднак спрэчкі па ўдасканаленні разумення яго сэнсу і сутнасці працягваюцца. Ю.У. Брамлей указвае, што “вызначэнне месца этнічных суполак сярод розных чалавечых згуртаванняў – задача надзвычай складаная, аб чым наглядна сведчаць значныя разыходжанні ў дэфініцыях этнасу. Адны аўтары, напрыклад, у якасці галоўных прыкмет этнасу называюць мову і культуру, другія дадаюць да гэтага тэрыторыю і этнічную самасвядомасць, некаторыя ўказваюць, акрамя таго, на асаблівасці псіхічнага складу; іншыя ўключаюць ў этнічыя прыкметы агульнасць паходжання, дзяржаўную прыналежнасць” [31, с. 15].

Сацыяльная філасофія замест тэрміна “этнас” выкарыстоўвае іншы – “нацыя”. Аднак этнолагі і этнографы пашыраюць поле ўжывання першай дэфініцыі, разглядаюць яе як агульнае найменне такіх утварэнняў, як племя, народнасць, нацыянальнасць, нацыя. Найбольш распаўсюджаны пункт погляду на этнас належыць Ю.У. Брамлею: “Этнас – гістарычна склаўшаяся сукупнасць людзей, што валодаюць агульнымі, адносна стабільнымі асаблівасцямі культуры (у тым ліку мовы) і псіхікі, а таксама разуменнем свайго адзінства і адрознення ад іншых такіх жа ўтварэнняў” [31, с. 37]. Аўтар мяркуе, што функцыянаванне этнасу забяспечваюць сінхронным (у прасторы) і дыяхронным (у часе) тыпамі інфармацыйных сувязей, якія забяспечваюць тэрытарыяльныя межы і этнічную пераемнасць.

З гэтага вынікае разуменне этнасу як сацыяльнай еднасці (Ю.У. Брамлей, С.А. Аўцюкоў, М.І. Чабаксараў): “Што да асноўных уласцівасцей этнасу, то яны праяўляюцца, у першую чаргу, у спецыфічных рысах культуры, што ўтворана яго членамі, а таксама ў іх этнічнай самасвядомасці [31, с. 37].



Рэпазіторый ВДУ

У навуцы існуе шэраг тэорый, якія характарызуюць сутнасць і паходжанне нацыі як сацыяльнай з'явы. Вылучым найбольш агульнае гісторыка-матэрыялістычнае вызначэнне, прынятае ў філасофіі. Народ – гістарычная, устойлівая еднасць людзей, якая складваецца ў працэсе фарміравання эканамічных, тэрытарыяльных сувязей, літаратурнай мовы, некаторых асаблівасцей культуры і характару. У сваю чаргу, культуру можна вызначыць, як "сістэму надбіялагічных праграм, што гістарычна развіваюцца і выступаюць умовай узнаўлення і змянення сацыяльнага жыцця ва ўсіх яго асноўных праявах" [139, с. 527].

У сваім даследаванні мы падразумяваем культуру этнічнай суполкі, якую можна разглядаць як пэўную еднасць, што ўтрымлівае шэраг кампанентаў: традыцыі, звычаі, нормы паводзін, мову, рэлігійныя вераванні. Усе яны ўзаемазвязаныя і характарызуюцца ўзаемапранікненнем. Менавіта гэта дапамагае адраджэнню нацыянальнай культуры пры ўмове страты нейкай яе часткі.

Тэорыю, гісторыю народнага традыцыйнага выхавання вывучае этнапедагогіка. Сёння існуе некалькі падыходаў да разумення тэрміна. Першае належыць заснавальніку этнапедагагічных даследаванняў – Г.Н. Волкаву: "Этнапедагогіка – навука аб эмпірычным вопыце этнічных груп у выхаванні і адукацыі дзяцей, аб маральна-этычных і эстэтычных поглядах на сапраўдныя каштоўнасці сям'і, роду, племені, народнасці, нацыі. Этнапедагогіка тлумачыць народную педагогіку і прапануе шляхі яе выкарыстання ў сучасных умовах, збірае і даследуе вопыт этнічных груп, заснаваны на шматвяковым спалучэнні народных традыцый, якія натуральна развіваюцца" [39, с. 4].

Уключыўшыся ў навуковую дыскусію беларускі даследчык В.С. Болбас прапануе сваё разуменне этнапедагогікі. Аўтар аналізуе тэрмін "народная педагогіка" і ў залежнасці ад сутнасці тэрміна "народ", які ўзводзіцца да паняцця "этнас", яднае два значэнні. Даследчык мяркуе, што, калі адбываецца вывучэнне тых народна-педагагічных набыткаў, якія ўласцівы толькі пэўнаму этнасу, пабудаваных на яго асаблівасцях і не заўжды прыдатных для запазычвання, то лепш выкарыстоўваць тэрмін "этнапедагогіка" [24]. На наш погляд, у гэтым плане даследчык звужае поле функцыянавання тэрміна. Аднак мы згодны з В.С. Болбасам у яго імкненні скіраваць даследчыкаў на гістарычны падыход у асэнсаванні ідэй этнапедагогікі.

Абгрунтаваную пазіцыю знаходзім у працах У.М. Конана адносна таго, што "этнапедагогіка не паддаецца прынятай у культуралогіі, літаратуразнаўстве і іншых галінах гуманітарнай навукі атрыбуцыі (індывідуальнага або калектыўнага аўтарства,



Рэпазіторый ВДУ

даты стварэння і інш.) і храналагічнай перыядызацыі” [92, с. 9]. Зварот даследчыка да ролі архетыпаў беларускай культуры дапамагае раскрыць асаблівасці народнага ўспрымання рэчаіснасці, тлумачыць сутнасць ментальнасці народа.

Аднак, на наш погляд, мэтазгодна развесці паняцці “этнапедагогіка” і “народная педагогіка”. Народных педагогік можа быць шмат: практычна кожны народ, што існуе на планеце, можа ганарыцца сваімі асаблівымі поспехамі ў выхаванні падрастаючага пакалення. Таму, мы лічым, павінна быць навука, з пэўным навуковым апаратам, традыцыйнымі падыходамі, агульнымі прынцыпамі, на падставе якіх можа ісці вывучэнне педагагічнага багацця народаў. Таму больш пераканаўчай падаецца пазіцыя Г.Н. Волкава ў вызначэнні сутнасці этнапедагогікі. Адначасова пры гэтым разгляд беларускімі навукоўцамі сутнасці тэрміна “народная педагогіка” бачыцца больш глыбокім і фундаментальным.

Абапіраючыся на вызначэнне Г.Н. Волкава, сфармулюем першы прынцып нашага даследавання: ***апора на тэарэтыка-метадалагічныя асновы этнапедагогікі як навукі аб народнай педагогіцы*** ў вызначэнні катэгарыяльна-паняційнага апарату.

Першапачатковае азначэнне “народнай педагогікі” знаходзім у кнізе этнографа Г.С. Вінаградава з аднайменнай назвай [36]. Народная педагогіка трактавалася ім як “сукупнасць і ўзаемадзеянне народных уяўленняў, поглядаў на жыццё, на выхаванне і навучанне новых пакаленняў, на мэты і задачы выхавання і навучання, сродкі і шляхі ўздзеяння на падрастаючае пакаленне” [36, с. 7].

Сёння ў шматлікіх спробах тэарэтычна вызначыць сутнасць народнай педагогікі можна вылучыць некалькі галоўных напрамкаў.

Разуменне народнай педагогікі як духоўнага феномена народа, эмпірычных ведаў, ідэй, ідэалаў вынікае з напрацовак А.Ф. Хінтыбідзе, Ш.А. Мірзоева [127; 128], В.Ф. Афанасьева, Ю.А. Рудзя, В.В. Лебедзевай. Як педагагічная практыка людзей, яна разглядаецца ў працах Г.С. Вінаградава [36], А.Ш. Гашымава, М.С. Кавалевіч [75]. Найбольш абгрунтаванай падаецца пазіцыя навукоўцаў, якія бачаць народную педагогіку як адзінства педагагічнай думкі і выхаваўчага вопыту чалавечай суполкі: Г.П. Арлова [5], А.А. Грымаць [50; 51], З.П. Васільцова [33], Г.Н. Волкаў [39], А.Е. Ізмайлаў [69], М.М. Мелякоў [125], В.С. Кукушын [106], С.В. Снапкоўская, Я.І. Ханбікаў [220], А. Хрыстава [224].

З развіццём тэорыі фарміравання нацыянальнай самасвядомасці ў савецкай педагогіцы з’явіліся спачатку асобныя

Репозиторий ВГУ

працы, а потым і шэраг даследаванняў, у якіх ставіцца непасрэдна пытанне аб неабходнасці вывучэння беларускай народнай педагогікі (Г.П. Арлова, В.С. Болбас, Д.І. Вадзінскі, А.А. Грымаць, К.А. Кулінковіч, Ф.Т. Міхайлаў, М.Ф. Піліпенка, Л.В. Ракава і інш.). Разам з узнікненнем этнапедагагічных даследаванняў выкарыстанне сродкаў, метадаў і прыёмаў народнай педагогікі ў працэсе выхавання стала набываць мэтанакіраваны і планамерны характар. Метадалагічны падыход да вырашэння праблем пераемнасці навуковай і народнай педагогікі раскрывае ў сваіх працах Г.П. Арлова. На выснове аналізу і вывучэння педагагічных канцэпцый мінулага і сучаснасці яна робіць вывад, што "іх жыццёвасць у вялікай ступені залежыць ад адносін навукоўцаў да народнага вопыту выхавання" [5, с. 3]. Глыбокая тэарэтыка-метадалагічная распрацоўка праблемы дазваляе вызначыць сваё бачанне пытанняў і акрэсліць магчымасці рэалізацыі яго розных накірункаў. Г.П. Арлова стварае лагічны малюнак сістэмы выхавання нашых продкаў; паглыбляе сутнасць вызначэння народнай педагогікі, раскрывае прынцыпы выхавання ў беларускай сям'і, знаёміць са сродкамі беларускай народнай педагогікі, прапануе сваё разуменне сістэмы спосабаў, прыёмаў і метадаў выхавання, дэманструе асноўныя ідэі выхавання і яго галоўныя напрамкі.

Важнасць пераемнасці народнай і афіцыйнай педагогікі падтрымліваецца выданнем у краіне кніг, прысвечаных беларускай народнай педагогіцы, яе асаблівасцям, традыцыям, формам, сродкам і метадам, якія ўсё больш актыўна ўваходзяць у навучальна-выхаваўчы працэс сучаснай школы. Працы (гл. працы Г.П. Арловай, В.С. Болбаса, А.А. Грымаця, Л.М. Варанецкай, У.А. Пашкевіча і г.д.) спрыяюць раскрыццю ролі традыцый у рэалізацыі выхаваўчай работы ў сучасных умовах, выхаваўчай практыцы. Абгрунтавана даказваецца, што выкарыстанне народна-педагагічнай спадчыны дапамагае выхаваць "не нацыяналіста, а асобу, якая мае дачыненне да ўсяго свету, асобу, якая выгадавана на лепшых культурных дасягненнях чалавецтва, асобу, якая здольна да інтэграцыі ў сусветную культуру і цывілізацыю, асобу, якая не згубіла сваёй нацыянальнай самабытнасці" [6, с. 18]. Асобныя аспекты народнага выхавання асветлены ў этнапедагагічных пошуках А.Э. Крываносавай [103; 104], Л.В. Ракавай [165; 166], якія ставяць у цэнтр сваёй увагі каштоўнасці народнай педагогікі ў маральным і сямейным выхаванні, А.Л. Міхайлавай [129; 130], што даследуе праблему фарміравання маральнага і фізічнага здароўя асобы, В.В. Буткевіч [120], Ю.С. Любімавай [119], што распрацоўваюць пытанні эстэ-

Рэпазіторый ВГУ

тычнага выхавання малодшых школьнікаў сродкамі народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Аўтары звяртаюцца да метадаў і сродкаў выхавання беларусаў, разглядаюць культурную спадчыну народа. Пытанні фарміравання нацыянальнай самасвядомасці, этнакультурнай кампетэнцыі з’яўляюцца вядучымі ў даследаваннях Л.Г. Зайцавай, Я.У. Піскун, Л.А. Захарчук і інш. Прапанавана для практычнай работы выхавальнікаў дзіцяцых садкоў праграма “Этнасад”, якая будуецца на прынцыпах этнічнай сацыялізацыі асобы.

Нягледзячы на ўстойлівую цікавасць навукоўцаў, фундаментальных даследаванняў, што датычацца традыцый эстэтычнага выхавання ў беларускай педагогіцы канца XIX – пачатку XX стагоддзя, няма. Між тым, традыцыі эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы складаліся на працягу стагоддзяў. Для таго, каб знайсці сваё месца ў іх асэнсаванні, трэба распрацаваць навуковы падыход да вывучэння азначанай праблемы. Магчымасць акрэсліць навуковыя асновы даследавання традыцый эстэтычнага выхавання ў народнай педагогіцы дазваляе комплексны падыход да этнапедагагічнага асэнсавання дадзенай з’явы (традыцый, народнай педагогікі, эстэтычнага выхавання) у працах філасофаў, культуролагаў, этнографаў, этнапсіхалогаў, фалькларыстаў і інш.

Пры вызначэнні паняційна-тэрміналагічнага апарату даследавання засяродзім увагу на сутнасці вылучанага пытання. Тэрмін “традыцыя” існуе ў розных галінах і ўзроўнях навуковых пошукаў. Найбольш агульны з іх – філасофскі. Вызначаецца, што традыцыі існуюць у жыцці, выхаванні, мастацкай дзейнасці. Наша цікавасць у асноўным распаўсюджваецца на грамадскае функцыянаванне традыцый, у прыватнасці, выхаваўчых. Таму разгледзім, які сэнс надаецца мысліцелямі тэрміну “традыцыя”. Класікі дыялектычнага матэрыялізму трактуюць традыцыю як здольнасць грамадскіх адносін захоўваць пэўны стан даволі працяглы час; дыферэнцыравана ацэньваюць ролю традыцый: гэта не толькі крыніца пераемнасці ў развіцці грамадства і культуры, але (пры некаторых умовах) падстава застою. Погляд на традыцыю як на спадчыну мінулага захоўваўся да другой паловы XX стагоддзя. У межах гэтага падыходу традыцыйныя з’явы культуры разглядаліся як рудыменты, якія павінны абавязкова знікнуць пры мадэрнізацыі грамадства. Другая палова XX стагоддзя характарызуецца ўзнікненнем тэарэтычных даследаванняў, што паклалі пачатак крытыцы тэзіса аб статычнасці традыцыйнага грамадства. Было выказана меркаванне, што “сучаснасць” не супрацьпастаўляецца традыцыі.



Рэпазіторый ВДУ

Навукоўцы ўзнімаюць дыскусію наконт існавання істотных адрозненняў паміж паняццямі “традыцыя” і “звычай”. З найбольш цікавымі вызначэннямі традыцыі і звычаю выступаюць філосафы Э.А. Балер, П.П. Кампарс, Э.С. Маркаран, В.Д. Плахаў [155], А.Г. Спіркін, І.У. Суханаў [196], А.К. Уледаў. Даследчыкі адстойваюць думку, што першай прыступкай засваення жыццёвага вопыту з’яўляецца звычай; “традыцыі – больш грунтоўнае і агульнае паняцце аб матэрыяльным і духоўным жыцці чалавека, яны засвойваюцца, замацоўваюцца і перадаюцца пэўнымі групамі людзей і выконваюць ролю трансфарматараў культурнага вопыту” [81, с. 21–22]. Б.Х. Цаўкілаў, І.А. Блінкоў трымаюцца, на наш погляд, не вельмі дасканалай пазіцыі, што прынцыповых адрозненняў паміж гэтымі дэфініцыямі няма. Больш дакладным і абгрунтаваным падаецца пункт погляду І.В. Суханава, П.П. Кампарса, В.Д. Плахава аб неабходнасці ўліку гэтай розніцы. В.Д. Плахаў навукова раскрывае сутнасць і прыроду традыцый, абгрунтавана прапануе іх як закон сістэмы грамадскіх адносін. Аўтар не абмяжоўваецца пабудовай тэарэтычнай мадэлі традыцый – па-філасофску асэнсоўвае іх месца і ролю ў гістарычным працэсе [155, с. 36]. Істотным бачыцца адкрыццё І.В. Суханавым сувязі паміж з’яўленнем у чалавецтва сістэмы традыцый і ўзнікненнем народнай педагогікі. Мы абапіраемся на тэзіс філосафа аб тым, што народныя нормы былі адлюстраваны ў звычаях і традыцыях і адыгрывалі ролю своеасаблівай праграмы выхавання новага пакалення [196].

Навуковая дыскусія аб існасці традыцый працягваецца ў некалькіх накірунках тэарэтычнага даследавання. У.Д. Плахаў вызначае традыцыі як “грамадскія адносіны, што гістарычна склаліся і перадаюцца ад аднаго пакалення да другога” [155, с. 36]. У тым жа напрамку разглядаецца тэрмін і ў сучасным “Філасофскім энцыклапедычным слоўніку”: традыцыя ёсць перадача “духоўных каштоўнасцей ад пакалення да пакалення; на традыцыі заснавана культурнае жыццё” [211, с. 280]. Філосаф Х.Г. Гадамер [41] разумее традыцыю як захаванне сацыяльна значнай інфармацыі, таго, што ёсць, што ажыццяўляецца пры любых гістарычных зменах. Культуролаг А.В. Юдзін бачыць у традыцыі агульны накірунак, пэўныя характарыстыкі паводзін, якія магічна гарантуюць аптымальны вынік дзеянняў. Аўтар падкрэслівае, што “традыцыі – галіна неабходнасці, практыка яе рэалізацыі ў жывым жыцці – галіна свабоды, хаця і іерархічна падпарадкаваная традыцыі, …як зменлівае цяперашняе падпарадкавана нязменнаму мінуламу” [240, с. 49–50].

Рэпазіторый ВДУ

Свой погляд у прадстаўніка педагагічнай навукі В.Я. Кошалевай. Даследчыца разумее традыцыі як “сацыяльна арганізаваную і мэтанакіраваную сістэму перадачы новым пакаленням назапашаных ведаў, маральных каштоўнасцей і практычнага вопыту” [169]. Аднак аўтар падкрэслівае, што на традыцыі ўплываюць інавацыі, якія замацоўваюцца і змяняюць яе: “Традыцыя з’яўляецца пастаянна дзейным механізмам, які вядзе адбор і уніфікацыю інавацый” [169, с. 202]. А.С. Аруцюнаў прапануе эвалюцыйнае разуменне дэфініцыі: “Традыцыя – гэта групавы вопыт, што выражаны ў сацыяльна-арыентаваных стэрэатыпах, які шляхам прасторава-часавай трансмісіі акумулюецца і аднаўляецца ў розных чалавечых калектывах” [134, с. 160]. Можна меркаваць, што традыцыя пачынае сваё існаванне як інавацыя і толькі з цягам часу набывае ўстойлівую форму [227].

На нашу думку, названыя аўтары звужаюць функцыянальнае поле дэфініцыі, калі абмяжоўваюць сутнасць праблемы толькі працэсам перадачы ці захавання нейкага вопыту. Больш прымальныя для нас падыходы Э.С. Маркарана, Ю. Лявады, А.В. Мудрыка, А.Б. Гофмана, у працах якіх традыцыя разумеецца як спосаб захавання і перадачы, аднаўлення сацыяльных інстытутаў і норм, пры якім падтрымка апошніх абапіраецца на іх існаванне ў мінулым. Трактоўка тэрміна ўключае ў сябе таксама працэс перадачы сацыяльнай спадчыны (матэрыяльныя і духоўныя каштоўнасці) і яе спосабы: “У якасці традыцый выступаюць пэўныя грамадскія законы: нормы паводзін, каштоўнасці, ідэі, звычаі, абрады” [213, с. 692].

Культуралагічны падыход да сутнасці тэрміна дазваляе гаварыць аб традыцыі як сукупнасці архетыпаў нацыянальнай культуры, што знайшлі сваё выяўленне ў міфалогіі, рэлігіі, абрадах, фальклоры і інш., “якія выступаюць у якасці ўзораў, нормаў паводзін і маральных імператываў” [245]. Нарэшце, прадстаўнік этнапедагагічнай навукі Ш.М.-Х. Арсаліеў прапануе варыянт трактоўкі дэфініцыі, згодна з якім традыцыя аб’ядноўвае народ, бо арганізуе сувязь пакаленняў, садзейнічае аднаўленню этнічнай спадчыны.

Традыцыі валодаюць характарыстыкамі, якія дазваляюць меркаваць аб іх як пра аб’ектыўную з’яву. Імі з’яўляюцца, паводле педагога Т.С. Буторынай, усеагульнасць, масавасць, устойлівасць, працягласць існавання, эмацыянальная прывабнасць. Яны ўтрымліваюць аб’ектыўныя ўмовы жыцця грамадства, замацоўваюць істотныя яго элементы, садзейнічаюць яго пераемнасці.

С.Я. Куроўская разглядае наступныя асаблівасці традыцый: своеасаблівае пераходнае звяно паміж мінулым і сучасным, што забяспечвае пераемнасць, развіццё культуры; функцыянаванне



Рэпазіторый ВДУ

на пэўнай тэрыторыі; перадача праз выхаванне, навучанне і сацыялізацыю, якія ажыццяўляюцца ў сям'і і суполцы; устанаўленне правілаў і нормаў, якія датычацца ўсіх. Аўтар лічыць, што традыцыі служаць сродкам стабілізацыі адносін у грамадстве і ажыццяўляюць аднаўленне гэтых адносін у жыцці новых пакаленняў; з'яўляюцца сродкам перадачы сацыяльна-культурных каштоўнасцей, каналам сацыялізацыі асобы; арыентуюць паводзіны чалавека як у звыклых сітуацыях, так і ў новых, якія складваюцца ўпершыню; нівелююць этнічныя, культурныя, рэгіянальныя асаблівасці народа.

Даследчыкі акрэсліваюць тэарэтычнае разуменне сутнасці традыцый і сферы іх функцыянавання і выпрацоўваюць класіфікацыю традыцый на аснове таго ці іншага прынцыпу. Так, В.К. Бандарчык [9] вылучае не толькі традыцыі ў вытворчай дзейнасці, у матэрыяльнай, духоўнай культуры, у сям'і і сямейным побыце, але і падзяляе іх па сацыяльна-саслоўных, прафесійных прыкметах. Навуковец выдзяляе традыцыі пануючых класаў, інтэлігенцыі, сялян, рамеснікаў, рабочых. Прапануецца падзел традыцый, якія існуюць у грамадстве, на нацыянальныя, культурныя, бытавыя, грамадска-палітычныя [185, с. 312]. На падставе грамадскага падыходу Ю.І. Бокань [23] вызначае традыцыі ў навуцы, рэлігіі, палітыцы, мастацтве. На тры групы падзяляе традыцыі Ю.У. Брамлей [31], зыходзячы з іх значнасці ў жыцці чалавека. Гэта, па-першае, грамадска-грамадзянскія, па-другое, асабіста-грамадзянскія і, нарэшце, асабіста-сямейныя [31, с. 18]. В.Я. Кошалева звяртае ўвагу на сістэму выхавання і навучання і бачыць наступныя сферы існавання традыцыі: дзяржаўнай і царкоўнай палітыкі ў адукацыі; педагагічнай навукі; школьнай практыкі; масавай педагагічнай свядомасці (суб'ект дзейнасці – грамадства ў цэлым. Галіна прыкладання – сямейнае і грамадскае выхаванне. Спосаб дзейнасці – практыка выхавання)" [169, с. 202–203]. *(Менавіта гэта галіна падтрымлівае кола нашых этнапедагагічных пошукаў, карэктуе погляд на праблему.)*

Існуюць спробы (Э.С. Маркаран) развесці паняцці "культурная традыцыя" і "традыцыя". Калі "традыцыя – спосаб фіксацыі ў сацыяльнай памяці, трансмісіі (перадачы), рэпрадуцыравання (узнаўлення) культуры", то "культурная традыцыя" перадаецца сацыяльным, групавым вопытам, які набывае форму стэрэатыпа, што, у сваю чаргу, з цягам часу акумулюецца ў розных калектывах. Дапаўняе і развівае яго думку праца Л.Д. Сталярэнкі, прысвечаная этнапсіхалогіі народаў. У ёй закрануты шматлікія нацыянальныя традыцыі, што разумеюцца як правілы, нормы, стэрэатыпы паводзін, якія склаліся на падставе



Рэпазіторый ВДУ

жыццёвага вопыту нацыі, якія ўкараніліся ў паўсядзённым існаванні, передаюцца новым членам суполкі; а выкананне іх стала грамадскім абавязкам кожнага" [106, с. 105].

Сёння актуальныя працы філосафаў, педагогаў, этнапедагогаў, што скіраваныя на вывучэнне народных педагагічных традыцый выхавання. У прыватнасці адзначаецца, што да народнай традыцыі можна падыходзіць як да нейкага духоўнага ўтварэння, сацыялізаванага элемента, як праяве біялагічнага, у якой асноўныя характарыстыкі пераемнасці, нязменнасці зыходзяць з прыроды чалавека. Народную традыцыю як унікальны комплекс, сацыяльна-духоўнае ўтварэнне, заснаванае на пэўным універсальным першаварыянце, прапануе разглядаць Т.Ю. Скопінцава. З.Г. Нігматаў даследуе праблему гуманістычных традыцый народнай педагогікі і падкрэслівае, што "народныя традыцыі і звычаі … заключаюць у сабе шмат такога, што можа быць з поспехам выкарыстана пры стварэнні новага" [136, 6].

А.Д. Шчарбакоў распрацоўвае маральнае выхаванне навучэнцаў на народных традыцыях, І.А. Даўліеў звяртаецца да сямейных традыцый і звычаяў татарскага народа, М.М. Мелякоў [125] разглядае традыцыі выхавання дзяцей у народаў Поўначы, В.Я. Кошалева ўздымае педагагічныя традыцыі праваслаўя [169]. Каштоўнасць напрацовак у тым, што яны паглыбляюць сутнасць праблемы, асвятляюць яе з розных бакоў, абгрунтавана гавораць аб актуальнасці і неабходнасці вывучэння.

Фактычна, сістэма традыцый этнасу з'яўляецца вынікам яго выхаваўчых намаганняў на працягу вякоў. Праз яе народ ажыццяўляе аднаўленне сябе, сваёй культуры, матэрыяльнай і духоўнай, захоўвае пэўны псіхічны склад, характар, каштоўнасці.

Беларускі этнапедагог І.І. Калачова [81; 82] вылучае этнічныя традыцыі як "сукупнасць інфармацыйных элементаў з этнічнай адметнасцю ў матэрыяльным і духоўным жыцці, а таксама спосаб іх трансмісіі ў рамках пэўнага этнасу" [81, с. 23]. Іх састаўной часткай аўтар разглядае этнапедагагічныя традыцыі, якія "займаюць значнае месца ў духоўнай культуры беларускага народа" [там жа, с. 21]. Паняцце "этнічныя традыцыі" раскрываецца даследчыцай у сувязі з паняццямі "этнас" і "традыцыя". "Этнас" разумеецца як супольнасць людзей, якая склалася гістарычна на пэўнай тэрыторыі і характарызуецца агульнасцю мовы, побыту, культуры, самасвядомасці, адлюстраванай у адзінай назве і ўяўленнях пра агульнасць паходжання" [81]. І.І. Калачова вызначае погляды на біялагічныя і сацыяльныя аспекты этнасу Л. Гумілёва (этнас як біялагічная папуляцыя, вялікая роля нале-

жыць генетычнай спадчыннасці), Ю.У. Брамлея (аснова засваення чалавекам этнічнай інфармацыі – сацыяльная спадчыннасць).

Вывучэнне этнапедагагічнай спадчыны народаў Беларусі, народных традыцый і звычаяў выхавання падводзіць І.І. Калачову да выпрацоўкі характарыстык этнічных традыцый беларускага народа. Іх аўтар бачыць у пэўных адметнасцях ў культуры, побыце, мове, што перадаюцца праз лад жыцця, традыцыйныя ramёствы, сямейныя і грамадскія адносіны, маральныя нормы і правілы, якія падзяляюцца на працоўныя, сямейныя, грамадскія, рэлігійныя, каляндарныя [81; 82].

Нарэшце, з'яўляюцца дысертацыйныя даследаванні, што падкрэсліваюць важнасць вывучэння народных традыцый, педагогікі і педагагічных умоў развіцця цікавасці да іх, іх выкарыстання (Р.С. Умяргалін [207], В.В. Фралова [216]).

Даследчыца В.Я. Кошалева вылучае некалькі асаблівасцей, што адрозніваюць праваслаўную педагагічную традыцыю ад навуковай педагогікі. На наш погляд, яны належаць і народным традыцыям выхавання, а таму ўяўляюць цікавасць для нашага даследавання: "традыцыя бесперапынная і не параджае ўнутры сябе "рэвалюцыйных сітуацый"; традыцыі не ўласцівы плюралізм меркаванняў, дыскусійнасць, сутыкненне розных філасофскіх плыняў; традыцыя імкнецца захаваць сябе ад знешніх уздзеянняў; традыцыя безасабовая; традыцыя фіксуецца ў пісьменнасці, але існуе таксама ў вусных формах і звычаях; пісьмовая традыцыя строга арыентуецца на аўтарытэты (Святое Пісанне), вусная – на запаветы продкаў; традыцыя аперыруе не катэгорыямі, а ўстойлівымі вобразамі" [169, с. 204]. І.І. Крук прапануе выразна размяжоўваць народную культурную і праваслаўную традыцыі, бо, па яго мяркаванні, "побач з вопытам нашай народнай педагогікі ляжаць няспрэчныя каштоўнасці хрысціянскай педагогікі з яе асноўнымі дзесяццю запаветамі і ідэаламі чалавечай годнасці і духоўнасці – постаццю Ісуса Хрыста" [101, с. 8].

Грунтоўна размяжоўвае традыцыі і спадчыннасць народа з пазіцый каштоўнаснага падыходу айчынны культуролаг Ю.В. Чарняўская [227]. Яна падкрэслівае, што "традыцыі – гэта не ўся спадчыннасць народа, але яго некаторая частка – тая, якую члены этнасу ацэньваюць (станоўча ці адмоўна) як нешта значнае дзеля грамадства… Традыцыя – гэта сам працэс такой ацэнкі, наступнага засваення, а таксама механізм міжпакаленнай перадачы" [227, с. 138].

Усебаковы аналіз падыходаў прадстаўнікоў розных галін ведаў да вызначэння сутнасці паняцця "традыцыя" дае нам магчымасць сфарміраваць асабістую пазіцыю адносна тэрміна. У асноўным згаджаючыся з прапанаванымі вызначэннямі, мы трак-



Репозиторий ВГУ

туем тэрмін наступным чынам: **традыцыя** – *гэта сістэма перадачы сацыяльна значымых ведаў, каштоўнасцей, поглядаў, навыкаў, што гістарычна склалася на працягу стагоддзяў пад уплывам нацыянальнай культуры і накіраваная на захаванне і памнажэнне дадзенага народнага вопыту.* Традыцыя надае сэнс чалавечаму жыццю, бо яна замацоўвае і перадае пэўную іерархічную паслядоўнасць сацыяльных каштоўнасцей. На аснове гэтага падкрэслім вядучы прынцып даследавання – ***улік асаблівасцей нацыянальнай культуры ў выхаванні.***

У падмурку ўсялякай культуры – традыцыйная культура выхавання, якая ўзяла свой пачатак са з'яўленнем чалавека. Г.Н. Волкаў [38; 39] піша, што педагогіка ў кантэксце агульначалавечай культуры такая ж бясконцая, як і выхаванне, бо выхаванне і ёсць практычная педагогіка.

Мы лічым, што ў станаўленні і развіцці выхаваўчага і адукацыйнага працэсу прыярытэтнае значэнне набывае вопыт папярэдніх пакаленняў. Яго асэнсаванне мэтазгоднае не толькі дзеля разумення сучаснасці, але і фарміравання, стварэння будучага. У народнай педагогіцы знайшлі адбітак думкі і мары беларуса, гэта своеасаблівы летапіс будаўніцтва новага жыцця. Таму, перш чым ісці наперад па шляху ўдасканалення і змянення грамадства, неабходна ў пэўнай ступені даведацца пра ўсё тое, што было створана, назапашана і захавана продкамі, вывучаць і творча ўжываць на карысць сучаснікаў.

Вылучым яшчэ адзін прынцып даследавання: ***прыярытэт народнай педагогікі ў выхаванні.*** Г.Н. Волкаў піша пра гэта наступным чынам: "Без памяці (гістарычнай) – няма традыцый, без традыцый – няма культуры, без культуры – няма выхавання, без выхавання – няма духоўнасці, без духоўнасці – няма асобы, без асобы – няма народа (гістарычнай асобы)" [38, 68]. Адзначым, што такой пазіцыі прытрымліваліся вядомыя асветнікі ўсіх часоў. Знакамітыя педагогі мінулага вывучалі вопыт народнай педагогікі, апісвалі яго ў сваіх працах, указвалі на неабходнасць выкарыстання, уключалі жыватворныя ідэі народнай педагагічнай канцэпцыі, творча здзяйсняючы пераемнасць народнай і навуковай педагогікі.

Я.А. Каменскі быў адным з першых у Еўропе даследчыкаў, які звярнуў увагу на карысныя аспекты народнага выхавання. Яго педагагічная сістэма стала тэарэтычным абгрунтаваннем і развіццём працэсу падрыхтоўкі да самастойнага жыцця, які склаўся ў славянскіх народаў Чэхіі, Польшчы, Украіны. Я.А. Каменскі высока ацэньваў ролю народнай творчасці ў выхаванні падрастаючага пакалення; збіраў і вывучаў чэшскія



Рэпазіторый ВДУ

прымаўкі і прыказкі, узоры роднай мовы, грунтоўна разглядаў традыцыі і звычаі народа. Менавіта гэта дало магчымасць асветніку сфармуляваць навуковыя пастулаты на падмурку народна-педагагічных традыцый, вылучыць вядучы прынцып народнай педагогікі – прыродаадпаведнасці, што вызначыла жыццяздольнасць яго педагагічнай канцэпцыі, яе актуальнасць для вырашэння сённяшніх праблем адукацыі і выхавання.

На швейцарскую народную педагогіку ў сваіх працах абапіраўся І.Г. Песталоцы. Ён цаніў фізічнае выхаванне, якое будавалася на элементарных, жыццёва неабходных рухах, элементах працоўных аперацый (лазанне, бег, скачкі і г.д.). Заснавальнік дыдактыкі развіваў думку Я.А. Каменскага аб тым, што выхаванне павінна быць прыродаадпаведным: яно заклікана развіваць чалавечыя духоўныя і фізічныя сілы ва ўсебаковай дзіцячай дзейнасці. Дзеля дасягнення гэтай мэты І.Г. Песталоцы не толькі падкрэсліваў карыснасць, але і шырока прапагандаваў народную мудрасць выхавання. Ён і яго паслядоўнікі Д. Локк, К. Гельвецый зразумелі неабходнасць культураадпаведнага выхавання. Аднак сам гэты прынцып быў сфармуляваны Ф. Дыстэрвегам. Фактычна з гэтага прынцыпу вынікае неабходнасць выхавання на прыярытэтах чалавечай культуры, у межах норм і каштоўнасцей нацыянальных культур, якія не супрацьлеглыя агульначалавечым. Педагог пісаў пра тое, што ў выхаванні неабходна прымаць пад увагу ўмовы месца і часу, у якіх нарадзіўся чалавек ці ў якіх прадбачыцца яму жыць. Галоўнае ў выхаванні – зварот увагі на ўсю сучасную культуру ў шырокім сэнсе слова, асабліва культуру краіны, што з'яўляецца радзімай вучня. Фактычна гэта заклік да выхавання падрастаючага пакалення на традыцыях нацыянальнай культуры.

Адзін са стваральнікаў сістэмы адукацыі ў Расіі М.В. Ламаносаў імкнуўся даследаваць чалавека як частку прыроды. Ён рабіў свае вывады на падставе прынцыпу прыродаадпаведнасці; лічыў неабходным здзяйсняць індывідуальны падыход у адносінах да дзяцей. Падмуркам педагагічнай тэорыі вялікага вучонага былі нацыянальныя традыцыі, прагрэсіўны выхаваўчы вопыт народаў Расіі.

Погляды даследчыкаў больш позняга часу дазваляюць разглядаць народную педагогіку і эстэтычнае выхаванне ў адзінстве, вылучаць ідэалы народа як аснову, што фарміруе сістэму эстэтычнага выхавання. Ля вытокаў гэтага працэсу – разуменне адзінства цялеснага (фізічнага) і духоўнага (імкненне да ідэалу дасканалага чалавека). Выхаваўчыя традыцыі народнай педагогікі захаваліся ў фальклоры, мастацтве. Нашы сённяшнія веды аб іх у многім грунтуюцца на каштоўнасцях, здабытых



Рэпазіторый ВДУ

беларускімі фалькларыстамі, этнографамі. Даследуючы і апісваючы мову, побыт, фальклор, яны развівалі ў працах дух народнага жыцця, што дазваляла і дазваляе вывучаць самае каштоўнае і карыснае.

Адным з першых мысліцеляў-педагогаў, які задзейнічаў народныя багацці ў галіне выхавання, лічыцца ***С.Ф. Рысінскі***. Яго зборнік "Прыказкі і прымаўкі" (Любча, 1618) карыстаўся вялікай папулярнасцю, нават Я.А. Каменскі плённа выкарыстоўваў яго матэрыялы ў сваіх працах.

Першыя працы па краязнаўстве і этнаграфіі выйшлі ў канцы XVIII – першай палове XIX стагоддзя. Гэта "Апісанне Крычаўскага графства, або былога староства 1786 года" А. Меера, "Запіскі падарожжа па заходніх правінцыях Расійскай дзяржавы" (1803) В.М. Севяргіна, выданні, што належалі І.І. Ляпехіну, Л. Галамбёўскаму, З. Даленга-Хадакоўскаму, Ю. Крашэўскаму, Е.П. Тышкевічу, Я. Чачоту, Я. Баршчэўскаму і інш. У асноўным аўтары былі прадстаўнікамі дробнай шляхты, добра ведалі духоўную спадчыну народа, быт, звычаі і абрады.

З другой паловы XIX стагоддзя этнаграфія пачала развівацца ў цеснай сувязі з мастацкай літаратурай, геаграфіяй, краязнаўствам. Рускае імператарскае геаграфічнае таварыства дало штуршок для больш актыўнага этнаграфічнага вывучэння Беларусі. Яно паспрыяла выданню "Этнаграфічнага зборніка", дзе былі надрукаваны запісы М. Анімелі, А. Кіркора. Мэтанакіраваная работа, што разгарнулася па сістэматызацыі, абагульненні разнастайных звестак па геаграфіі, гаспадарцы, народнай культуры, вылілася ў грунтоўныя выданні "Матэрыялы для геаграфіі і статыстыкі Расіі, сабраныя афіцэрамі генеральнага штаба". Акрамя гэтага, з'яўляліся апісанні і разважанні Р.Ф. Эркета. Аднячасова польскія даследчыкі, такія, як О. Кольберг, М. Федароўскі, З. Глогер, К. Машыньскі, зрабілі сур'ёзныя намаганні ў справе вывучэння этнаграфіі і фальклору Беларусі. Першай гісторыяй беларускай этнаграфіі сталі главы 4-га тома "Гісторыі рускай этнаграфіі" А.М. Пыпіна.

Актыўна збіралі фальклор настаўнікі, выкарыстоўваючы яго ў сваёй практычнай педагагічнай дзейнасці. Этнографы і фалькларысты, што займаліся гэтай справай, імкнуліся выдаваць зборнікі, якія, урэшце рэшт, таксама прапагандавалі ідэі, служылі зыходным матэрыялам народна-педагагічных ведаў для выкарыстання ў навучальна-выхаваўчым працэсе. Варта дадаць, што ўсе этнаграфічныя работы, хоць і не спецыяльна, але былі скіраваны на выхаванне эстэтыкі. Мы згаджаемся з думкай сучасных беларускіх этнапедагогаў, у прыватнасці, В.С. Болбаса, аб тым,

Рэпазіторый ВДУ

што “вывучэнне этнапедагагічных набыткаў з даўніх часоў праводзілася ў агульным рэчышчы даследавання культуры, быту і гісторыі беларусаў” [24, с. 27].

Аргументаваў практычнае выкарыстанне фальклорнай народна-педагагічнай спадчыны ***Ян Чачот***. Яго пункт погляду заключаўся ў тым, што “людзі, выхаваныя на народных традыцыях, заўсёды будуць больш добразычлівымі, працавітымі, сумленнымі і шчырымі” [24, с. 28]. Я. Чачот лічыў, што песні (якія ён, дарэчы, збіраў), казкі, легенды, паданні здольны выклікаць “пяшчотныя, прыгожыя, тонкія і нават глыбокія пачуцці”. Асветнік звяртаў увагу на тое, што народныя паэтычныя творы аказваюць вялікі ўплыў на пачуцці і розум слухача, а гэта спрыяе маральнаму і эстэтычнаму выхаванню.

***М.А. Дзмітрыеў*** вёў даследаванне культуры і быту беларусаў, выдаў зборы песень, казак, абрадаў, забаў. Педагог зрабіў вывад аб вялікім духоўна-маральным патэнцыяле беларускай культуры, які належыць выкарыстоўваць з мэтай удасканалення маладога пакалення.

***П.М. Шпілеўскі*** (Драўлянскі) – этнограф, педагог, пісьменнік, тэатральны крытык – праяўляў вялікую цікавасць да беларускага фальклору, бо імкнуўся спасцігнуць душу народа. Яго “Падарожжа па Палессі і Беларускім краі”, “Беларусь у характарыстычных апісаннях і фантастычных яе казках” з’яўляюцца сапраўднымі захавальнікамі народных педагагічных ідэй, скарбонкай народных эстэтычных знаходак.

Вывучэнне літаратурных крыніц дае падставу сцвярджаць, што беларускія асветнікі канца XIX – пачатку XX стагоддзя, даследчыкі побыту, культуры падкрэслівалі велізарную выхаваўчую сілу народнай педагогікі, улічвалі шэраг аспектаў, сярод якіх значнае месца займаў эстэтычны. І сёння прыцягваюць увагу навукоўцаў каштоўныя фальклорна-этнаграфічныя запісы мінуўшчыны.

Гісторык, фалькларыст, этнограф, які апісваў сямейны побыт, вывучаў вясельныя абрады, сямейнае звычаёвае права, ***М.В. Доўнар-Запольскі*** высока цаніў здабыткі беларускага фальклору, абрадаў, звычаяў, падкрэсліваў важнасць народнай творчасці беларусаў, якая складае вялікае багацце. Знаўца беларускай культуры лічыў неабходным ганарыцца, падтрымліваць і захоўваць культурныя скарбы. Ён, поруч з Ф.К. Багушэвічам, выступаў за адукацыю народа на яго роднай мове.

***Ф.К. Багушэвіч*** першым з беларускіх асветнікаў XIX ст. выказаў думку аб беларускай мове як аб важнейшым элеменце беларускай культуры, грамадскага жыцця і нацыянальнай свядомасці беларусаў, называючы мову “ўбраннем душы”. Пер-



Рэпазіторый ВДУ

спектывы развіцця беларускага народа ён звязваў з захаваннем роднай мовы [187, с. 45].

Этнограф, педагог, гісторык ***Ю.Ф. Крачкоўскі*** паставіў у цэнтр сваёй увагі пытанні сямейнага выхавання. У працэсе фальклорных экспедыцый запісваў песні, звычаі, паданні беларускага народа.

Прафесійны педагог ***І.Р. Кулакоўскі*** быў прыхільнікам ідэі навучання беларускіх дзяцей у адпаведнасці з мясцовымі традыцыямі і на роднай мове. У вывучэнні мовы сваіх продкаў педагог бачыў эфектыўны сродак выхавання “любові да народнасці”, пазнання “характару народнай гісторыі” [132, с. 57].

***М.Я. Нікіфароўскі*** (педагог, этнограф і фалькларыст) значную частку сваіх кніг прысвяціў аналізу музычных здольнасцей беларускага народа, яго творчага патэнцыялу. Грунтоўныя даследаванні па этнаграфіі, фальклоры і гісторыі Віцебшчыны і зараз з’яўляюцца каштоўнай крыніцай для вывучэння матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў. Навуковец сабраў і сістэматызаваў шмат узораў народнай педагагічнай спадчыны.

***П.М. Шпілеўскі*** адстойваў права беларусаў на нацыянальнае развіццё, выступаў за выхаванне дзяцей на роднай мове, з дапамогай матэрыялаў народнага фальклору, у адпаведнасці з асноўнымі выхаваўчымі традыцыямі беларусаў. У тым жа накірунку працавалі педагог, гісторык, краязнаўца, этнограф ***Я.Ф. Арлоўскі***; мовазнавец, фалькларыст, этнограф ***І.І. Насовіч***, аўтар знакамітых зборнікаў прыказак і прымавак беларускага народа, “Словаря белорусского наречия”.

Асветнік і педагог, вучоны ў галіне этнаграфіі, фалькларысткі, археалогіі ***Е.Р. Раманаў*** плённа вывучаў вуснапаэтычную творчасць народа. У народным фальклоры ён бачыў магутны выхаваўчы сродак. Менавіта Е.Р. Раманавым былі прапанаваны праграмы па зборы звестак аб гульнях, цацках дзяцей, ідэя творчага запазычання народнага вопыту фізічнага выхавання; абгрунтавана мэтазгоднасць выкарыстання беларускіх народных цацак, гульняў, дзіцячых забаў з педагагічнага пункту гледжання. Даследчыкам падрыхтаваны матэрыялы для дзевяці выпускаў “Беларускага зборніка”, “Матэрыялы па гісторыі тапаграфіі Віцебскай губерні “Павет Веліжскі” і г.д.

Беларускі этнограф і фалькларыст, мовазнаўца і педагог ***А.Я. Багдановіч*** адным з першых навукоўцаў выдаў працу, у якой была зроблена спроба аналізу і абагульнення ідэй і традыцый народнай педагогікі ў гісторыі педагагічнай думкі Беларусі. Тэарэтычныя палажэнні А.Я. Багдановіч актыўна выкарыстоўваў у сваім прафесійным жыцці. Да фальклору ставіўся як да крыніцы

Рэпазіторый ВДУ

для вывучэння не толькі педагагічных поглядаў народа. Ён бачыў у ім цэласную сістэму выхавання, якая апрацавана і апрабавана пакаленнямі.

Этнограф і фалькларыст ***А.К. Сержпутоўскі*** арганізоўваў этнаграфічныя экспедыцыі, па матэрыялах якіх выдаваў этнаграфічныя даследаванні, прысвечаныя разгляду народных традыцый жыцця і выхавання.

Збіральнік фальклору ***П.В. Шэйн*** вызначае абрадавую паэзію як дамінуючую для беларускага фальклору, разглядае народную песню як галоўную эмацыянальна-эстэтычную форму духоўнага жыцця сялянства [26]. Знакамітаму фалькларысту і этнографу пісалі Я. Карскі, Ю. Крачкоўскі, Я. Лучына, М.Я. Нікіфароўскі, З. Радчанка – усе яны адчувалі неабходнасць апоры школы на народны вопыт выхавання. Гэтыя погляды знайшлі свой адбітак у разнастайных кнігах і артыкулах. Напрыклад, М.Я. Нікіфароўскі ў “Нарысах Віцебскай Беларусі” пісаў аб тым, што “беларуская маці, нават непісьменная, умее пакуль выхаваць дзіця ў адданасці праваслаўю і дзяржаўнай уладзе” [28].

***Я.Ф. Карскі*** вялікую ўвагу надаваў мове, слову, беларускім народным прымаўкам і прыказкам, казкам. На прыказкі і прымаўкі даследчык абапіраўся як на свайго роду народную мудрасць. Этнограф і фалькларыст адзначаў, што па малым фальклорным жанрам, па казкам народ вучыцца маральнасці, жывіць бязмежны простор фантазіі, уносіцца ў лепшы свет. Новымі казкамі, якія складаюцца з анекдотаў і сатырычных расказаў, беларусы задавальняюць сваю дасціпнасць.

Рэвалюцыя 1905–1907 гг. паклала пачатак новай хвалі дзейнасці беларускага адраджэння, вядомымі прадстаўнікамі якой былі ***В. Іваноўскі, К. Каганец, Я. Купала, Я. Колас, Цётка, М. Багдановіч, А.М. і З.М. Луцкевічы, В. Ластоўскі, С. Палуян***. Яны рашуча і паслядоўна выступалі за адраджэнне беларускай літаратуры і мовы, стварэнне беларускай нацыянальнай школы, разглядаючы гэтыя патрабаванні як арганічную частку нацыянальна-вызваленчай барацьбы і адначасова як адну з галоўных нязменных умоў нармальнага развіцця культуры Беларусі і нацыянальнай самасвядомасці беларускага народа [186, с. 46]. У іх асветніцкіх працах народным ідэям выхавання было адведзена асноўнае месца. У прыватнасці, ***В. Іваноўскі*** напісаў і выдаў падручнік “Беларускі лемантар, або Першая навука на лацінцы”. ***К. Каганец*** на гэтай аснове апублікаваў кірылічны варыянт лемантара. Беларуская паэтэса, асветніца ***Цётка*** (А.С. Пашкевіч) стала ініцыятарам адкрыцця беларускіх школ, стварыла першы падручнік для школ на беларускай мове, у якім знаёміла з побы-



Рэпазіторый ВДУ

там сялянскай сям'і, прадметамі, прыродай. На падставе вывучэння жыцця беларускага народа, традыцый, звычаяў, маралі аўтар значную частку кнігі напоўніла народна-педагагічнымі творамі розных жанраў: ад прыпевак да казак. Як адзначаюць сучасныя навукоўцы, "Цётка вызначыла асаблівасці народнага выхавання – ранні пачатак, дэмакратызм, натуральны характар, індывідуалізацыю і гуманізацыю" [186, с. 150]. Уся дзейнасць асветніцы, педагога, літаратара была пранікнута вялікім клопатам аб адраджэнні і развіцці нацыянальнай мовы і культуры. Актыўную дапамогу ёй аказвала ***У.Ф. Луцэвіч*** – жонка Я. Купалы.

Справу А. Пашкевіч падтрымаў ***Я. Колас***. Развіваючы ідэю К.Д. Ушынскага аб народнасці выхавання, ён імкнуўся да пазнання жыццёвай мудрасці, роднай мовы, каб стварыць падручнікі, дапаможнікі, літаратурныя творы, якія прасякнуты ідэямі бесперапыннасці працэсу народнага выхавання, паўнаты і завершанасці педагагічнага цыкла, цэласнасці ўспрымання, дыферэнцыйнага падыходу [186; 187]. Вялікі выхаваўчы патэнцыял Я. Колас бачыў у фальклоры і народнай педагогіцы, дакладна, з любоўю апісваў звычаі і абрады, асаблівасці народнага выхавання. Значны ўклад у станаўленне і развіццё нацыянальнай школы і педагагічнай думкі Беларусі належыць ***М.А. Багдановічу***. Ён марыў аб стварэнні педагогіка-метадычных асноў працэсу навучання на роднай мове. Багдановіч вылучаў недахопы, якія несла з сабой выкладанне ў школах на рускай мове. Бадай, галоўным сярод іх паэт лічыў страту духоўнай культуры беларусаў, бо знікненне з ужывання вялікай колькасці адметных слоў цягне за сабой і знікненне перажыванняў, што былі звязаны з гэтымі словамі, а гэта, у сваю чаргу, абядняе як дзіцячую псіхіку, так і творчы патэнцыял народа.

Беларускі літаратуразнаўца, публіцыст і крытык ***С.Е. Палуян*** распрацаваў канцэпцыю беларускага адраджэння, у аснове якой – абуджэнне нацыянальнай свядомасці і перш-наперш адраджэнне мовы, праз увядзенне выкладання на роднай мове.

Да ідэй народнай педагогікі звяртаўся асветнік, грамадскі дзеяч ***В. Ластоўскі***, бо адчуваў іх значнасць у выхаванні нацыянальнай свядомасці. Пры асэнсаванні ролі народнай педагогікі ў выхаванні дзяцей, этнапедагагічныя традыцыі ён разглядаў як падмурак айчыннай выхаваўчай сістэмы. Галоўнымі накірункамі развіцця нацыянальнай адукацыі, на яго думку, былі: гістарычная адукацыя, вывучэнне роднай мовы і народнай творчасці.

У кантэксце стварэння нацыянальнай школы, вызначэння нацыянальнай ідэнтычнасці ***Б.А. Тарашкевіч*** падрыхтаваў першую беларускую граматыку, якая была выдадзена ў 1918 г.



Рэпазіторый ВГУ

Сярод актыўных творцаў беларускай школы можна таксама назваць імёны ***І.Ю. Лёсіка, Л. Гмырака, М. Гарэцкага, М.А. Янчука***, якія адной з галоўных нацыянальных каштоўнасцей лічылі родную мову і выхаванне на традыцыях народнай педагогікі і фальклору. Сучасныя даследчыкі (у прыватнасці, Л.В. Ракава) адзначаюць, што росквіт народнай педагогікі быў дасягнуты ў XIX ст.: “Велізарныя грамадска-палітычныя і эканамічныя змены, якія пачаліся ў XX ст. і працягваліся шмат дзесяцігоддзяў, паступова разбуралі і збяднялі вельмі багатую этнапедагагічную спадчыну, лёс існавання якой пастаўлены пад пагрозу [132, с. 115]. Працэс яе вывучэння таксама залежаў ад стану грамадска-палітычнай сітуацыі ў краіне. Уздым нацыянальна-патрыятычнага настрою павялічваў навуковую цікавасць да культуры, да традыцый, народна-педагагічнай спадчыны.

У гады савецкай улады цікавасць да народнай культурнай спадчыны спачатку ўзрастае, а потым, да сярэдзіны 30-х гг. XX ст., змяншаецца. Аднак змяненне статусу Беларусі, пераход яе ў лік самастойных дзяржаў зноў паварочваюць грамадскую думку да народных здабыткаў, аднаўлення і выкарыстання народнай спадчыны. Апошняе дзесяцігоддзе знамянальна шэрагам даследаванняў, прысвечаных як народнай культуры ўвогуле, так і праблемам менавіта народнай педагогікі.

Мастацтвазнаўцы Я.М. Сахута, Д.М. Трызна, І. Ялатомцава, этнолагі, фалькларысты В.К. Бандарчык, Г.А. Барташэвіч, А.І. Гурскі, Э.С. Дубянецкі, І.І. Калачова, І.І. Крук, А.С. Ліс, І.І. Сучкоў, В.С. Цітоў і шэраг іншых працягваюць традыцыі даследчыкаў беларускай культуры XIX–XX стагоддзяў. Працы этнапедагогаў Г.П. Арловай, В.С. Болбаса, В.В. Буткевіч, А.Э. Крываносавай, Ю.С. Любімавай, Я.І. Сярмяжкі, У.А. Пашкевіча і інш. аналізуюць стан і перспектывы выкарыстання багаццяў беларускай народнай педагогікі. Навукоўцы лічаць, што далучэнне жыхароў краіны да этнапедагагічнай спадчыны беларусаў садзейнічае больш натуральнаму ўваходу асобы ў агульнанацыянальную, агульначалавечую плынь, узбагачае чалавека праверанымі жыццём ведамі, каштоўнасцямі, спрыяе вырашэнню задач сучаснай педагагічнай навукі.

***Прынцып прыродаадпаведнасці***. Чалавек фарміруецца ў коле натуральнага шляху развіцця сваёй прыроды. Згодна з думкай Я.А. Каменскага, тое ў чалавеку ўстойлівае, што ён засвойвае ў маладосці. Вывучэнне традыцыйных народных падыходаў да працэсу эстэтычнага выхавання дазваляе зрабіць вывад, што найбольшая ўвага надаецца выхаванню менавіта дзіцяці, падлетка, юнака.

Репозиторий ВГУ

Прыродаабумоўленасць – адна з галоўных асаблівасцей народнай педагогікі. Таму працэс эстэтычнага выхавання ўлічвае ўзроставыя, індывідуальныя, асабовыя, псіхічныя асаблівасці маладога пакалення. Напрыклад, фальклорныя жанры арыентаваны на розны ўзрост, маюць, згодна з ім, свае асаблівасці. З узростам ідзе змена і эстэтычнай дзейнасці: калі ў маленстве дзеці співаюць, слухаюць спевы, казкі, то ў больш сталым узросце дзяўчына ўжо рыхтуе свой пасаг. Яна не проста вырабляе рэчы, а аздабляе тканыя вырабы выразнай вышыўкай; хлопец аддае шмат часу для вырабу калаўрота, каб потым падараваць сваё тварэнне дзяўчыне і г.д. Такім чынам, улічваецца пол, узрост чалавека, супадзенне моманту, часу нараджэння з адпаведным станам прыроды [201, с. 71]. Згодна з даследаваннямі Л.В. Ракавай, нават жыццё чалавека мела перыядызацыю ў адпаведнасці з порамі года [166].

***Прынцып культураадпаведнасці***, які абвешчаны нямецкім педагогам Ф. Дыстэрвегам, уключае апору на айчынныя, нацыянальныя ідэі творчага самаразвіцця. Прынцып культураадпаведнасці ў межах нашага даследавання сугучны ідэям філосафа У.В. Конана пра беларускія культурныя архетыпы, на падставе якіх будуецца кола народнай культуры, сучасных этнапедагогаў: Г.Н. Волкава (пра асобы – сімвалы), І.Я. Якаўлева (прыярытэты духоўных каштоўнасцей). Згодна з думкай А.А. Грымаця, "нацыянальная прыналежнасць накладвае свой адбітак на псіхалагічныя асаблівасці індывіда... Прадстаўнік той ці іншай нацыянальнай еднасці схільны мысліць, адчуваць, дзейнічаць так, як яму дыктуюць нацыянальныя традыцыі, нормы і правілы паводзін, якія складваліся стагоддзямі. Людзі, якія выхоўваліся на выпрацаваных нацыяй каштоўнасцях і традыцыях, кіруюцца імі як асноўнымі нормамі паводзін і адносін" [50, с. 9].

Беларуская культура адметная сваёй талерантнасцю да ўплыву іншых культур. Тое, што не супрацьстаіць народнаму эстэтычнаму ідэалу, прымаецца і асімілюецца.

***Прынцып натуральнасці выхаваўчых падыходаў народа***. Натуральнасць, згодна з думкай Г.Н. Волкава [39], – універсальная асаблівасць і сродак народнага выхавання. З натуральнага імкнення чалавека да прыгажосці, гармоніі, нарадзіліся музыка і жывапіс, жаданне быць з роднай прыродай, мець зносіны са сваімі роднымі і блізкімі – патрыятызм, культ продкаў. Напрыклад, дзіцячыя гульні бяруць пачатак з навакольнага асяроддзя і працы (*"Рэдзька", "Зайчык", "Пастушок і авечкі", "Крупы драць"*); загадкі адлюстроўваюць чалавечае жыццё, прыроду і яе з'явы (*"З акна ў акно – залатое верацяно" /сонечны прамень/, "Што ў печы мокне, а ў вадзе сохне?" /воск/*);



Репозиторий ВГУ

міфалогія асвятляе наваколле (*Пярун – бог нябеснага агню, Грамаўніца – жонка Перуна; Вадзянік, Русалкі, Азярніцы – апекуны чыстай воднай прасторы, Аржавень, Багнік, Балотнік – балотнай і г.д.*) [12; 13; 19].

Натуральнасць пранізвае мэты, сродкі, метады, працэс і змест эстэтычнага выхавання. Сам народны эстэтычны ідэал з'явіўся пад уплывам натуральнасці прыгажосці, яе адпаведнасці прыроднаму і сацыяльнаму асяроддзю.

Прымыкае да вышэйназванага прынцыпу ***прынцып народнасці***, які ў рускай педагогіцы ўпершыню прапанаваў К.Дз. Ушынскі, калі зрабіў мадэль адукацыі, у аснове якой – родная культура, мова і нацыянальнае мастацтва. Мы ставімся да народнасці як імкненння да самастойнасці пры крытычным засваенні таго лепшага, што ствараецца ў галіне выхавання. Згодна з гэтым, мы разглядаем эстэтычнае выхаванне ў межах павагі да традыцый народнай культуры і педагогікі, развіцця пачуцця нацыянальнай самасвядомасці.

У беларусаў па традыцыі ўжо з першых дзён маці, родныя вядуць "размовы" з немаўляткам, спяваюць яму калыханкі. Пэўныя словы паўтараюцца больш голасна, выразна. Дзіця пераймае ў дарослых і пачынае вымаўляць гукі, склады, словы. Засваенне роднай мовы мае вялікі сэнс для эстэтычнага развіцця чалавека. У зносінах менавіта матчына слова фарміруе родную (альбо матчыну) мову, якой належала прытрымлівацца на працягу жыцця: *"Хто веру і мову мяняў, той не то сябе – і суседа прадаваў".*

Эстэтычнае выхаванне ў беларускай народнай педагогіцы мае цесную сувязь з іншымі аспектамі выхавання, паколькі характэрнай рысай выхаваўчай сістэмы народа з'яўляецца ***цэласнасць выхаваўчага працэсу, непарыўнасць і узаемадапаўняльнасць выхаваўчых уздзеянняў.*** Падзел выхавання на галіны (разумовае, фізічнае, эстэтычнае, эстэтычнае, працоўнае) даволі ўмоўны, бо кожны накірунак мае цесныя сувязі з усімі іншымі. Так, загадкі развіваюць эстэтычны погляд на свет, кемлівасць, спрыяюць разумоваму выхаванню; казкі праз эстэтычнае падводзяць да маральнага; праца прасякнута пачуццём эстэтычнага, а прылады працы ўражваюць эстэтычнай завершанасцю форм.

Уплыў на эстэтычнае выхаванне, на эстэтычнае развіццё чалавека ідзе бесперапынна на працягу года: народны каляндар багаты на святы, падзеі, якія патрабуюць пільнай эстэтычнай увагі (Ражаство, Каляды, Гуканне Вясны, Тройца, Купала, Багач, Дзяды). Нарэшце, само чалавечае жыццё ад нараджэння да смерці мае свае каналы эстэтычнага ўздзеяння. Выразнасцю адрозніваюцца абрады, прысвечаныя радзінным звычаям; народнае вяселле выглядае

Репозиторий ВГУ

як яркае цудоўнае відовішча, з пэўнымі ролямі і выканаўцамі; пахавальны абрад поўніць сэрца смуткам і жалобай.

***Прынцып адзінства жыцця і выхавання.*** Для беларускай народнай педагогікі характэрна выхаванне ў жыцці і праз жыццё. З самага ранняга ўзросту дзеці назіралі за бацькамі, іх паводзінамі ў сям'і, побыце, працы, слухалі песні, казкі, прымаўкі і прыказкі, загадкі і г.д., якія прасякнуты пачуццём эстэтычнага. Працоўныя заданні, што выконваліся дзеткамі, неслі пячатку эстэтычнага позірку на свет, імкненне зрабіць яго больш прыгожым. Напрыклад, сеяць расліны трэба было роўненькімі радочкамі, каб узыходы радавалі вока; перад святамі абавязкова старанна прыбіралі ў хаце. Нават моўныя асаблівасці адпавядалі азначанаму прынцыпу. Так, назвы раслін падкрэслівалі не толькі іх вонкавы выгляд (дзьмухавец, буслікі, рагулькі, іскаркі), уздзеянне на чалавека пры спажыванні (гарлянка, дурніцы, жывакост, сардэчнік), але і прапаноўвалі даследаванне эстэтычных таямніц у выглядзе казак, паданняў, звязаных з імі (божае дрэўка, браткі, кукушкіны слёзкі, ключыкі).

Такім чынам, даследаванне традыцый эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы абапіраецца на наступныя прынцыпы:

*натуральнасць выхаваўчых падыходаў;*
*прыродаадпаведнасць;*
*культураадпаведнасць;*
*народнасць;*
*прыярытэт народнай педагогікі ў выхаванні;*
*цэласнасць выхаваўчага працэсу;*
*непарыўнасць і ўзаемадапаўняльнасць выхаваўчых уздзеянняў;*
*адзінства жыцця і выхавання.*

Вынікі даследавання паказваюць, што ***эстэтычнае выхаванне ў беларускай народнай педагогіцы*** з'яўляецца часткай агульнага выхаваўчага працэсу. Яго ***мэта*** – фарміраванне чалавека, які здольны бачыць, адчуваць, захоўваць і ствараць прыгожае, прыгажосць вакол сябе. Даследчыкі беларускай культуры неаднаразова падкрэсліваюць, што творцамі і карыстальнікамі мастацтва з'яўляюцца як дарослыя, так і дзеці. Сучаснай канцэпцыі дзейнаснага падыходу ў выхаванні адпавядае народная традыцыя, згодна з якой заахвочваецца і паважаецца імкненне ствараць прыгожыя рэчы, удзельнічаць у народных святах і абрадавых дзеяннях. Актыўнае далучэнне асобы да мастацтва спрыяе не толькі эстэтычнаму, але і маральнаму, інтэлектуальнаму, фізічнаму ўдасканальванню як малога, так і дарослага чалавека.



Репозиторий ВГУ

Усё прагрэсіўнае ў развіцці грамадства мае карані ў народзе, народных адносінах. Станоўчыя педагагічныя традыцыі народа маюць вялікі выхаваўчы сэнс, а таму патрабуюць пільнага вывучэння, творчага выкарыстання.

Зыходзячы з вывучэння літаратурных і навуковых крыніц, мы можам зрабіць вывад, што пытанні традыцый, эстэтычнага выхавання вывучаюцца шматлікімі даследчыкамі як сур'ёзная і важкая праблема. Грунтоўны аналіз даследаванняў, прысвечаных народнай педагогіцы, дазваляе прыйсці да высновы, што народная педагогіка – частка гістарычна сфарміраванай культурнай спадчыны народа, скіраваная на ўсебаковае развіццё і выхаванне асобы.

Такім чынам, асноўнымі прынцыпамі даследавання традыцый эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы з'яўляюцца:

- апора на тэарэтыка-метадалагічныя асновы этнапедагогікі як навукі аб народнай педагогіцы пры вызначэнні катэгарыяльна-паняційнага апарату;
- следаванне гуманістычным і дэмакратычным ідэалам народа ў вызначэнні мэты, зместу, сродкаў і метадаў эстэтычнага выхавання;
- улік асаблівасцей нацыянальнай культуры ў выхаванні;
- прыярытэт народнай педагогікі ў выхаванні.

Мы маем магчымасць вызначыць сутнасць традыцый эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы. Мы разумеем традыцыі як гістарычна сфарміраваную на працягу стагоддзяў сістэму перадачы эстэтычных ведаў, каштоўнасцей, поглядаў, густаў беларускага народа ў працэсе выхаваўчага ўзаемадзеяння пакаленняў.

## 1.2. Асноўныя ўмовы здзяйснення (рэалізацыі) эстэтычнага выхавання ў народнай педагогіцы

На эстэтычнае выхаванне ў беларускай народнай педагогіцы істотна паўплываў шэраг умоў:

агульнасць, калектыўнаць выхаваўчага ўздзеяння;

пераемнасць з іншымі накірункамі выхавання;

паслядоўнасць выхаваўчага працэсу;

рацыянальнае выкарыстанне сродкаў і метадаў народнай педагогікі;

цікавасць і любоў народа да прыгажосці;

эстэтычныя здольнасці, эмацыянальная чуласць прадстаўнікоў суполкі;

Репозиторий ВГУ

улік узроставых асаблівасцей у выхаванні і г.д.

Сярод іх асноўнымі з’яўляюцца: ***прыроднае ўздзеянне; выхаванне ў працы; выкарыстанне патэнцыялу народнай творчасці; распаўсюджванне ў паўсядзённым жыцці беларуса трыяды: мары, народныя вераванні, успаміны (інтэнсіфікатары маральна-эстэтычнага жыцця)***. Разгледзім асаблівасці ўплыву на чалавека, яго выхаванне, імкненне да дасканаласці, гармоніі і творчасці прыроднага ўздзеяння. Яны ўтрымліваюць шэраг этнічных культурных архетыпаў, такіх, як дом (“родная хатка), зямля (“родная зямелька”), дрэва, маці і г.д., што паглыбляюць і пашыраюць выхаваўчы дыяпазон.

### *Прыроднае ўздзеянне*

Сучасная сусветная тэндэнцыя – цікавасць да індывідуальнасці, як чалавека, так і асаблівасцей нацыі. У той жа час індывідуальнасць нацыі вызначаецца такімі характарыстыкамі, як нацыянальная культура, традыцыі, звычаі і г.д. Народная педагогіка ўяўляе сабой адзін з гістарычных механізмаў, які грунтуецца на асаблівасцях этнасу і дазваляе не толькі фіксаваць пэўныя асаблівасці чалавечай суполкі, але і рэтрансляваць іх у будучыню. Выкарыстанне скарбаў народнай педагогікі дазваляе пераасэнсаваць і аднавіць багацце гістарычнай спадчыны, лепшых традыцый продкаў (у прыватнасці, традыцый эстэтычнага выхавання), уключыць іх у кантэкст сусветнай культуры. Менавіта таму мы закранём адну з галоўных умоў, што аказала найбольшы ўплыў на эстэтычнае выхаванне ў беларускай народнай педагогіцы: прыроднае ўздзеянне.

Прырода развіваецца па сваіх законах, якія паступова адкрываюцца чалавеку ў працэсе іх пазнання, творчасці. Прырода як аб’ект эстэтычных адносін выклікае эстэтычныя перажыванні, найбольш зразумелыя і блізкія чалавеку. Аднак самі па сабе прыродныя з’явы ці рэчы не выступаюць прыгожымі ці непрыгожымі. Іх фізічныя характарыстыкі спрадвечна ўтрымліваюць магчымасць уплываць на асобу колерам, гукам, формай, але ўсіх натуральных уласцівасцей недастаткова дзеля таго, каб гаварыць аб іх эстэтычнай каштоўнасці. Неабходна, каб чалавек засвоіў іх матэрыяльна і духоўна. Мы згодны з меркаваннем філосафа А.А. Радугіна пра тое, што “толькі ўключэнне прыродных рэчаў і з’яў у грамадскую практыку здольна надаць ім уласна чалавечы змест, той асаблівы сэнс і пачуцці, якія і складаюць выснову эстэтычных адносін” [232, с. 138].

Сучасныя даследаванні этнографаў, археолагаў, гісторыкаў мастацтва сведчаць аб тым, што чалавек адкрывае для сябе пры-

Репозиторий ВГУ

родную прыгажосць паступова, праз пераўтвараючае ўздзеянне як на прадметы, так і з'явы прыроды. Праз гэта замацоўваецца ўладаранне асобы над рэчаіснасцю, выяўляюцца яе творчыя здольнасці. Чалавек змяняе свет і бачыць у ім самога сябе, сваю існасць, і праз гэта пачынае да ўсяго прыроднага наваколля прымяняць "чалавечую меру", выбірае з усіх прыродных з'яў тыя, форма, стан, колеры якіх найбольш адпавядаюць, гарманіруюць з яго настроем, духоўным станам, заўважае тое, што супадае як з яго жыццёвым вопытам, так і з уяўленнямі аб прыгажосці. Разуменне, асэнсаванне чалавекам эстэтычных праяў прыроды перарастае ў жаданне жыць па законах прыгажосці, ствараць яе сваімі рукамі, берагчы, а назіранні за ёй вучаць мэтанакіраванасці і гармоніі. Менавіта аб гэтым гаворыць у сваім філасофскім даследаванні Л. Курбанмамедаў: "Практычная, працоўная, мастацка-эстэтычная дзейнасць народа будуецца на падмурку прынцыпаў гармоніі, сіметрыі, рытму, прапорцыі, меры, мэтазгоднасці" [107, с. 13]. Працягвае і развівае яго думку Г.Н. Волкаў, калі даводзіць, што "прыродаадпаведны падыход у выхаванні забяспечвае гарманічны, комплексны падыход да фарміравання асобы, паколькі прырода аказвае камбінаванае ўздзеянне на пачуцці, свядомасць, паводзіны чалавека" [39, с. 129]. У рэчышчы вышэйсказанага мы можам адзначыць, што развіццё беларусаў як нацыі няспынна суправаджаецца эстэтычнай адзнакай шматгранных праяўленняў прыроды.

Чалавек любога ўзросту неўсвядомлена імкнецца да блізкасці з прыродай, адкрыцця ў ёй цудоўнага, паэтычнага, хаця прыгажосць прыроды – не толькі знешняя частка яе з'яў, а тое добрае, станоўчае, што яны нясуць, належыць ім. Успрыняцце, перажыванне прыгажосці прыроды знітавана з ідэаламі і нормамі грамадства, што адлюстроўваюць уяўленні людзей аб гармоніі з'яў. Таму ўсё, што дапамагае прыродзе, не перашкаджае яе развіццю, разглядаецца як дабро, карысць, і наадварот.

Беларусы жывуць у мясцовасці, адметнай ляснымі і воднымі багаццямі. Жыццё насельніцтва цесна звязана з гарманічнай прыродай, якая традыцыйна ўключаецца ў звычаі, вераванні беларусаў. Наогул, згодна з заўвагай беларускага філосафа Л.С. Лапцёнка, "этнакультурныя традыцыі фарміраваліся пад прамым уздзеяннем прыроднага цыкла, у асаблівасці бесперапыннага нараджэння-памірання (вясна – восень, што суадносіцца з сяўбой і збіраннем ураджаю) і непасрэдна прыроднага асяроддзя" [112, с. 55] Прырода аказвае ўплыў на быт і працу сялян, што падпарадкоўваюцца асаблівасцям свайго наваколля. А ўсё большае адчуванне чалавекам асабовай



Рэпазіторый ВДУ

адухоўленасці дапамагае яму глыбей разумець сусвет і прыроду. Беларус імкнецца суадносіць свой свет з гармоніяй наваколля. Для яго важна не проста жыццё, а жыццё, прасякнутае, напоўненае прыгажосцю ва ўсіх яго праявах. Таму фарміраванне асноўных асаблівасцей чалавечай псіхікі адбывалася пад уплывам, у цесным узаемадзеянні з натуральным асяроддзем. Такое разуменне станаўлення ўзаемаадносін чалавека і прыроды было ўласціва для навукоўцаў розных краін і часоў. Напрыклад, нямецкі вучоны, падарожнік А. Гумбальдт звяртаў увагу на таямнічую сувязь ландшафту не толькі з матэрыяльным, але і з духоўным жыццём чалавека. Цесную сувязь паміж багаццем інтэлектуальнага і пачуццёвага жыцця і унікальнасцю багацця акаляючага свету адзначае наш сучаснік В.Ф. Мартынаў. Ён разглядае прыродную гармонію неад'емнай часткай духоўнага жыцця чалавека [122, с. 59]. З другога боку, У.М. Конан вядзе размову аб сакралізацыі жыццядзейных сіл прыроды ў міфалогіі і ранніх формах рэлігіі [93, с 61]. Сапраўды, звычаі, абрады, працоўная дзейнасць беларусаў – усё прыстасавана да прыродна-кліматычных умоў, а гэта накладвае адбітак і на характар жыхароў. Шматлікія прыклады фальклору, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва адлюстроўваюць своеасаблівую злучанасць насельніцтва з прыродай, яго залежнасць ад прыродна-сезонных цыклаў, уплыў яе на эмоцыі, фантазіі, дзейнасць людзей.

Адзін з першых даследчыкаў беларускага фальклору І. Храпавіцкі падкрэслівае істотную рысу народнай эстэтыкі – "адзінства чалавека з прыродай" [19]. Жыццё чалавека неадрыўна ад прыроды, якая з'яўляецца яго домам і асяроддзем існавання. Беларус не толькі не проціпастаўляе сябе прыродзе, але нават не выдзяляе сябе з яе, бо поўнасцю залежыць ад яе. Гэтыя погляды замацаваны ў фальклорных тэкстах, вывучэнне якіх дазволіла В.А. Маславай сфармуляваць вывад: "Ён (чалавек) адносіўся да прыроды па ўзоры больш слабага да больш моцнага, інакш кажучы, абагаўляў Сонца, Ваду, Град, Маланку, Дождж" [123, с. 38]. І таму надаваў эстэтычную афарбоўку амаль усім яе з'явам. Ад бацькоў дзецям перадаваліся вобразныя назіранні, параўнанні, якія напоўнены практычным і выхаваўчым сэнсам, эстэтычным пачуццём.

З асаблівасцей прыроднага асяроддзя з'яўляюцца ўяўленні прашчураў пра знешні воблік і характар багоў і дэманічных істот. Рэальнасць і міф пераплецены ў неверагодны свет, падпарадкаваны законам прыгажосці і маралі. У залежнасці ад эстэтычнага успрыняцця прасторы розніцца вонкавы выгляд яе апекуна. Міфічныя во-



Рэпазіторый ВДУ

бразы народ стварае паводле сваіх чалавечых якасцей, адлюстроўвае добрае і благое з дапамогай самых яркіх фарбаў.

Знешні воблік, характар незвычайных істот, створаных фантазіяй прашчураў, былі падказаны менавіта асаблівасцямі прыроднага асяроддзя. Даследчык беларускай міфалогіі У.А. Васілевіч звяртае ўвагу на шырокую распаўсюджанасць звышнатуральных гаспадароў прасторы. Ён дапамагае ўбачыць сувязь іх вобліку з мясцовасцю існавання, вызначыць эстэтычны сэнс выявы. Аўтар піша: “Багамі і дэманічнымі істотамі ў беларусаў некалі была напоўнена ўся навакольная прырода – ад зямельных нетраў да недасягальнага Космасу” [12, с. 4]. Рэальнае жыццё і міфалагічныя ўяўленні дзіўна перапляталіся, зрабіўшы неверагодны, таямнічы свет, што падпарадкуецца законам прыгажосці і маралі. У залежнасці ад эстэтычнага ўспрыняцця прасторы можна знайсці розныя вонкавыя выявы іх апекуноў. Міфічныя вобразы народ ствараў паводле сваіх чалавечых якасцей, з адлюстраваннем добрага і благога з дапамогай самых яркіх фарбаў. Напрыклад, Вадзяніцы *“паўстаюць у выглядзе маладых дзяўчат з доўгімі распушчанымі валасамі, адзетыя як да шлюбу: празрыстыя белыя сукенкі да зямлі, на галавах вяночкі з белых кветак і лёгкі белы вэлюм. Час ад часу вадзяніцы выходзяць з вады, спяваюць, водзяць па беразе карагоды. Рухі іх павольныя і плаўныя, песні сумныя і працяглыя*” [12, с. 78]. А вось Балотнік “*страшэнны таўстун, зусім без вачэй, увесь у тоўстым слоі гразі, да якой наліплі ў беспарадку водарасці, мохавыя валокны, смаўжы, жукі і іншыя вадзяныя насякомыя*” [Там жа, с. 98], Хапун – “*невялічанькі, скурчаны дзядок з доўгай сівой барадою і з вельмі вялікаю торбаю – большай, чым ён сам. Хапун лётае па ветры, прыглядаючыся, дзе якое дзіця не слухаецца старэйшых, капрызіць*” [Там жа, с. 102].

Беларус жадае зрабіць свой свет больш асэнсаваным, добрым, гарманічным, знайсці адухоўленасць у з’явах. Таму адбываецца персаніфікацыя асяроддзя і прыродных праяў. Чалавек узаемадзейнічае са звышнатуральнымі істотамі, якія амаль бесперапынна бяруць удзел у яго справах, дапамагаюць, перашкаджаюць, караюць. Адзін з галоўных вобразаў – Пярун. Ён, “*паводле ўяўленняў беларусаў, велічны, статны, высокага росту з чорнымі валасамі і доўгай залатой барадою. Седзячы на вогненнай калясніцы, ён раз’язджае па небе, узброены лукам і стрэламі. Яго грымотны лук – каменны молат, часам вясёлка. Яго стрэлы – маланкі ... Грамаўніца – жонка Перуна. Як багіню лета, беларус уяўляе яе прыгожай і поўнай жанчынай з галавой, прыбранай спелымі каласамі, і з пладамі ў руках*” [Там жа, с. 105]. Такім чы-



Репозиторий ВГУ

нам, спалучэнне прыгожага і агіднага, жахлівага, смешнага, трагічнага, рамантычнага ў вобразах садзейнічае развіццю разнастайных эстэтычных пачуццяў у слухачоў.

З часоў язычніцтва ў народзе пакланяюцца прыродным з'явам. Гэта мае не толькі рытуальны сэнс – уміласцівіць багоў, дамагчыся спагады, але і адыгрывае менавіта эстэтычную ролю – усвядоміць велічнасць, моц, прыгажосць прыроды, што з цягам часу адбіваецца ў народных казках, песнях, паданнях. Цікавы вобраз Палевіка, якога ў народзе ўяўлялі "*маладым, статным, блакітнавокім хлопцам, абавязкова русавалосым, што, відаць, асацыіравалася з золатам спелай нівы. Ён – яе гаспадар. Махне правай рукой – расце і таўсцее сцябло. Махне левай – наліваецца колас. Страсяне галавой – уся ніва ўсцілаецца залатымі снапамі*" [12, с. 47]. Пакланенне прыродзе і яе ўвасабленне замацавана ў культах, абрадах, вераваннях, якія маюць больш ад мастацтва, чым ад рэлігіі. Менавіта беларускія богі з'яўляюцца паэтычнымі вобразамі, цудадзейнымі эстэтыка-выхаваўчымі сімваламі. Багіня прыгажосці Лада і яе муж бог Лад сімвалізуюць любоў, каханне, прыгажосць, весялосць, шлюб, урадлівасць і асалоду [77]. Наогул, у міфалагічных уяўленнях пра прыгожае галоўнай з'яўляецца ідэя гармоніі, ладу, шлюбнай згоды. Багіні Жыва і Мора выглядаюць рознымі лікамі адной маці-прыроды, нясуць адбітак галоўных прыродных з'яў: нараджэння, росквіту, пладанашэння, памірання. Гэтыя выявы багінь знітоўваюць паняцці жыцця і смерці, дабра і зла. Яшчэ адзін прыклад таму – яднанне ў адным боскім абліччы двух воблікаў, як гэта мае месца з Ярылам. Ён паўстае то прыгожым малайцом, моцным, прывабным, то непрыемным старым, які едзе на казле. Але і ў гэтым няма ніякай супярэчнасці, бо прырода адзіная ў сваёй шматвобразнасці [77]. Гэта яднанне ў жыцці эстэтычных катэгорый прыгожага і агіднага, узвышанага і нізменнага.

Даследчыца В.А. Маслава робіць вывад, што "з міфаў выраслі казкі з іх фантастыкай" [123, с. 10]. В.М. Сакольчык звяртае ўвагу на тое, што шмат народных казак па сваім паходжанні з'яўляюцца пераказам, паэтычным перакладам старажытных абрадаў [190; 191]. Напрыклад, аўтар прапануе параўнаць казку пра царэўну-жабку са старажытнаславянскім абрадам русальскага тыдня, а казку пра сястрыцу Алёнушку і брацiка Іванушку з купальскім рытуалам. Даследчыца этнічных традыцый у духоўнай культуры беларусаў І.В. Казакова адзначае, што, суадносна з эстэтыка-міфалагічным светапоглядам беларусаў, ваду "пасля купання дзіцяці вылівалі пад тое дрэўца, якое саджалі бацькі нованароджанага ў гонар з'яўлення на свет.



Репозиторий ВГУ

Пасля купання хлопчыка – пад дрэва, якое ў традыцыйнай народнай эстэтыцы лічылася сімвалам прыгажосці, доўгажыхарства (дуб, ясень), а дзяўчынкі – пад яблыньку, вішню (каб падобна на дрэўца, была прыгожай, мела шмат дзетак). Можа, ад гэтага пайшло ўяўленне "жывой вады", у процілегласць "мёртвай", якая забірае моц. Ваду пасля абмывання нябожчыка "вылівалі там, дзе ніхто не ходзіць і не свеціць сонца, каб яна не нарабіла шкоды" [79, с. 72]. Да таго ж вада ў беларусаў мела магічную моц забыцця, яна магла палегчыць страты, супакоіць, ажывіць, з яе пачыналася і ёю заканчвалася жыццё. Дададзім, што ў паэзіі народа, замовах, прыкметах функцыю гаючай вады можа выконваць сляза або раса. Адсюль нярэдкія звароты да плачаў, да боскіх слёз, што гістарычна ўвязваецца са старажытнай магіяй і глыбокай павагай да вады. А. Багдановіч адзначае: "По сей день у белорусов почитаются озёра, кладези и источники… Ключевая вода, или, как её часто называют, "живая" почитается высоким целебным и очищающим средством" [19, с. 20].

Па народных уяўленнях вада, зямля, паветра і агонь – асноўныя касмічныя стыхіі. Вада звязваецца з пачаткам стварэння Сусвету, дзе яна сімвалізуе Хаос. Згодна з этыялагічнымі паданнямі, зямля была створана з пяску, узятага на дне першапачатковых водаў. Вада ў беларусаў, як і ў іншых індаеўрапейскай і славяна-балцкай міфалогіях, падзяляецца на зямную і нябесную. "*У зямных водах хаваюцца Змей ці пазнейшы Чорт. Дождж як нябесная вада пасылаецца Грымотнікам (Перуном, якога пазней замяніў святы Ілля*" [13, с. 57]. У свядомасці беларусаў вада – той ачышчальны сродак, без якога немагчымы пераход чалавека з аднаго свету на другі, немагчыма быць прынятым у кола грамады (рытуал хрышчэння немаўляці). Ачышчальна-пераходную ролю адыгрывае вада ў вясельнай абраднасці. Перад адпраўкай ў храм бацька з вядром вады павінен быў абысці вясельны поезд, з вядром вады сустракалі маладых у вёсцы, а дома маладых вялі да калодзежа, дзе з аднаго вядра аблівалі ногі.

У шматлікіх народных абрадах вада выступае як сінонім здароўя: "*Той, хто першы на Каляды прынясе вады, то будзе здаравейшы за ўсіх цэлы год. Вада, прынесеная на Каляды з укінутай у яе срэбранай манетай мела незвычайныя ачышчальныя і гаючыя ўласцівасці, асабліва для чысціні твару*" [Там жа, 58], для прыгажосці. Аднак трэба было "*пільнавацца, каб пры ўмыванні на дол не ўпала ні кроплі, іначай увесь год будуць весціся блохі*" [Там жа, с. 58].



Репозиторий ВГУ

Трэба дадаць, што ў вадзе, па ўяўленнях беларуса, жыло шмат звышнатуральных істот, якія іх апекавалі (Мокаш даглядала калодзежы і наогул мокрыя месцы, а жаночая пара Вялеса мела прамое дачыненне да рэк і крыніц). У зямных водах жылі і такія казачна-міфалагічныя персанажы, як вадзянік, русалкі.

У казках беларус адлюстраваў сваё жыццё, мары аб справядлівым і прыгожым, бо яна, па словах В.А. Сухамлінскага, – "непадзельная ад прыгажосці", у ёй чалавек раскрывае сваё разуменне эстэтычнага [198]. Жаданні бачыць дасканаласць у жыцці агучваліся ў вусных творах. Аб тым жа разважае беларускі фальклорыст М.А. Янкоўскі [242], які лічыць, што народ-мастак стварае вобразы ў адпаведнасці як са сваёй эстэтыкай, так і сваімі мастацкімі ацэнкамі і ўяўленнямі. Імкненне да найвышэйшай прыгажосці адбілася ў шэрагу цудоўных казак. Беларус верыў, што на зямлі існуе сапраўдная гармонія, жадаў бачыць дасканаласць у жыцці, і яго вера і мары пераходзілі ў вусныя творы вобразамі яблынькі з залатымі яблыкамі, залатога птаха.

Прырода, навакольнае асяроддзе – крыніца казак, якім належыць вялікая роля ў фармаіраванні эстэтычных пачуццяў людзей. У мінулым гэты жанр быў натуральнай неабходнасцю, арганічнай, а таму неўсвядомленай, часткай народнага быту. Як творы мастацтва, казкі задавальнялі эстэтычныя запатрабаванні народа і ў той жа час былі важным сродкам пазнання сусвету і абагульнення працоўнага вопыту пакаленняў, сродкам выхавання.

Найбольш старажытнымі лічацца тыя казкі, у якіх паўстае міфалагічнае светаўспрыманне народа. Гэта чарадзейныя казкі, дзе ўдзельнічаюць і ачалавечваюцца прыродныя стыхіі, дзе квітнеюць вядзьмарства і цуд. Абагаўленне прыроды, яе велічнасці, гаворыць аб вялікай эстэтычнай значнасці, якой надзяляліся сонца, зямля, вада. Лічыцца і ўнушаецца, што, валодаючы незвычайнымі, звышнатуральнымі якасцямі, яны могуць абараняць чалавека ад захворванняў, няшчасцяў, уплываць на яго далейшы лёс. У казцы "Андрэй – усіх мудрэй" [208, с. 336] ствараецца вобраз старэнькай сонцавай маці, якой кланяецца Андрэй. Падобныя ўяўленні сустракаем і ў творы "Бацькаў дар" [Там жа, с. 187]. У ім найбольш відавочная сувязь казачных вобразаў і матываў з народным абрадам Радаўніцы, з уяўленнямі аб замагільным жыцці продкаў, якія пасля смерці нібы застаюцца абаронцамі жывых і нават распараджаюцца іх лёсам.

Старажытны беларус добра разумее і эмацыянальна перажывае прыгожае ў прыродзе. Яе эстэтычнае ўспрыняцце адбіваецца на мове казак, надае ім асаблівую прыгажосць і паэтычнасць, а слухача прывучае да назіральнасці: *"Яснае сонейка*

Репозиторий ВГУ

*свеціць і грэе, ветрык ціха калыша зялёнае вецце на вербах. Рака блішчыць праз рэдкія кусты арэшніку, бы люстэрка, а ў затоне адлюстроўваюцца старыя дубы, курная хатка ля перавозу, стог леташняга сена, агароджаны плотам"* [Там жа, с. 98].

Сярод унікальнага матэрыялу, амаль спецыяльна прызначанага для развіцця эстэтычных і мастацкіх пачуццяў (на гэта ўказваюць Н. Гілевіч [44; 45; 46], К.П. Кабашнікаў [72; 73; 74], У.М. Конан [92; 93; 94]) значнае месца належыць казкам пра жывёл. Яны бяруць свой пачатак з сацыяльнага і духоўна-практычнага вопыту чалавека-селяніна, чыя фантазія ідзе са звычайнага жыцця. Дзейныя асобы – заяц, ліса, воўк, сабака, кот, мядзведзь, певень – думаюць, адчуваюць, паводзяць сябе па-чалавечы, навакольнае асяроддзе ацэньваюць як звычайныя людзі з такімі рознымі рысамі характару, як сквапнасць, хітрасць, баязлівасць, дурасць, лянота. Іх справы, адносіны пераконваюць у неабходнасці прыгожых учынкаў, думак, падводзяць да разумення эстэтычнага ідэала. Мы падтрымліваем пазіцыю М.А. Янкоўскага ў тым, што гэтая група казак нібы спецыяльна прызначаецца для выхавання, мае мэтай не толькі абвастрыць розум, але і сфарміраваць густы, як эстэтычныя, мастацкія, так і сацыяльна-этычныя.

Эстэтычную функцыю выконваюць у казках розныя жывёлы. Надзеленыя чалавечымі рысамі, характарамі, яны прыцягваюць увагу, робяцца своеасаблівай прызмай поглядаў на жыццё. Наогул, эстэтычныя адносіны чалавека да жывёл, эстэтычная адзнака шмат у чым вызначаецца іх значнасцю ў жыцці асобы і грамадства [192]. Баязлівы заяц і хітрая лісіца, дурны воўк і знаходлівы кот, працавіты конь і клапатлівая курка – вобразы, што ўзніклі на аснове яднання практычнай і натуральнай, прыроднай функцыі жывёл, хвалявалі і хвалююць слухачоў казак, садзейнічаюць эстэтыцы ўспрымання і адносін. Гэта сведчыць аб тым, што беларускія народныя казкі высвечваюць глыбіню эстэтычных уяўленняў народа, яго нязменнае імкненне да хараства, да яднання з прыродай. Стваральнікі казак з глыбокай павагай ставяцца да прыроды, вучацца ў яе і назіраюць за ёй.

Назіранні за навакольным асяроддзем, за надвор'ем прыводзяць да ўзнікнення прыкмет, прасякнутых пачуццём эстэтычнага: *"Ранішняя раса – і добрая сляза: ёй лес умываецца, з ночкай развітаецца", "Мужыку лета – што святому рай", "Дзе летам кветак карагод, там і пчолы, там і мёд"* [58]. У прыгажосці прыкмет адчуваецца подых замілавання прыродай, разуменне таго, што чалавек – яе дзіця, а яна – матухна, якая навучае, дае слушныя парады, якія трэба толькі пабачыць, пачуць, зразумець: *"Не сей пшаніцу раней дубовага ліста, таму што ў маі браты-*

*халады жывуць"* [58, с. 22]. Менавіта прыгажосць, па народным уяўленні, стварае асаблівую магію дабра, што спрыяе жыццю.

Магіяй прасякнуты і старажытныя замовы. Прыгажосць слова, рытмічнасць, вобразнасць паспрыялі іх шырокаму распаўсюджванню на тэрыторыі Беларусі. Шырокае бытаванне мелі лячэбныя замовы, якімі валодалі імі не толькі знахары, але і простыя людзі. Паказальна, згодна У. Лобачу, што "ў другой палове XX ст. у беларускай вёсцы ўсе асноўныя віды замоў працягвалі бытаваць, не страціўшы свайго функцыянальнага прызначэння" [13, с. 180]. Цікава, што лекавыя асаблівасці павінны праяўляцца ў найбольш рамантычныя гадзіны сутак – на ранішняй і вячэрняй зары. Зара своеасаблівы рэгулятар жыцця, жыццёвых рытмаў, сігнал да пачатку або сканчэння дзейнасці. Звычайная справа для беларуса – уставаць на світанні і глядзець на ўсход, каб даведацца, які чакае яго дзень. Такім чынам, кожная раніца пачыналася з вітання з зарой, і кожны дзень чалавек з ёй развітваўся. "Зара-заранiца, ясна-царыца", "Зара-заранiца, Божжа памачніца", "Зара-заранiца, красная дзявіца" – з дапамогай эпітэтаў ствараецца вобраз памочніцы Бога, што здатная прыслухоўвацца да просьбаў людзей.

Частотным элементам замоў з'яўляецца вобраз ракі. Рака выступае ў якасці "стрыжня сусвету, што пранізвае верхні, сярэдні і ніжні свет" [13, с. 423]. Менавіта такое разуменне, стаўленне да блакітнай прыроднай стужкі дазваляе выкарыстоўваць вобраз ракі ў замове ад кровацячэння.

*"Плыло тры рэчкі: адна вадзяная, другая малочная, а трэцяя крывавая. Вадзяная – працячы! Малочная – працячы! А кроў гаручая, супыніся і запячыся. Другім разам, гасподнім часам. Плыла рака морам, а ў той рацэ тры жылы: адна вадзяная, другая малочная, а трэцяя крывавая. Вадзяная – працячы! Малочная – працячы! А крывавая, суніміся і запячыся! Трэцім разам, гасподнім часам. Плыло тры рэчкі: рэчкі: адна вадзяная, другая малочная, а трэцяя крывавая. Вадзяная – працячы! Малочная – працячы! А кроў гаручая, сунімайся, запякайся!"* [19, с. 75].

У замовах пашыраны зачын, які пабудаваны на падваенні слоў: *"Устану я рана-раненька, умыюся бела-бяленька, узыду на крутую гару, зірну пад ясную зару – там стаіць дзядзька-лябедзька, стары, барадаты…"* [Там жа]. Так паступова развіваецца эстэтычнае ўспрыняцце мовы і адначасова эстэтычны густ.

Замовы пабудаваны на ўсхваленні прыгожага, на паэтычных закліках да прыроды, да яе праяў з мэтай схіліць на свой бок, папрасіць дапамогі. Даследчыкі сыходзяцца ў тым, што замовы – помнікі эстэтычна-эмацыянальнай мастацкай мовы беларуса,



Рэпазіторый ВДУ

абавязаныя нараджэннем як веры ў неабходнасць з дапамогай слова, магічнага дзеяння ператварыць жаданне ў рэальнасць, так і глыбокім пачуццём павагі і ўвасаблення прыроды.

Замовы нагадваюць па сваім эмацыянальна-эстэтычным настроі вершы ў прозе (звароты “вадзіца-царыца, усяму святому памочніца”, “зара-зараніца”, “цар-дваравя, царыца-дваравіца” [19]). Моцным эстэтыка-паэтычным пачуццём прасякнута замова пра выган скаціны ў поле: *“Красна сонца і ясен свет, і з лунамі яснымі, і звёздамі частымі, і з зорамі вогненнымі, і ранішняй расой і з вячэрняй і сушу і мора асычаеш і маць сыру зямлю ўграваеш!..”* [19, с. 69]. Толькі чалавек з чулай душой, развітым эстэтычным густам здольны скласці такія пранікнёныя радкі.

Селянін здзіўляецца прыгажосці і шчодрасці прыроды і трапна заўважае прыкметы, да якіх можна далучыць прыказкі і прымаўкі, што датычацца асобных сезонаў, дзён, з’яў. Прыкмета на 17 чэрвеня: *“Калі ў гэты дзень вецер дзьме з мокрага месца (балота, возера) – чакай непагоды. Вецер – ён усё скажа, не пытайся, не падганяй. Ён пакуль даляцеў, сем рэк выпіў, сем чорных груганоў абагнаў, быццам сем лісточкаў, дрэвам згубленых”* [58, с. 112–113]. Менавіта ў такіх радках знітоўваюцца прыкметы, прымаўкі і народная каляндарна-абрадавая паэзія. Гэта той прыклад, які раскрывае як погляды чалавека на прыроду, так і яе ўплыў на людзей.

Шматлікія даследчыкі беларускага фальклору, літаратуразнаўцы сышліся на тым, што старажытная каляндарна-абрадавая песня сведчыць аб моцнай духоўнай сувязі працаўніка са светам прыроды, аб ушанаванні яе жывых і нежывых прадметаў і з’яў, пакланенні ім. У песні прасочваюцца змены ў працы селяніна адпаведна сезонам года, адпаведна аснова яе – аграрная.

Песні спрыяюць фарміраванню эстэтычнага погляду на жыццё, унушаюць думку аб прыгажосці, эстэтычнасці і гармоніі навакольнага асяроддзя. За доўгі час існавання гэта было дасягнута сістэмай прыёмаў і сродкаў паэтычнага адлюстравання рэчаіснасці, праз сэнсава-вобразную злучанасць з прыродным наваколлем. Прыродныя краявіды адлюстроўваюць традыцыйную мадэль свету. Так, Т. Валодзіна ўказвае, што праз вобраз поля перадаецца ідэя свайго, блізкага.

Песенная творчасць прасякнута вобразамі: міфалагічнымі, народжанымі фантазіяй, і рэальнымі, якія створаны па законах рэалістычнага мастацтва. Каляда, Купалка, Сонца, Зіма, Восень суседнічаюць з вобразамі малой (маладой) дзяўчыны, брата і сястры, матулі, бацькі. Песні напоўнены сімваламі: жаночымі – каліна, бяроза, ліпа, і мужчынскімі – дуб, дубок, клён, ясень –



Репозиторий ВГУ

хлопцу. Бяроза "ў пераважнай колькасці фальклорных твораў сімвалізуе жаночую палову чалавецтва: дзяўчыну на выданні, нявесту, маці, свякроўку" [228, с. 7]. Мы сустракаемся з паэтычнымі ўвасабленнямі: ходзяць хмары, выплыў месяц. У песнях шмат памяншальна-ласкальных форм слоў: зімачка, зямліца, татачка, што надаюць творам пяшчоту і мяккасць, вызначаюць асаблівыя адносіны выканаўцаў да падзеі. Гіпербала дапамагае перадаць у паэтычнай форме працавітасць чалавека, яго шчаслівы лёс ці нядолю, надае творам добры гумар.

Вобразнасць вусных твораў ідзе ад прыроднай рэчаіснасці. Самае прыгожае, дарагое сэрцу селяніна адлюстроўваецца ў песнях. Г.Н. Волкаў указвае: "Песні садзейнічаюць эстэтычнаму, маральнаму выхаванню і непасрэдна (дзеяннем, справай, прадстаўленнем магчымасці практыкавацца), і апасродкавана (праз задачы і значэнне той ці іншай галіны выхавання ў агульным працэсе развіцця і фарміравання асобы" [39, с. 105]. Пра што б ні спяваў беларус, на яго думку, настрой нязменна ўплывае прыгожае ў прыродзе – выток эстэтычнай асалоды чалавека. З яе вынікаюць паэтычныя параўнанні, метафары, абуджаецца жыватворная эстэтычная сіла – гэта ўзор для творчых праяў чалавека. Прырода натхняе народных майстроў, якія аздабляюць свае вырабы, прылады працы геаметрычнымі матывамі з зашыфраванымі старажытнымі ўяўленнямі пра наваколле, сусвет. Напрыклад, прасніцы часцей за ўсё аздабляюцца разьбой, якая выконваецца ў выглядзе разнастайных прамавугольнікаў, запоўненых зубчыкамі, што абазначаюць засеянае поле, а круг-разетка з прамянямі сімвалізуе сонца. Шэраг маленькіх разетак вобразна адбіваюць яго сутачны рух па небасхіле [180].

Пад уплывам прыроднага наваколля ў беларускім дойлідстве склаўся своеасаблівы эстэтыка-прагматычны падыход. Так, выбар месца для жылля асацыятыўна звязваецца з вобразамі дабрабыту і шчасця, таму перавага аддаецца раней абжытым мясцінам ці тым, дзе любіць адпачываць рагатая жывёла, жывыя істоты – сімвалы хатняга дабрабыту. Інакш кажучы, пошукі месца для хаты прасякнуты адбіткамі старажытных анімістычных светаўяўленняў, традыцыйнага ладу мыслення. У гэтых традыцыях увасобіліся адносіны чалавека да сваёй зямлі, да малой радзімы, якая наканавана лёсам, і да сябе як неад'емнай часткі прыроды, з якой трэба жыць поруч у згодзе і гармоніі.

Цікавым з пункту погляду адносін да эстэтычных поглядаў падаецца і выбар, нарыхтоўка будаўнічага матэрыялу. Дрэвы для хаты выбіраюцца з ліку тых, з якіх ніколі не дабывалі смалужывіцу. Лес трэба секчы на зыходзе зімы – у пачатку вясны, што



Рэпазіторый ВДУ

сімвалічна звязваецца з абуджэннем жыцця. Выразнае патрабаванне не выкарыстоўваць у будаўніцтве сухастой ці зваленыя бурай дрэвы. Такім чынам, смерць і хвароба, зло вобразна сімвалізуюцца з непрыгожым, проціпастаўляюцца жывому і гарманічнаму [12; 13; 225].

Прырода і яе з’явы паспрыялі ўзнікненню пачуцця прыгожага, высокай унутранай культуры і эстэтычнага густу беларуса. З уласцівага продкам пачуцця адзінства з прыродай узнікае найвышэйшая прыгажосць чалавечай душы, што замацавана ў традыцыйнай культуры народа, якая, у сваю чаргу, дапамагла сфарміраваць своеасаблівую нацыю з высокаразвітай матэрыяльнай і духоўнай культурай.

Такім чынам, уплыў народнай педагагічнай спадчыны на выхаванне асобы нельга перабольшыць. Народная педагогіка спрыяе фармаіраванню і захаванню самабытнасці чалавека на падмурку нацыянальных каштоўнасцей і спрадвечных поглядаў. У галіну эстэтычнага выхавання яна прыносіць шматграннасць, эмацыянальнасць, каштоўнасны падыход да з’яў жыцця, скіраванасць асобы на творчасць.

### *Выхаванне ў працы як умова эстэтычнага выхавання*

Важнай умовай рэалізацыі эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы з’яўляецца ***выхаванне ў працы.*** Праца дала штуршок да развіцця чалавечай свядомасці і ўсіх чалавечых пачуццяў, у тым ліку і пачуцця прыгожага. Праца дае чалавеку найбольшую магчымасць дакрануцца да грамадскага быцця, адчуць разнастайныя станоўчыя чалавечыя эмоцыі: ад гонару за добра выкананую справу да пачуцця асалоды ад вынікаў намаганняў. Каштоўнасці, на якіх будуецца мастацтва, былі створаны народнай працоўнай дзейнасцю.

Працоўная дзейнасць ставілася народнай педагогікай вышэй за іншыя сферы дзейнасці, таму да яе фарміраваліся ўзвышаныя адносіны. Шмат прыказак сведчыць аб тым, што здольнасць да працы лічылася галоўнай нормай ацэнкі чалавека: *“Па рабоце майстра знаць”, “Гультай ды злодзей – два родныя браты”, “Майстар – залатыя рукі”.*

У паняцце “прыгажосць працы” ўваходзіць разуменне прыгажосці таго, хто працуе, прыгажосці працоўнага працэсу, прыгажосці прадукта працы. Прапанаваны сучаснымі філосафамі падыход адпавядае традыцыйным народным поглядам на прыгожае. Падмуркам народнага выхавання з’яўляецца сапраўдная, выніковая праца, якая звязвае ўсе сродкі выхавання ў адзінае цэлае. Яна як своеасаблівая гісторыя народа знаходзіць увасабленне



Репозиторий ВГУ

ў святах, абрадах, казках. Можна меркаваць, што ў беларускай народнай педагогіцы выхаванне ў працы ёсць адна з галоўных умоў здзяйснення эстэтычнага выхавання, бо жыццё беларуса – гэта падпарадкаванне навакольнага свету з мэтай задавальнення сваіх патрэб. Працоўныя намаганні маюць за мэту пэўны вынік, які валодае утылітарна-практычнай і духоўнай значнасцю. Гэта рэч і эстэтычнае перажыванне, якое грунтуецца на эмацыянальнай адзнацы якасці прадукта і майстэрства творцы. Праца родная мастацтву, якое можна вызначыць "як найвышэйшы і спецыфічны від майстэрства, што разлічаны на выклік і задавальненне эстэтычных эмоцый, узнікае менавіта ў працэсе працоўнай дзейнасці" [163, с. 191]. На працягу гісторыі беларусы выхоўваюць жаданне і ўменне дасягнуць дасканаласці ў рэчах, працоўных працэсах.

Авалоданне сіламі прыроды дапамагло народу развіць фізічныя і духоўныя здольнасці. Гэта адбілася ва ўменні сувымяраць вынікі сваіх намаганняў з заканамернасцямі, што ўласцівы прыродзе. Беларусы стваралі неабходныя рэчы такімі, каб яны ў найбольшай ступені адпавядалі свайму прызначэнню: як формай, так і якасцю, і мэтазгоднасцю і г.д. Людзі заўважылі, што чым прыгажэйшая рэч, тым больш яна зручная і функцыянальная. Прылада правільнай формы, выдатна апрацаваная, больш спрыяе дзейнасці, дазваляе адчуваць не толькі фізічныя рухі, але і заўважаць сам працэс змянення працоўнага матэрыялу, атрымліваць з гэтай нагоды пэўныя эстэтычныя перажыванні. Гэта адкрыццё стала высновай фарміравання і ўдасканальвання здольнасці чалавека да эстэтычнай адзнакі прадметаў і з'яў, а таксама выпрацоўцы ўмення тварыць па законах прыгажосці. Менавіта выхаванне ў працы дазваляе беларусу асэнсоўваць самастойную і своеасаблівую каштоўнасць рытму, прапарцыянальнасці, суразмернасці, сіметрычнасці прадуктаў і вытворчых дзеянняў, падводзіць да яго разумення маладое пакаленне. Эстэтычнае адчуванне формы ідзе з радаснага самаадчування, якое выклікае арганізаванасць працоўнага працэсу, што аблягчае працу, узнімае яе якасць і вытворчасць. Узнікненне падобнага пачуцця выклікае знешні выгляд рэчы, якая вырабляецца, ствараецца чалавекам.

Рукатворныя рэчы валодаюць пэўнай эстэтычнай вартасцю, набыццю якой садзейнічае маральна-пачуццёвае задавальненне, якое, у сваю чаргу, можа спрыяць развіццю матэрыяльных працэсаў. Можна вызначыць такі шлях: цікавасць, заахвочванне, задавальненне працэсам і прадуктам працы, жаданне зрабіць яшчэ лепш, больш прыгожа. Выраб рэчаў становіцца свабоднай, асэнсаванай працай, якая прыносіць эстэтычнае задавальненне і радасць. Усе рэчы, што акружаюць селяніна ў яго жыцці



Рэпазіторый ВДУ

(будынкі, начынне хаты, посуд, адзенне, прылады працы і г.д.), не толькі утылітарныя, але і эстэтычныя, каб не проста аблегчыць паўсядзённую працу, а зрабіць яе і само жыццё больш прыгожымі. Ствараюць іх ці самі сяляне, ці майстры-рамеснікі, што выкарыстоўвюць сродкі прыроды, надаюць ім неабходную функцыянальнасць і мэтанакіраванасць. Майстар укладвае ў свой выраб усё ўменне: ён сам задумвае рэч і сам выконвае задуманае. Прыгажосць і карысць сплятаюцца ў адзінае. Такім чынам, кожны, хто жадае быць майстрам, павінен валодаць рамяствам ва ўсёй яго паўнаце. Адсюль вытокі цікавасці да работы і прыгожаму яе выкананню, інакш кажучы – творчасці.

Адпаведна фармулюецца запаведзь народнай педагогікі – трэба любіць працу і людзей працы. Народ разумее, што чалавек не нараджаецца працавітым, а выхоўваецца, і гэта якасць пераклікаецца з эстэтычным светаўспрыманнем. З маленства дзіця прывучаецца працаваць прыгожа. Каб забяспечыць гэта, "заахвоціць" немаўлятка стаць у будучым майстрам сваёй справы, выконваюцца пэўныя традыцыйныя дзеянні. Напрыклад, пупавіну нованароджанага дзіцяці абразаюць на тым прадмеце, які, магчыма, можа быць прыладай працы яго як дарослага чалавека. Для хлопчыка могуць узяць дубовую плашку (каб быў моцным), сякеру (каб добра з ёй працаваў), кнігу (каб умеў чытаць і пісаць). Для дзяўчынкі выбіраюць прадметы "жаночых работ", каб выконвала іх з задавальненнем. Продкі "лічылі, што маці пры дапамозе адрэзанага невялічкага кавалачка паследу магла "запраграмаваць" будучыя схільнасці свайго дзіцяці: калі яна кіне гэты кавалачак у канюшні, хлопец будзе ладзіць з канём, калі ж павесіць на саху ці плуг, хлопец вырасце дбайным і гаспадарлівым; калі рэшткі кінуць каля царквы, дзіця будзе "любіць Бога", а то і манахам стане" [99, с. 239–240]. Падобны паводле сэнсу абрад выконваецца і пры хрышчэнні дзіцяці. Лічыцца, што калі кумы пераступяць праз пакладзеныя ля парога кнігу, сякеру і іншыя рэчы, то дзіця, калі вырасце, будзе добра імі валодаць, а толькі ў самаадданай і прыгожай працы чалавек можа дасягнуць дабрабыту і шчасця. З гэтай нагоды, калі ў сям'і нараджаецца дзяўчына, то набываюць куфар, які паступова запаўняецца яе ўласнымі вырабамі. Часта на вяселлі па гэтай частцы пасагу мяркуюць аб нявесце: якая яна майстрыца; адначасова ідзе працоўнае выпрабаванне – сочаць, як маладая гатуе ежу, прыбірае ў хаце, прыносіць ваду, мые бялізну… Хлопчыка таксама рыхтуюць да значнай падзеі ў яго жыцці. Ён ведае, што загадкі праверацць яго кемлівасць, а пэўныя заданні – навыкі гаспадара, уменне працаваць хутка, якасна, прыгожа [99]. У белару-

Репозиторий ВГУ

скай народнай педагогіцы прасочваецца думка аб неабходнасці самастойнасці дзяцей, дзеля чаго тыя рана прывучаюцца да працы, ім унушаецца думка аб неабходнасці прыгожага і якаснага выканання справы. Аб ступені дарослацсі мяркуюць на падставе таго, што і як чалавек умее рабіць

Паколькі галоўнай мерай духоўнасці і эстэтычнай каштоўнасці з'яўляецца праца, таму і эстэтычнае выхаванне ажыццяўляецца ў працэсе працы. Невыпадкова ў вуснай народнай творчасці прэвалюе працоўная тэматыка.

Праца эстэтычна ўплывае на казкі, а праз іх і на слухачоў. Шмат апісанняў працоўных працэсаў, што спрыяе іх духоўнаму засваенню новымі пакаленнямі. У творы "Аб удавы сыну, што на могілках начаваў" паэтызуецца цыкл вырошчвання і прыгатавання хлеба. Паэтызуюцца простыя рэчы, калі чалавек старанна выконвае сваю працу, напрыклад, закладвае і даглядае сад: як гэта раскрываецца ў казцы "Пра торбачку, ражок і рушнічок": *"Ад усходу і да заходу сонца шчыруе на сваім участку малады садоўнік. Капае, падразае, падвязвае, размаўляе з кожным маладым дрэўцам, быццам з немаўляткам"* [208, с. 112]. І як вынік – *"...выстраіліся шарэнгі маладзенькіх дрэўцаў – яблынь, ігруш, сліў, вішань, і кожнае ўсыпана бела-ружовымі кветкамі. Шчыруюць у іх пчолы, чмялі. А пах які ад кветак ідзе! Дыхаеш – не надыхаешся!"* [Там жа, с. 113].

Праводзіцца думка, што любоў да справы ўзвышае яе да эстэтычна значнай творчасці. Народная педагогіка заклікае не баяцца працы *("Вочы старашацца, а рукі робяць"*), актыўна ўдзельнічаць у працоўнай дзейнасці, спадзявацца на сваю працу, якую трэба выконваць у пару, якасна, творча, з натхненнем *("Дай мазі ў кола, а працы – песні вясёлай", "Гуляй, ды працу знай, "Работа міла, ды дзень малы"*).

Адначасова сцвярджаецца, што працоўнае выхаванне – умова фарміравання эстэтычных густаў, пачуццяў. Усе павінны працаваць, *"Усё жывое трудзіцца"* – асноўны погляд сялян на працу. Даследчык беларускага жыцця А.Я. Багдановіч на мяжы XIX–XX стагоддзяў адзначаў, што "бацькі імкнуліся да таго, каб выхаваць у дзецях любоў да працы на роднай зямлі, сярод роднай прыроды, таму суадносныя матывы пранізвалі звычаі і святы беларускага народа, якія аздаблялі яго быт і працу" [19, с. 24].

З даўніх часоў самая жаданая для беларусаў – свабодная, асэнсаваная, сумленная праца, якая дае і дабрабыт, і радасць, і эстэтычнае задавальненне. Найважнейшы аспект успрыняцця працаўніком прыгажосці ствараемай рэчы – "уяўленні аб мэтанакіраванасці і гармоніі працы поруч з працэсам вытворчасці прадукта" [146, с. 24–25]



Рэпазіторый ВДУ

*(“Хто працуе, той мае”, “Без працы не есці пірагоў”, “Каб смачна есці і хораша хадзіць, трэба многа рабіць”, “Добра працуеш – павагу маеш”, “Прымусовая работа самая цяжкая”, “Добра рабі, добра і будзе”, “Праца з балота робіць залота”, “Работа не бясчэсціць чалавека, а крэпіць і цешыць”).*

Народам набыта і замацавана ўяўленне аб тым, што самі адносіны да працы павінны быць эстэтычнымі. Гэта азначае ўменне бачыць сэнс у справе, імкненне выканаць яе хутка, прыгожа, якасна, ухваляюцца спрытныя эстэтычныя працоўныя рухі: *“Хто працуе, той святкуе”, “Каму работа служыць, той ні аб чым не тужыць”, “Працуй і смак чуй”, “Хто ў рабоце не лянівы, той ў жыцці шчаслівы”, “Сілаю студню капаючы, вады не піць”.* Чалавечая вартасць вымяраецца працаздольнасцю, якасцю працы: *“Якую робіш справу, такую маеш і славу”, “Птушку пазнаюць у палёце, а чалавека – на рабоце”, “Чалавек без рамяства, як дзеўка без хараства”.*

Жыць у разуменні беларуса – значыць працаваць, бо ў працы спасцігаецца сутнасць чалавека, радасць яго жыцця, надаецца духоўная сіла: *“Чалавек жыве век, а добрае дзела – два”*. Эстэтыка, унесеная ў працоўны працэс, аблягчае лёс селяніна, майстра, робіць яго жыццё напоўненым. У той жа час у адносінах да лянівага чалавека прысутнічаюць даволі рэзкія суджэнні: *“Працаваць не любіш – чалавекам не будзеш”, “Ад работы ўцякаць – дабра не ведаць”, “Без працы не будзе шчасця”, “Лянота жуе чалавека, як іржа жалеза”, “Не на адну хваробу праца – найлепшыя лекі”, “Праца чалавека трымае і ўздымае, а гультайства псуе”, “Хто работаю не даражыць, той не будзе шчасліва жыць”, “Хто не робіць – той не есць”.* Існуе шмат камічных і іранічных высноў: *“Гультай за работу – мазоль за руку”, “Хутка робіць, але перарабляе доўга”, “За сто работ бярэцца, а ні адна не ўдаецца”, “І шыла, і мыла, і ткала, і прала – і ўсё языком”, “Лежабоку сонца не ў пару ўзыходзіць”, “У добрай гаспадыні і певень нясецца”.*

Унясенню эстэтычнах элементаў ва ўмовы дзейнасці, праяўленню прыгажосці служылі народныя песні, непасрэдна звязаныя з працоўнымі працэсамі. Яны поўнілі дні беларуса святлом духоўнасці, дадавалі радасці ў нялёгкае жыццё, аблягчалі цяжкую працу селяніна. Даследуючы народную педагогіку рускага народа, Г.М. Піўнева адзначае, што “песні былі заклікаdebы прыхарошваць доўгую і стамляльна-манатонную працу, здымаць стомленасць і, у пэўнай ступені, пацяшаць працаўніка. Аднак было б няправільным, гаворачы пра песні, непасрэдна звязаных з працай, падкрэсліваць толькі іх утылітарнае прызначэнне.



Рэпазіторый ВДУ

Рэалізацыя першаснага, утылітарнага прызначэння звязана з эстэтычным уздзеяннем песні: чым больш дасканалы твор, тым больш паспяхова ён аблягчае працу, здымае стому і г.д. І наадварот, слабы твор не можа выконваць сваю утылітарную функцыю [150, с. 124]. Прапанаваны тэзіс прыемлемы і ў адносінах да беларускай народнай педагогікі:

*Палуднічкі прагудзелі,*
*Палуднаваць захацелі.*
*Хоць гудзіце, не гудзіце,*
*Палуднаваць не будзеце:*
*Шчэ постаці на пражалі,*
*Капы снапоў не звязалі.* [19, с. 177].

У адзіным коле злучаюцца мелодыя, словы, змест: з мелодыі паўстае спякотны летні час, словы распавядаюць пра пачуцці чалавека, змест даносіць асаблівасці пабудовы працоўных дзеянняў.

Даследчыкі адзначаюць, што “народная лірычная песня на працягу стагоддзяў была амаль адзінай і галоўнай эмацыянальна-эстэтычнай формай духоўнага жыцця беларускага сялянства” [44, с. 5]:

*А дзе тая крынічанька,*
*Голуб што купаўся?*
*А дзе тая дзяўчынанька,*
*З каторай кахаўся?*
*А ўжо тая крынічанька*
*Даўно замучона,*
*А ўжо тая дзяўчынанька*
*З другім заручона ...* [19, с. 567].

Як бачым, усе пачуцці можна перадаць песняй, пабудаванай на аснове галоўных архетыпаў беларускай культуры, на вобразах жанчыны, птушкі, дрэва.

Аналізуючы педагагічную каштоўнасць народнай песні, Г.Н. Волкаў заўважае, што прыгожаму выкананню песні дзіця пачыналі вучыць літаральна з калыскі, бо матчына песня заўжды была прасякнута пачуццямі (любові, спагады, пяшчоты, дабра) [39]. Гэта развівала музычны слых, густ і дзіця ўступала ў плынь грамадскага жыцця з пэўным позіркам на правілы спеваў. Сапраўды, без песні не адбывалася ні адна падзея народнага жыцця. Музычны твор найлепшым чынам перадаваў этычную і эстэтычную сутнасць беларусаў. Змест народных песень паказвае

Рэпазіторый ВГУ

значнасць эстэтыка-маральных якасцей, якія ўтрымліваюць эстэтычны ідэал, гэта адзін з самых эфектыўных сродкаў фарміравання любові да прыгожага.

Сярод песень вылучаюць пазаабрадавыя і каляндарна-абрадавыя, якія складаюцца з некалькіх цыклаў. Мэта каляндарна-абрадавых – дапамагчы зрабіць паспяховай працу земляроба. Яны былі звязаны з галоўнымі момантамі жыцця прыроды і ахоплівалі ўвесь гадавы цыкл. Напрыклад, першы зімовы – падрыхтоўчы этап, які павінен сімвалічна забяспечыць ураджай. Цэнтральнае месца ў ім належыць калядкам і шчадроўкам, якія выконваюцца ў час абыходу калядоўшчыкамі сялянскіх двароў. У песнях усхваляюцца гаспадары, славіцца падворак, хараство, багацце. Гаспадар апісваецца як мудры, шчодры і заможны чалавек; яго клічуць пайсці паглядзець на поле, дзе нібыта расце высокае жыта, паспявае пшаніца; прапаноўваюць паглядзець на дзіва ў хляве. Калядкі і шчадроўкі прасякнуты эстэтыкай светлага, ідэалізаванага жыцця. У іх прысутнічае шмат вобразаў з агульнага песенна-фальклорнага матэрыялу. Гэта сталыя эпітэты (жарка сонейка, ясен месячык), параўнанні (падваротнічка – рыб'я костачка), метафары (срэбны капытцы, шаўковы хвосцік), памяншальна-ласкальныя формы (дарожанькі, мядок-саладок, красна барынька) і г.д. Эстэтычнае ўздзеянне працы на чалавека становіцца асновай для стварэння гэтых песень.

Адлюстраваны ідэалізаваны малюнак сялянскай рэчаіснасці асветлены духоўнасцю, замілаваннем чалавекам і яго намаганнямі, знаёміць з маральна-этычнымі ўяўленнямі пра багацце і прыгажосць як вяршыні працоўнага працэсу. Падрабязна разглядае гэту з'яву даследчык А.С. Ліс. У прыватнасці, ён піша: "Прадметнасць вобразаў старажытнай песні, высокая мера эстэтызацыі прадметаў, звязаных з будучым ворывам, сяўбой, стваралі асаблівую, прыўзнятую атмасферу, рабілі зрокава-адчувальнай перспектыву працы на веснавым полі і спрыялі эмацыянальнай настройцы соцыума на канкрэтнае перажыванне, што і было адной з пабудак калядавання і шчадравання як этнасацыяльнай з'явы... Калядкі і шчадроўкі адметны сваім радасным светаўспрыманнем, магічнай вобразнай сімволікай, узбуйненнем вобраза чалавека, у іх адлюстраванага. Гэта "кананічныя абрадавыя тэксты ў іх класічнай эстэтычнай форме" [113, с. 9–10].

Ілюзорны малюнак песень псіхалагічна выклікае імкненне да лепшага. М.А. Дабралюбаў адзначаў, што "ні адзін народ не адрозніваецца такой любоўю да спеваў, як славяне... У нас народ суправаджае спевамі ўсе ўрачыстыя выпадкі свайго жыцця, усялякую справу, усялякую весялосць або смутак. Едзе хто-небудзь

араць зямлю, ён аблягчае працу сваёй песняй; збіраюцца сяляне жаць, касіць у спякотны час, і тут песні гучаць паміж імі, надаючы свежасць сярод цяжкой працы. Праводзяць лета, святкуюць уборку хлеба, – зноў з песнямі. Песня суправаджае пасяленца ва ўсіх яго грамадскіх справах” [44, с. 74].

Можна меркаваць, што народныя песні напаўняюць дні беларуса святлом духоўнасці, дадаюць радасці ў нялёгкім жыцці. Мы згаджаемся з даследчыкам Н.С. Гілевічам, аб тым, што “ў песнях прыгожае – мэта, а сама праца – сродак. Праз працу ўстанаўліваецца сувязь эстэтычнага з маральным, разумовым і фізічным выхаваннем” [44, с. 104]. Песня агучвае ідэалы беларускага народа: “У песнях гадавога круга ў арганічнай паэтычна-вобразнай форме, па законах эстэтыкі, увасоблены такія вызначальныя рысы народнага характару, як працавітасць, сумленнасць, годнасць, непрыняцце сацыяльнага прыгнёту і сямейнай дэспатыі, талерантнасць, зычлівасць – маральна-этычны комплекс, наяўнасць якога зберагала этнас ад разбурэння і забяспечвала яму бытаванне ў прасторы і часе” [113, с. 30]. У беларускіх песнях раскрываецца ў яркіх паэтычных вобразах гісторыя жыцця, працы чалавека, і яны напоўнены вялікай сілай эмацыянальнага ўздзеяння, абуджаюць і ўскалыхваюць пачуцці. Менавіта жывое слова побач з мелодыяй раскрываюць хараство і багацце народнай душы, яе эстэтычныя густы і запатрабаванні. Нездарма А.Я. Багдановіч яшчэ ў пачатку веку падкрэсліў, што беларускія песні з’яўляюцца агульнапрызнаным люстэркам народнай душы.

Песенная традыцыя беларускага народа арганічна звязана са святамі. Філосаф У.Ф. Мартынаў скіроўвае ўвагу на тое, што чалавек “святкаваў быццё” больш за 50% часу ў годзе [122, с. 154]. Песні суправаджалі чалавека ўсё жыццё, былі з ім і ў буднія дні, і ў святочныя. Вывучэнне фальклорнага матэрыялу дазваляе адзначыць, што ў беларусаў святы прымяркоўваюцца не толькі да вольных дзён, але і да выканання пэўных сельскагаспадарчых работ. Непасрэдную сувязь свята і працы, цяжкай працы можна тлумачыць імкненнем чалавека эстэтычна ўпрыгожыць жыццё, зрабіць паўсядзённыя абавязкі больш жаданымі і прывабнымі, абудзіць цікавасць да іх. У народным свяце, як сведчаць этнаграфічныя, фалькларыстычныя, мастацказнаўчыя матэрыялы, у адзіным коле абрады, песні, гульні, праца, танцы – разнастайныя сродкі і метады народнай педагогікі.

Так, песня з’яўляецца складанай формай народнай паэтычнай творчасці, якая нарадзілася з працоўнай дзейнасці селяніна з мэтай яе ўпрыгожвання і аблягчэння, задавальнення духоўных патрэб чалавека, з галоўным прызначэннем – эстэтычна выхоўваць. Песня раскры-



Рэпазіторый ВДУ

вае значэнне эстэтычнага ў жыцці, знешнюю і ўнутраную прыгажосць чалавека. Шматлікія даследчыкі сведчаць, што песенныя формы стаяць у шэрагу найлепшых сродкаў развіцця эстэтычных густаў у падрастаючага пакалення. Гэта адбываецца дзякуючы ўзмацненню эстэтычнага ўздзеяння паэтычнага слова прыгожай мелодыяй. Але значэнне гэтага жанру нельга акрэсліваць толькі знешняй, фармальнай прыгажосцю верша і мелодыі. Моцны аспект народнай песні – прыгажосць думкі і зместу.

Звернем увагу на такую галіну народнай музычна-пластычнай творчасці, як танцы, што створаны народнай фантазіяй, уяўляюць сабой гістарычны матэрыял і элемент духоўнага жыцця. Шматлікія элементы танца, рухі бяруць пачатак ад вытворчых працэсаў, з перайманння прыродных стыхій, жэстаў людзей, рухаў жывёл. Сродкамі народнага мастацтва адбіваецца ў танцах дух нацыі. Матывы працы прасочваюцца ў танцах “Кросны” – як імітацыя працы ткачыхі за кроснамі, “Ручнікі” – вышывання ручнікоў, “Малацілачка” – адлюстраваны некаторыя моманты малацьбы, “Мельнік”, ”Млынок” – ва ўмоўнай харэаграфічнай форме перадаецца работа ветрака, “Талакуха” – талакі, ”Таўкачыкі” – праца людзей, што таўкуць зерне ў ступе і г.д. Гэтыя танцы скіраваны на дасягненне эстэтычнага эфекту, а праз яго і на прывучэнне дзяцей да працы. Мы падзяляем думку педагога В.П. Коцікавай аб тым, што “харэаграфія садзейнічае ўдасканаленню фізічнага і духоўнага пачатку ў чалавеку, стварае той гарманічны сінтэз душы і цела, да якога спрадвечна імкнецца чалавек” [96, с. 42].

Народныя танцы, яркія, выразныя, змястоўныя, з прываблівай цікавай формай, узнікаюць зноў і зноў у адпаведнай сітуацыі, уваходзяць у жыццё, атрымліваюць свае назвы. Дзеці пераймаюць іх ад дарослых, ад пакалення да пакалення, захоўваючы найлепшыя, найцікавейшыя рысы. Гэта актуалізуе думку, што танцы, розныя, пераменлівыя, здольны выказаць думкі і пачуцці, адлюстраваць свой час. У гэтай універсальнасці і заключаецца іх роля ў эстэтычным выхаванні [1].

Такім чынам, штодзённыя клопаты беларуса даюць штуршок да стварэння эстэтычна завершаных і сэнсава значымых твораў. Праца дапамагае не толькі ўспрымаць прыгожае, але і ствараць рэчаіснасць па яе законах. Гэта аказвае ўздзеянне на эстэтычнае выхаванне чалавека. Выхаванне ў працы дазваляе асобе рухацца наперад у пазнанні эстэтычнага, выступае крыніцай натхнення эстэтычна значымай творчасці.



Репозиторий ВГУ

Веданне асаблівасцей народнага выхавання ў працы як умове эстэтычнага выхавання, дапамагае актыўна задзейнічаць патэнцыял народнай педагогікі ў сучасным выхаваўчым працэсе.

### *Выхаваўчы патэнцыял народнай творчасці*

У багатай, разнастайнай беларускай творчасці выпрацавана мноства формаў, матываў, у якіх прасочваюцца векавыя традыцыі народа. Яна адлюстроўвае сабой духоўны вопыт і эстэтычны густ, яднае індывідуальную творчасць і калектыўную мастацкую свядомасць. У творчасці адлюстроўваюцца ідэалы народнай эстэтыкі. У.М. Конан разглядае традыцыйную народную культуру як першасную форму эстэтычнага засваення і мастацкага выяўлення быцця культуры. У прыватнасці, ён піша: "Архаічныя тыпы культуры (міфа-паэтычная творчасць) характарызуюцца аксіялагічным сінкрэтызмам – адзінствам практычна-жыццёвых (утылітарных), этычных, рэлігійных і эстэтычных каштоўнасцей – карыснага, прыгожага, добрага і святога" [93, с. 61]. Такім чынам, народная культура, народжаная творчасцю простага чалавека, нясе духоўны пачатак, сцвярджае гуманізм, свабоду, сацыяльную самастойнасць асобы, адлюстроўвае жыццё ва ўсёй яго глыбіні і паўнаце. Традыцыйная народная творчасць ярка, поўна і своеасабліва выяўляе этнічныя асаблівасці народа, яго эстэтычныя густы і светасузіранне [180, с. 211].

Даследчыкі К.П. Кабашнікаў, А.І. Гурскі, М.А. Янкоўскі прыйшлі да высновы, што вядучая грамадская функцыя народнага мастацтва (як часткі народнай творчасці) – выхаваўчая. Мастацтва разглядае жыццё з улікам эстэтычнай характарыстыкі, садзейнічае фарміраванню асобы, яе маральных асноў, адносін да жыцця, развівае эстэтычныя пачуцці, творчыя здольнасці, спрыяе ўзнікненню мастацкага погляду на свет. Высокі выхаваўчы патэнцыял народнага мастацтва мэтанакіравана выкарыстоўваецца народнай педагогікай.

У адносінах да прасторы і часу віды народнага мастацтва можна падзяліць на "прасторавыя", "часавыя" і "прасторава-часавыя". Да "прасторавых" адносяцца тыя, у якіх вобраз існуе ў прасторы і не змяняецца ў часе (дойлідства, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва). Эстэтычная каштоўнасць твораў азначанай групы заключаецца ў прыгажосці іх формаў, эстэтычнай прыродзе выкарыстанага матэрыялу, у практычнай мэтазгоднасці. "Часавыя" – віды фальклору, якія ў паэтычнай форме адлюстроўваюць жыццё народа на розных этапах гістарычнага развіцця; "прасторава-часавыя" – песні, танцы, святы, звычаі, развіццё якіх адбываецца адначасова па двух напрамках.

Репозиторий ВГУ

Высокі выхаваўчы патэнцыял народнай творчасці шчодра выкарыстоўваецца адвечнай педагогікай чалавека. Мудрая мэтанакіраванасць пранізвае прадметнае асяроддзе народнага быту і праяўляецца ў практычным здаровым сэнсе існавання кожнай рэчы, выразнасці яе функцыянальнага значэння. Утылітарнасць адлюстроўвае рэальныя запатрабавані людзей, дапамагае зразумець характар іх быту, асаблівасці прыроды і клімату, падкрэслівае зручнасць рэчаў і нясе ў сабе эстэтычны пачатак. Нарэшце, само тварэнне, што абуджае і актывізуе творчасць у працэсе духоўнай ці фізічнай працы, таксама ўтрымлівае элемент эстэтычнага.

Народнае мастацтва ўзнікла і развівалася як асобны від дзейнасці, у аснове якой ляжалі праца, што таксама паклала пачатак развіцця мовы. Найдаражэйшае багацце кожнага народа – яго мова – “выступае галоўным інструментам перадачы і захавання змястоўных канцэптаў духоўнай культуры, эстэтычным інтэгратарам этнічных уласцівасцей, якасцей, уласцівых данаму этнасацыяльнаму арганізму” [175, с. 168], – пераканаўча даказвае В.А. Салееў. Яшчэ ў мінулым стагоддзі К.Д. Ушынскім была створана канцэпцыя роднай мовы як крыніцы і сродку ўсебаковага развіцця чалавека, яго духоўнасці [63, с. 80]. Паводле тэорыі, В. Гумбальдта, мова – гэта бесперапынны працэс духоўнай творчасці, які акрэслівае ўсе духоўныя адносіны чалавека да свету. У ёй гарманічна спалучаецца эстэтычны змест думак і мар народа, замацоўваецца разуменне прыгажосці рэчаіснасці. Жывая мова народа заўжды поўніцца сапраўднымі эстэтычнымі з’явамі. Вытокі народнага слова мы знаходзім у бясконцым развіцці і пераменах думак і пачуццяў, што непарыўна звязаны з перажываннямі і працай, штодзённымі клопатамі жыцця. Менавіта таму ў ім замацавана на працягу пакаленняў тое, што думаў, адчуваў і рабіў чалавек. Напрыклад, асаблівы сэнс нададзены назвам месяцаў, у якіх адбіты вобразы асноўных прыродных і працоўных падзей. Сакавік – час пачатку руху соку, ліпень – цвіценне ліп, жнівень – збор зерневых культур, жніво; лістапад – час, калі на дрэвах не застаецца лісця; студзень – найбольш халодны, сцюдзёны месяц года, люты – у якім “лютуе” мароз.

Вядомы даследчык беларускай мовы Я.Ф. Карскі на мяжы XIX–XX стагоддзяў звяртаў увагу на меладыку і плаўнасць роднай мовы, яе эстэтычную вартасць. Можна сцвярджаць, што бацькоўская мова з’яўляецца моцным сродкам эстэтычнага выхавання. Аб гэтым сведчыць выказаная філолагам-славістам А. Патабнёй ідэя аб першаснасці мовы перад творчасцю, тоеснасці мастацтва і слова. На падставе думкі, што ўся мова і кожнае асобнае слова адпавядаюць мастацтву, мовазнаўца Л.У. Шчэрба

Репозиторий ВГУ

абгрунтаваў канцэпцыю абумоўленасці мовай развіцця мастацтва. І сёння шматлікія навукоўцы (М. Някрасава, Г. Вагнер, М. Васіленка, П. Багатыроў) сцвярджаюць: “Народнае мастацтва як мінулага, так і сучаснага вызначаюць традыцыйнасць і калектыўнасць творчасці” [180, 26]. Мова арганізуе і развівае духоўную творчасць, акрэслівае адносіны асобы да свету, гарманічна спалучае эстэтыку думак і памкненняў людзей, адлюстроўвае і асэнсоўвае гармонію жыцця і наваколля. Мову можна разглядаць як своеасаблівы паказчык духоўнага развіцця народа, бо яна – выток вусна-паэтычнай творчасці беларусаў, дзе замацаваны маральна-этычны і эстэтычны ідэалы народа.

Адным з асноўных жанраў народнай паэтычнай творчасці з’яўляюцца казкі, у якіх выказана імкненне народа да дасканалай прыгажосці. У дадзеных творах беларус перадае сваё жыццё, мары аб справядлівым і прыгожым, бо казка, па словах В. Сухамлінскага, – “непадзельна ад прыгажосці”, у ёй чалавек раскрывае сваё разуменне эстэтычнага [198]. Жаданне бачыць дасканаласць у жыцці агучвалася ў вусных творах. Цікавую думку выказвае беларускі фалькларыст М.А. Янкоўскі, што народмастак стварае свае вобразы ў адпаведнасці як са сваёй эстэтыкай, так і сваімі мастацкімі ацэнкамі і ўяўленнямі [242].

Сярод унікальнага матэрыялу, амаль спецыяльна прызначанага для развіцця эстэтычных і мастацкіх пачуццяў (на гэта ўказваюць Н. Гілевіч [45], К.П. Кабашнікаў [73; 74], У.М. Конан [93; 94]), значнае месца належыць казкам пра жывёл. Яны бяруць свой пачатак з сацыяльнага і духоўна-практычнага вопыту чалавека-селяніна, чыя фантазія ідзе са звычайнага жыцця. Дзеючыя асобы – заяц, ліса, воўк, сабака, кот, мядзведзь, певень – думаюць, адчуваюць, паводзяць сябе па-чалавечы, навакольнае асяроддзе ацэньваюць як звычайныя людзі з такімі рознымі рысамі характару, як сквапнасць, хітрасць, баязлівасць, дурасць, лянота. Іх справы, адносіны пераконваюць у неабходнасці прыгожых учынкаў, думак, падводзяць да разумення эстэтычнага ідэалу. Мы раздзяляем пазіцыю М.А. Янкоўскага ў тым, што гэтая група казак нібы спецыяльна прызначаецца для выхавання, мае за мэту не толькі абвастрыць розум, але і сфарміраваць густы: эстэтычныя, мастацкія, сацыяльна-этычныя [242], развіць пачуццё камічнага. Дарэчы, адзначае У.М. Конан, смешнымі звяры выглядаюць толькі па аналогіі з чалавекам, чалавечым жыццём [93].

Дзіцячы фальклор з самых ранніх гадоў садзейнічаў фарміраванню эстэтычнага ідэала, быў адным з неабходных сродкаў эстэтычнага выхавання. Аналіз твораў вуснай народнай творчасці дае падставы сцвярджаць, што ідэал прыгажосці



Репозиторий ВГУ

арганічна пераплецены з маральнасцю. Прыгажосць супадае з дабром: таму можна меркаваць аб маральнай функцыі эстэтычнага ідэалу ў беларускай народнай педагогіцы. У.М. Конан выводзіць вітаісцкую сутнасць народнай эстэтыкі, у якой "універсальнае дабро – усё, што нараджала і захоўвала жыццё на Зямлі. А злом аказаліся процілеглыя жыццю з'явы і падзеі" [93, с, 61]. Нагадаем даследаванне А.І. Шорава, які разглядаў адзінства эстэтычнага і этычнага аспектаў выхавання, што адлюстраваны ў вуснай народнай творчасці адыгаў. Іх перакананні, што ветлівасць, такт дапамагаюць разуменню людзей, паляпшэнню агульнага жыцця сугучны поглядам беларусаў на ўзаемаадносіны з іншымі людзьмі (Шоров А.И. Адыгская (черкесская) народная педагогика: учеб. пособие. – Майкоп, 1999, с. 344). Мы падзяляем меркаванне Л.С. Аляксеевай, што "дзякуючы прыгажосці людзі інтуітыўна цягнуцца да дабра яшчэ да таго, як ідэя дабра будзе асэнсавана ўспрынята іх маральнай свядомасцю" [1, с. 43]. Прыгажосць паводзін як частка маральнай і грамадскай дзейнасці заўсёды разглядалася беларусамі як спосаб самаўдасканальвання чалавека, павелічэння багацця яго духоўнага свету, культурных запатрабаванняў. Пацвярджэнне гэтага знаходзім у прыказках: *"Біцца не гадзіцца, лаяцца не палагаецца", "Лепш памаўчаць, ніж гаварыць невядома што", "На свет лепш не радзіцца, ніж ліхім чалавекам быць", "Не краса чалавека красіць, а характар", "Не той чалавек, хто грошы мае, а той чалавек, што няпраўды не мае", "Пажыві для людзей, пажывуць і людзі для цябе".*

Народная педагогіка праз творчасць, праз мастацтва паступова ўводзіла дзяцей у складаны свет чалавечых узаемаадносін, дзе непазбежныя сутыкненні дабра і зла, любові і нянавісці, агіднага і прыгожага. Але дзяцей вучаць не скарацца перад цяжкасцямі, весці актыўную барацьбу за дабро, прыгажосць, маральнасць. Мы згодны з Л.С. Аляксеевай, у яе меркаванні, што дзіця, калі засвойвае гульні-жарты, дражнілкі, скорагаворкі, праходзіць так званую "школу гумару". Гэта пераконвае яго, што вясёлы чалавек здольны з усмешкай пераадольваць цяжкасці, пачэсна выходзіць з канфліктных сітуацый. Вясёлы, добры смех, здольнасць пасмяяцца з сябе выхоўвае здольнасць радавацца, фарміруе аптымістычныя адносіны да жыцця [1, с. 46]. Жартоўныя песні займаюць сваю нішу ў вясельным фальклоры ("А мой мілы захварэў..." [19, с. 580], "Спарадзіла чачотачка семера дачок..." [Там жа, с. 583], "Пасеяў мужык грэчку..." [Там жа, с. 585]:

*Ды казалі, наш малады*
*Вельмі харош,*

*Ажно ў яго доўгі нос,*
*Па яблыку вочкі,*
*Буслаў нос...* [Там жа, с. 302].

Падобныя творы выклікаюць добрую ўсмешку ў слухачоў і выканаўцаў, бо пабудаваны на адной з вызначальных катэгорый эстэтыкі – камічнага.

Наогул, беларускія народныя песні актыўна ўплываюць на эстэтычны стан асобы. Менавіта музыка па-за свядомасцю чалавека ўздзейнічае на яго падсвядомасць, эмацыянальны стан. Музыка, харавыя спевы сёння разглядаюцца як найважнейшы сродак фарміравання здаровага чалавека. Даследчыкі народнай культуры, традыцый адзначаюць, што “народная лірычная песня на працягу стагоддзяў была амаль адзінай і галоўнай эмацыянальна-эстэтычнай формай духоўнага жыцця беларускага сялянства” [54, с. 5]. Вызначальнай для беларускага народнага мастацтва з’яўляецца надзвычай багатая спадчына радзінных і валачобных песень, якія дзівосна багатыя паводле музыкальных тэм і тэкстаў, з’яўляюцца, калі можна так мовіць, візітнай карткай беларускай песеннай культуры і нацыянальнага погляду на жыццё. Валачобныя песні ўзвялічваюць чалавека, праз эстэтычны вобраз закладваецца станоўчая псіхалагічная праграма:

*...Падмятаюць двары ўсё павім пяром,*
*Усё павім пяром, залатым крылом.*
*Стаўляе сталы ўсё цясовыя.*
*Засцілае сталы ўсё кітайкаю,*
*Усё кітайкаю, усё зялёнаю,*
*Стаўляе кубкі ўсё сярэбраныя,*
*Налівае кубкі зялёным віном,*
*Зялёным віном, чорным півам,*
*Чорным півам, да салодкім мёдам...* [19, с. 119].

На думку даследчыкаў Л.М. Варанецкай, А.А. Грымаця: “Педагагічная каштоўнасць песні ў тым, што прыгожым спевам вучылі, а яны, у сваю чаргу, вучылі прыгожаму і дабру. Песняй суправаджаліся ўсе падзеі народнага жыцця – праца, святы, гульні, пахаванні і г.д. Усё жыццё людзей праходзіла ў песні, якая найлепшым вобразам выражала этычную і эстэтычную сутнасць асобы” [39, с. 88]. Змест народных песень паказвае значнасць эстэтыка-маральных якасцей, якія ўтрымлівае эстэтычны ідэал.



Репозиторий ВГУ

Песня агучвае ідэалы беларускага народа. У песнях гадавога кола ў арганічнай паэтычна-вобразнай форме, па законах эстэтыкі, увасоблены такія вызначальныя рысы народнага характару, як працавітасць, сумленнасць, годнасць, непрыняцце сацыяльнага прыгнёту і сямейнай дэспатыі, талерантнасць, зычлівасць – маральна-этычны комплекс, наяўнасць якога зберагала этнас ад разбурэння і забяспечвала яму бытаванне ў прасторы і часе [113; 116]. У беларускіх песнях раскрываецца ў паэтычных вобразах гісторыя жыцця, працы чалавека і яны напоўнены вялікай сілай эмацыянальнага ўздзеяння, абуджаюць, пачуцці. Менавіта жывое слова побач з мелодыяй раскрываюць хараство і багацце народнай душы, яе эстэтычныя густы і запатрабаванні. Нездарма А.Я. Багдановіч яшчэ ў пачатку стагоддзя падкрэсліў, што беларускія песні з’яўляюцца агульнапрызнаным люстэркам народнай душы [19].

Акрамя фальклорных твораў, свой уплыў на выхаванне асобы робіць эстэтычна арганізаваная рэчаіснасць. Імкненне продкаў да прыгожага знаходзіць адлюстраванне ва ўсіх галінах дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, народнай матэрыяльнай культуры. Яшчэ А.У. Луначарскі заўважыў, што: “чалавек разлічвае, каб рэчы, што яго акружаюць, былі прыгожымі… Чалавеку хочацца, каб гэтыя прадметы яму падабаліся, … каб яны выклікалі ў ім пэўную станоўчую, прыемную, радасную эмоцыю” [117, с. 76].

Знамянальна, што пры выбары месца для жылля селянін ацэньваў не толькі ўрадлівасць глебы, блізкасць да вады, экалагічны стан, але і прыгажосць абранага месца [225]. Наогул, беларуская вёска падае прыклад гармоніі чалавека і прыроды, прыстасавання першага да ўмоў асяроддзя. У гэтым бачыцца паяднанасць эстэтычнага і утылітарнага. Вяршыняй народнага дойлідства з’яўляецца будаўніцтва жылля для сялян з адзінствам будаўнічага матэрыялу (дрэва) і канструкцыі. Напрыклад, “эстэтычная выразнасць у драўляным дойлідстве дасягалася спалучэннем простых геаметрычных форм…, разьбой” [19, с. 228]. С. Ясенін [64], І.І. Крук [99] ацэньваюць хату як выпрацаваны продкамі філасофскі і эстэтычны сімвал паняццяў і адносін да свету. Чырвоны кут – нібыта зара, столь – нябесны звод, матыца – Млечны Шлях [64]. Сапраўды, найбольш шаноўнае, прыгожае месца ў хаце – покуць з абразамі, пакрытымі ўзорнымі ручнікамі… Яно атаясамліваецца з усходам і поўднем, а па дыяганалі ад чырвонага кута, у супрацьлеглым баку заўсёды размешчана белая печ. Яе месца сімвалізуе захад і поўнач. І сама печ цалкам паўтарала міфа-паэтычную мадэль свету, “яе структурныя гарызонты адпавядалі плыні часу: падпечак (як і праграб) –



Рэпазіторый ВДУ

мінулае, загнет, вусце, і засланка – дзень сённяшні, комін, перакрываны юшкай (душой), суадносіўся з будучыняй [13. с. 379].

“На працягу шэрагу стагоддзяў беларусы выпрацавалі такі космас свайго жытла, які абавязкова спрыяў духоўнай і фізічнай камфортнасці”, – падкрэслівае І.І. Крук [99, с. 297]. У аздабленні сялянскага жылля шырока выкарыстоўваецца разьба па дрэве. Скразная і краявая, розныя вільчыкі, мастацкая раскладка шалёўкі, паліхромія дазваляюць зрабіць будынак эстэтычна завершаным. Асабліва пачалі па-мастацку аздабляць шчыты і крокы пасля пашырэння пілаваных дошак [21]. Дарэчы, майстэрства разьбы і роспісу па дрэве атрымала шырокае распаўсюджванне ў аздабленні сялянскіх бытавых рэчаў, на што ўказваюць Я.М. Сахута [178; 179; 180], В.В. Трацэўскі, Ю.А. Якімовіч. Такім чынам, дзякуючы вытворчым і мастацкім традыцыям, індывідуальным памкненням і густам, сацыяльнай неаднароднасці беларускай вёскі, жыллёвы інтэр’ер сялян сучасныя даследчыкі вызначаюць як прыгожы і разнастайны. Кожная хата, жылы і нежылы пакой ствараюць асаблівы настрой душы, сведчаць пра матэрыяльны і духоўны лад жыцця народа, яго эстэтычныя запатрабаванні.

Асаблівасць народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва – адзінства эстэтычнай і утылітарнай функцый. Яго можна прасачыць у адзенні, прыладах працы, посудзе і іншых рэчах побыту, якія аздабляюцца дэкорам (спрадвечна сакральна-магічным) ці выконваюць эстэтычную функцыю дзякуючы прыгожай, зграбнай форме, якая найлепш адпавядае іх прызначэнню. Зручныя, прыгожыя рэчы, што выкананы з адпаведнага матэрыялу, становяцца здабыткамі мастацтва. Неабходнасць у іх выклікала да жыцця творчую працу чалавека. Хатняе начынне мае сваё замацаванае месца, разглядаецца ў функцыянальным і кампазіцыйным парадку, зроблена рукамі майстроў-умельцаў ці самім гаспадаром і, як вынік, нясе адбітак асобы выканаўцы. Праца выканаўцы складаецца пад уплывам традыцыйнага імкнення да дасканаласці і творчасці, якая характарызуецца унікальнасцю, адчуваннем матэрыялу, формы, дэкору [178]. Так, людзі ўмела выкарыстоўваюць матэрыял, адчуваюць яго магчымасці і сродкі, шукаюць найлепшую форму вырабу, і ў выніку рэчы звяртаюць на сябе ўвагу прыгажосцю, прадуманасцю, логікай форм, што і ёсць адна з умоў мастацкасці, крытэрый эстэтычнага.

На Беларусі распаўсюджаны розныя народныя промыслы, карані якіх губляюцца ў сівой мінуўшчыне. Напрыклад, мастацтва ***размалёўкі па дрэве***. Так, элементы аздаблення Агоўскіх куфроў узяты з прыроднага наваколля: кветкі, лісце, трава, каласы, ягады, звяркі. Фарбы для стварэння выяў бяруцца яркія, інтэнсіўныя. Кож-



Рэпазітарый ВДУ

ны элемент размалёўкі нясе сэнсавым падтэкстам запавет ці добрае пажаданне. У прыкладах народнага роспісу па дрэве адчуваецца любоў да прыроды, з якой непарыўна звязана ўся дзейнасць селяніна, уменне паказаць яе ў яркіх і выразных, але ў той жа час лаканічных і абагульненых дэкаратыўных матывах.

Бытавыя рэчы для захавання прадуктаў і адзення вырабляюць з лазы, саломкі, лубу, бяросты і аздабляюць арнаментам з ромбікаў, зубчыкаў, крыжыкаў. Удалае спалучэнне чырвонай лазы з залацістай саломкай, пляценне з лазовых дубцоў і карэння робіць простыя рэчы сапраўднымі творамі мастацтва, развівае здольнасць да эстэтычнага ўспрыняцця і праз яго да індывідуальнасці эстэтычнага мыслення. Беларускае ***саломапляценне*** Я.М. Сахута лічыць унікальнай з’явай народнага мастацтва ўсёй Еўропы [178]. Плеценыя шкатулкі, фруктоўніцы, капелюшы, дэкаратыўныя скульптуры ствараюцца з аржаной саломы. Традыцыйным упрыгожваннем сялянскіх хат на працягу доўгага часу былі павукі – своеасаблівая канструкцыя са звязаных паміж сабою саломак. З гэтага ж сонечнага матэрыялу пляліся дзіцячыя цацкі, дэкаратыўная скульптура. Нават царскія брамы цэркваў былі створаны з дапамогай саломкі (з’ява, характэрная толькі для Беларусі). Рамкі, шкатулкі, куфэркі аздабляліся ў тэхніцы аплікацыі, а ўзоры вырабаў нагадвалі геаметрычны тканы арнамент. Саломкай жа на палатне выклейваліся аналагі тканым і маляваным насценным дыванам з выявамі букетаў кветак, гірляндаў, птушак [18].

Адным з найбольш вядомых, шырока распаўсюджаных відаў народнага мастацтва з’яўляецца ***ганчарства і кераміка***. У паданнях згадваецца, што першыя людзі і жывёлы былі вылеплены з гліны. Працяглы час ганчарства было жаночай справай, людзі верылі, што толькі жанчына валодае незвычайнымі ўласцівасцямі (сярод мужчын падобнай сілай валодаў каваль). У канцы XIX – першай палове XX стагоддзя дзейнічала каля сямідзесяці ганчарных цэнтраў, са сваімі асаблівасцямі апрацоўкі гліны. Можна адзначыць Бабінавіцкую кераміку (з в. Бабінавічы Лёзненскага раёна). Вырабы адметныя “карычневай палівай, яны размаляваны ангобам у розныя завіткі і парасткі, галінкі” [18, с. 86]. У в. Гарадняны Столінскага раёна ганчарныя вырабы белагліняныя, маюць аздабленне ў выглядзе пояска і хвалістых рысак светла-карычневага колеру [178; 180]. Пружанская кераміка з г. Пружаны “чорнаглянцаваная з дэкорам у выглядзе вертыкальных палосак, сеткі, хваёвых галін, а таксама і чорная паліваная і непаліваная” [18, с. 467].



Рэпазіторый ВДУ

Гліняны посуд у беларусаў меў пэўныя паралелі з чалавечым жыццём: як і чалавек, ён нараджаецца, жыве і памірае, нават падзяляецца рода-полавымі прыкметамі: гладышун і гладышка, гаршчок і гаршчыца. Посуд, пусты знутры, уяўляўся змесцівам як душы, так і, магчыма, дэманалагічных істот. У павер'ях абыгрываецца цэласнасць ці бітасць посуду (прыгажосць і непрыгажосць). Надбіты або трэснуўшы посуд асцерагаліся трымаць у хаце, бо лічылі за кепскі знак [13, с. 388], які перанёс непрыгажосць, несуцэльнасць на звышнатуральныя ўласцівасці.

Такім чынам, прыгожыя, простыя керамічныя вырабы радуюць вока чалавека, аздабляюць хату, вучаць карыстацца эстэтычна значнымі рэчамі. Эстэтыка рукатворнасці ярка праступае ў фігурных сасудах у выглядзе розных жывёл: бараноў, мядзведзяў, ільвоў. Звычайна гэтыя вырабы не зусім дасканала перадаюць прапорцыі жывёлы, а нясуць пэўны эстэтычна абагульнены вобраз. Ганчарным промыслам амаль заўжды спадарожнічаў выраб гліняных цацак. Даследчыкі адзначаюць, што росквіт мастацтва глінянай цацкі (свістулькі ў выглядзе птушак, конікаў, фігуры людзей і інш.) прыходзіцца на канец XIX – пач. XX стагоддзя.

***Лялька і цацка***, што выкананы ў лепшых традыцыях народнага мастацтва адкрывае свайму маленькаму ўладару вялікую прастору для фантазіі і свайго, асаблівага бачання. Толькі некалькі характэрных рыс вызначаюць галоўнае: крутая шыя з грывай – у каня, загнутыя рогі – у барана, вялікія вочы – у савы... Лялька і цацка ўводзяць дзіця ў вялікую мастацкую культуру народнай творчасці, фарміруюць эстэтычны густ, пачуцці.

У старажытнасці гліняная цацка не была цацкай у нашым сённяшнім разуменні. Гэта адметнасць паганскага культу, адбіткі свяшчэнных жывёл і свіст, які яны ўтвараюць, валодае магічнымі ўласцівасцямі. Нашы продкі верылі, што гэты свіст праганяе злых духаў і запрашае добрых. З часоў прыняцця хрысціянства рытуальны сэнс пастулова быў страчаны, і пластыка з часам пераўтварылася ў ляльку, захаваўшы адметную стылістыку на працягу стагоддзяў. Увесь гэты час яна захапляе і эстэтычна выхоўвае дзяцей.

Распаўсюджаным і старажытным відам народнага мастацтва з'яўляецца ***ткацтва***. Гэта ўменне абавязковае для кожнай сялянкі, нават княжай дачкі. Невыпадкова асноўную частку пасагу дзяўчыны, якая выходзіць замуж, павінны складаць тканыя вырабы: адзенне, ручнікі, абрусы. З ткацтвам звязаны народныя звычаі, яно ўзгадваецца ў песнях. Шмат працоўных і творчых намаганняў трэба прыкласці, каб авалодаць майстэрствам. Дзяўчынак пачыналі вучыць ткаць з 7–8 гадоў. Сам працэс выра-



Рэпазіторый ВДУ

бу тканіны расцягваўся на год, бо трэба было вырасціць лён, авечку, потым спрасці ніці, снаваць, наладжваць кросны (давалялася рабіць мужчынам) і інш. Усе працоўныя аперацыі суправаджаліся шэрагам магічна-эстэтычных дзеянняў, прыкметаў, прыпевак. Каб лён быў чыстым, яго неслі на поле ў чыстым абрусе, прыгаворвалі: "Светлы дзень, як вакно, радзіся добрае валакно!". Нельга было прасці ў пятніцу, каб вялася жывёла, а таксама ў святыя дні. А вось найлепшым днём для снавання лічылі пятніцу – жаночы дзень. Пры снаванні вялікая ўвага аддавалася рытуальнай чысціні выканаўцы. Потым са сплеценай асновай рабілі рытуалы, накіраваныя на забеспячэнне ўраджаю лёну і поспеху ў працы [13, с. 505].

Прадметы ўзорнага ткацтва адлюстроўваюць багатую самабытную творчасць мясцовых майстроў, адыгрываюць істотную ролю ў мастацка-эстэтычным афармленні жылля. Рытмічныя паўторы з дапамогай перапляцення нітак, вышыўкі, набіванкі настолькі заварожваюць вока, што ўзнікае параўнанне іх з музыкай, мелодыяй "вечной песни перед мирозданием" [64, с. 135]. Традыцыі беларускага ткацтва сведчаць аб творчай адоранасці беларускага народа, аб яго любові да ўзорыстасці ў аздабленні свайго адзення і жылля. У кампазіцыях пераважаюць кветкі, што акаймаваны шлякам з раслінным арнаментам, радзей сустракаюцца малюнкі з геаметрычным арнаментам, з фігуркамі жывёл, чалавека.

Распаўсюджаны від жаночага рукадзелля, што цесна звязаны з ткацтвам, – ***вышыўка***, якая нясе вялікую эстэтычную нагрузку. Вышыўкай беларускія сялянкі ўпрыгожваюць адзенне, прадметы побыту. У найбольш чыстым выглядзе нацыянальныя асаблівасці вышыўкі і ткацтва прасочваюцца ў дэкоры ручнікоў і адзення (фартух, пояс, кашуля). Знамянальна, што ў жыцці беларуса ручнікі выконваюць шмат абрадавых функцый (нават існуюць спецыяльныя назвы, што падкрэсліваюць іх прызначэнне: набожнік, уціральнік, покрыва і інш.). Традыцыйна нованароджанага прымаюць на прыгожы ручнік, на ручніку падносяць хлеб-соль маладым, пры дапамозе яго апускаюць труну ў магілу. А шматлікія вясельныя абрады і сёння не абыходзяцца без дэкарыраванага палатна: "Падчас вяселля абодвух маладых вялі ў хату, пакрыўшы іх галовы ручніком. На ўзроўні народных уяўленняў гэтыя акцыі азначалі пажаданні багацця, дабрабыту, а таксама далучэнне да новага дому" [13, с. 483]. Вышыўка – абавязковы працоўны навык, неабходны кожнай жанчыне. У беларусаў бытавала нават "запаветнае шыццё" – калі на тканіне вышывалі выявы хворых частак цела і ахвяравалі царкве [Там жа, с. 100].



Рэпазіторый ВДУ

У выніку творчасці многіх пакаленняў узоры народнай вышыўкі набылі выключную завершанасць, гармонію прапорцый, прыгажосць і выразнасць арнаментальных фігур, спалучэнняў колеру. Асноўныя колеры вышыўкі найчасцей былі традыцыйныя для народнай эстэтыкі: белы як натуральны фон палатна, чырвоны як сімвалічны колер сонца і жыцця ў славян, у тым ліку і беларусаў, чорны як колер смутку, бо чалавечае жыццё не вечнае [100].

Адным з відаў эстэтычна значымай творчасці з’яўляецца ***народнае адзенне*** – своеасаблівая візітная картка этнасу, нацыянальны сімвал [118]. Яно ствараецца рукамі саміх працоўных і бытуе ў іх асяроддзі, адлюстроўвае індывідуальныя густы, пачуццё меры, месца жыхарства, дух эпохі. Народнае адзенне складае частку культуры і выяўляе нацыянальныя асаблівасці і эстэтычныя густы чалавечай суполкі. Да ХХ стагоддзя сяляне выкарыстоўвалі для пашыву адзення самаробныя тканіны з лёну, воўны, колер якім надаецца прыроднымі фарбавальнікамі. Структура гэтых рэчаў заснавана на прастаце і мэтазгоднасці. Шмат высокамастацкіх узораў, закончаных ансамбляў і іх частак, можна ўбачыць ў народным адзенні. Яно, прыгожае і разнастайнае, дазваляе развіваць і выхоўваць эстэтычныя густы грамадства.

Гарманічнае спалучэнне практычнасці і прыгажосці народнага мастацтва садзейнічае эстэтычнаму ўспрыняццю свету, эстэтызацыі асобы. Выдатныя ўзоры пластыкі, арнаменту, стылізацыі, каларыту з твораў народных майстроў незаменныя для выхавання ў чалавеку пачуцця прыгожага, жадання самому ствараць прыгажосць.

Важная частка народнага мастацтва – ***народны танец*** – найстаражытнейшая праява творчай мастацкай дзейнасці чалавека, дзе ў эстэтычна абагульненай форме адлюстраваны вытворчыя працэсы, чалавечыя жэсты, рухі жывёл. Глыбока пранікае ў сутнасць гэтай з’явы І.І. Крук, які адзначае, што “беларускі народны танец – гэта сюжэт увасобленай у рухах казкі, а тая ж казка – не што іншае, як танец народнай фантазіі, карункі слоўнага мастацтва, аздобленыя пластыкай пазаслоўнай інфармацыі: мімікай, жэстамі, элементамі пантамімы” [99, с. 8]. Народныя харэаграфічныя вобразы дапамагаюць зразумець унутраны свет чалавека, сваёй спецыфічнай мовай расказваюць аб жыцці. Арганічна звязаныя з музыкай, танцы народа адыгрываюць сваю ролю ў эстэтычным выхаванні асобы, бо дапамагаюць развіваць эстэтычнае ўспрыняцце, запрашаюць да творчасці.

Народны танец, музыка побач з іншымі галінамі народнага мастацтва – песнямі, гульнямі, святочным адзеннем, абрадавай

Рэпазіторый ВДУ

ежай – яднаюцца ў ***народных святах, звычаях, абрадах***, што выступаюць скарбонкай эстэтычных здабыткаў беларусаў. Народныя святы як адзін з відаў творчасці народа, што садзейнічае фарміраванню выхаваўчай дамінанты, патрабуюць асаблівай увагі. Кожны чалавек імкнецца выканаць сваю ролю на вачах аднавяскоўцаў як мага лепш, больш эстэтычна. У сярэдзіне XIX стагоддзя 22 красавіка беларусы святкавалі Ляльнік, у гонар Лялі. Яе ўяўлялі юнай, стройнай, прыгожай дзяўчынай. На свята дзяўчаты з усёй вёскі збіраліся на лузе і выбіралі самую прыгожую. Потым яе апраналі ў белую кашулю, рукі і стан упрыгожвалі зелянінай, а на галаву ўскладалі вянок з веснавых красак. На ўзвышэнне, што заслана зялёным дыванам, садзілі Лялю, прыносілі зялёныя вянкі, хлеб, масла, тварог і г.д. Вакол вадзілі хараводы і спявалі песню, у якой прасілі цёплай вясны і багатага ўраджаю. У адказ на песню Ляля дарыла вянкі і частавала дзяўчат. Гэтыя травы захоўвалі да наступнага Ляльніка [13, с. 286–287].

Найбольш значная абрадавая дзея – шлюб. Рытуальна вяселле было максімальна разгорнутым, сімвалічна насычаным мерапрыемствам. Таму з гэтай тэматыкай было звязана, бадай, найбольшая колькасць павер'яў, магічных дзеяў, рэгламентаваных паводзін. Аб шлюбных перспектывах чалавека меркавалі ўжо па часе нараджэння: лічылася, што, калі дзіця нараджаецца на зменах квадраў месяца, то шлюб будзе бяздзетны. Варожбы аб часе, месцы і характару магчымага шлюбу праходзілі ў гульнях, ігрышчах, танцах падрыхтоўчага, перадшлюбнага характару: "Жаніцьба Цярэшкі", "Яшчур", "Падушачка", "Удавец". Сам вясельны абрад сімвалізаваў паўтор двух асноўных жыццёвых пачаткаў адначасова: смерць і нараджэнне. Таму шлюбная абраднасць падзяляецца на дзве часткі, з сімвалічнымі паміраннем хлопца і дзяўчыны (песні нявесты і яе сяброўак падчас Суборнай суботы мінорныя і нагадваюць галашэнні) і нараджэннем жонкі і мужа (сімвалічнае нараджэнне пачыналася пасля вянчання, калі паступова маладыя пачыналі рэальна ўдзельнічаць у святкаванні) [13]. Наогул, вяселле – найбольш разгорнутая мастацка-сакральная дзея, што закранае ўсе аспекты народнай творчасці, скарыстоўвае ўсё багацце народнага мастацтва.

Мастацтва стварае культ гармоніі, развівае здольнасці чалавека да эмпатыі, саманазірання і самавыхавання, дапамагае нараджэнню эстэтычных пачуццяў. Можна гаварыць аб імкненні беларуса набыць праз рэчы, грамадскія адносіны максімальныя ўражанні і пачуцці. Дасягалася пры іх ускладненні, з аднаго боку, і спрашчэнні, з другога. Арнамент, узоры, рытуальныя дзеянні пашыраюць рэчаіснасць, выклікаюць станоўчыя эмацыянальныя



Репозиторий ВГУ

ўражанні, узрушэнні. У той жа час, з мэтай атрымаць разнастайныя ўражанні, існавала тэндэнцыя да спрашчэння, стылізацыі, падпарадкавання. Чалавек меў намер наблізіцца да "залатой сярэдзіны". Трэба пагадзіцца са словамі А. Луначарскага аб тым, што чалавек "увесь час імкнецца зрабіць разнастайнай і спрошчвае сваё асяроддзе, пастаянна імкнецца наблізіцца да найвялікшай шматвобразнасці пры найвялікшым адзінстве. Тое, у чым ён менавіта знаходзіць такую шматвобразнасць, як менавіта вырашае праблему адзінства, адзначае сабой стыль пэўнага народа, эпохі ці пэўнай асобы" [117, с. 87]. Гэта ўносіла ў жыццё найвышэйшы план быцця, іншае адчуванне кожнай справы, думкі, пачуцця: "І ніякія будні не маглі яго засланіць… матэрыяльнае і духоўнае стваралі непарыўнае адзінства. Усё ў жыцці – радасць і смутак, лёс аднаго чалавека і ўсяго народа, кожная птушка, рачулка, песенька – адлюстроўвала найвышэйшыя каштоўнасці і сэнс, а таму само па сабе станавілася каштоўнай, уключалася ў адзіны сусветны парадак, адзінае кола жыцця, кола быцця [1, с. 70].

Такім чынам, мы сцвярджаем, што творчы патэнцыял мастацтва беларускага народа абуджае эстэтычныя думкі і пачуцці, фарміруе культ гармоніі, развівае эмпатычныя здольнасці чалавека, вучыць саманазіранню і самавыхаванню. Гэта садзейнічае выхаванню эстэтычна развітага чалавека на ідэалах народнай эстэтыкі.

### *Распаўсюджванне ў паўсядзённым жыцці беларуса трыяды: мары, народныя вераванні, успаміны (інтэнсіфікатары маральна-эстэтычнага жыцця)*

Народ становіцца народам дзякуючы сваім поглядам, вераванням. Беларуская міфалогія лічыцца адной з самых старажытных у Заходняй Еўропе, яна захавала не толькі вобразы першапачатковых боскіх і дэманічных істот, але і правілы ўзаемадзеяння з імі, варыянты чалавечых паводзін, каб дабіцца спагады, абароны ад звышнатуральнай сілы з'яў. Г.Н. Волкаў піша, што будынак чалавечай асобы ўяўляецца як бы пабудаваным на чатырох "гранітных слупах" – самым трывалым з падмуркаў: навука (веды), рэлігія (вера), мастацтва (прыгажосць), выхаванне (любоў). Адзначым, што беларуская народная педагогіка адводзіла кожнаму з іх пэўнае месца. З дапамогай традыцыйнага ўкладу, падыходаў да выхавання і жыцця ў асобе ўзмацняўся духоўны падмурак. Веды аб вядзенні гаспадаркі, чалавечых зносінах, сусвеце; уяўленні пра свет жывых і памерлых, рэальны і нябачны свет, яго пабудову; адносіны да бацькоў, дзетак – усё прасякнута прыгажосцю *("Гэты свет як макаў цвет: зранку расцвітае, да вечара ападае", "Не рабі ліхога, і не бойся нікога", "Рання адна*

Репозиторий ВГУ

*гадзіна варта трох вечаровых", "Богу багаваць, а нам працаваць", "Не скончыўшы адну работу, за другую не бярыся", "Які хто змоладу, такі і ў старасці", "Тады дзяцей вучаць, як каля лаўкі ходзяць", "Бацькоў – любі, старых – паважай", "Ніхто так дзеткам не спагадае, як матка родная", "Паміраць збірайся, а пра дзяцей думай"* [19; 157]).

Аб чым марыць беларус? На гэтае пытанне гучыць адказ ва ўсёй творчасці чалавека – аб шчасці. Шчасце – асэнсаваная праца, якая нясе дабрабыт у сям'ю, здароўе як для дарослых, так і для маленькіх, а яшчэ – мірнае жыццё. Адлюстраваны мары чалавека ў песнях, казках, паданнях, загаворах – ва ўсіх жанрах вуснай народнай творчасці. Калектыўныя ўяўленні аб ідэальным жыцці пераўтвараюцца ў пэўныя абрадавыя дзеянні. Згодна Э. Дзюркгейму, гэтыя дзеянні падразумяваюць уздеянне і рэагаванне з боку іншага і самі выступаюць вынікам такіх узаемадзеянняў. Аднолькавыя словы, жэсты, якія адносяцца да адной рэчы, пераўтвараюць людзей у еднасць, у цэлае. Роля калектыўных дзеянняў заключаецца ў тым, што група асэнсоўвае, усведамляе сябе, сваю існасць. Калектыўныя дзеянні становяцца сімваламі – умоўнымі знакамі сэнсавага выражэння грамадскай свядомасці. Такая сімволіка перадаецца з пакалення ў пакаленне, незалежна ад асобных прадстаўнікоў супольнасці, суправаджае ўсе значныя падзеі грамадства. Свая сімволіка існуе і для духоўна-маральнага жыцця чалавека. У гэтай сувязі асабліва важныя шматлікія народныя абрады. Між імі асаблівае месца належыць рытуалам пераходу – нараджэння, вясельны і пахавальны. Кожны з іх сімвалізуе асаблівыя формы ўзаемадзеяння і адносін паміж людзьмі, спрыяе зняццю псіхаэмацыйнага напружання, дазваляе звярнуць увагу на эстэтычны аспект рэчаіснасці. А.А. Фрынлянд прасочвае ў абрадавых дзеяннях важную сацыяльную матывацыю: прыняцце і захаванне індывідам яго сапраўднага статуса і асэнсаванне перамен, што непазбежных з часам. Шматвекавая практыка абрадавых дзеянняў накіравана на рэгламентацыю працэсаў засваення культурных роляў і нормаў паводзін у якасна розныя стадыі жыццёвага цыкла. Чалавечыя ўчынкі, перажыванні, ідэалы з'яўляюцца звыклымі каналамі сувязі паміж мінулым і сучасным – гістарычнай і паўсядзённай памяццю. Пра гэта даводзіў Э. Касірэр: "Мы не можам апісаць чалавечы ўспамін як просты зварот да падзеі, як слабы вобраз ці копію папярэдніх уражанняў. Гэта разам на проста паўтор, а хутчэй адраджэнне мінулага – яно ўключае творчы і канструктыўны працэсы" [86, с. 500].



Рэпазіторый ВДУ

Прыгажосць як месца сутыкнення двух сусветаў, ёсць увядзенне быцця ў маральны аспект праз яго адухаўленне, працяг пачатай прыродай мастацкай справы ў святле будучай рэчаіснасці, інакш кажучы, пачуццёвае адлюстраванне ў матэрыяльным свеце ісціны і дабра [139, с. 959]. З дапамогай мастацтва чалавек рабіў спробу паўплываць на долю: асабістую ці значных для яго людзей. Гэта вяло да эстэтычнага асэнсавання рэчаіснасці. Сярод беларусаў былі шырока пашыраны варожбы на шлюб, ураджай, чалавечую долю. Гэтыя абрады прасочваюцца ва ўсім гадавым абрадавым цыкле. Аб гэтым сведчыць І.С. Сычова: "Толькі кананічна правільнае і па-мастацку дасканалае выкананне абраду магло забяспечыць дабрабыт, што садзейнічала практычна-дзейнаснаму характару эстэтычнага выхавання, павышала значнасць навыкаў у галіне народнага мастацтва. Свет лічыўся адзіным, адсутнічаў строгі падзел на матэрыяльную і ідэальную культуру, прагматычнае супрацьпастаўленне хлеба і песні: яны былі непадзельнымі або ўзаемадапаўняльнымі" [201, с. 69].

Шэраг вераванняў, што існаваў (і існуе!) у беларускай народнай традыцыі, ірацыянальна дэтэрмінуе, не звужае, а пашырае, падвойвае свет, бо вядзе да пошуку больш спрыяльнага на падставе кананічна добрага і прыгожага, пабудавана на эстэтычным перажыванні маральных учынкаў. Напрыклад, нельга было адмовіць цяжарнай жанчыне ў яе просьбе, бо інакш той, хто адмовіў, панясе матэрыяльныя страты – "мышы (моль) пагрызуць". Існавала патрабаванне да цяжарнай жанчыны не глядзець на агідныя рэчы, каб не прынесці шкоды дзіцяці. Калі выбіралі немаўлятку імя, мусілі засцерагчыся называць яго імем чалавека з няўдалым лёсам, маральна непрыгожага, нешчаслівага. Наадварот, перавага аддавалася імёнам паважаных людзей, працавітых, сямейных [99].

Існавала забарона на тое, каб нейкая жанчына (напрыклад, маці, сяброўка) абмятала смецце вакол дзяўчыны. Лічылася, што такім чынам "абмятаюцца жаніхі". Калі малады адпраўляўся да вянца, то клаў у халявы ботаў медныя або сярэбраныя грошы, каб магічна забяспечыць заможнае шлюбнае жыццё. У беларусаў лічылася не толькі непрыгожым, але і надзвычай небяспечным класці на стале хлеб скарынкаю ўніз, бо гэта дэманструе нешаноўныя адносіны да хлеба і лічыцца нават пажаданнем смерці бацькам. Жыццё і смерць падзяляюць прастору на "гэты" і "той" свет. Праз успаміны беларусы іх аб'ядноўваюць, уводзяць у кола сучаснасці тое ці тых, хто ўжо сышлі ў нябыт. Гэтая галіна духоўнага жыцця прасочваецца ў рытуальных дзеяннях, у абрадах памінання продкаў на так званыя Дзяды. Дзяды адзначаюцца



Репозиторий ВГУ

некалькі разоў на год: масленічныя, радаўніцкія, траецкія (духаўскія ці стаўроўскія), пятроўскія, змітраўскія.

Восеньскія (Змітраўскія, Вялікія, Асяніны, Тоўстая вячэра, Хаўтуры) дзяды самыя галоўныя. На іх абавязкова не проста прыбраць у хаце, прыгатаваць вячэру, запрасіць продкаў да стала, але і весці гаворкі пра продкаў: успамінаць учынкі і парады. Часам пасля вячэры родзічы весялілі Дзядоў: былі песні, танцы, маскарады. Пасля заканчэння вячэры свечку традыцыйна тушылі хлебнай скарынкай або блінам, бо існавала прыкмета: калі дым пойдзе ўверх – добра, а калі нахілена, асабліва ў бок дзвярэй, то ў сям'і нехта памрэ [13].

Аднак успаміны былі прымеркаваны не толькі да дзён памінання. Як расповед пра мінулае, пра традыцыі сям'і, роду, станоўчыя прыклады жыцця бліжэйшай суполкі, яны напаўнялі і штодзённае жыццё беларуса. Асэнсаваныя ўспаміны дазволілі скласціся сістэме народных прыкмет аграрнага календара (*"У Сямёнаў дзень да абеду ары, а пасля абеду рагатага з поля гані", "Сымон да варот, на дварэ сем пагод: сее, вее, круціць, муціць, зверху лье, знізу мяце",* існавала прыкмета "Калі на Апанаса бывае мяцеліца – чакаецца працяглая вясна і прыйдзецца нават "пунькі падмясці"), замацавалі каштоўнасныя традыцыі пашаны старэйшых *("Бацькоў любі, старых паважай", "Нічые такія слёзы, як матчыны: яны і ўтоляць, яны і шчасця выпрасяць"* [19]). Усё гэта служыла асновай інтэнсіфікацыі маральна-эстэтычнага ўспрыняцця свету.

Такім чынам, штодзённае жыццё ўвесь час поўніцца эмацыянальнасцю, эстэтычнае выкананне і маральнасць учынкаў спрыяюць добраму самаадчуванню і наадварот.

Немагчыма закрануць усю глыбіню народнай творчасці, аднак у цэлым мы схільны сцвярджаць, што творчы патэнцыял мастацтва беларускага народа абуджае эстэтычныя думкі і пачуцці, стварае культ гармоніі, развівае эмпатычныя здольнасці чалавека, вучыць саманазіранню і самавыхаванню. Гэта садзейнічае выхаванню эстэтычна развітога чалавека на ідэалах народнай эстэтыкі.

Галоўныя ўмовы рэалізацыі эстэтычнага выхавання ў народнай педагогіцы:

- прыроднае ўздзеянне,
- выхаванне ў працы,
- выкарыстанне творчага патэнцыялу народнага мастацтва,
- мары, забабоны, успаміны – найбольш эфектыўныя сродкі інтэнсіфікацыі маральна-эстэтычнага жыцця – дазваляюць вырашаць шмат выхаваўчых задач: ад абуджэння эстэтычных



Репозиторий ВГУ

пачуццяў, фарміравання эстэтычнай свядомасці да патрэбы змяняць рэчаіснасць па законах прыгажосці. Эстэтычныя пачуцці дапамагаюць інтэграваць народ у адзінае, пабудаваць жыццё па законах прыгажосці, творчасці і гармоніі.

## 1.3. Сутнасць эстэтычнага ідэала ў беларускай народнай педагогіцы

Эстэтычнае выхаванне ў беларускай народнай педагогіцы – састаўная, арганічная частка цэласнага выхаваўчага працэсу. Яго мэта – фарміраванне чалавека прыгожага знешне, фізічна здаровага, у адзінстве з прыгажосцю пачуццяў, думак, дзеянняў. Асновай гэтага працэсу з’яўляецца разуменне адзінства фізічнага і духоўнага, што можна разглядаць як арганізацыю супрацоўніцтва і імкнення да ідэала дасканалага чалавека. Каштоўнасны арыенцір, стымул эстэтычнага развіцця чалавека – эстэтычны ідэал.

Эстэтычны ідэал любога народа наогул, беларускага ў прыватнасці, павінен разглядаццца як паняцце канкрэтна-гістарычнае, з уласцівасцю дазмянення і неаднароднасці ў залежнасці ад сацыяльнай нішы, якую займае яго носьбіт.

Паколькі народная педагогіка існуе як спрадвечнае багацце народа, якое ўзнікла і функцыянуе ў яго асяроддзі, то ў сферу нашай цікавасці ўваходзіць найбольш шырокая частка насельніцтва Беларусі, творцы і нашчадкі гэтай педагогікі – працоўнае сялянства. Безумоўна, і рамеснікі, і працоўныя, і інтэлігенцыя, аднак менавіта сялянства ў асноўным захоўвае традыцыі і карыстаецца здабыткамі народнай педагогікі.

Пры разглядзе эстэтычнага ідэала ў межах народнай педагогікі мы лічым мэтазгодным звярнуцца да канцэпцыі В.Г. Кудраўцава, Т.І. Аліевай, дзе ў якасці параметральных ацэначных характарыстык дзіцячай субкультуры выдзяляюцца “кансерватызм”, “дынамізм” і “дэмакратызм”. Творчае выкарыстанне дадзенай канцэпцыі ў адносінах да тэмы нашага даследавання дазваляе весці размову аб дынамізме, дэмакратызме і кансерватызме як своеасаблівай шматбаковай характарыстыцы эстэтычнага ідэала. Мы прапануем мадэль нашага бачання эстэтычнага ідэала беларускага народа ў межах прадмета даследавання.

Характарызуючы эстэтычны ідэал, можна гаварыць аб яго дынамізме і кансерватызме адначасова.

Кансерватызм адыгрывае ролю стабілізатара грамадскіх адносін, у тым ліку і эстэтычных. Нашу думку мы грунтуем на тэзісе Ю.У. Чарняўскай аб тым, што “менавіта ў сферы эстэтыкі

выключнае значэнне мае арыентацыя на традыцыю, на тое, што ўжо трывала ўкаранілася ў жыцці. Гэта датычыцца і ўмоў існавання эстэтыкі і ў дачыненні да яе можна сцвярджаць, што асноўныя эстэтычныя праблемы былі адкрыты ўжо тады, калі індывід зразумеў сябе чалавекам, калі ён пачаў задумвацца над сэнсам свайго жыцця. Кожнае новае пакаленне адкрывае для сябе гэтыя праблемы і спрабуе іх вырашыць" [227, с. 90]. Праявы кансерватызму ў беларускім эстэтычным ідэале – маруднае з'яўленне ці знікненне пэўных фальклорных форм, форм мастацкай выразнасці. Яны трансфармуюцца, набываюць іншы сэнс, характар, але застаюцца ў народным жыцці. Напрыклад, сведчанне таму – аздабленне стрэх дамоў вільчыкамі. Першапачаткова яны выконвалі функцыю абярэгаў, але з цягам часу пераўтварыліся ў дэкаратыўны элемент, захаваўшы толькі эстэтычную функцыю. Помнікамі мастацкага слова народа застаюцца замовы. У жывым бытаванні яны былі вельмі распаўсюджаны на працягу вякоў і ўжываліся з утылітарнай мэтай: паспрыяць урадлівасці глебы, захаваць жывёлу, пазбавіцца ад хваробы, "прысушыць" ці "адсушыць" чалавека і г.д. Іх эфектыўнасць, лічылася, залежыць ад строгага выканання кананічнага тэксту і (у некаторых выпадках) спецыфічных дзеянняў. Песні шлюбнай тэматыкі, легенды захавалі памяць пра архаічныя ўзаемаадносіны інцэсту:

*...А хвала ж табе Бог,*
*Што з сястрою спаць не лёг.*
*Пойдзем, сястра, у поле*
*Рассеімся травою, –*
*А на брату – сіні цвет,*
*На сястрыцы – жоўценькі...* [19, с. 166].

Цікава, што менавіта гэты факт тлумачыць назву двухколернай кветкі "браткі".

Кансерватызм эстэтычнага ідэала беларусаў не дае магчымасці страціць набытыя каштоўнасці, нават пад уплывам ідэалаў іншых культур, іншых класаў, часоў.

Дынамізм у тым, што існуе шмат варыянтаў адной з'явы – казак, загадак, песень, узораў адзення, спосабаў упрыгожвання рэчаў і г.д. Напрыклад, бытуе шэраг загадак пра месяц, якія апісваюць яго як пэўную жывёлу: *"Лысы конь цераз вароты глядзіць"* [19, с. 340], *"З высокай дарогі глядзіць бычок крутарогі"* [19, с. 338], загадак пра цыбулю *"Сядзіць панна ў чырвоным кафтане. Як узялі разбіраць – сталі плакаць, наракаць", "Ляжыць грушка ў чырвоным кажушку. Хто яе ўкусіць,*

*той плакаць мусіць”* [Там жа, с. 341], прымавак пра любоў да родных мясцін: *“Дарагая тая хатка, дзе радзіла мяне матка”, “Мілы той куток, дзе рэзан пупок”* [Там жа, с. 341–345]. Спіс можна прадаўжаць бясконца.

Дынамізм і дэмакратызм спрыяюць зменнасці эстэтычнага ідэалу, уплыву на яго разнастайных акалічнасцей. Паспрабуем іх акрэсліць.

Эстэтычны ідэал узнікае як вытворная ад аб’ектыўных і суб’ектыўных перадумоў. З аднаго боку, гэта ўмова далейшага развіцця, а з другога – пэўная ідэя, суадносна з якой і ажыццяўляецца развіццё. Прасочым, на чым грунтуецца эстэтычны ідэал беларускага народа. Пачнём з аб’ектыўных матэрыяльных перадумоў, што ляжаць па-за чалавекам, але ўплываюць, фарміруюць яго жыццё.

Па-першае, гэта само жыццё, матэрыяльныя ўмовы існавання, а таксама геаграфічныя, біялагічныя, гістарычныя. Рэчаіснасць становіцца аб’ектам для ідэала толькі тады, калі чалавек уступае з ёй у актыўныя ўзаемаадносіны, калі ён актыўна яе пераўтварае. Аб’ектыўныя ўмовы існавання патрабуюць суадносных відаў дзейнасці, што дазваляюць жыць, выкарыстоўваць прыродныя багацці. Адсюль вынікаюць асноўныя віды працы: земляробства (вырошчванне злакавых, ільняных культур, гародніны), жывёлагадоўля (догляд жывёл), дробная хатняя вытворчасць. Прыродныя ўмовы даюць магчымасць развіцца такім рамёствам, як ганчарства, ткацтва і г.д. Геаграфічнае становішча беларускага народа ў зоне змешаных лясоў, умеранага кантынентальнага клімату, прысутнасць вялікай колькасці азёр, рэк, балот, лясоў, разнастайнага жывёльнага свету, характэрнага для дадзенага прыроднага комплексу, таксама спрыяе развіццю спецыфічных відаў дзейнасці, узнікненню асаблівай культуры.

Геаграфічныя ўмовы накладваюць адбітак на біялогію чалавека, можна сказаць, садзейнічаюць узнікненню расавых адрозненняў. Антрапалагічная розніца беларуса і жыхара паўночнай ці паўднёвай краіны нават у межах Еўропы, ёсць і будзе аб’ектыўнай перадумовай існавання рознага роду эстэтычнага ідэала фізічнага вобліку чалавека. Хто прыгожы для беларуса? Светлыя (нават назва якая – ільняныя!) валасы, акруглы твар з прамым ці трохі курносым носам, з шырокапастаўленымі таксама ж светлымі (блакітнымі або шэрымі) вачамі, з сярэдняй паўнаты чырвонымі вуснамі, белай скурай, стройны і мускулісты чалавек, спрытны і вынослівы, прыстасаваны да працоўнай дзейнасці [103]. Свой адбітак на асаблівасці індывіда накідае нацыянальная прыналежнасць. Прадстаўнікі адной нацыянальнай еднасці

Рэпазіторый ВДУ

схільны думаць і дзейнічаць суадносна з нацыянальнымі традыцыямі, нормамі і правіламі паводзін, якія складваліся стагоддзямі. Як адзначае А.А. Грымаць, "людзі, якія выхоўваліся на выпрацаваных нацыяй каштоўнасцях і традыцыях, кіруюцца імі як асноўнымі нормамі паводзін і адносін" [131, с. 9].

Асаблівасці надвор'я, чарговасць сезонных змен у прыродзе па-свойму ўплываюць на жыццё, дзейнасць, а гэта значыць, і на станаўленне, і функцыянаванне эстэтычнага ідэала. Пераход зімы ў вясну, лета ў восень, змены жыццёвага рытму згодна з азначаным кругазваротам можна прасачыць у гаспадарча-бытавой дзейнасці людзей: вясна, абуджэнне прыроды – гэта час падрыхтоўкі да сяўбы, абрадаў і свят, што прысвечаны ажываючай зямлі і расліннасці. Пералічым толькі некаторыя назвы – "Гуканне вясны", "Саракі", "Камаедзіца", "Вялікдзень" і г.д.

Лета, час росквіту прыроды і ў той жа момант – сенакос, праца ў агародзе, садзе, жніво: "*Лета праляжыш, зімой з торбай пабяжыш"* [58, с. 25], *"Сей хлеб, – не спі, будзеш жаць – не станеш драмаць"* [Там жа, с. 27]. Адначасова летам надыходзяць, мабыць, самыя прыгожыя святы, што славяць моц і велічнасць прыроды, працалюбства чалавека. Немагчыма ўявіць культуру Беларусі без Купальскага свята, жніўных абрадаў, што "складалі аснову самай цяжкай працоўнай дзеі, падчас якой з гонарам выстаяць дапамагала радаснае ўсведамленне, што здабываецца, "творыцца" хлеб, каравай – сімвал жыцця, аснова дабрабыту, паказчык багацця, заможнасці, гаспадарлівасці" [116, с. 128].

Восень – час завядання, памірання: *"Асенняе сонца, як удаўцова сэрца"* [58, с. 30], *"Прыйшоў верасень – супакоіў прыроду"* [Там жа, с. 33], *"У лістападзе раніца з прыцемкамі сярод дня сустракаецца"* [Там жа, с. 37]. Беларус імкнецца скончыць усе сельскагаспадарчыя работы, сабраць ураджай, падрыхтаваць зямлю да зімовага адпачынку. Са змяненнем прыроднага настрою становіцца іншай мелодыка і настрой песень, што выконваюцца падчас апошніх работ на Пакровы, на Дзяды. Песенныя творы становяцца больш працяжнымі, сумнымі, як галасы прыроднай самоты, развітання з цяплом, птушкамі, зелянінай. На Змітраўскіх Дзядах ідзе асэнсаванне пражытага года, свайго жыцця на фоне станоўчых прыкладаў продкаў. Успамінаюцца кроўныя як мага далей у мінулае, "не менш чым да дзесятага калена" [116, с. 156]. Абавязкова пэўная падрыхтоўка да свята: "У гэты дзень усе хатнія мыліся ў лазні і пакідалі крыху вады і венік для дзядоў. Не шкадуючы прыпасаў, гатавалі вячэру. Продкаў трэба было добра пачаставаць, а потым і павесяліць, іначай яны нашлюць неўраджай і іншыя напасці" [13, с. 146].



Рэпазіторый ВДУ

Зіма – час доўгіх начэй, маразоў і халоднага снегу. Жыццё замірае, але не супыняе свой рух. Гэта пара падрыхтоўкі да вясны, выкарыстання ўраджаю, сустрэч. У асноўным зімой прадзецца лён (звычай супрадкаў, вячорак), вядзецца рамонт прылад працы да веснавых работ. "*Рыхтуй сані летам, а калёсы зімой,*" – кажуць у народзе. На гэты ж час прыпадаюць маляўнічыя святы "Каляды", "Масленка", якія выклікаюць эстэтычныя пачуцці, адлюстроўваюць жаданне чалавека жыць шчасліва. Яны напоўнены працоўнымі і шлюбнымі матывамі:

*Ой, у лузе, лузе, красна каліна,*
*Святы вечар!*
*А красней за таго Ганна ў таткі.*
*Святы вечар!*
*Маладая Ганначка па двару хадзіла,*
*Святы вечар!*
*Па двару хадзіла, увесь двор скрасіла!*
*Святы вечар!* [19, с. 92].

Мастацтва пашырае час: з яго дапамогай чалавек аднаўляе мінулае і робіць спробу зазірнуць у будучыню. У пэўны момант чалавека апаноўваюць пэўныя ўражанні, эмоцыі, думкі. Яго жыццё памнажаецца мастацтвам на вопыт народа, традыцыі творчасці мінулых пакаленняў і ахоплівае праз гэта бязмежную часавую прастору. Такім чынам чалавек паядноўваецца з духоўным вопытам сваіх продкаў, дасягае высокіх духоўных вяршынь.

Наступная матэрыяльная перадумова, што ўздзейнічае на фарміраванне эстэтычнага ідэала беларуса – вытворчая працоўная дзейнасць. Умовы існавання такія, што толькі актыўнае падпарадкаванне прыроды для сваіх патрэб (вырошчванне хлеба і гародніны, догляд жывёлы) дае магчымасць прымальнага жыцця. Інакш кажучы, ні паляванне, ні рыбалоўства не выступаюць у беларускім асяроддзі асноўнай працай (у адрозненне ад прадстаўнікоў паўночных народаў). Гэта адпачынак, забава. Таму і кажуць у народзе, перадаюць сваеназіранні і погляды: *"Рыбак рыбу вудзіць, ды век нудзіць", "Хто палюе ды рыбачыць, той хлеб рэдка бачыць".* Адносіны сялянства да гэтых спраў даволі негатыўныя. Жыццё заснавана на сельскай гаспадарцы, доглядзе скаціны, вырабе неабходных рэчаў. Гэта цяжкая праца, якая патрабуе штодзённых намаганняў і напружання ўсіх сіл: *"Без клопату і без поту наш брат не пражыве", "Гаспадарку вадзіць – не разінуўшы рот хадзіць", "Дзе араты плача, там жняя скача", "Калі ўлетку на сонцы не папячэшся, то ўзімку*



Репозиторий ВГУ

*з холаду натрасешся", "Не вымем карова малако дае, а языком", "Як накорміш, так і надоіш", "Пасееш – то будзе капа, а не пасееш – то ні снапа"* [17; 19] і г.д.

Перадумовай для станаўлення эстэтычнага ідэала можа служыць уяўленне беларусаў аб тым, што праца павінна прыносіць карысць і задавальненне таму, хто яе выконвае. Падуладнасць селяніна пану, вымушаныя работы на яго пакідаюць незадаволенасць у душы. Аб гэтым спяваюць у песнях *("Да мы позна з поля ідзём, // Да прыганятага клянём"* [19, с. 20]), гавораць у прымаўках *"Прымусовая работа самая цяжкая", "Дзе адзін пануе, там сто гаруе", "На службе хлеб смачны, але не спажытны"* [19]. Такім чынам, свабодная, творчая асэнсаваная праца – аснова для фарміравання эстэтычнага ідэала народа. Зыходзячы з таго, што сялянская гаспадарка ў асноўным натуральная, людзі мала выкарыстоўваюць прамысловую прадукцыю, у таваразвароце пераважаюць вырабы менавіта народных промыслаў. Народнае мастацтва развіваецца "…пераважна ў выглядзе хатняй вытворчасці, на ўласныя патрэбы" [180, с. 19].

Мы разглядаем эстэтычны ідэал беларускага сялянства, бо большасць насельніцтва складаюць менавіта сяляне – вытворцы і спажыўцы мясцовай прадукцыі, і іх погляды на прыгажосць, на разуменне сутнасці эстэтычнага мы лічым вядучымі пры вызначэнні народнага ідэала. У той жа час намі не адвяргаецца ўздзеянне ідэалаў вышэйшага саслоўя, але адзначым, што "шляхта, магнаты, заможнае гарадское насельніцтва, царква з XIII стагоддзя імкнуцца да заходняй культуры, засвойваюць і працуюць у традыцыях еўрапейскіх напрамкаў". Аднак, як сцвярджае Я.М. Сахута, "у традыцыйнай народнай культуры ўплыў Захаду праявіўся слаба, ёй больш імпанавала культура літоўскіх плямёнаў… У народным побыце беларусаў, які доўгі час захоўваў архаічныя рысы і перажыткі натуральнай гаспадаркі, гэтая традыцыя нібы захавалася аж да XIX ст., а некаторыя яе рысы адгукаюцца і ў нашы дні" [180, с. 16]. Дададзім, што рамёствы, цесна звязаныя з традыцыйным народным мастацтвам, праца народных майстроў дазволілі надаць агульнаеўрапейскаму стылявому напрамку на Беларусі спецыфічную беларускую трактоўку.

Мы закранулі асноўныя матэрыяльныя перадумовы, што ўплываюць на эстэтычны ідэал. Звернемся да духоўных перадумоў.

Кожны чалавек валодае індывідуальнай свядомасцю. Яго развіццё прадугледжвае ўзнікненне на пэўным этапе самасвядомасці, у тым ліку і эстэтычнай, якая цесна звязана з эстэтычным ідэалам. У гэтым выпадку ўзаемадапаўняльны ўплыў



Рэпазіторый ВДУ

ідэала на эстэтычную свядомасць і эстэтычнай свядомасці на ідэал. У развіцці аднаго чалавека спачатку эстэтычны ідэал уздзейнічае на фарміраванне яго эстэтычнай свядомасці, а потым ужо сфарміраваная эстэтычная свядомасць асобы пачынае ўздзейнічаць на ідэал грамадства. Такім чынам, эстэтычны ідэал грамадства можа змяняцца, калі мяняецца эстэтычны ідэал членаў суполкі. Паўстае пытанне, што ўздзейнічае на эстэтычную самасвядомасць чалавека, акрамя грамадскага эстэтычнага ідэала, паколькі ён, у сваю чаргу, можа змяняцца пад уплывам эстэтычнай самасвядомасці чалавека. Звернемся да глыбінных формаў свядомасці: працоўнай, рэлігійнай, маральнай, нацыянальнай. Яны цесна ўзаемазвязаны, аказваюць уплыў і ўзаемаабумоўленыя.

У выніку рэальнага ўзаемадзеяння чалавека са светам, на аснове яго дзейнасці ў межах грамадска-гістарычнай практыкі ўзнікае свядомасць чалавека. Разуменне важнасці, неабходнасці працы, пабудова працоўнай дзейнасці і яе развіццё ад больш простых форм да больш складаных садзейнічае станаўленню працоўнай самасвядомасці: *"Усё жывое трудзіцца", "Дзе справа, там і слава", "Праца не паганіць чалавека, а корміць, поіць і вучыць", "Хто хоча шчасліва жыць, той працу павінен любіць"* [17; 19]. У працэсе працы набывае развіццё і ўдасканаленне мова, чалавек усведамляе сябе як носьбіта маральных якасцей, адказнасці за свае паводзіны перад іншымі. Нездарма кажуць у народзе *"Чаго сабе не хочаш, таго і другому не рабі", "Зробіш людзям дабро – і цябе адгодзяць", "Шчыраму і Бог дапамагае"* [Там жа].

Гэта разуменне цесна звязана з рэлігійнай самасвядомасцю беларуса. Мітрапаліт А. Увядзенскі вызначае тры тыпы веры і веруючых: інтуітыўная вера, вера з меркаванняў маралі і эстэтычная. "Любы з гэтых варыянтаў веры – каштоўнасны, як адчуванне Бога, які знаходзіцца побач і верыць у цябе, ці прытрымліванне чужога сумлення; альбо асэнсаванне таго, што Сусвет вакол цябе – не бяздушная машына без машыніста, а адзіны адухоўлены свет" [227, с. 107]. Мы лічым, што ў беларусаў пераважаў трэці, эстэтычны тып веры і вернікаў. Важна адзначыць, што знешне рэлігійнасць у народзе не афішыравалася. Бог у душы, у сэрцы, людзі жывуць, карыстаючыся запаведзямі, якія распаўсюджваюцца ў афарыстычнай форме прыказак і прымавак, напрыклад: *"Бацькоў любі, старых паважай", "Хоць бедны, ды чэсны", "Хто бацьку і маці зневажае, той дабра не знае", "Ад добрага не ўцякай і благога не рабі", "Руку, нагу пераломіш – зжывецца, а душу пераломіш – не зжывецца", "Хоча чалавек прапасці – пачынае красці", "Хто попрасту робіць, таму анёл пасобіць, а хто пачынае хітрыць, к таму чорт паляціць", "Няма*



Рэпазіторый ВДУ

*горай, як завісныя вочы”* [17; 19]. Чалавек сам адказны за свае ўчынкі: *“Бог з пугаю не стаіць, кожны, як захочэ, мажэ жыць”* [182, с. 236], самае галоўнае – шчырасць ва ўзаемаадносінах з Богам: *“Не таго Бог выслухае, хто ўмее добра прасіць, а таго, хто не моліцца, а толькі шчыра ўздыхне да падыме вочы да Бога”* [Там жа, с. 237].

Паколькі на тэрыторыі Беларусі існавала двухвер’е ці, па-іншаму, “народнае праваслаўе” (І.І. Крук азначаную з’яву параўноўвае са слаёным пірагом свядомасці, “у якім чаргуюцца, узаемадапаўняюцца і ўзаемаўзбагачаюцца язычніцкая і хрысціянская культуры” [101, с. 8]). Мы схільны лічыць, што мэтай рэлігійнасці былі ў вялікай ступені эстэтычныя запатрабаванні асобы. Мы падтрымліваем пазіцыю В.П. Кошалевай [169] у ацэнцы эстэтычнай значнасці малітваў: яны прыгожыя і паэтычныя па форме, глыбокія па змесце. Завучванне на памяць, распяванне развівае слых, памяць і мову дзяцей, дапамагае выказаць душэўны настрой. Да таго ж сваё вучэнне царква распаўсюджвала ў народзе ў асноўным звыклымі для традыцыі шляхамі: у першую чаргу – вусным і ў другую – зрокавым. Богаслужэнне разлічана на слуханне тэксту і суперажыванне яму; гэта тэатральная дзея з моцным эмацыянальна-псіхалагічным эфектам, у якім кожны хрысціянін прымае непасрэдны ўдзел. Такім чынам, беларускі народ да сваіх, звыклых багоў прыняў каштоўнасці хрысціянства, якія ў пэўнай ступені пашырылі духоўна-эстэтычныя пошукі чалавека. Асіміляцыю можам убачыць у народным календары, які звязаў галоўныя ўрачыстасці са святамі хрысціянства, аб чым падрабязна піша І.І. Крук [99]. Святы Георгій-пераможац (Ягорый, Юрый) функцыянальна замяніў Ярылу, Святы Ілля – Перуна, Святыя Улас (Аўласій), Мікола – Вялеса. Практычна адначасова ўзнікае і развіваецца нацыянальная свядомасць, як любові да сваёй мовы, зямлі, веры: *“Хто мову і веру мяняў, той не толькі сябе, а і маці прадаваў”, “На роднай зямлі – як на камлі”, “Благая тая птушка, што свайго гнязда не пільнуецца”, “Далёкая старонка без ветру сушыць”, “Жонка як жонка, але мілей родная старонка”, “З’ехаў на чужыну, як зваліўся ў дамавіну”, “Лепей у сваіх людзях з голаду паміраць, чым у чужых людзях золата збіраць”, “Чужая старана тугою арана, слёзкамі засявана”* [17; 19].

Можна сцвярджаць, што эстэтычны ідэал ёсць нейкая інтэгратыўная якасць, што ўтрымлівае матэрыяльную (умовы жыцця, геаграфічны стан, біялагічныя асаблівасці, вытворчыя адносіны) і непасрэдна духоўную кампаненту (працоўная, маральная, рэлігійная, нацыянальная самасвядомасць).



Репозиторий ВГУ

Узнікае пытанне: эстэтычны ідэал – з'ява суб'ектыўная, параджэнне чалавечай свядомасці ці аб'ектыўная, што адлюстроўвае тое, што існуе ў свеце па-за чалавечым успрыняццем? Адказаць на яго магчыма, вызначыўшы пазіцыю: прыгажосць суб'ектыўная ці аб'ектыўная з'ява.

Калі прыняць пазіцыю аб'ектыўнасці прыгажосці, а разам з тым і эстэтычнага ідэала, то вынікам будзе разуменне таго, што народ не выпрацоўвае свой уласны эстэтычны ідэал, а пастунова набліжаецца да той яго часткі, што адчыняецца яму ў працэсе разнастайнага пазнання свету і самапазнання. Інакш кажучы, эстэтычны ідэал робіцца больш канкрэтным таму, што чалавек пазнае яго праз гарманічныя зносіны са светам, творча-сузіральную пазіцыю, у якой беларус выступае дбайным, руплівым гаспадаром.

Аднак правамерна існаванне і іншай канцэпцыі. Эстэтычны ідэал ёсць узаемадзеянне аб'ектыўнага з нашай псіхікай. У прапанаванай сітуацыі народ перапрацоўвае суб'ектыўныя ўражанні ў ідэал. На агульнай выснове зыходным матэрыяле розныя асобы працуюць па-рознаму і, натуральна, атрымліваюць розны вынік. Чалавек – актыўны творца, які змяняе свет, а праз гэтыя змяненні ўносіць нешта новае ў эстэтычны ідэал.

На наш погляд, першая пазіцыя – існаванне аб'ектыўнай прыгажосці ў свеце, якая пастунова адкрываецца чалавеку ў працэсе пазнання, далучэння да прыроды больш адпавядае ўзнікненню і развіццю эстэтычнага ідэала беларускага народа. Чалавек шануе прыроду, шмат у чым абмяжоўвае і стрымлівае сябе, і гэта дазваляе выжываць у складаных абставінах. Пастунова ствараецца вусная энцыклапедыя жыцця – багатая паэтычная спадчына і складаная сістэма абрадаў, якія (згодна з напрацоўкамі Я. Крука) строга рэгламентавалі ўзаемаадносіны з наваколлем і, абапіраючыся на заўважаную рытмічнасць і паўтаральнасць прыродных з'яў, маглі прагназаваць, вызначаць пэўную ўзаемазалежнасць паміж імі [99; 100]. Яскравыя прыклады таму – народныя святы і абрады, фальклор. У фальклоры В.Д. Ліцьвінка бачыць мастацтва перыяду дзяцінства чалавечага грамадства. У язычніцкі перыяд чалавецтва не гвалціла акаляючае асяроддзе, не ставіла сябе вышэй за прыроду, адчувала і бачыла сябе часцінкай Сусвету [116]. Так, мэта беларуса – гармонія з акаляючым светам. Яго будынкі, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, фальклорныя творы, абрады, звычаі, святы – усё прасякнута адчуваннем прыгажосці свету, якую чалавек імкнецца спасцігнуць, выкарыстаць і захаваць. Адкрываючы сваё сэрца насустрач прыгажосці свету, чалавек пастунова асэнсоўвае, фарміруе ідэал прыгажосці. Такое далучэнне да ідэала магчыма праз сузіранне жы-



Репозиторий ВГУ

вога свету, замацаванага ў святах, абрадавых дзеяннях. Зноў звернемся да Купалля. Удзельнікі свята назіраюць раніцай за “ігрой сонца на паверхні вады”, як “яно дзялілася на некалькі частак, якія то разыходзіліся, то сыходзіліся на вадзе” [116, с. 123].

Даволі часта на святах варожаць аб будучыні, звяртаючыся да прыродных сродкаў і з’яў. На тым жа Купаллі дзяўчаты пускаюць вяночкі па рацэ і па іх паводзінах мяркуюць аб сваім жыцці. Па стане прыроды на Вадохрышча, Грамніцы, Макея мокрага, Сямёна-летаправодца, Арыну-плакунню жураўліную, Пакровы вызначаюць будучае надвор’е. Народ не проста назірае, адчувае, а арганічна ўбірае прыгажосць наваколля. Людзі кажуць: *“Майская травіца – нібы маладая дзявіца”, “Ранішняя раса харашэй вячэрняй”, “Прыйшоў верасень – супакоіў прыроду”, “Вясну хваляць за дажджы і сонца, а лета – за снапы і вазы”* [17; 58].

Цікавыя чалавечыя адносіны да вясёлкі. Згодна з народнымі паданнямі, вясёлка апускае адзін канец у мора, раку, луг і цягне ваду з усім, што ў ёй ёсць. Вада падымаецца ў хмару, адкуль, як праз сіта, прасейваецца, і дождж падае на зямлю… Бог даў вясёлку дзеля таго, каб не было патопу, бо яна ведае меру вады для дажджу. Пакуль яна не накачае вады, дождж не пойдзе. Вясёлку ў народзе ўспрымалі лукам перуна, з якога грамавержац пасылае на зямлю вогненныя стрэлы – маланкі. Па асаблівасцях вясёлкі і часе яе ўзнікнення на небе прадказвалі будучае надвор’е [13, с. 110].

Чалавек верыць, што прырода дапаможа, падзеліцца сваім харалством. Таму чацвёртага лістапада, на Казанскую, “непрыгожыя дзяўчаты раніцай беглі ў лес, шукалі ліст, на якім затрымаўся іней, глядзелі ў яго, як у люстэрка, і верылі, што ўся хвароба з іх твару сыдзе” [58, с. 143]. Гармонія рэчаіснасці, адбіўшыся на эстэтычным ідэале беларуса, аказвае ўплыў на ўсю яго гаспадарча-бытавую дзейнасць.

Звернемся да нацыянальнага касцюма. Традыцыі, згодна з эстэтычным ідэалам, вызначаюць, якое адзенне насіць у будні, якое ў святы, урачыстыя дні. Паколькі праца – аснова жыцця народа, то “ў самае прыгожае адзенне прыбіраліся да працоўных урачыстасцей: выгану жывёлы на “юр’еўскую расу”, на свята Першай баразны, Першага снапа на ніве або Першага пакосу на сенажаці. Абрадавы касцюм перыяду ўборкі ўраджаю ўпрыгожваўся перавяслам са жмені жыта, вянком з лепшых каласоў і траў” [132, с. 54].

Спрадвечная еднасць людзей з прыродай становіцца крыніцай земляробчага календара беларусаў. Чалавек атаясамлівае сябе з жывым светам і не імкнецца вылучыцца або ўзвысіцца над ім. Наваколле падаецца жывым і адухоўленым,



Рэпазіторый ВДУ

здольным да разумных паводзін. Мова народа захоўвае рэшткі антрапамарфізму. Вельмі паважліва ставіцца беларус да крыніцы жыцця і цеплыні – Сонца. Усведамленне цыклічнасці сонечнага руху замацоўваецца ў фальклоры (прыказках, загадках, легендах), святах. Яны, увогуле, выступаюць вехамі ў жыцці беларуса-земляроба, адлюстроўваючы галоўныя пункты сонечнага руху: раўнадзенства (“Вялікдзень”, “Дзяды”), сонцаварот (“Каляды”, “Купалле”). На гэтыя важныя моманты скіроўвае ўвагу В.Д. Ліцьвінка. Усе мастацкія сродкі гадавых свят створаны пад уздзеяннем прыродных біярытмаў. Яны адлюстраваны ў гуках, рухах, словах, рытуалах. Нават мелодыі песень гарманіруюць з прыроднымі гукамі пэўнай пары года. Магчыма, гэта і стварае правіла “святкаваць у пару” [116].

Паказальны і эстэтыка-маральныя адносіны чалавека да прыроды. Разгледзім іх на прыкладзе траецка-сёмушных святкаванняў. Кожная сям’я аздабляла свой падворак і хату маладой зялянінай бярозы: “Бярозу ставілі і ў двары перад кожным акном хаты, што павінна было сімвалізаваць улучанасць кожнага з трох пакаленняў сям’і, якія жылі пад адным дахам, у чарговы кругазварот жыцця, у веснавы вір прыроднага абуджэння і росквіту” [13, с. 56]. На Сямік дзяўчаты ішлі ў бярозавыя гаі на абрад “завівання бярозкі”. Дзяўчаты сплятаюць вяршынямі дзве маладыя бярозкі, каб атрымалася рытуальная арка, праз якую потым праходзяць, каб “пакуміцца”. Гэты рытуал сімвалізаваў змену сацыяльнага статуса ўдзельнікаў. А праз тыдзень “тыя ж дзяўчаты ішлі ў лес расплятаць бярозкі, бо лічылася, што дрэва можа пакрыўдзіцца і ўчыніць шкоду” [99, с. 114]. Мы бачым, што людзі выкарыстоўваюць прыродныя сродкі, каб упрыгожыць, узбагаціць свае святы, але робяць гэта вельмі акуратна, імкнучыся захаваць наваколле ў яго спрадвечным стане і прыгажосці. На Берасцейшчыне “існаваў вясельны рытуал: вяртаючыся з-пад вянца, вясельны картэж праязджаў пад жывой бярозавай аркай, утворанай пераплеценымі вершалінамі бяроз, што раслі паабапал дарогі. Гэты абрад сімвалізаваў апошнюю прыжыццёвую змену сацыяльнага статуса маладых, што ўступалі ў шлюб” [13, с. 56].

Прыгадаем абрад “Гукання вясны”, які выконваюць з надыходам першага цяпла. На пагорках, каб быць бліжэй да неба, да птушак, спяваюцца песні. Вяснянкі – адгалосак старажытнага ўяўлення, што птушкі “прынясуць на сваіх крылах цяпло, вясну. Таму трэба іх паклікаць” [100, с. 40] – голасна, прыгожа. Адчуванне аднаўлення жыцця, перажыванне радасці з гэтай нагоды патрабуе пэўных практычных дзеянняў, каб замацаваць, паглыбіць пачуцці, што выліваецца ў цікавы і маляўнічы абрад.

Рэпазіторый ВГУ

Вясну гукалі з караваем, з “жаваранкамі”, вянком з барвянка і, абавязкова, з песнямі.

Беларускі эстэтычны ідэал выпрацоўваецца дзякуючы прыгажосці, якая ўзбагачае душу і сэрца, дае штуршок да творчасці. Але на яго фарміраванне ўплывае яшчэ адна акалічнасць. Месцазнаходжанне беларускіх зямель як своеасаблівы калідор паміж каталіцкімі і праваслаўнымі краінамі, на сутыку Усходняга і Заходняга свету садзейнічае ўздзеянню розных культур. Адкрытасць, кантакт з іншымі нацыямі, што праходзіў як непасрэдна, так і апасродкавана праз кантакты шляхты, кіруючай вярхушкі, дазваляе гаварыць аб уплыве інтэрнацыянальнага на эстэтычны ідэал нашага народа. Належыць звярнуць увагу на тое, у якой прапорцыі знаходзяцца суадносіны нацыянальнага і інтэрнацыянальнага, калі іншаземнае прымаецца і засвойваецца, у якім выпадку можна казаць аб яго рашучым непрыняцці. Паколькі Беларусь не толькі размяжоўвае Рымскую і Візантыйскую культуры, але і знітоўвае дзве хрысціянскія рэлігіі: праваслаўную і каталіцкую, то размову трэба весці і аб іх уздзеянні на эстэтычны ідэал беларуса, бо ў мінулым менавіта рэлігійныя адрозненні ўплывалі на станаўленне той ці іншай нацыянальнай культуры. Мы не можам прыняць пункт гледжання М. Вебера аб “закрытай” культуры, якая не прымае ніякіх элементаў іншых культур. На наш погляд, для беларусаў характэрна наступная пазіцыя, што сфарміравалася яшчэ з часоў прыняцця хрысціянства: на ўласныя эстэтычныя здабыткі накладваюцца іншыя эстэтычныя каштоўнасці. Але толькі тое, што ў корані не проціпастаўляецца духу народнага ідэала, а дапаўняе, пашырае ці развівае яго, арганічна ўваходзіць у яго склад – застаецца. Калектыўная свядомасць прымае толькі тое, што не супярэчыць свайму, не размывае падмурак асабістай культуры. Калі ж гэта ўсё ж такі адбываецца, то можна казаць аб страце нацыяй сваёй індывідуальнасці, аб яе заняпадзе.

Вернемся да часоў прыняцця хрысціянства. Адвечная, што ідзе ад этнічных каранёў беларусаў, культура сустрэлася і аб’ядналася з хрысціянствам. Гэты працэс ішоў працяглы час і быў дастаткова няпросты. Але суіснаванне дзвюх традыцый доўгі час побач дазволіла ім да ХХ стагоддзя ўзаемадапоўніцца і ўзаемаўзбагаціцца. Цікава, што, успрыняўшы праваслаўе, беларускае сялянства як бы аб’ядналася з ім. І хаця існуе шмат католікаў, каталіцкіх храмаў, іншыя канфесіі, усё ж Беларусь лічыцца праваслаўнай краінай, а самі беларусы – праваслаўнымі. Магчыма, такая рэлігійная выбіральнасць пайшла ад таго, што ідэйнае напаўненне праваслаўя аказалася бліжэйшым да эстэтыч-



Репозиторий ВГУ

нага ідэала беларуса. Святочная прыгажосць храмаў, што ўзвышае чалавека, спакой, гарманічная еднасць з прыродай, адчуванне духоўнай спагады, сонечнасць і ўзнёсласць дазволілі беларусам зрабіць свой выбар на карысць праваслаўя, хаця і са сваімі язычніцкімі элементамі. Разгледзім некаторыя прыклады.

На вузлавыя моманты язычніцкага календара накладваліся галоўныя святы хрысціянства, што стварае асаблівы нацыянальны каларыт. Таму святочная абраднасць мае свой спецыфічны выгляд, пацвярджэннем чаму з'яўляюцца шматлікія факты. Аб дахрысціянскай аснове беларускай культуры сведчыць купальскае свята, сутнасць якога мала змянілася за час яго існавання. Купалу як міфічны вобраз увасабляла сабою лялька – жаночае чучала, якое насілі, скакалі з ім, запальвалі і тапілі ў вадзе. Сённяшнія даследчыкі звязваюць назву свята з пакланеннем Сонцу, якое ўвасаблялі ачышчальныя купальскія вогнішчы, якія дайшлі з часоў матрыярхату, ачалавечаныя вобразам жанчыны-Купалы ці яе дачкі [116]. Да свята рыхтаваліся з раніцы – на лузе збіраліся кветкі і зёлкі, якія ў гэты дзень набывалі незвычайную моц. Потым, пасвечаныя ў царкве, яны служылі лекамі на працягу года. З кветак плялі вянкі для варажбы, кветкі ўторквалі ў сцены дома на лёс кожнага з сямейнікаў. На пагорак ці паляну зносілі ўсялякую старызну для купальскага вогнішча. Для яго распыльвання вынаходзілі жывы агонь – церлі кавалкі дрэва. Полымя святочнага агню надзялялася ачышчальнай сілай ад злых духаў, праганяла смерць, хваробы. Моладзь вадзіла карагоды, скакала вакол вогнішча, спявала, усе частаваліся. Апоўначы моладзь ішла ў лес на пошукі папараць-кветкі, на якую ў гэты момант зыходзіў агонь Перуна, яна ўспыхвала на некалькі імгненняў яркім цветам. Калі чалавек паспее ўхапіць яе ў гэты момант, "той будзе мець усё, чаго толькі душа пажадае". Святкаванне доўжылася да раніцы, калі людзі глядзелі, як уздымаецца сонца, як яно "купаецца", "іграе". Такім чынам, у свяце Купалы спалучыліся розныя культы – сонца, агню, вады, расліннасці. Хрысціянская традыцыя святкавання часу нараджэння Іаана Хрысціцеля не вынішчыла культу. Замацаванне розніцы свят, гісторыка-культурныя асаблівасці нашай самасвядомасці, вынікае з песні: "Сёння Купалле, а заўтра – Ян… [101].

Узгадаем яшчэ адно свята – "Стрэчанне-Грамніцы". Гэта зімовае свята народнага календара. Хрысціянская царква святкуе "Сретение Господне". У гэты дзень сустрэліся Сімяон з Іісусам Хрыстом (Стары і Новы Запаветы). Але народ перайначыў назву і з'явілася "Стрэчанне", а побач і новы сэнс – сустрэча зімы з вясною:

Рэпазіторый ВДУ

*А ў нас сёння Стрэчанне, Стрэчанне,*
*Зіма з летам стрэлася, стрэлася,*
*Лета зіму піхнула, піхнула*
*І ножачку звіхнула, звіхнула.*
*Зіма пайшла плачучы, плачучы,*
*А лета пайшло скачучы, скачучы* [116, с. 26].

А.У. Русецкі прыводзіць наступны расповед пра гэта свята: *“На Стрэчанне зіма з летам сустрэлася і з дарогі не зварочвае, а лета яе ў зубы б’е: зубы трашчаць, дзеці, збіраючы іх, пішчаць” (гэта значыць, ледзяшы са стрэх павіслі)* [58, с. 86]. Даецца эмацыянальнае апісанне як стану душы, якой надакучылі маразы і цемра, так і стану прыроды – дзённым адлігам, паводзінам дзяцей у гульнях.

Яшчэ адна назва свята – Грамніцы – звязана з імем старажытнага бажаства Грамоўніка, які не толькі не ўчыняў шкоды, а наогул, быў абаронцам сялян, лічыўся богам навальніц і дажджоў. Калісьці ў старажытнасці, каб адагнаць злых духаў ад чалавека, вялікую ролю надавалі шуму, грому (адсюль пахавальныя і вясельныя галашэнні, званочак пад дугой у каня і г.д.). М. Нікіфароўскі пісаў, што назва атрымалася ад таго, што ў гэты дзень Святы Юрый выпрабоўвае на чарцях сваю стрэльбу. Прыняцце хрысціянства перанесла магічна-ахоўную ролю шумугрому на свечкі, аднак захавала іх язычніцкую назву – “грамнічныя”, або “грамніцы”. Менавіта іх трэба было захоўваць ў хаце, каб засцерагчы маёмасць ад маланкавага пажару.

Таксама лічылася, што ўжо могуць быць грымоты і навальніцы і прайшла палавіна зімы (*“На Грамніцы палавіна зіміцы”, “Грамніца – хлебу палавіца, а корму траціна”, “Да Грамніцы не скідай з рук рукавіцы, а як прайшлі Грамніцы, то не патрэбны рукавіцы”*).

Нагадаем свята Вялеса – апекуна свойскай жывёлы. Мэтай царквы было вынішчыць культ Вялеса са свядомасці беларусаў. Таму гэты дзень святкуецца як дзень шанавання памяці свяшчэннапакутніка Уласія. Але ж і за хрысціянскім святам захавалася магічная роля папярэдніка. Таму І.І. Крук адзначае: “Вельмі часта можна сустрэць іконы, на якіх Уласій сядзіць на беразе рэчкі або ідзе па даліне ў акружэнні хатняй жывёлы” [100, с. 49].

І такіх прыкладаў шмат. Гэта і роспіс велікодных яек – старажытны від народнага мастацтва. Пафарбаванае ў чырвоны колер яйка сімвалізуе ў хрысціянскай традыцыі кроў Ісуса Хрыста, што пралітая Ім дзеля збаўлення чалавека ад грахоў. Яйка звязана і з аграрнымі святамі. У яго вобразе ўвасоблена ўяўленне народа

Рэпазіторый ВДУ

пра жыццёвую моц прыроды. У веснавых абрадах старажытных славян яйка разглядаецца сімвалам абуджэння прыроды пасля зімы, сведчыць пра дабрабыт, заможнасць, мае магічныя ўласцівасці. Яйка, пакладзенае ў варотах, на першы выган скаціны ў поле пасля стойлавага ўтрымання павінна было забяспечыць будучы прыплод, захаваць на працягу года скаціну здаровай [100]. Дзеля гэтага ж магчыма выкананне замоў: *"Як гэтае яйка цэленькае, кругленькае, так і мая скацінка каб была поўная, цэлая і сытая"* [100, с. 100].

Прынесенае з царквы яйка апускалі ў ваду, каб памыцца і потым быць румяным, прыгожым і здаровым увесь год. Важная роля яек у аграрных абрадах, абрадах памінання продкаў. Але не ўсякае яйка валодае звышнатуральнымі якасцямі. Яно павінна мець святочны, прыгожы (эстэтычны) выгляд. З гэтай нагоды іх дэкарыравалі, што замацавана ў назвах – пісанкі, маляванкі (яйкі, размаляваныя рознымі ўзорамі) і крашанкі (пафарбаваныя ў адвары шалупіння цыбулі ці кары дрэў).

Афіцыйная рэлігія паступова прыстасавалася да старажытных абрадаў і свят. П.Г. Багатыроў падкрэслівае, што хрысціянскія і народныя абрады не толькі не варагавалі, але часта ўмацоўвалі адзін аднаго, але і не былі ўзаемазаменныя. Каляды святкуюцца побач з Ражаством Хрыстовым, Дзень веснавога адраджэння сонца (Ярылы) – з Велікаднем, амаль супадаюць Тройца і Сёмуха, Купальскае свята з ушанаваннем Іаана Хрысціцеля, старажытныя святы жніва – са Спасам, побач з Багачом – Ражаство Багародзіцы і г.д. Гэта еднасць падтрымліваецца ў святочных песнях, легендах, прыкметах. Напрыклад, магічна-заклінальны характар мелі валачобныя песні. Гэта свайго роду народны каляндар, адметны пералікам асноўных гадавых святаў і святых, што дапамагаюць селяніну ў жыцці. Апісваюцца магічна-прыродныя функцыі святых:

*...Ясен Красен упярод пайшоў,*
*Пасля таго святы Казімір*
*Дровы сякець і ў клад кладзець,*
*Святое Благавешчанне – жытцо рушыць,*
*Хоць пад сняжком – з божым душком,*
*Святая Вербніца – вярбу ломюць,*
*У касцёл нясуць, пасвянцаюць;*
*Чысты чацверг – ачышчаець,*
*Святы Вялікдзень – разгаўляюцца*
*З чырвоным яйкам, з белым сырам, з малым сынам...* [19, с. 118].

Юрый прыносіць расу, адмыкае зямлю і выпускае вясну; Мікалай ідзе з травой, Пётр – з дажджом, Ілля – з сярпом і пачынае жніво. Бог – галоўная выява, ён стаіць на чале ўсіх: “Па полю сам Бог ходзіць, жыта родзіць, жыта і пшаніцу, усякую пашніцу.” Валачобныя песні патрабавалі паслядоўнасці пераліку святцаў, бо ўспрымаліся як спецыфічныя аграрна-магічныя замовы, пры выкананні якіх нельга было збівацца ці прапускаць. Гэта магло наклікаць бяду на сям’ю ці гаспадарку слухачоў [100]. Старанна назіралі за надвор’ем, прыроднымі з’явамі, каб прадказаць будучыню гаспадаркі: *“У Вадохрышча (19 студзеня) снег – да ўраджаю хлеба. На Вадохрышча цёпла – у засеках густа і цёмна”, “Калі на Стрэчанне (15 лютага) певень пад страхой нап’ецца, то на Юр’я (6 мая) вол травы наесца”, “Затрымаўся снег на стрэхах да Саракоў (22 сакавіка), значыць, вясна позніцца”* [58].

Нават легенды яднаюць прыродныя з’явы і рэлігійныя ўяўленні: Ілля-прарок выступае паляўнічым на чорта, кідае ў яго маланкамі-стрэламі, кожны гадавы дзень носіць імя Святога і мае сваю прыкмету надвор’я, звязаную з ім: *“1 лютага – Макараў дзень, Макар-ясны, вяснаўказчык; 12 ліпеня – Пятро (Пятроў дзень, Пятрок) – Святы Пятро – у жыце ядро. “Калі высыплецца ячмень, зязюля падавіцца зернем і больш не кукуе. 11 – верасня дзень усячэння галавы Іаана Прадцечы. “У гэты дзень заканчваецца лета чырвонае, сустракалі “бабіна” лета”* [Там жа, с. 131].

Асабліва цікавымі выступаюць маляўнічыя апісанні прыроды, прасякнутыя вобразнасцю і паэтычнасцю: *“...Расце ўсё як на драждждах; здаецца, пасадзі на полі дзіця, дык і тое вырасце”...* [19, с. 459]. Да паэтычных сродкаў, што выкарыстоўваюцца ў расказах і былічках, варта аднесці пейзажныя замалёўкі:

*“Там бы ў гаршку кіпіць, так таўкуцца хмары, а маланка крышыць іх да рве на кускі, рве ў шмацце да кідае праз усё небо з аднаго боку да другога. Маланка паліць, неба раве, стогне да так грымаціць, бы там тысяча гармат смаліць, а дажджу няма. Бачно, што гэто не навальніца, што гэто не град пасылае Бог, каб пакараць людзей за грахі, а што гэто хтось пашавяліў пекло, патурбаваў нячыстую сілу, бы хлапчук ражном гняздо вос, і яны закружыліса, заснавалі туды-сюды да рынуліся ва ўсе бакі, ці чорт ведае куды. Так мітусяцца хмары, таўкуцца аблакі, грукацяць грымоты, гарыць небо бы ў гуце, лес схіляецца чуць не да зямлі, трашчыць да стогне, а зямля спалохалася, схавалася пад расліну, ляжыць ціхенько й не дышэ, жджэ-пажджэ, не дажджэцца, покуль засвеціцца на ўсходзе да не брызнуць аттуль ясныя пісухі-стрэлы сонейка ды не разгоняць нечысць, ці не запруць*



Репозиторий ВГУ

*яе зноў ў цёмнае пекла таўчыса кала смалы. Дак от якая арабінавая ноч"* [182, с. 35].

Беларускі эстэтычны ідэал інтэграваны, ён утрымлівае рэлігійныя, нацыянальныя і гендэрныя кампаненты. Для яго характэрна змяшэнне розных рэчаў, стыляў, ён надзіва шматзначны. Прычына таму – уплыў розных этнічных культур: рускай, польскай, літоўскай, украінскай. Фарміраванне эстэтычнага ідэала беларускага народа звязана з такой спецыфічнай рысай характару, як талерантнасць, цярпімасць, памяркоўнасць, паблажлівасць да праяў іншых нацыянальных культур, а гэта значыць і ідэалаў. Усё гэта робіць дастаткова складаным фармуляванне сутнасці ідэала, ён значна пашыраецца, аднак аблягчае эстэтычнае выхаванне, паколькі прымае лепшыя рысы і якасці з іншых культур. Напрыклад, на Палессі прыкметны ўплыў традыцый украінскага народнага мастацтва. Возьмем хатняе абсталяванне, у прыватнасці, печ. Яна не проста беліцца, як на ўсходзе, а аздабляецца матывамі кветак, як гэта характэрна для ўкраінскіх гаспадынь. Рускія традыцыі больш уплывовыя на ўсходзе, дзе, напрыклад, актыўна развіваецца традыцыя аздаблення саней, вазкоў, дугі, вупражы. Звернем увагу на вышыўку, якая вызначаецца багаццем тэхнік і прыёмаў. Шыццё наборам – адна "з яркіх этнічных адзнак беларускай вышыўкі", двухбаковае шво прыйшло пад уплывам рускіх традыцый спачатку на Паазер'е, а потым распаўсюдзілася па ўсёй тэрыторыі" [180, с. 247].

Можна адзначыць вялікую ўвагу беларусаў да сваёй родавай гісторыі, жыцця і смерці. Смерць беларусы разглядалі не толькі як прыродную з'яву, але і духоўна значны феномен, гэта персаніфікаваная істота, якая набліжаецца да чалавека дзеля прадказання хуткай канчыны ці ў сам гэты момант: "Смерць малявалася дзеваю, ростам вышэйшаю за дрэвы, з вогненным вянком на галаве і акрываўленай хусткай у руцэ, і дзе яна ступала – там пакрывалі зямлю свежыя магілы; у які бок памахала хусткаю – там пусцелі гарады і сёлы; у якое акно прасоўвала руку – там не заставалася ніводнай жывой душы. Смерць паўставала ў абліччы бледнай і схуднелай жанчыны, загорнутай у белае пакрывала (саван), падобнае да шлюбнага адзення, з густым вэлюмам. Смерць падавалася і як старая худая баба з вялікімі зубамі ці сатлелым тварам нябожчыка [13, с. 472].

Смерць уключана ў складаны будынак сацыяльных і культурных адносін, мае глыбокі маральна-эстэтычны сэнс [122]. Гэта прасочваецца ў традыцыях ушанавання памёрлых продкаў – "дзядоў". Сюды адносяцца найбольш вялікія святы – "Наўскі вялікдзень", які адзначаецца ў чысты чацвер на Велікодным



Репозиторий ВГУ

тыдні. Абрад абавязаны сваім нараджэннем сямейна-родавай традыцыі ўшаноўваць душы продкаў, якія могуць станоўча ці адмоўна ўплываць на лёс сваіх нашчадкаў [116, с. 77–78]. Усе кроўныя сваякі ў святочным адзенні ідуць на старанна прыбраную магілу апошняга з памерлых. Там адбываецца святочны абед, кавалкі страў якога абавязкова адкладваюцца "дзядам". Памерлых шаноўна ўспамінаюць, абавязкова галосяць. Потым застолле доўжыцца дома, ужо са спевамі, танцамі, гуляннем і мае значэнне пераадолення смерці, сцвярджэння жыцця. Той жа сэнс мае святкаванне восеньскіх, або Змітраўскіх, дзядоў. Але яны праходзяць менавіта ў хаце, дзе жыхары дзякуюць сваім продкам за падтрымку і дапамогу [100]. Такім чынам, услед за І.І. Крукам, можна сцвярджаць, што "ва ўсёй сістэме народнага календара ніколі не было духоўна-эстэтычнай нішы. Зусім натуральным і лагічна-абгрунтаваным было замяшчэнне абрадаў працоўна-вытворчага накірунку абрадамі сямейна-персаніфікаванага цыкла" [100, с. 179].

Народныя чарадзейныя казкі фіксуюць развіццё эстэтычнага ідэала. У іх адлюстраваны выявы майстроў, здольных здзейсніць працоўны цуд. Цяжкі лёс герояў, працоўныя выпрабаванні – усё падкрэслівае жыццесцвярджальную моц казак, здольнасць чалавека здабыць сваё шчасце не проста як багацце, шлюб, але і знешняе пераўтварэнне, якое робіцца праявай іх сапраўднай сутнасці [55]. Знешняя непрывабнасць герояў з'яўляецца часовым адхіленнем ад нормы, якое можна змяніць пры выкананні пэўных умоў, дзеянняў. Прааналізаваўшы шмат фальклорных крыніц, У.Я. Гусеў так ацэньвае пераўтварэнні персанажаў казак: "Прыгожае адзенне, багацце, знатнасць – усё, чаго ў жыцці быў пазбаўлены працаўнік, але што ён заслужыў сваёй працай, – дастаецца ўлюбёнаму герою казак як узнагарода за ўсе нястачы і выпрабаванні, ганенні і несправядлівасці, … якія так знаёмы самому апавядальніку і яго слухачам – простым працоўным людзям" [56, с. 54].

На першае месца ў эстэтычным ідэале ставіцца ўнутраная прыгажосць чалавека, яго душы, характару, дзеянняў, учынкаў, розум: *"Глянеш – хоць пацалуй, а прыступішся – плюнеш", "Краса прыглядзіцца, а розум прыгадзіцца", "Стань, паглядзі, плюнь ды пайдзі", "Пышная душа ва ўбогім целе", "Пан – саломаю напхан", "Не тое золата, што ў скарыначцы ляжыць", "З твару – яйцо, а ўнутры – баўтун"* [17; 157]. Народ на вопыце пераконваецца сам і пераконвае нашчадкаў у тым, што шчасце спадарожнічае працавітаму, сумленнаму, добраму чалавеку. Душэўная прыгажосць мае вялікую перавагу перад фізічнай пры-

Рэпазіторый ВДУ

вабнасцю. Народ дае параду: *“Не цані чалавека па твары, а цані па душы”, “Не заўсёды той калючы бывае, хто скураю вожыка падшывае”, “Не адзенне чалавека, а чалавек адзенне харашыць”* [17; 157]. Прыгажосць чалавека пазнаецца ў яго ўчынках. Знешне непрыглядны Іван-дурань праяўляе свае станоўчыя маральныя якасці і пераўвасабляецца знешне [6].

Эстэтычны ідэал цесна звязваецца з сацыяльна-маральнымі паводзінамі. Да сацыяльных аднясём зносіны беларусаў з суседзямі, аднавяскоўцамі, сямейнікамі і падарожнікамі. А.К. Сержпутоўскі зафіксаваў наступны расповед: *“Сябрына яшчэ з даўнейшых часоў вядзецца паміж добрых людзей. Хто ж ухіляецца ад сябрыны ды жыве адзін як воўк, той калі-небудзь дажывецца да пустога канца”* [182, с. 144].

Характэрная рыса працоўнай дзейнасці беларуса – імкненне сялян дапамагаць адзін аднаму: *“Адзін дасужы, ды не дужы”, “Аднаму і ў кашы няспорна”, “Будзе людзям – будзе і нам”, “Гуртам і ў бядзе лягчэй”, “Дружнай грамадзе воўк не страшны”* [19]. Калектывізм як сродак сумеснага жыцця знайшоў свой адбітак у “Талацэ” – народным звычаі калектыўнай дапамогі ў гаспадарчых работах. Для тэрміновай ці працаёмкай работы запрашаліся сваякі, суседзі, аднавяскоўцы. Разам вывозілі лес, гной на поле, рубілі хату, касілі сена, жалі жыта і інш. Дапамога найперш адрасавалася пагарэльцам, удовам, салдаткам, бясконным. Завяршалася талака звычайна застоллем і спяваннем талочных песень, у якіх пераважае жартоўны тон, перадаецца атмасфера агульнай працы [21].

Аб маральных якасцях беларусаў распавядае А.К. Сержпутоўскі: “Сяляне высока цанілі такія рысы характару, як гасціннасць, таварыскасць, добрасуседства. Лічылася непрыстойным праехаць міма хаты сябра і не зайсці павітацца. Тады ў дарозе магла адбыцца нейкая непрыемнасць” [182, с. 12]. Вылучым таксама, што беларус прытрымліваецца заведзенага рытму святочных і працоўных дзён, выконвае пэўныя абрадавыя дзеянні (частуе валачобнікаў, старанна прыбіраецца перад святочнымі днямі, далучаецца да калектыўнага святкавання…). Цэняцца спагадлівыя людзі, якія паважліва ставяцца да старых, слабых, хворых, народных звычаяў, з’яўляюцца выдатнымі майстрамі сваёй справы. Сведчыць аб гэтым фальклор, героі якога атрымліваюць пэўныя практычна і эстэтычна значныя ўзнагароды. Народнае мастацтва эстэтычна замацоўвае і ўзнаўляе працоўнае жыццё. Увага фіксуецца на станоўчым ідэальным вобразе працаўніка або калектыву:

Репозиторий ВГУ

*...Там жнуць жнейкі маладыя,*
*У іх сярпочкі залатыя.*
*Серп заложа, сноп паложа,*
*Шаг падбавя, копы ставя,*
*Копы ліча, гаспадар кліча...* [19, с. 121 – 122].

Шчодрыя падарункі гаспадароў валачобнікам спрыялі выкананню ў іх гонар песень з пажаданнямі ўсялякага дабра і ідэалізацыяй сямейнікаў і іх гаспадаркі:

*Ой, жыві здароў і будзь багат*
*І з жаною маладою,*
*І з дзеткамі наймілейшымі,*
*І з брацелямі найкраўнейшымі,*
*І з суседзямі найбліжэйшымі.*
*Будзь здароў, як крынічная вада,*
*Будзь вясёл, як хароша вясна,*
*Будзь багаты, як сырая зямля* [100, с. 84].

У народнай педагогіцы эстэтычнае выхаванне скіравана на фарміраванне эстэтычнага ідэала. Патрабаванні да чалавека, правілы жыцця і паводзін, працоўныя нормы адлюстроўваюцца ў фальклоры і мастацтве. Вывучэнне этнаграфічных матэрыялаў дае магчымасць сцвярджаць, што ў народнай педагогіцы ў эстэтычны ідэал уваходзяць адносіны чалавека да працы, людзей, асяроддзя. Гэты ідэал вызначаецца характарам беларусаў (памяркоўны, талерантны, працалюбівы), грамадскім ладам. Прыгожым з’яўляецца сам чалавек з сукупнасцю маральных (галоўных) і фізічных (менш важных) якасцей, яго праца, якая разглядаецца як вольная, грамадская і індывідуальная карысная дзейнасць. Цяжкая і паўсядзённая, яна павінна быць прыгожай: рацыянальна арганізаванай, выконвацца мэтанакіравана, і вынік таксама павінен быць эстэтычна значны. Можна казаць аб карыснасці працы як для працаўніка, так і для іншых асоб; аб карыснасці утылітарнай (вырабы пэўнай рэчы) і духоўнай, калі яна зацвярджае чалавека ў рэчаіснасці, прыносіць асалоду і задавальненне ад рухаў, намаганняў, вынікаў.

Эстэтычны ідэал замацаваны ў творчасці і свядомасці людзей. Ён передаецца з пакалення ў пакаленне праз традыцыі мастацтва, фальклорную творчасць, абрадавыя дзеянні. Трэба пагадзіцца з тэзісам Г.П. Арловай аб тым, што “ўсе жанры народнай творчасці садзейнічаюць эстэтычнаму выхаванню, таму што сам акт творчасці – элемент эстэтыкі – натуральным чынам мае

Репозиторий ВГУ

на ўвазе самавыяўленне і самаразвіццё” [5, с. 74]. Нацыя выпрацавала эстэтычныя каштоўнасці і традыцыі і кіруецца імі як асноўнымі нормамі эстэтычнай дзейнасці і наогул жыцця. Такім чынам, эстэтычны ідэал убірае ў сябе адносіны чалавека да працы, людзей, прыроды і ўтрымлівае вобраз чалавека-працаўніка. Народныя прыказкі, прымаўкі падкрэсліваюць, што *“Не той харош, хто прыгож, а той харош, хто для дзела гож”* [19]. Інакш кажучы, не назавуць прыгожым лодыра ці гультайку. Людзі адзначаць прыгажосць твару, цела, аднак параўнанне пойдзе праз працоўныя ўчынкі, што адмовіць у дараванні “тытула” прыгожы *(“Броўкі як сярпочкі, а ніўка няжатая стаіць”* [17]). Нават існавала сцвярджэнне-прыкмета на 16 лістапада, дзень калі традыцыйна мнуць лён: *“Ільняное золата росціць дзяўчыну царэўнай, а няўмекам добры лёс не вытчацца”, “У гультаяватай ткахі і для сябе няма рубахі!”* [58, с. 147].

Мы падкрэсліваем, што эстэтычны ідэал грамадства складаецца як еднасць ідэалаў, што належаць асобам дадзенай чалавечай суполкі, ён выпрацоўваецца на працягу многіх пакаленняў. Эстэтычнаму ідэалу ўласцівы дынамізм, дэмакратызм і кансерватызм адначасова. Праява кансерватызму – захаванне ідэалаў папярэдніх пакаленняў і праяў гэтых ідэалаў у чалавечай творчасці. Гаварыць аб дынамізме і дэмакратызме можна па той прычыне, што ідэал адгукаецца на ўздзеянне аб’ектыўных і суб’ектыўных перадумоў. Да аб’ектыўных аднясём геаграфічныя і кліматычныя ўмовы існавання, класавы падзел грамадства, біялогію чалавека. Галоўная суб’ектыўная перадумова – чалавечая самасвядомасць, якая выступае як нацыянальная, рэлігійная, працоўная, маральная, а таксама ўтрымлівае міжнацыянальную кампаненту.

Аналіз навукова-педагагічнай літаратуры дазволіў вызначыць тэарэтыка-метадалагічныя асновы даследавання традыцый эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы.

Эстэтычнае выхаванне ў народнай педагогіцы – выхаванне ў асобе жадання, здольнасці ўспрыняцця і разумення таго прыгожага ў жыцці, якое з’яўляецца жыццёва неабходным для працоўных; прывіццё на гэтай глебе эстэтычных густаў, эмацыянальных адносін да акаляючага свету і сацыяльнага жыцця праз авалоданне культурай продкаў. Сутнасць эстэтычнага выхавання ў народнай педагогіцы – працэс, які ахоплівае ўсе ўзроставыя групы, характарызуецца працягласцю (ад нараджэння дзіцяці на працягу ўсяго жыцця), мэтанакіраванасцю (мэта – фарміраванне эстэтычна дасканалай асобы), бесперапыннасцю (выхоўваюць людзі, прыродная рэчаіснасць, побыт, як у працоўнай дзейнасці, так і ў вольны час). Традыцыі эстэтычнага выхавання ў народнай



Рэпазіторый ВДУ

педагогіцы – гістарычна склаўшаяся на працягу стагоддзяў сістэма перадачы эстэтычных ведаў, каштоўнасцей, поглядаў, густаў народа ў працэсе выхаваўчага ўзаемадзеяння дарослага і падрастаючага пакаленняў.

Намі вылучаны і акрэслены асноўныя прынцыпы даследавання традыцый эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы (прынцып адзінства жыцця і выхавання (выхаванне ў жыцці і праз жыццё); цэласнасці выхаваўчага працэсу, непарыўнасці і ўзаемадапаўняльнасці выхаваўчых уздзеянняў (падзел выхавання на галіны даволі ўмоўны, бо кожны накірунак мае цесныя сувязі з усімі іншымі); прынцып народнасці (у аснове выхавання – родная культура, мова і народная творчасць); прынцып натуральнасці выхаваўчых падыходаў народа (натуральнасць – універсальная асаблівасць і сродак народнага выхавання); прынцып культураадпаведнасці (апора на айчынныя ідэі творчага самаразвіцця); прынцып прыродаадпаведнасці (выхаванне ідзе ў строгай адпаведнасці з узроставай перыядызацыяй, якая вялася ў адпаведнасці з порамі года); прынцып прыярытэту народнай педагогікі ў выхаванні (выхаванне пачынаецца ў сямейным побыце, дзе пануюць народныя выхаваўчыя традыцыі); прынцып уліку асаблівасцей нацыянальнай культуры ў выхаванні (народныя традыцыі і асаблівасці выхавання робяць асобу прыналежнай да пэўнага этнасу).

У якасці галоўных умоў здзяйснення эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы мы разглядаем: прыроднае ўздзеянне; выхаванне ў працы; выкарыстанне патэнцыялу народнай творчасці; распаўсюджванне ў паўсядзённым жыцці беларускага селяніна трыяды: мары, народныя вераванні, успаміны (інтэнсіфікатары народнага духоўнага жыцця).

Зроблена спроба вылучыць асноўныя передумовы фарміравання эстэтычнага ідэала. На фарміраванне эстэтычнага ідэала значны ўплыў аказалі аб'ектыўныя (геаграфічныя (як асаблівасці прыродна-кліматычнай зоны з бесперапыннымі яскравымі сезоннымі зменамі), біялагічныя (як існаванне пэўнага тыповага вонкавага выгляду чалавека, які прыстасаваны для свайго няяркага прыроднага асяроддзя), класавыя (у беларускай народнай педагогіцы замацаваны эстэтычны ідэал сялянства – чалавека, здольнага да працы, працаўніка, які эстэтычна пераўтварае і ўпрыгожвае жыццё)) і суб'ектыўныя (нацыянальныя (выхаванне з пазіцый талерантных адносін да іншых нацыянальнасцей), рэлігійныя (бесканфліктнае суіснаванне ў адных межах некалькі рэлігійных канцэсій, якія не толькі не варагавалі, але і пашыралі дыяпазон прымальнасці эстэтычных з'яў адна ад-

ной), працоўныя (прыгожа тое, што мае нейкі утылітарна-практычны сэнс, што дапамагае працаўніку), маральныя (аб'яднанасць прыгожага і маральнага), міжнацыянальныя (уплыў эстэтычных ідэалаў іншых народаў) перадумовы.

У якасці значных характарыстык эстэтычнага ідэала беларускага народа вынікаюць наступныя: дынамізм (як існаванне шматварыянтнасці адной з'явы – казак, загадак, песень, узораў адзення, спосабаў упрыгожвання рэчаў), дэмакратызм (кожны чалавек валодае майстэрстам можа праявіць яго ці то ў працоўнай, ці мастацкай дзейнасці), кансерватызм (вельмі маруднае з'яўленне ці знікненне нейкіх фальклорных форм, форм мастацкай выразнасці, якія трансфармуюцца, набываюць іншы сэнс, характар, але застаюцца ў народным жыцці), якія дазваляюць кожнаму чалавеку тварыць прыгажосць суадносна з асабістым яе бачаннем, але ў агульным нацыянальным накірунку. Замацаванню належаць найлепшыя ўзоры.

Репозиторий ВГУ

# 2. ЗМЕСТ ЭСТЭТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ Ў БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ ПЕДАГОГІЦЫ

## 2.1. Сістэма сродкаў і метадаў эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы

Вядучыя педагогі мінулага і сучаснасці адзначалі важнасць выхавання чалавека з мэтай захавання сувязі паміж старэйшым пакаленнем і яго нашчадкамі. І на сённяшні дзень катэгорыя "выхаванне" з'яўляецца адной з найбольш складаных у навуцы.

Дэфініцыя разглядаецца ў некалькіх накірунках – як функцыя грамадства па падрыхтоўцы падрастаючага пакалення да жыцця; як спецыяльны працэс фарміравання чалавека, накіраваны на развіццё асобы; як перадача грамадска-гістарычнага вопыту новым пакаленням з мэтай падрыхтоўкі іх да грамадскага жыцця і працы. Л.Д. Сталярэнка і С.І. Самыгіна бачаць у выхаванні "сацыяльнае мэтанакіраванае стварэнне ўмоў (матэрыяльных, духоўных, арганізацыйных) дзеля засваення грамадска-гістарычнага вопыту новым пакаленнем з мэтай падрыхтоўкі яго да грамадскага жыцця і вытворчай працы [195, 18]. Выхаванне ў шырокім сацыяльным сэнсе ўключае ўздзеянне на асобу грамадства ў цэлым і выхаванне ў вузкім сэнсе – як мэтанакіраваная дзейнасць, што заклікана сфарміраваць сістэму якасцей асобы, поглядаў і перакананняў. Выхаванне – гэта мэтанакіраванае фарміраванне асобы на аснове фарміравання: пэўных адносін да прадметаў, з'яў навакольнага свету; светасузірання; паводзін (як праявы адносін і светасузірання). Працэс выхавання абагульняе некалькі важных накірункаў, сярод якіх маральнае, разумовае, працоўнае, эстэтычнае і іншыя, якія маюць асаблівасці рэалізацыі ў афіцыйнай і народнай педагогіках.

Эстэтычнае выхаванне – істотная галіна сістэмы выхавання падрастаючага пакалення. Яно дазваляе захаваць і памножыць здабыткі матэрыяльнай і духоўнай культуры, уяўляе сабой "мэтанакіраваны працэс фарміравання ў чалавека эстэтычных адносін да рэчаіснасці… Яно звязана з успрыманнем і разуменнем … прыгожага ў рэчаіснасці, асалодай ім, эстэтычнай творчасцю чалавека" [115].

Эстэтычнае выхаванне можа ўспрымацца як філасофская і педагагічная катэгорыя, бо ў яго працэсе адлюстроўваецца фарміраванне ў асобе эстэтычных адносін да рэчаіснасці (прыроды, працы, грамадскіх адносін, учынкаў людзей) і эстэтычнай

дзейнасці. Да эстэтычнага выхавання можна падыходзіць і як да складанай філасофскай і грамадска-педагагічнай сістэмы, якая з'яўляецца часткай духоўнай культуры чалавека [59]. Эстэтычныя адносіны чалавека да рэчаіснасці, што ўключаюць прыроднае і прадметнае асяроддзе, мастацтва, мае аб'ектыўныя заканамернасці, якія даступныя асэнсаванню, вывучэнню і правільнаму выкарыстанню [59, с. 24].

Мы разглядаем ***эстэтычнае выхаванне ў беларускай народнай педагогіцы*** як выхаванне ў асобе жадання, здольнасці ўспрыняцця і разумення таго прыгожага ў жыцці, якое з'яўляецца неабходным для працоўных; прывіццё на гэтай глебе эстэтычных густаў, эмацыянальных адносін да акаляючага свету і сацыяльнага жыцця праз авалоданне культурай продкаў. Эстэтычнае выхаванне ў беларускай народнай педагогіцы мае мэтанакіраваны характар, які склаўся пад уплывам назапашаных сацыяльна-культурных каштоўнасцей і звязаных з імі эстэтычнага ідэала; ажыццяўляецца праз сістэму выхаваўчых уздзеянняў і ўплываў. Для нашага даследавання істотна, што мэта эстэтычнага выхавання адлюстроўвае абагульнены калектыўны вопыт выхавання, аднак у межах агульнага накірунку кожная сям'я ўносіла карэктывы на падставе асабістай эстэтычнай выхаванасці, асабістых уяўленняў аб выхаванні і памкненняў у жыцці. Агульная мэта эстэтычнага выхавання, на наш погляд, існавала як імкненне да дасягнення эстэтычнага ідэала народа.

Дзеля дасягнення пастаўленай мэты народам выкарыстоўваліся разнастайныя метады ўздзеяння на асобу. Некаторыя з іх агульныя з метадамі, што прымяняюцца ў афіцыйнай педагогіцы (напрыклад, гутарка, назіранне, практыкаванне), хаця і са сваімі асаблівасцямі напаўнення, сродкаў; некаторыя – спецыфічныя (наказ, грамадская думка, благаславенне). Метады і сродкі выхавання ў навуковай педагогіцы пэўным чынам класіфікаваны і вывучаны, і працэс гэты працягваецца. Узнікненне ў апошні час увагі да здабыткаў народнай педагогікі, у тым ліку яе сродкаў і метадаў выхавання, выклікае неабходнасць іх характарыстыкі, аналізу практыкі рэалізацыі ў народным жыцці. Такімі даследчыкамі з'яўляюцца Г.Н. Волкаў [38; 39], А.Э. Ізмайлаў, Ш.А. Мірзоеў [127; 128], беларускія: Г.П. Арлова [4; 5; 142; 144], В.С. Болбас [27; 28], М.І. Кавалевіч [75].

На сённяшні час існуе некалькі спроб навукоўцаў зрабіць агульную сістэматызацыю народнапедагагічных метадаў і прыёмаў. Засяродзім увагу на прапановах В.І. Баймурзінай [7], А.Э. Крываносавай [103; 104], Ш.А. Мірзоева [127; 128], А.І. Шорава.



Рэпазіторый ВДУ

В.І. Баймурзіна прапануе падзяліць метады народнага выхаваня на:

– славеснага ўздзеяння, куды ўваходзяць растлумачэнне, парады, просьбы, адабрэнні, угаворы, дакоры;

– маральнага ўздзеяння, да якіх адносяцца звычаі, забарона, пагроза, праклён, папрок, благаслаўленні, заклінанні, маленні;

– метады эмацыянальнага ўздзеяння, якія праяўляюцца ва ўсмешцы, пахвале, матэрыяльным заахвочванні, ганьбаванні, пабоях [7, с. 10].

Іншы варыянт належыць Ш.А. Мірзоеву [127]. Згодна з яго класіфікацыяй, метады падзяляюцца на:

– пераканання (этычная гутарка, паказ, растлумачэнне, унушэнне, патрабаванне, асуджэнне, пакаранне);

– прымусу (даручэнне, унушэнне, патрабаванне, асуджэнне, пакаранне); – падвядзенне вынікаў (іспыты);

– стымулюючыя метады (пахвала і заахвочванне);

– станоўчага эмацыянальнага ўздзеяння (прывітанні, зварот, пажаданні дабра, благаславенне, запавет).

Недахопам прыведзеных класіфікцый з’яўляецца іх сціслацсь: даволі значны пласт педагагічнай культуры застаецца па-за ўвагай. Напрыклад: праца, грамадская думка, спаборніцтвы, практыкаванні, што займаюць вялікае месца ў выхаваўчых сістэмах народнай педагогікі.

Параўнальна з іншымі больш дэталёва распрацавана галіна маральнага выхавання ў народнай педагогіцы. Да яе звяртаецца А.І. Шораў і выдзяляе метады, што спрыяюць засваенню маральных ведаў; метады, скіраваныя на фарміраванне ўменняў, навыкаў, звычак; метады эмацыянальнага замацавання адпаведных маральным нормам паводзін і ўплыву на адмоўныя ўчынкі. У галіне маральнага выхавання ўласную класіфікацыю народна-педагагічных метадаў і прыёмаў прапануе беларуская даследчыца А.Э. Крываносава [103]. Яна вылучае метады фарміравання маральнай свядомасці праз перакананне; метады арганізацыі дзейнасці; метады ацэнкі і стымулявання паводзін.

На жаль, класіфікацыі метадаў народнага выхавання, якая б наглядна паказала спецыфічныя рысы эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы, няма. Спроба наблізіцца да класіфікацыі метадаў зроблена расійскай даследчыцай Л.С. Аляксеевай [1]. Аднак аўтар абмяжоўваецца разглядам задач эстэтычнага выхавання, а таксама яго сродкаў і метадаў, і не разводзіць іх ні па ўзроставых групах, ні па выхаваўчых мэтах ці нейкіх іншых крытэрыях. Азначаную праблему паспрабуем разгледзець мы.



Репозиторий ВГУ

Праведзены аналіз народна-педагагічных крыніц беларускага народа дазваляе сцвярджаць, што эстэтычнае выхаванне ўключала сістэму сродкаў і метадаў, што былі скіраваны на развіццё рыс і якасцей асобы, спалучаных з народным эстэтычным ідэалам.

Мы прапануем разгледзець метады эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы згодна з іх **накіраванасцю на ўнутраны свет асобы** (інтравертаваныя, ці ***інтраверсію***), альбо **накіраваныя ад асобы на знешні духоўны ці матэрыяльны свет** (экстравертаваныя, ці ***экстраверсію***). Згодна з вызначэннямі, мы мяркуем выкарыстаць вытворныя ад прапанаваных дэфініцый для азначэння скіраванасці працэсаў эстэтычнага выхавання.

Першая група метадаў – інтравертаваных – спрыяе далучэнню асобы да свету прыгажосці: фарміраванне і развіццё ўмення бачыць, адчуваць, успрымаць, разумець, ацэньваць прыгожае, эстэтычна перажываць з'явы прыгажосці (непрыгажосці). Другая група метадаў – экстравертаваных – скіравана на фарміраванне і развіццё ўменняў ствараць і захоўваць прыгажосць: паводзін, зносін, працы, творчасці, прыроды і г.д.

Важнай рысай метадаў эстэтычнага выхавання з'яўляецца спецыфіка іх прымянення ў розных сацыяльных падгрупах. Па-першае, неабходна разгледзець галоўны сацыяльны інстытут, у межах якога праходзіла і праходзіць выхаванне дзіцяці – мы маем на ўвазе сям'ю (як першасны інстытут сацыялізацыі асобы, як група родзічаў, што жыве разам, вядзе гаспадарку і выконвае функцыі нараджэння і выхавання дзяцей). Другім важным кампанентам выхаваўчага працэсу ў беларускай народнай педагогіцы з'яўляецца мясцовая суполка жыхароў (як сукупнасць жыхароў, што аб'яднаныя формамі сумеснага жыцця і дзейнасці ў пэўных тэрытарыяльных межах). Трэцім – асяроддзе равеснікаў, чые погляды, паводзіны, выхаванасць таксама ўплывалі на працэс выхавання, у нашым выпадку, эстэтычнага. І, нарэшце, чацвёрты кампанент, які прысутнічае пры выкананні любой дзейнасці, – сама асоба, яе рэагаванне на свае ўчынкі і на ўздеянне з іншых бакоў.

Прапанаваныя накірункі шляху эстэтычнага выхавання аб'яднаем у наступнай табліцы (табл. 1).

Адзначым, што кожны народ мае свой эстэтычны ідэал, які адрозніваецца асаблівасцямі мастацкага падыходу да вуснай і прыкладной творчасці, жыцця, чалавека, прыроды. Што датычыцца беларуса, то ён па-свойму бачыць прыгажосць рэчаіснасці, прыроды, працы. Яму ўласцівы глыбокія, развітыя эстэтычныя пачуцці, тонкія заўвагі аб сутнасці эстэтычных з'яў. Паспрабуем больш падрабязна разгледзець эстэтычнае выхаванне ў белару-



Рэпазіторый ВДУ

скай народнай педагогіцы, прасачыць, як сродкі і метады, якімі нашы продкі найбольш карысталіся, спрыялі эстэтычнаму выхаванню асобы.

Табліца 1

**Суадноснасць групы выхавальнікаў і скіраванасць метадаў эстэтычнага выхавання**

| Група выхавальнікаў / Скіраванасць метадаў эстэтычнага выхавання | Сям'я | Мясцовая суполка жыхароў | Равеснікі | Асоба |
|---|---|---|---|---|
| Успрыняцце прыгажосці (інтравертаваныя метады) | Перакананне, праца, прыклад і аўтарытэт, назіранне, гульня, парада, прывучанне, унушэнне, гутарка, тлумачэнне, заахвочванне, запалохванне, ухваленне, вымова, зварот да эстэтычнага пачуцця, павагі да старэйшых | Грамадская думка, заахвочванне, асуджэнне, ухваленне, прыклад і аўтарытэт, расповед і гутарка, узаемная павага | Праца, прыклад і аўтарытэт, назіранні, гульня, гутарка, практыкаванне, грамадская думка, зварот да страху, брузглівасці | Саманазіранне, самааналіз, самаўнушэнне, самаперакананне, гульня, саматлумачэнне, самазапалохванне, самавымова, пачуццё павагі да старэйшых |
| Стварэнне і захаванне прыгажосці (экстравертаваныя метады) | Практыкаванні, ухваленні, праца, вымова, прывучэнне | Іспыт, спаборніцтва, грамадская думка, ухваленне, праца, вымова | Праца, сумеснае баўленне часу, гульні, пастаноўка далейшай перспектывы, супрадкі, вячоркі | Практыкаванні, праца, самапланаванне, гульня |

Да сродкаў эстэтычнага выхавання мы адносім гульню, працу і рамёствы, мову, народную творчасць, традыцыі, святы, звычаі, абрады, зносіны, лазню, арганізацыю прасторавага асяроддзя пражывання, рэлігію, прыроду – усе тыя галіны творчасці

Репозиторий ВГУ

і жыццядзейнасці народа, пры дапамозе якіх ідзе эстэтычнае ўздзеянне на асобу.

***Гульня*** суправаджала дзіця з калыскі. Спачатку адлюстроўвае фізіялагічныя запатрабаванні малога, а потым гульня станавілася вядучым відам дзейнасці. Праз гэта яна становіцца адным з вядучых сродкаў эстэтычнага выхавання маленькага беларуса. Дзіцячыя гульні заўжды прасякнуты эмацыянальным пачуццём, атмасферай святла і радасці, спрыяюць пачуццёваму знаёмству з рэчаіснасцю.

Важкім сродкам эстэтычнага выхавання, старажытным і ўсеагульным, з'яўляецца ***праца***, з асаблівай разнастайнасцю дзейнасці народа – ***рамёствамі***. Праца і рамёствы праз развіццё мыслення чалавека, паспрыялі ўзнікненню разнастайнага ***дэкаратыўна-прыкладнога*** мастацтва, якое аздабляла жыццё, паказвала прыгажосць навакольнага асяроддзя, чалавечай душы і спраў. Высока ацэньваецца майстэрства чалавека, чые рукі надаюць рэчам прыгажосць і дасканаласць. З узнікненнем працы пачынаецца фарміраванне грамадства. Атрымлівае развіццё ***мова*** – сродак эстэтычнага выхавання асобы. Чалавек у выніку свабоднай асэнсаванай працы адчувае радасць творчасці. Гэта пачуццё знайшло адбітак і замацаванне ў моўных мастацкіх выразах. Прыгадаем словы А.М. Горкага, што “мастацтва слова нарадзілася ў глыбокай старажытнасці з працэсаў працы людзей. Прычынай узнікнення гэтага мастацтва служыла імкненне людзей да арганізацыі працоўнага вопыту ў слоўных формах, – у формах двухрадкоўяў, “прыказак”, “прымавак”, працоўных лозунгаў старажытнасці” [48, с. 787]. Так, развіццё мовы вядзе за сабой узнікненне ***вуснай народнай творчасці*** – скарбонкі ведаў па ўсіх накірунках выхавання, у тым ліку і эстэтычнага. ***Калыханкі, пацешкі, лічылкі, казкі, загадкі, прымаўкі і прыказкі, галашэнні, паданні, гульні, песні, прыкметы*** і г.д. напаўняюць духоўнае жыццё чалавека.

***Традыцыі, звычаі, святы, абрады*** як сінкрэтычныя формы засваення рэчаіснасці выступаюць сродкам эстэтычнага выхавання людзей. Народныя традыцыі забяспечвалі і зберагалі асаблівае псіхалагічнае асяроддзе, што спрые духоўнай сувязі пакаленняў [2], з іх дапамогай закладваліся асновы эстэтычнага выхавання.

У якасці сродка эстэтычнага выхавання выступае ***эстэтыка паводзін, быту***. Эстэтыку паводзін можна разумець як суму прыёмаў знешніх паводзін чалавека, як характар, скіраванасць сукупнасці ўчынкаў. Кожны член вясковай суполкі павінен паводзіць сябе такім чынам, каб прыемна было і яму, і яго суседзям. Сярод беларусаў распаўсюджаны звычай, паводле якога жы-

хары вёскі віталіся нават з незнаёмымі. Ветлівыя словы сведчаць аб увазе да кожнага чалавека, выклікаюць пачуццё радасці. На фарміраванне звычаю аказала ўплыў імкненне народа да прыгажосці чалавечых зносін і ўчынкаў. Важным сродкам выгступае ***арганізацыя прасторавага асяроддзя пражывання,*** якое павінна было адпавядаць уяўленням насельніцтва аб прыгажосці, мэтазгоднасці, гармоніі. У эстэтыцы быту імкнуліся выпрацаваць у кожным чалавеку пачуццё рытму, гармоніі. Сапраўды, згодна з даследаваннямі В.С. Цітова, "разнастайныя рэчы хатняга ўжытку, начынне, падсобны інвентар, мэбля, тканіны, харчовыя прыпасы займалі ў сістэме інтэр'ера сваё звыклае, уласцівае ім месца, змяшчаліся ў пэўнай паслядоўнасці і парадку, утвараючы пэўную функцыянальную і кампазіцыйную ўзаемасувязь" [225, с. 59]. Сродкам эстэтычнага выхавання, на які мала ўвагі звяртаюць даследчыкі, выступае ***лазня***. Гэта месца сутыкнення стыхій агню і вады, спалучэнне якіх можа аказаць негатыўны уплыў на чалавека, таму ў лазні нельга было піць ваду. Лазня мела свайго апекуна – Лазніка, таму пры ўваходзе трэба было ўжываць пэўныя формулы "ўзаемадзеяння" з ім: "Хрышчоны – на палок, нехрышчоны – з палка", а пры выхадзе – "Табе, баня, на стаянне, а нам – на здароўе". Лазня – месца патэнцыйнай прысутнасці іншага свету, таму скарыстоўвалася для варажбы, гэта месца ізаляцыі парадзіхі ў час родаў і пасля іх, у лазні напярэдадні саракавога дня пасля смерці гаспадара пакідалі на акне чыстае адзенне, ручнік, венік, мыла. Абавязкова перад святамі беларус хадзіў у лазню, каб адбывалася адзінства прыгажосці душы і цела – абавязкова апраналася чыстая бялізна, якую таксама мылі ў лазні. Традыцыйна лазня тапілася штотыднёва, а пры захворванні чалавека, які лячыўся цяплом (парыўся), маглі і часцей [13].

Нацыянальныя асаблівасці дапамагаюць выначыць такія важныя сродкі выхавання, як ***рэлігія*** (унікальная сітуацыя, калі на адной тэрыторыі не варагуюць некалькі канфесій, а паганства мякка спалучалася з хрысціянствам. Праваслаўе давала прыклад таго, як трэба чалавеку жыць, пераадольваць цяжкасці. Аднак ***прырода*** ў большай ступені тлумачылася паганскімі культамі. Зразумела, прырода кожнага рэгіёна адыгрывае сваю ролю, аднак жа гэты сродак (і адначасова ўмову) эстэтычнага выхавання трэба ўлічваць.

Сродкі народнай педагогікі выкарыстоўваюцца ў працэсе рэалізацыі метадаў эстэтычнага выхавання. Метадамі выхавання ў народнай педагогіцы можна разглядаць "шляхі, спосабы выпрацоўкі ў дзяцей і моладзі ўяўленняў і паняццяў, поглядаў і перакананняў, пачуццяў, суадносных паводзін, што вынікаюць з мэт і задач выхавання [2, с. 107]. Адзначым, што за стагоддзі

Рэпазіторый ВДУ

свайго існавання беларуская народная педагогіка назапасіла шмат разнастайных метадаў, з дапамогай якіх выхоўваюцца новыя пакаленні. Розныя галіны выхаваўчай работы скарыстоўваюць уласныя метады; гэта ж датычыцца і праблемы эстэтычнага выхавання. Аналіз народнага вопыту выхавання і творчасці дае падставы вылучаць такія пашыраныя метады эстэтычнага выхавання, як ***прыклад і аўтарытэт*, *гульня, унушэнне, перакананне, прывучэнне, практыкаванне, праца, назіранне, грамадская думка, заахвочванне, ухваленне і асуджэнне, вымовы, пасядзелкі, вячоркі, тлумачэнн*е, *гутарка*, *запалохванне, зварот да эстэтычнага пачуцця, узаемная павага, агульная эстэтыка паводзін.***

Прапануем кароткую характарыстыку азначаных метадаў. Г.П. Арлова падкрэслівае, што ў якасці ***прыкладу і аўтарытэта*** “могуць служыць як героі народнай творчасці, так і самі рэальныя людзі” [6, с. 32]. Яны становяцца жыццёвым арыенцірам: як жыць, ставіцца да працы і грамадства, паводзіць сябе ў разнастайных сітуацыях. Без асабістага прыкладу бацькоў, аўтарытэтных людзей выкарыстанне іншых метадаў амаль нічога не ўнесла б для эстэтычнага выхавання чалавека.

***Гульня*** дае веды аб навакольным свеце, чалавечых зносінах, некаторых асаблівасцях працоўных дзеянняў. Яна спрыяе развіццю мастацкіх здольнасцей (спеваў, танцаў, дыферэнцыроўкі колераў), абуджае пачуццё радасці, захаплення і іншыя. Метад ***унушэння***, спрыяючы эстэтычнаму выхаванню чалавека, асабліва прыдатны ў маленстве, калі з дапамогай калыханак, пацешак, казак дарослыя ўздзейнічаюць на выхаванца: словы прымаюцца як ісціна. Паступова ўнушэнне замяняецца метадам ***перакanання***. І.А. Шораў вызначае дадзены метад як маральную асвету, з дапамогай якой народная педагогіка давала дзецям веды аб маральных каштоўнасцях, дапамагала асэнсаванню і ўзбагачэнню асабістага маральнага вопыту дзяцей, садзейнічала іх маральнаму самаўдасканальванню [229]. Праз перакананне тлумачыцца неабходнасць прыгожых учынкаў, карыснасць выканання працоўныях дзеянняў рытмічна, старанна, сумленна: “*Калі здолееш узяцца за справу – і снег загарыцца, не здолееш – і масла не ўспыхне”, “Сады садзіць – жыццё харашыць*” [17]. Гэта садзейнічае фармаванню эстэтычнай самасвядомасці, раскрываецца сутнасць эстэтычнага ідэала, абуджаецца імкненне да самаўдасканальвання.

Эфектыўнымі выступаюць метады ***прывучэння і практыкавання***. Яны незаменныя пры навучанні дзеянням, набыццю навыкаў, уменняў, пры выпрацоўцы звычак, замацаванні ведаў. ***Праца*** – сродак і метад народнай педагогікі – мае бязмежны

выхаваўчы патэнцыял. Яна дазваляе не толькі выхоўваць, але і правяраць якасць выхавання. Асэнсаваная, карысная праца абуджае пачуццё прыгожага, і народ не ўяўляе без яе жыцця: "*Усё жывое трудзіцца*". "Праца – крыніца радасці, прыгажосці, асалоды, надзея на лепшае жыццё. Адначасова гэта вялікі цяжар, які прыгнятае чалавека," – зазначае Л. Курбанмамедаў [107, с. 15]. Вялікі ўплыў на развіццё чалавека аказвае метад ***назірання***. Назіральны хутчэй засвойвае разнастайнасць свету, больш кемлівы. Метад спаборніцтва дапамагае эстэтычнаму выхаванню беларуса. Кожны чалавек жадае станоўча вылучыцца, атрымаць ухваленне, таму імкнецца быць прыгажэйшым, спрытнейшым. На ўсё гэта ўплывае ***грамадская думка*** (выступае як метад народнай педагогікі). Яна аказвае кіруючае ўздзеянне на жыццё людзей. У вёсцы актуальныя і значныя факты і падзеі жыцця кожнага жыхары бачаць і абмяркоўваюць. Вынік гэтага – грамадская думка, якая станоўча ці адмоўна ацэньвае ўчынкі і тым самым рэгулюе паводзіны, лад жыцця. Метады ***заахвочвання, ухвалення і асуджэння, вымовы*** распаўсюджаны ў народнай педагогіцы. Асуджаюцца неахайнасць, лянота, сквапнасць, іншыя заганныя рысы. Заахвочваецца жаданне быць добрым, міласэрным, працавітым, сумленным, выхаваным, бо гэтыя якасці ўхваляюцца, разглядаюцца як найлепшыя. Дарэчы, даволі часта яны ішлі побач – заахвочванне пераходзіла ва ўхваленне, а асуджэнне цягнула за сабой вымову. Метад народнай педагогікі, які сёння амаль знікае – ***пасядзелкі, вячоркі***. Песні гучаць у хаце; адначасова жанчыны ці дзяўчыны прадуць, шыюць, вышываюць… Кожная імкнецца паказаць сябе добрай майстрыцай, прыгожай, разумнай, вясёлай, здольнай на жарты і прыгожую песню. А для дзіцяці гэтыя рэчы, што ствараліся жаночымі рукамі, былі першым светам мастацтва, вучылі бачыць прыгожае.

Абавязкова выкарыстоўваецца метад ***тлумачэння***, каб дзіця даведалася, успрыняло эстэтычныя запатрабаванні, выпрацаваныя народам. Найчасцей тлумачэнні аб'ядноўваліся з такім метадам, як ***гутарка***. Але не заўсёды хапала часу ў бацькоў, каб падрабязна даводзіць малым неабходнасць тых ці іншых эстэтычных дзеянняў. Тады на дапамогу прыходзіў метад ***запалохвання*** – праз жудасныя вобразы нячысцікаў, абяцанні нейкіх нешчаслівых выпадкаў дзіця прымушалася выконваць патрабаванні дарослых (а падчас і не толькі дзіця, але і дарослы, напрыклад, цяжарная жанчына). Згодна запісам А.К. Сержпутоўскага, "калі тоўстая жанчына з куском у роце каго-небудзь прывітае, то дзіця будзе шапялявае ці заікатае" [182, с. 166]. Гэты ж метад пашыраны і паміж саміх дзетак, калі яны, сабраўшыся гуртам, пачыналі расказваць неверагодныя



Рэпазіторый ВДУ

гісторыі. Іх вобразнасць спрыяла ўспрыняццю невераготнага як сапраўднага ("*Жалезная баба жыла ў студні і ўцягвала туды ўсіх, хто ў яе заглядваў, а ўжо асабліва дзяцей*" [12, с. 48], "*бліжэй да зімы Бадзюля ўвязваецца следам за чалавекам, у хаце якога і пасяляецца. З гэтага часу там назіраюцца ўсякія прыкрасці: чалавек пачынае піць, пускаючы на вецер свій набытак. Бадзюля чакае, калі той ўсё растрасе і пойдзе па свеце. Каб прагнаць Бадзюлю, трэба чыста вымесці і вымыць у хаце, і бруд выліць наводлег на заход сонца*" [13, с. 39]).

Актыўны і такі метад народнай педагогікі, як ***зварот да эстэтычнага пачуцця***. У працы, паводзінах існавала імкненне зрабіць так, каб было прыемна і сабе, і людзям, зрабіць прыгожа. Моц народных казак, песень, прыказак, спеваў, танцаў, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў тым, што яны закранаюць эстэтычныя пачуцці асобы (прыгажосці, замілавання, узвышанага і г.д.).

Паколькі эстэтычнае выхаванне агранічна звязана з маральным, іх адзінства адлюстроўваецца ў адной з найважнейшых каштоўнасных установак, згодна з якой "прыгожым з'яўляецца тое, што маральна, што ўзвышае і робіць больш высакародным чалавека, а маральнае павінна існаваць ва ўнутранай сувязі з прыгожым" [244]. Быў запатрабаваны і такі метад, як ***узаемная павага*** паміж удзельнікамі выхаваўчага і жыццёвага працэсу, аб ***агульная эстэтыка паводзін***, што было і метадам, і вынікам эстэтычнага выхавання. Эстэтыка паводзін, быту, пачуццяў напрамую залежыць ад умоў, у якіх праходзіць жыццё чалавека. (Мы не будзем кранацца ў даследаванні найбольш цяжкіх з'яў, што існавалі ў беларускай вёсцы канца XIX – пачатку XX стагоддзя, – гэта вядомыя факты, засяродзім увагу на тым каштоўным, карысным для эстэтычнага выхавання, што засталося ад продкаў.) Шмат народных правіл, звычаяў аформлена ў выглядзе прымхаў, забабонаў і г.д., галоўны сэнс якіх – упрыгожыць жыццё, даць маладым арыенцір: што можна і чаго нельга рабіць, як рабіць лепш, каб было прыгожа. Напрыклад: *"як абіваюць лён, трээ пець песні, та праз усю работу зы льном будзе спявацца"* [182, с. 91], *"Калі ў час яды прыдзе старац, та гэто добрая прыкмета. Калі таго старца пачастуюць, та той хаце будзе шанцаваць"* [Там жа, с. 106], *"Перш, чым мясіць у дзяжы цесто, жанчына павінна ўмыцца й памаліцца Богу, а то цесто не падыдзе"* [Там жа, 109]. На выпрацоўку паводзін былі скіраваны апавяданні пра міфічных апекуноў хаты, леса, вады. Напрыклад, казалі і верылі, што *"Дамавік любіць гаспадароў і гаспадынь працалюбівых, рахманых і цвярозых; што ўсе іх дзеянні яму падабаюцца..., не любіць сварак, гучных размоў і бруду ў хаце і хляве, асабліва на сцеж-*



Рэпазіторый ВДУ

*ках”* [12, с. 21–24], а Дамавуха, чысценькая і акуратненькая, вельмі не любіла нядбалых і неахайных гаспадыняў, *“і таму часта помсціла ім, падкідваючы ў прыгатаваную такой гаспадыняю страву свірэпкі. Тады ў гэтай сям'і адбываліся сваркі і бойкі*” [Там жа, 27].

Аднак нават самыя прыгожыя рэчы не здольны самі па сабе эстэтычна выхоўваць. Галоўная роля ў выхаванні належыць дзейнасці: працоўнай, зносін і г.д. Дарослыя вучаць дзяцей не толькі бачыць і заўважаць, але і любіць прыгожае, прывучаюць да клопатаў аб прыгажосці. Праз народную педагогіку праходзіць думка, што выхавальнік павінен ведаць, што з'яўляецца прыгожым, эстэтычным; што ўяўляе сабой эстэтычны ідэал і шляхі набліжэння да яго; нарэшце, ён сам, учынкі, быт павінны быць эстэтычнымі, інакш кажучы, аб'ядноўваць імкненні, словы і справы людзей.

Паспрабуем прасачыць прызначэнне метадаў эстэтычнага выхавання ў жыцці беларусаў і іх рэалізацыю ў коле сацыяльных груп вёскі.

### 1. Метады, скіраваныя на ўспрыняцце і разуменне прыгажосці (інтравертаванага тыпу)

*Выкарыстанне метадаў першай групы* ***ў сямейным выхаванні, сям'і*** (зварот да эстэтычнага пачуцця, унушэнне, перакананне, назіранне, гульня, праца, прыклад і аўтарытэт, парада, прывучанне, тлумачэнне, гутарка, заахвочванне, запалохванне, ухваленне, вымова, павага да старэйшых).

Найбольш значны сацыяльны інстытут выхавання чалавека – сям'я: *“Гаспадар і жонка – найлепшая суполка”* , *“У каго дзеці – у таго і шчасце”, “Малы жук, а пары сабе шукае”* [19], – кажуць у народзе. Некаторыя сучасныя даследчыкі лічаць, што народная педагогіка беларусаў – гэта сямейная педагогіка, разумеючы яе як “сферу практычнай дзейнасці бацькоў па выхаванні дзяцей (у адрозненне ад этнапедагогікі як навукі) на аснове аднаўлення (адраджэння) выхаваўчых традыцый радаслоўнай, сям'і, а таксама многіх пакаленняў беларусаў з улікам рэгіянальных асаблівасцей і шматвяковай нацыянальнай культуры (культуры этнасу) [229, с. 248]. Так, ад сям'і, ад бацькі з маткай усё добрае і ўсё благое: *“Якое дрэва – такі і клін, які бацька – такі і сын; якая доска – такая і стружка, якая маці – такая і дачушка”, “Якое вогнішча, такі і дым, які бацька, такі і сын”, “Які куст, такі і парастак, “Якое карэнне, такое і насенне”* [12; 157]. Бацькі – ***прыклад і аўтарытэт***, і таму адзін з асноўных пастулатаў педагогікі беларусаў аб неабходнасці паважлівых адносін дзяцей да дарослых.

Ад іх пераймаецца ўсё: як працаваць, святкаваць, паводзіць сябе з аднавяскоўцамі. Дзеці назіраюць, пераносяць вопыт назіранняў у гульні, потым далучаюцца да працы самі. Менавіта сям'я закладвае падмурак эстэтычнага выхавання, абуджае эстэтычныя пачуцці, вучыць бачыць, успрымаць, разумець і ацэньваць прыгожае.

Сучаснымі даследаваннямі даказана, што эстэтычныя пачуцці з'яўляюцца ў дзіцяці вельмі рана. Яны развіваюцца пад уздзеяннем выхавання і навучання на аснове пачуццёвага ўспрыняцця, пазнання рэальнага свету і ўспрыняцця мастацтва [131]. Традыцыйна з першых дзён маленькага беларуса суправаджаюць песні. Калыханкі развіваюць слых дзіцяці, садзейнічаюць развіццю эстэтычнага ўспрыняцця. Спачатку немаўлятка слухае пяшчотную мелодыю, засынае ці прачынаецца з ёй, засвойвае лад і строй роднай мовы, рыхтуецца да маўленчай дзейнасці. Гэта, фактычна, спрадвечны шлях перадачы векавога вопыту, поглядаў, норм паміж пакаленнямі. Першыя ***ўнушэнні, перакананні*** даводзяцца з матчынай песняй, яна ж знаёміць з наваколлем, звярамі, птушкамі.

Характэрная асаблівасць калыханак – ужыванне памяншальна-ласкальных слоў: *"кветачка", "коцік", "галубок*"; чыстых колераў: *"чырвоныя боты", "вараны конь", "ясненькі дзянёчак*". Поруч знаходзіцца паэтычная выява Сну, якога Бог у выглядзе галубка пасылае да "*дзіцяткі, каб тое хутка і добра заснула. Сон-галубок калыша люльку. Крыху закалыхаўшы, ён пакрывае адным крыльцам малому цемечка, другім – вочкі. Тады таму робіцца цёпленька і добра, як каля маткі, і яно хутка засынае. А галубок увесь час, пакуль дзіця спіць, сядзіць у яго каля галоўкі і адганяе ўсякія жахі*" [12, с. 192–193]. Згодна з такімі ўяўленнямі ў некаторых мясцовасцях існавала традыцыя чапляць над калыскай дзіцяці саламянага галубка [13, с. 478].

Знаёмства з навакольным светам, яго ўспрыняцце працягваецца праз ***гульню***. Яна спрыяе актыўнаму фарміраванню непасрэднага пачуццёвага ўспрымання рэчаіснасці ў свядомасці. Пацешкі і забаўлянкі незаменныя ў набыцці дзецьмі вопыту эмацыянальных зносін. Родныя пахлопваюць, пагладжваюць, гойдаюць дзіця на руках ці каленях ў такт тэксту, казытаюць, што выклікае страх, смех, асалоду – эмацыянальныя перажыванні, жаданне зноў паслухаць твор і адчуць гаму эмоцый:

*Паня сына нарадзіла,*
*На коніка пасадзіла.*
*Канёк вараненькі,*
*Панічок маленькі.*



Рэпазіторый ВДУ

*Гуца, конік, да вады,*
*Шаўковыя павады.*
*Канёк не напіўся,*
*Панічок зваліўся* [60, с. 19].

Тэксты дапамагаюць дзіцяці зразумець, прыняць навакольны свет. Коцік, пеўнік, галубок – усе яны са звыклага наваколля, а ў пацешках, гульнях, набываюць нейкае іншае, эстэтычнае асвятленне, звяртаюць на сябе ўвагу:

*Ішлі козы ў арахі,*
*Нашчыпалі тры мяхі,*
*Хацелі Ваню забароць:*
*Калі-калі-калі* [Там жа, с. 20].

Сарока-балбатуха, бадатыя козы – усе ўваходзяць у свядомасць поруч з пачуццямі радасці, нястрашнага страху, гумару, адчуваннем ласкі і пяшчоты.

М.А. Лоскі адзначаў, што ва ўсіх славян развітыя каштоўнасныя адносіны да людзей і да рэчаў наогул. Гэта знаходзіць сваё выражэнне ў вялікай колькасці памяншальна-ласкальных імёнаў, што выражаюць пачуццё пяшчоты. Усякае асабовае імя можна вымавіць ласкава: Іван – Ванечка, Ванятка; Пётр – Пеця, Пятрок, Пятруша, Петрык; Алена – Алёначка, Аленка; Ганна – Ганнушка, Ганначка і г.д. Формы імёнаў выкарыстоўваюцца як у паўсядзённым жыцці, так і ў малых фальклорных формах, што адрасаваны дзецям (калыханкі, забаўлянкі, гульні патрабуюць асобаснага звароту да дзіцяці, для чаго выкарыстоўваюць "ласкавыя" словаформы).

Памяншальна-ласкальныя словы выкарыстоўваюць з агульнымі назоўнікамі, што стварае асаблівы каларыт мяккасці, прыязні, душэўнага камфорту, утульнасці. Коцік, пеўнічак, лісічка, бярозка, сонейка, месячык – звычайныя, стандартныя словаформы беларускага фальклору. У той жа час ужываюцца назоўнікі, як агульныя, так і ўласныя, з адмоўнай экспрэсіўнай афарбоўкай для неэстэтычных персанажаў (у прыватнасці, міфалагічных): Кадук, Хапун, Лойма, Баламуцень, Шатан, Сербай, Трасца, Хондзя, Марня, Паляндра. Акрамя грубага спалучэння гукаў, дадзеныя адзінкі выконваюць сэнсавую і вобразную нагрузку, якая замацоўвае адмоўныя адносіны да іх: Чума, Мор, Мара, Чорна боль, Чорная немач, дэманалагічная постаць хваробы. Чума ўяўлялася ў вобразе чорнай жанчыны, паветранай істоты, стыхіі, што валодае вогненнымі стрэламі. Складкі белага



Репозиторий ВГУ

адзення Чумы шырока развіваюцца і закрываюць ззянне месяца. Чума не пераносіць пеўневага крыку і сабачага брэху, і таму ўсюды, дзе яна пануе, сабакі перастаюць брахаць, а спеў пеўня робіцца хрыплым [13, с. 559].

Частотна асаблівасці роднай мовы выкарыстоўвалі продкі ў адносінах да дзетак. Адзін з метадаў выхавання – ***запалохванне*** – заснаваны на высокай унушальнасці дзяцей, вобразнасці іх ус-прыняцця і мыслення. Антыэстэтычная выява Хапуна ("*Невялічанькі, скурчаны дзядок з доўгай сівою барадою і з вельмі вялікаю торбаю – большай, чым ён сам*" [12, с. 109] збірае і зносіць непаслухмяных дзяцей. Падпільнаваўшы, калі такое дзіця адышлося далей ад дому, ён хапае яго і саджае ў торбу. Убачыць Хапуна папярэдне, каб схавацца і ўцячы ад яго яго, немагчыма, бо ён нябачны і відзён толькі тады, калі развяжа торбу, а робіць ён гэта толькі ў сябе дома. З дзяцей здзекваецца (нават сячэ крапівою), а потым з гэтых дзетак вырастаюць новыя хапуны [13]. Нават у дзяўчынкі *"вырастае доўгая сівая барада па кале-на*". Пасля ўспрыняцця падобнай істоты ў большасці дзетак жаданне непаслухмянасці і свавольства страчвалася на доўгі час. У падобным накірунку вырашаны вобразы Жалезнай Бабы: *"Гэта злая нізкаРослая старая з жалезнымі вялікімі грудзямі хапае жалезным круком тых дзяцей, якія асмельваюцца заходзіць адны ў палі і агароды, каб паласавацца бобам, гарохам, макам, гароднінай, кідае іх у сваю жалезную ступку, таўчэ і есць… Жалезная Баба жыла ў студні і ўцягвала туды ўсіх, хто ў яе заглядваў, а ўжо асабліва дзяцей"* [12, с. 49]), Аржавеня, ці Аржавенніка ("*нячысцік, які жыве ў аржавеннях – багністых мясцінах, быццам пакрытых ржою… Уяўляўся брудна-рудым, пакрытым іржавымі прыліпамі, з надзвычай тоўстым жыватом і тонкімі, як сцябліны хвашча, нагамі. Увесь час ён адрыгвае і выклікае агіду ва ўсіх нячысцікаў і жывых істотаў* [13, с. 25])".

Значную ролю ў сямейным выхаванні адыгрывалі ***назіранні*** за паводзінамі, узаемнымі адносінамі родных, асаблівасцямі выканання спраў: *"Калі бацька рыбак, дык і дзеці ў ваду глядзяць", "Ад дурнога куста і дубец крывы, і ягада пуста", "Ад злой маткі злыя дзеткі", "Калі нарадзіўся з крывымі нагамі, то ўжо ніхто іх не выправіць", "Калі ўродзіцца з лысінкай, то з лысінкай і памрэ"* [19; 157] – заўважае народ. Менавіта назіранні дапамагаюць запомніць песні, традыцыйныя формы правядзення святаў, даюць веды аб тым, каго ***грамадская думка*** ацэньвае высока і за што. Назіранні спалучаюцца з ***растлумачэннямі, унушэннямі***, ***перакананнямі***. Гэта распаўсюджаныя і даступныя метады эстэтычнага выхавання. Дзяцей пераконвалі ў неабходнасці



Репозиторий ВГУ

прыгажосці ў адносінах з іншымі людзьмі, у паўсядзённых паводзінах, працы, дамашнім побыце. З узростам дзяцей пашыралася прымяненне метадаў: растлумачэнне суправаджалася аналізам, больш глыбокім і дэталёвым, дзеці атрымлівалі веды аб сутнасці эстэтычных падыходаў народа, норм і правіл паводзін.

Дзеці – актыўныя ўдзельнікі жыцця, і дарослыя адчуваюць свой абавязак перадаць ім скарб ведаў, у тым ліку і эстэтычных, што і адбываецца праз гутаркі, казкі, прыказкі. Казкі праз незнаёмы і цудоўны свет пераконваюць у перамозе дабра і прыгажосці. Гэта выдатны сродак развіцця эстэтычнага ўспрыняцця і паэтычнага пазнання навакольнага свету, абагульнення жыццёвага вопыту. Беларусы з вялікай увагай ставіліся да асобы казачніка, бо ён павінен быў надаць казцы пэўную афарбоўку, закрануць розум і пачуцці слухача, а праз гэта – паспрыяць рэалізацыі выхаваўчага патэнцыялу твора [4; 5]. Таму сапраўднага казачніка кожная сям’я традыцыйна сустракала з радасцю.

У казачных творах найбольш прывабнымі рысамі надзелены станоўчыя героі, каб падкрэсліць, давесці думку аб непарыўнай еднасці дабрыні і прыгажосці. Беларусы бачаць прыгажосць чалавека ў працоўнай актыўнасці, што фарміруе традыцыю прадстаўлення фальклорнага героя як знешне прыгожага працавітага асілка. Адначасова казкі пераконваюць і даказваюць неабходнасць глыбокай ацэнкі чалавека, патрабуюць адрозніваць унутраны свет чалавека ад яго вонкавага выгляду, умець бачыць духоўную прыгажосць ці выродлівасць. Так, неэстэтычныя рысы ўласцівы тым, хто ўвасабляе злое і нядобрае, а высокамаральны герой казкі перажывае знешняе ператварэнне, набывае эстэтычна значную ўзнагароду.

Кожны твор пераносіць чалавека з паўсядзённасці ў паэтычны свет, які існуе па правілах казкі. Так і растуць цудоўныя залатыя яблыкі, гараць незвычайным святлом пёркі жар-птушкі, прыгожыя працаўнікі знаходзяць сваё шчасце. Беларус верыць і ўнушае дзеткам, што прыгажосць існуе, яе можна знайсці, трэба быць толькі ўважлівым, назіральным і добрым. Кожная народная казка выклікае гаму эстэтычных і іншых пачуццяў, бо напоўнена гумарам (“Ганарыстая варона”, “Жаронцы”, “Як Сцёпка з панам размаўляў”), развівае спагаду (“Любоў здраду асіліць”, “Чарадзейны пярсцёнак”), нараджае пачуццё гневу (“Жаронцы”, “З рога ўсяго многа”, “Праўда і крыўда”) і інш. [208]. Падкрэслім, што кожная казка выклікае не адно, а гаму эстэтычных пачуццяў.

Функцыя ***перакананне і ўнушэння*** выразна высвечваецца ў прыказках і прымаўках, якія дзеці чуюць спачатку ад бацькоў, сямейнікаў, а потым, з пашырэннем кантактаў, ад іншых членаў



Рэпазіторый ВДУ

суполкі. Перакананні накіраваны да розуму дзіцяці. У суадносінах з традыцыйнымі народна-педагагічнымі поглядамі на эстэтычнае выхаванне яны ўслаўляюць прыгажосць чалавека-працаўніка, сумленнага, высокамаральнага і добрага. Асуджаючы неэстэтычныя рысы чалавека, бацькі выкрываюць іх сутнасць, паказваюць неабходнасць прыгожых учынкаў, паводзін, ладу жыцця. Гэта падкрэсліваецца выкарыстаннем слоў, што нясуць эмацыянальную нагрузку. Эстэтычнае спалучаецца са словамі: золата, прыгожы, чырвоны, чысты: *“Прыгожаму ўсё гожа”, “Не частуй мяне ні піўцом, ні вінцом, а прывітай мяне шчыранькім слаўцом”, “Тады слова серабро, калі справа – золата”, “Золота і ў балоце свеціцца”, “Добрага добра і ўспамінаюць”, “Ідзі ў родны край, там і пад елкаю рай”* [17; 19].

У сямейным выхаванні пастаянна прысутнічае ***праца*** **–** хатняя, земляробчая, па догляду дамашняй жывёлы, рамесніцкая, – прасякнутая эстэтычнымі перажываннямі. На Беларусі рамёствы падзяляюцца на “хатнія” (для ўласных патрэб), рамяство па заказе і на рынак (дробнатаварная вытворчасць) [225, с. 111]. У народнай працоўнай творчасці праяўляюцца густ і духоўныя памкненні чалавека, што прайшлі праз прызму нацыянальных традыцый. У вырабах спалучаюцца утылітарная, эстэтычная і сімволіка-абрадавая функцыі, вырабы часта з’яўляюцца творамі самабытнага народнага мастацтва. Напрыклад, дойлідства вызначаецца функцыянальнасцю, канструктыўнасцю, комплекснасцю. Эстэтычная выразнасць жылля надаецца з дапамогай аздаблення ў выглядзе вільчыкаў, кансоляў, спецыфічнай апрацоўкі вуглоў хаты, карункавых ліштваў і падстрэшнікаў, дэкаратыўнай апрацоўцы франтонаў. Прыгожы від беларускага народнага мастацтва – пляценне з саломкі – мае дыяпазон вырабаў ад уласна практычных рэчаў – гаспадарчага посуду да дэкору царскіх варот у царкве. Выкарыстанне сонечнага матэрыялу прыносіць задавальненне і асалоду, прывабнасць рэчаў забяспечвае іх распаўсюджванне на тэрыторыі Беларусі, замацоўвае эстэтычную функцыю. Так, эстэтызацыя акаляючага асяроддзя аказвае ўскосны ўплыў на выхаванне падрастаючага чалавека.

Важным элементам эстэтычнага выхавання ў сям’і з’яўляецца хатняя праца, што ўбірае ў сябе прыгатаванне ежы, догляд за жывёлай, падтрыманне чысціні. Дзеці пераконваюцца, што ўшанаванню належыць чалавек, які не проста завіхаецца па гаспадарцы, а вядзе яе прыгожа, якасна. Народ гаворыць: *“Не пытайся, ці галоўка гладка, а пытайся, ці падмецена хатка”* [12]. Напрыклад, выпечка хлеба суправаджаецца шэрагам правіл, павер’яў, абярэгаў [225], якія накіраваны на фарміраванне эстэ-



Рэпазіторый ВДУ

тычных перажыванняў. З пашанай ставяцца да дзяжы, якая размяшчаецца на чыстым ручніку, хусціне, пакрываецца белым палатном. Яе нельга пазычаць камусьці, а хлеб трэба рашчыняць толькі ў добрым настроі – тады ён будзе прыгожы і смачны. Уменне гаспадыні пячы смачны хлеб замацавалася ў пэўных традыцыйных прыкметах. Лічылася, што *“калі велікодны хлеб (“паска”) спячэцца пышным, то сям’і будзе спадарожнічаць поспех, а калі атрымаецца ацеслівым, або патрэскаецца скарынка – трэба было чакаць непрыемных навін (магчыма, нават смерці сваякоў)”* [100, с. 73]. Падобны абрад выконваецца на вяселлі. Такім чынам, эстэтычная якасць – прыгажосць (хлеба) як бы ўплывае на жыццё. Стараннасць гаспадыні адбіваецца на якасці прадукта, таму і прадвяшчае прыгожы хлеб шчасце, і наадварот.

Дзяцей прывучаюць да працы мэтанакіравана, заданні ўскладняюць паступова і абавязкова патрабуюць прыгожага, стараннага, творчага выканання. Этнографы адзначаюць, што традыцыйна нават звычайныя земляробчыя аперацыі селянін выконвае з душой. У вяскоўцаў выпрацавана звычка да выключна акуратнай, мернай пасадкі сельскагаспадарчых культур дзеля таго, каб узыходы радавалі вока. Да таго ж прывучалі і дзяцей.

Калі дзіця паводзіла сябе так, як ад яго чакалі дарослыя, адпаведна ўяўленням народа аб прыгажосці, працы, адносін, бацькі ***ўхвалялі***, адабралі ўчынкі, выказвалі станоўчыя адносіны да гэтага, тым самым ішло пабуджэнне да прыгожых учынкаў. Ухваленне выклікала станоўчыя эмоцыі, садзейнічала фарміраванню добразычлівасці, чуласці, жадання быць яшчэ лепшым. У якасці ўхвалення бацькі выкарыстоўвалі ўсмешку, удзячнасць, даручэнне больш складанай справы, падзяку, падарунак. Дарэчы, у традыцыях народнай педагогікі было даволі строгае выхаванне, таму выказаныя бацькамі станоўчыя заўвагі, падарункі былі вельмі дарагімі для дзіцяці, садзейнічалі ўздыму сіл, стымулявала імкненне да супрацоўніцтва, развівала жаданне прынесці карысць і радасць сямейнікам. Аднак, калі дзіця не выконвала патрабаванняў, свавольнічала, вяло сябе непрыгожа, бацькі выкарыстоўвалі ***пакаранні***. У беларусаў лічылася, што пакаранне – моцны сродак уздзеяння, таму найбольш пашыранымі яго формамі былі вусныя – заўвагі, пагроза. *“Не біце вяроўкамі, навучайце гаворкамі”, “Не крычы, а лепш навучы”, “Розга – не навука”* [5] – прымаўкі зафіксавалі погляд народа на тое, што дзецям больш патрэбна не пакаранне, а правільная арганізацыя працы, вольнага часу, своечасовае фарміраванне эстэтычных, працоўных, маральных і іншых ведаў, навыкаў. Аднак бацькі могуць звярнуцца і да фізічнага пакарання, бо *“Не слухае ківа, паслухае кія”* [5].

*Выкарыстанне метадаў першай групы*
***мясцовай суполкай жыхароў:*** грамадская думка, заахвочванне, асуджэнне, ухваленне, прыклад і аўтарытэт, расповед і гутарка, узаемная павага

***Грамадская думка*** ў форме ацэнкі ці загаду выносіць рашэнне па праблеме, гэта актыўная ўплывовая сіла, якая кантралявала сфарміраванасць у людзей эстэтычных якасцей, унутраных запатрабаванняў весці сябе згодна эстэтычнага ідэала без прымусу. Грамадская думка заахвочвае і асуджае, ухваляе і ганьбіць. Кожная сям'я ўлічвала ўплыў грамадскай думкі, прымала пад увагу пазіцыю сваякоў, суседзяў, наогул, сацыяльнага асяроддзя. "*Грамада – вялікі чалавек*" [12], яна мае ўстойлівыя, адпрацаваныя стагоддзямі формулы ўхвалення ці асуджэння. Этнапедагог Г.П. Арлова зазначае: "Нярэдка, ацэньваючы тую ці іншую з'яву ў жыцці чалавека, народ бярэ гатовыя, універсальныя па змесце і форме характарыстыкі (выслоўі, прыказкі, прымаўкі, афарызмы). Гэта, дарэчы, дазволіла выдзеліць вусную народную творчасць у своеасаблівы інструмент рэгуляцыі паводзін чалавека. Чалавек "узгадняе" свае паводзіны з адпаведнай грамадскай думкай" [5, с. 21]. Напрыклад, грамадская думка ўлічвала цнатлівасць дзяўчыны, якая выходзіла замуж. Калі патрабаванне не выканана – ганьбіліся бацькі маладой, якія павінны былі прайсці ў вупражы, ганьбілася маладая, якой замест красы (бутэлькі гарэлкі, што заткнута каласамі жыта і аўса) падавалі пустую бутэльку, заткнутую саломай і саламяны вянок. І не толькі дзяўчына павінна была захаваць чысціню. Калі на пасад (хлебную дзяжу, пакрытую вывернутым кажухом) садзіўся нецнатлівы чалавек, гэта пагражала бедствамі, няўродамі, звядзеннем скаціны ва ўсіх родных [13].

Грамадская думка аказвае істотны ўплыў на якасць працы. *"Рабі так, каб сабак не дражніць і людзей не смяшыць"* [17], – раіць народ. Гэта значыць якасна і прыгожа. Вось і імкнуцца майстры зрабіць рэч, каб было зручна карыстацца, прыгожую, з пэўнага матэрыялу. Паступова, шляхам параўнання сваёй працы з эстэтычным ідэалам, ідзе развіццё эстэтычнага густу, прывіваецца звычка эстэтычна ацэньваць рэчаіснасць. Знешняя патрабавальнасць паступова перарастае ва ўнутраную, дзіця прывучаецца да культуры, яе эстэтычнага кампаненту, што спрыяе выхаванню на ўзроўні пачуццяў як на самым моцным падмурку.

Дзеці ведаюць, што аб гаспадарах мяркуюць па двары, па хаце. Таму абавязкова штодзённа прыбіраюцца ўнутраныя памяшканні, тэрыторыя каля хаты. Прыгожа, дагледжана, усё на сваім месцы – пачэсна *("Якая гаспадыня – такі і парадак"* [17]).

Рэпазіторый ВДУ

А калі не – грамадская думка не дасць спакою, экспрэсіўна сфармулюе свае адносіны з дапамогай прыказак: *“Так, сяк, накасяк, абы не па-людску”, “Ад яго, як ад казла – ні воўны, ні малака”, “Гумно плача без гаспадара, а хата без гаспадыні”, “Красатой гаршка не закрасіш”* [17; 19; 157].

У выніку шматгадовых уважлівых назіранняў чалавека за станам прыроды з’явіліся прыкметы. Яны вылiлiся ў прыгожую форму трапных радкоў, што дапамагаюць выказаць сваё эстэтычнае пачуццё, апісаць з’явы рэчаіснасці: *“Вясна – маці, а лета – бацька”, “Вясна красна, хоць і галодная”, “Калі ўвесну першы матыль карычневы, то ў гэтым годзе будзе многа мёду, а калі белы – то многа малака”* [58]. Здаецца, якая карысць з матыля… Але звяртае на яго ўвагу селянін, на гэтую радасную вестачку вясны, і нават “варожыць” такім чынам. А якую радасць выклікае першы красавіцкі дождж, што “золата варты”! Якім вялікім эстэтычным пачуццём прасякнуты народныя словы: *“Майская травіца – нібы маладая дзявіца”, “Кветкі мацней пахнуць перад даждджом”, “Лета селяніну і маці, і бацька”, “У верасні сініца восень у госці кліча”* [Там жа]. Малыя фальклорныя формы жывуць працяглы час, аздабляюць і эстэтызуюць плынь сацыяльных зносін.

***Назіранні*** за ўзорамі працы лепшых майстроў падштурхоўваюць, вучаць стварэнню эстэтычна значных рэчаў. Адсюль ідзе пачатак існавання традыцыйных беларускіх промыслаў: адметных сваімі рысамі керамікі (Бабінавіцкая, Гараднянская, Гарадоцкая, Івянецкая, Пружанская і г.д.), ткацтва (Слуцкія паясы, Няглюбскія і Мотальскія ручнікі), традыцыйнага адзення (Маларыцкі, Калінкавіцкі, Магілёўскі, Вілейскі строі). Па стылістыцы апрацоўкі, па асаблівасцях упрыгожванняў людзі меркавалі, адкуль, з якой мясцовасці рэчы. Майстры імкнуліся прытрымлівацца спецыфічных рыс выканання, што належаць іх мястэчку, дасягаць дасканаласці ў сваіх вырабах: рабіць так, каб зручная рэч радавала вока і доўга служыла.

Вянец працоўных дзеянняў – ***святы***. Да іх найбольш старанна прыбіраюць ў хаце, мыюцца самі, надзяваюць лепшае адзенне, скіроўваюць намаганні, каб ўпрыгожыць быт. Па словах І.І. Крука, “селянін цвёрда трымаўся народнага календара: у працоўны дзень ад зоркі да змяркання быў ў полі, у святочны – святкаваў, не парушаючы выпрацаваных вякамі забабонаў, бо добра ведаў, што адыход ад норм паводзін мог наклікаць на сям’ю бяду, пагоршыць дабрабыт, сапсаваць адносіны з суседзямі, аднавяскоўцамі” [100, с. 70]. Менавіта працоўныя зразумелі і пачалі выкарыстоўваць выхаваўчы моц свята. У святах ***усе разам*** выконваюць эстэтычна значныя дзеянні: людзі ўпрыгожваюць



Рэпазіторый ВГУ

сябе (святочнае адзенне, вянкі), хату (чыстыя ручнікі, набажніцы, абрусы, новыя “павукі”, выцінанкі, свежая зяляніна), расліны (завіваюць бярозку, аздабляюць першы сноп, апошнія злакавыя сцябліны на ніве). Ствараемая ўрачыстасць абрадаў, чысціня адзення, цела, душы, святочна прыбранае месца жыцця, самі людзі; песні, музыка – усё стварае радасны настрой. Такім чынам узнікаюць спрыяльныя ўмовы для маральна-эстэтычнага выхавання, абуджэння эстэтычных пачуццяў.

На святах дзеці назіраюць, вучацца танцам, запамінаюць паслядоўнасць і разнастайнасць рухаў, музыкальную канву, паслядоўнасць іх выканання: “Чым глыбей дзіця ўглядалася ў дэталі, тым больш пераконвалася ў тым, што ўсе яны – розныя і непастаянныя па форме – маглі выразіць любую думку і праўдзіва адбіць любы час. У гэтай універсальнасці і заключаецца яе важная роля ў эстэтычным выхаванні” [1, с. 58]. Потым, ужо ў групе аднагодкаў, дзеці аднаўляюць набытыя веды, пераводзяць іх ва ўменні, а яшчэ далей, ствараюць танцавальны малюнак самі. Дзеці не мелі сваіх, асобных свят, аднак яны заўжды былі ў цэнтры свята, яны былі разам з вяскоўцамі. З іх ліку абіраліся персанажы, што станавіліся цэнтральнымі ў абрадах (Лёля, Куст, Русалка, Шчадрэц, Ярыла і г.д.). Гэта садзейнічала развіццю эстэтычнага ўспрыняцця, пачуццяў, атрыманню ведаў.

Адно з рытуальных дзеянняў перад святамі (асабліва Велікаднём, Калядамі) – абмыванне вадой. Паступова купанне ў вадаёмах замянілася лазняй, а ў посуд з вадой сталі класці срэбра. Раніцай, перад узыходам сонца, вада павінна змыць хваробы, прыдаць прыгажосць твару. Можна меркаваць, што сярод усіх пачуццяў, якія валодаюць чалавекам у гэты момант, уладараць эстэтычныя: пачуццё прыгажосці, добразычлівасці, жадання наблізіцца да эстэтычнага ідэала.

Уплывае на эстэтычны густ вусная народная творчасць, бо існаванне ў песенным свеце, плыні прыказак і прымавак, замоў, казак развівае рытмагукавое пачуццё мовы. І хаця шмат казак расказваецца ў межах сямейнага выхавання, цэняцца казачнікі, якія, сабраўшы вакол сябе слухачоў, дазваляюць ва ўсёй красе адчуць прыгажосць твораў народнага фальклору.

Вясковая суполка выносіць меркаванне аб маральных якасцях жыхароў. Лепшыя маюць вялікія перавагі. Існаваў звычай, калі ў гонар такіх людзей называлі немаўлятак, бралі іх адзенне, каб прыняць нованароджанага. Лічылася, што хросныя павінны быць высокамаральнымі людзьмі, а ўсе астатнія іх характарыстыкі адносіліся да другасных. Такія людзі мелі найбольшую пашану ў вёсцы, з імі раіліся, высока ацэньвалі іх думкі, меркаванні па пытаннях, яны былі прыкладам для жыхароў вёсцы.

Рэпазіторый ВДУ

### *Выкарыстанне метадаў першай групы* ***ў выхаваўчым уздзеянні аднагодкаў:*** праца, прыклад і аўтарытэт, назіранні, гульня, гутарка, практыкаванне, грамадская думка, зварот да страху, бурклівасці

***Гульня*** садзейнічае фарміраванню гатоўнасці дзіцяці да сацыяльна-псіхалагічнай дзейнасці. Дзіця ведае свае сацыяльныя функцыі, але выконвае іх у залежнасці ад вопыту. Гульня з'яўляецца школай зносін для малога, якая дапамагае вырашыць задачы бесканфліктнага выхаду з сітуацыі. У прыватнасці, лічылку можна разглядаць у якасці мікрагульні з мэтай станоўчага вырашэння праблемы, яна здымае асабістую адказнасць гульцоў за вызначэнне найбольш прывабных ці непрывабных роляў.

Дзіця расце ў гульні, якая вызначана беларускімі даследчыкамі як "сацыялагічны феномен, у якім умоўна адлюстроўваецца рэчаіснасць" [131, с. 141]. Некаторыя з іх выглядаюць драматычнымі дзеяннямі ("Пастух", "Авечкі", "Рэдзька" [52], "Каршун", "Гаспадыня і кот", "Фарбы", "Купец", "Рэдзька", "Гусі-лебедзі і воўк" [15]) з традыцыйна зафіксаванымі мастацкімі вобразамі і падзеямі. Існуюць гульні-карагоды, у якіх арганічна яднаюцца песня і рухі ("Падушачка", "У карагодзе мы былі", "Мак" [52], "Бярозка", "Лянок", "Пляцень", "Грушка", "А мы проса сеялі", "Агароднік", "Макі-макавачкі" [15]). Любяць дзеці спартыўныя гульні, дзе падзелены ролі, прысутнічае элемент спаборніцтва, а пэўныя словы падштурхоўваюць да выканання дзеянняў ("Дзядуля-ражок", "Фарбы", "Кілім-бам-ба", "Блін гарыць" [Там жа], "Гарлачык", "Даганялкі", "Дзікуны і беларусы", " Пацяг" [52]).

Гульні вучаць малых быць уважлівымі, назіральнымі, знаходлівымі, развіваюць творчыя магчымасці, вастрыню зроку, слыху, пачуццё прыгажосці, дапамагаюць засвоіць культуру свайго народа. А.Ю. Лозка вызначае народныя гульні як "від актыўнага адпачынку чалавека, гістарычна сфарміраванага на аснове драматызаваных, умоўных або творчых дзеянняў, у якога склаліся пэўныя правілы і прыёмы забаў і які з'яўляецца сродкам фізічнага, разумовага і маральна-эстэтычнага выхавання" [52, 17]. Шэраг народных гульняў ператварыліся з абрадаў, рытуальнай культуры дарослых, страціўшы свае магічныя ўласцівасці. Яны прыйшлі з часоў сівой даўніны, а таму нясуць адбітак язычніцкіх культаў, хаця ў рэчаіснасці ўспрымаюцца толькі сродкам адпачынку ці набыцця нейкіх навыкаў. Некаторыя гульні нарадзіліся як вынік назіранняў за працай, прыроднымі з'явамі, паводзінамі людзей. Аднак усе яны вучаць малых быць уважлівымі,



Рэпазіторый ВДУ

назіральнымі, знаходлівымі. Развіваюць вастрыню зроку, слыху, любоў да Радзімы, пачуццё прыгажосці, дапамагаюць засвоіць культуру свайго народа.

Цікавымі з пункту гледжання прыстасаванасці для эстэтычнага выхавання з'яўляюцца гульні-драматызацыі. Удзел у такіх "спектаклях" дае шмат карыснага кожнаму з гульцоў. Дзеці набываюць узгодненасць дзеянняў, у гульнёвай форме атрымліваюць і замацоўваюць веды аб тыповых праявах характару людзей, жывёл, выдзяляюць эстэтычныя аспекты ў працоўных аперацыях ("Рэдзька", "Гусі-лебедзі і воўк"). Ідзе развіццё тэатральных здольнасцей ў малых, яны рыхтуюцца да ўдзелу ў вялікіх святах дарослых. Непасрэдна ў гульнях дзеці вучацца разумець навакольны свет, дзейнічаць разам, мацнеюць фізічна.

У гульні "Рэдзька" выбіраюцца Ясь і гаспадар. Усе астатнія ўдзельнікі гульні – рэдзькі. Пачынаецца драматычная дзея, насычаная гумарам, песнямі, спаборніцтвамі. Песенька Яся, кпіны "рэдзек" смешныя і запамінальныя. Герой спрабуе выцягнуць адну з рэдзек, а яны нязлосна пасмейваюцца з Яся:

*"Ножкі ў Яся тоненькія,*
*Ручкі ў Яся слабенькія!"* [15, с. 52–53].

Гульня працягваецца, пакуль не будуць выцягнуты ўсе рэдзькі. Гэта дзеянне, насычанае жартамі, развівае мастацкія здольнасці, пачуццё гумару.

***Назіранні*** за дарослымі з'яўляюцца крыніцай для шматлікіх дзіцячых забаў. Дыялогі многіх драматызаваных гульняў падаюцца спісанымі з жыцця сялян, яны аздоблены гумарам, пачуццём рыфмы, рытму мовы.

Асаблівы ўплыў на эстэтычнае развіццё аказваюць гульні-карагоды. Іх упрыгожваюць арганічнае спалучэнне слоў, рухаў, песень, народных мелодый. Дзеці набываюць навыкі эстэтычных рухаў, калі танцуюць, развіваюць музычны слых і пачуццё мовы, калі спяваюць, сюжэт гульні вучыць эстэтычным адносінам да рэчаіснасці. Адзін з прыкладаў таму – "Бярозка" [15, с. 5]. Выбіраецца дзяўчынка-бярозка. Дзеці ходзяць па крузе, паклаўшы хустачкі на плячо, і спяваюць песеньку. Дзяўчына-бярозка, што стаіць у крузе, пад песню забірае хустачкі, падымае іх над галавой, імітуе шум лістоў, рух галін – шамаціць сукенкай, махае хустачкамі. Пад прыгаворку: *"А восенню карані ў бярозкі засынаюць, лісточкі ападаюць!"* – дзяўчынка-бяроза абыходзіць карагод і кожнаму на плячо кладзе яго хустачку [15].

Репозиторий ВГУ

У гульні "Надзейка" ўсе разам з вядучай павінны выконваць прапанаваныя рухі. Зразумела, дзіця, што выконвае ролю Надзейкі, імкнецца найбольш спрытна, яскрава выканаць песенныя загады ўдзельнікаў. А тыя, у сваю чаргу, старанна назіраюць за ёй, вучацца ўзгадняць свае рухі з рухамі абранай Надзейкі. Такім чынам, прапанаваная гульня вучыць дзяцей назіраць за чалавекам, жывёламі, раслінамі, фарміруе пэўныя харэаграфічныя навыкі.

У гульні "Калім-бам-ба" [15, с. 33] дзяцей цікавіць знешняе афармленне: дзве роўненькія шарэнгі, пачуццё моцна сціснутых рук сяброў, адчуванне сваёй еднасці з камандай. Узнікае агульная радасць ад затрымання або захопу праціўніка ці лёгкай збянтэжанасці, калі прайграюць. Гульня ўвесь час эмацыянальна насычана, поўніцца жаданнем перажываць. А пасля фізічна стомленыя дзеці звяртаюцца да неверагодных гісторый – казак.

Назіранні за дарослымі ў працы, на святах прывялі да ўзнікнення гульняў, у якіх дзеці паўтараюць працоўныя працэсы, адлюстроўваюць некаторыя абрады, гістарычныя падзеі і звычаі, што адыйшлі ў мінулае. Прыкладамі такіх гульняў з'яўляюцца "Стралец", "Французы і беларусы", "Жану красць", "У казакоў", "Прыгон", "У вайну", "Рускія і ляхі", "Некрут", "Кароль" і г.д. Аднак дзеці не толькі назіраюць за жыццём; да іх звяртаюцца дарослыя з растлумачэннямі, унушэннямі, перакананнямі, адчуваючы свой абавязак перадаць веды, у тым ліку і эстэтычныя.

Гэтыя ж назіранні прывялі да ўзнікнення гульняў, у якіх дзеці проста паўтаралі працоўныя працэсы [52]: "Пячэнне хлеба", "Пастух і авечкі", "У каноплі", "Снапы вязаць", "Чобаты", "Лён", "Мак" і г.д. Акрамя таго, дзеці разам з дарослымі ўдзельнічаюць у абрадах, самастойна ходзяць да бабкі па "валачобнае", з'яўляюцца засявальнікамі на "Васілля". Без дзяўчынак не абыходзіцца абрад ваджэння куста, яны ж запрашаюць гасцей на святкаванне хрэсьбін (Палессе, Цэнтральная Беларусь). Хлопчыкі і дзяўчынкі на Аўдоццю і на Саракі з "жаўраначкамі" гукаюць вясну, коўзаюцца з горак на Масленку, катаюць яйкі ў Вялікдзень і г.д. Такім чынам, падкрэслівае Л.В. Ракава, шэраг культавых і бытавых абрадаў служылі сюжэтамі народных гульняў: "Яшчур", "Зязюля", "У тура", "Жаніцьба Цярэшкі", "Страла" [166].

Сярод дзяцей вылучаўся пэўны хлопец (дзяўчына), больш спрытны, моцны, лоўкі, прыгожы, які меў больш ведаў. Менавіта гэты чалавек станавіўся лідэрам, ва ўсялякім выпадку прэтэндаваў на гэтую ролю. Калі ж хто-небудзь з хлопцаў рабіў нешта нядобрае, быў пашыраны звычай кінуць у бруд ягоную шапку. Лічылася нядобрым рабіць фізічнае пакаранне, а праз рэч выказваліся адносіны да ўчынку чалавека альбо да самой асобы.



Репозиторий ВГУ

Дарослыя разумелі неабходнасць зносін равеснікаў паміж сабой. Аднак яны ўносілі пэўную скіраванасць працэсу. У прыватнасці, ад іх ішлі лагодныя ці адмоўныя адносіны паміж некаторымі дзецьмі.

Больш сталыя дзеці занятыя працоўнай дзейнасцю. Зразумела, спачатку гэта найбольш простыя аперацыі, якія выконваюцца ў сямейным побыце, аднак падлеткавы ўзрост дазваляе даяраць больш значныя і складаныя дзеянні. Адной з любімых спраў хлопцаў было пасвіць коней, бо гэта давала магчымасць пакатацца на жывёліне. Падлеткам хацелася паказаць свой спрыт, уменне кіраваць канём, выканаць нейкую "штуку". У начным дзеці расказвалі адно аднаму казкі, дзяліліся прымхамі, расказвалі сакрэты забабонаў: як прываражыць дзеўку ці хлопца, як стаць багатым, здаровым, хто будзе суджаным – пра ўсё гэта вяліся размовы, выклікаючы шмат разнастайных пачуццяў. Дзеці вучыліся марыць, маляваць эстэтызаваны вобраз будучыні, параўноваць эстэтычнае і неэстэтычнае.

*Выкарыстанне метадаў першай групы* ***самой асобай:***
саманазіранне, самааналіз, самаўнушэнне, самаперакананне, гульня, саматлумачэнне, самазапалохванне, самавымова, пачуццё павагі да старэйшых і г.д.

Беларуская народная педагогіка актыўна прапагандуе працэс самавыхавання. Асоба павінна самадабудоўваць сябе ў зносінах, у вырашэнні шматлікіх задач. Гэты працэс будзе вызначальным для значнасці асобы і яе дзейнасці ў грамадстве. Пра значнасць самаўдасканалення гавораць казкі, калі знешне і сацыяльна невыразны галоўны герой, што прайшоў шэраг выпрабаванняў, пераўтвараецца ў добра-молайца, бярэ шлюб з прыгажуняй, з царэўнай.

Праз саманазіранне і самааналіз чалавек вучыўся знаходзіць тое ў навакольным і грамадскім жыцці, што кранае яго душу, вабіць вонкава, ці гукам. Самааналіз праходзіць праз усю сістэму прыказак і прымавак (*"Без прыказкі размова, што ежа без солі", "Без прыказкі і з лаўкі не зваліцца", "У прыказцы – праўда святая", "Добрая прыказка не ў брыво, а ў вока", "Добрая пасорвіца ў вочы колецца", "Умелая прыказка, што ў мяшку прывязка"* [157]). Шляхам паўсячаснага ўжывання прыказак і прымавак, дзе замацаваны маральна-этычны кодэкс народа, чалавек аналізуе жыццё, свае ўчынкі, а гэта значыць, узгадняе паводзіны, дзеі з ідэаламі: *"Сон на заўтра адлажы, а справу сёння зрабі", "Лепей жартаваць, чым гараваць", " Не з прыданым*



Репозиторий ВГУ

*жыць, а з чалавекам", "Не ўсё тое бяры, што хараша", "Добрае доўга помніцца, а кепскае ніколі не забудзецца", "Не рабі ліхога і не бойся нікога"* [Там жа]. Маральна, добра, па-чалавечы – гэта і значыць – прыгожа. Так, уся сістэма прыказак і прымавак беларускага народа з'яўлялася маральна-практычнай філасофіяй жыцця. Гэта карэктавала пачуцці, свядомасць і паводзіны чалавека.

Распаўсюджана самаўнушэнне. Беларус верыў, што, калі нейкія справы будуць выконвацца ў традыцыйным строга зафіксаваным парадку, то гэта паспрыяе як урадлівасці глебы, моцнасці жывёлы, так і заможнасці гаспадаркі, інакш кажучы – дабрабыту. Дабрабыт жа разглядаўся як неад'емная частка эстэтычнага ідэала, да якога мелі намер наблізіцца:

*Дай жа, Божа, пане гаспадару,*
*Жыці-быці, жыта павазіці,*
*Жыта павазіці, у тару злажыці,*
*У тару прыкладна, на таку ўмалотна,*
*На таку ўмалотна, у арудзе прысыпна…*[100, с. 84]

Жанчыны верылі, што калі пазбіраюць зёлкі на Купалле, то яны будуць уладаць надзвычайнымі лекавымі ўласцівасцямі. Прыгожыя кветкі пералёт-травы (лятучае зелле, зелле шчасця) нават амаль вынішчылі, бо "шчаслівы той, хто сарве іх: у сваім жыцці не знае гора, жаданні збудуца, здароўе паслужыць". Аднак выкарыстоўвалі расліну дзеля таго, каб дзеткі былі шчаслівымі – іх купалі ў адвары зёлкі [13, с. 375].

Існавалі дзеянні, якія маглі паспрыяць таму, каб нехта моцна закахаўся. Верылі, што, калі часта сумесна ўжываць акрайчык хлеба, ваду, пасля мыцця ў святочны дзень, дробку солі, абнесеную вакол хлопца ці дзяўчыны – усё гэта паспрыяе ўзнікненню моцнага любоўнага пачуцця.

Успрыняцце паразумення прыгажосці ў працэсе самавыхавання асобы ішло і цераз пачуццё павагі да старэйшых. Яно фарміравала асаблівы душэўны настрой, які перадаваўся ў такіх павер'ях, што Бог, калі ходзіць па зямлі, набывае вобраз старца. Старцы разглядаліся як носьбіты долі, лічылася, што, калі падчас нараджэння дзіцяці ў хату завітае старац – дзіця будзе шчаслівае [Там жа, с. 448]. Існавала патрабаванне паважлівых адносін да старых, нават тых, хто "здзяцінеўся". Беларусы верылі, што, калі дзіця шмат часу праводзіць з такім старым, то атрымае таксама доўгае жыццё, а пасля сам будзе адыгрываць такую ж ролю.

Часам беларус самазапалохваў сябе: знаходзячы нейкія незвычайныя, непрыгожыя выявы, якія прыносяць чалавеку шкоду.

Репозиторий ВГУ

Напрыклад, аблуднае дрэва – нейкае асаблівае паваленае бурай дрэва, пераступіўшы праз якое чалавек абавязкова заблудзіцца нават у знаёмым лесе [13, с. 151]. Гэта спрыяла таму, што чалавек, імкнуўся абмінаць непрыгожыя мясціны, звяртаць увагу на прыгажосць-непрыгажосць рэчаіснасці.

**Метады, скіраваныя на фарміраванне і развіццё уменняў будаваць і захоўваць прыгажосць (экстравертаваныя метады):** паводзін, зносін, працы, творчасці, прыроды і г.д.

*Выкарыстанне метадаў другой групы* ***ў сямейным выхаванн:*** практыкаванні, ухваленні, праца, вымова, прывучэнне.

Розныя эмоцыі, перажыванні поўняць чалавечае жыццё. Смерць чалавека, асабліва блізкага, – трагедыя, нясе адчай і роспач, глыбокія душэўныя пакуты, значнае ўзрушэнне родным памёрлага. Эмацыйнасць выліваецца ў пэўную паслядоўнасць і эстэтыку абрадаў са сваёй атрыбутыкай (абмыванне нябожчыка, апрананне ў новае адзенне, раскідванне на шляху да могілак яловых галінак, апусканне ў магілу на ручніку, памінальныя галашэнні, рытуальныя дні). Лічыцца неабходным утрыманне могілак у парадку. Пастулат народнай педагогікі: капаць зямлю да Радаўніцы нельга, бо на гэта продкі не даюць згоды. Спачатку прывядзіце да ладу магілку продкаў і толькі потым бярыцеся ладзіць справу ў сваёй гаспадарцы [99, с. 123]. Існавала павер’е, што калі гэта не зрабіць, родныя “пакрыўдзяцца” і не будуць спрыяць жывым у іх пачынаннях.

Перад Радаўніцай папраўляюць магілы, крыжы. Родныя ў святочным адзенні з рытуальнымі стравамі збіраюцца на магіле продкаў і пачынаецца памінальная трызна, добрыя ўспаміны пра родных, “размовы” з імі. Абавязкова прысутнічаюць галашэнні: “У народным асяроддзі нават ганьбавалі тых жанчын, якія не ўмелі добра галасіць” [100, с. 87]. Галашэнні – непаўторны фальклорны жанр, які мае сваю паэтыку, пэўныя ўстойлівыя словазлучэнні, сімвалы, метафары, сінонімы. Гэта своеасаблівы катарсіс, які выкліканы трагічнай з’явай жыцця. Паэзія галашэнняў дапамагае ачышчэнню душы, развіццю пяшчоты, даравання, падзякі:

*...І яблычка маё, сахарнае маё,*
*Недазрэўшы, адвалілася! Галоўка мая буйненькая!*
*Чаму ты рана пакацілася?*
*Вочкі мае ясненькія!*
*Чаго вы рана заплюшчыліся?*



Репозиторий ВГУ

*Ручачкі мае беленькія!*
*Чаму вы рана падламіліся?..* [Там жа, с. 93]

– стогне жанчына, што страціла дзіця.

Страта, па словах філосафаў, “нараджае магутны ўсплеск эстэтычных перажыванняў, з дапамогай якіх чалавек спасцігае імклівасць жыцця і змен у ім” [122, с. 125]. У гэтым сэнсе чалавек паглыбляе сваё светаўспрыняцце. Твор адлюстроўвае барацьбу быцця з небыццём, а таму не толькі нараджае, але і замацоўвае эстэтычнае пачуццё, творчыя адносіны да свету, у ім выяўляюцца ўсе бакі прыгажосці свету, як схаваныя, так і бачныя. У галашэннях жыццё імкнецца пераадолець нябыт. Радаўнічныя памінанні адметны пераходам ад турбот дня сённяшняга да перажыванняў дня мінулага, а потым зноў вяртаннем да рэчаіснасці. Кажуць: *“На Радаўніцу да абеду пашуць, па абедзе плачуць, а ўвечары скачуць”* [100]. Як бачна, духоўна-эстэтычнае развіццё асобы ўплывае на эмацыйны стан чалавека.

Шмат народных правіл, звычаяў мае сэнс – упрыгожыць жыццё, даць маладым арыенцір: як рабіць лепш, каб было прыгожа. Напрыклад: *“Як абіваюць лён, трээ пець песні, та праз усю работу зы льном будзе спявацца”, “Перш, чым мясіць у дзяжы цесто, жанчына павінна ўмыцца й памаліцца Богу, а то цесто не падыдзе”* [182, с. 91].

Зразумела, праца як асноўны метад народнай педагогікі, стаіць у шэрагу першых. З яе дапамогай адбываюцца ўсе перамены: з’яўляюцца і ўпрыгожваюцца вырабы, арганізуецца дзейнасць. Аб гэтым кажа народная мудрасць: *“Акуратная работа акуратных людзей любіць”, “Як робіш, так і маеш”, “Не святыя гаршкі лепяць”* [17]. Бацькі заўжды выступаюць прыкладам для сваіх дзяцей, усё добрае і ўсё благое – ад іх. Менавіта бацькі з’яўляюцца тым прыкладам, які садзейнічае ўзнікненню эстэтычна значнай дзейнасці. У сям’і дзеці бачаць першыя праявы мастацкага аздаблення вырабаў, эстэтычных адносін, чуюць першыя патрабаванні: *“Рабі так, каб сабак не дражніць і людзей не смяшыць”, “Не хваліся языком, а хваліся дзелам”, “Хутчэй, але не спяшайся”, “Жаданая праца як сонца ўзыход”* [Там жа], падмацаваныя работай бацькоў. Нават самае просценькае заданне малыя павінны выканаць прыгожа. Каб гэта атрымалася, родныя паказваюць прыёмы працы, тлумачаць, а потым і патрабуюць прыгожага выканання. Вясковыя матулі пры навучанні дзетак працоўным аперацыям абавязкова прыгаворваюць: *“Рабі так, каб было прыгожа”* [5].



Репозиторий ВГУ

Хутка далучаецца грамадская думка. Яе ўплыў на эстэтычна значную дзейнасць ідзе праз практычныя парады: *“За справу бярэшся – не бойся і не хваліся”, “Не пытайся, ці галоўка гладка, а пытайся, ці падмецена хатка”, “Ці ж цаніць дзеўку па сукенцы ў нядзельку?”, “Не глядзі, каб скора, а глядзі, каб добра”, “Чалавек без рамяства, як дзеўка без хараства”* [19].

Беларусы надаюць увагу фізічнай прывабнасці чалавека. Менавіта ў сям’і перадаюцца сакрэты касметычных сродкаў для захавання прыгажосці: як рыхтаваць адвары траў, выкарыстоўваць сокі, мёд; як рабіць магічныя дзеянні. Напрыклад, на Аленульносейку дзяўчаты не заплятаі валасы: *“Было павер’е, што валасы доўгімі стануць, светлымі, як лён”* [58, с. 109].

У сям’і адбываецца прывучэнне да ўмення цаніць і захоўваць прыгажосць цела. Абавязкова сям’я мылася ў лазні, яна выкарыстоўвалася ў якасці лекавага сродку, які дапамагае паправіць здароўе. Кожная жанчына перадавала рэцэпты падтрымання здароўя ў належным стане сваім дзеткам. Якая зёлка ад прастуды, якая для супакаення нерваў, якая для паляпшэння стрававання – усё ведалі і скарыстоўвалі ў жыцці. *“Здароўе – найлепшае багацце”, “Здаровы багатаму варты”, “Здароўе мілейшае за грошы”, “Брат любіць сястру прыгожую, муж жонку здаровую”* [19] – гэтыя і іншыя прымаўкі вымушалі больш увагі ўдзяляць фізічнаму стану. Аднак беларусы былі глыбока ўпэўнены, што, акрамя фізічнага здароўя і моцы, чалавек павінен валодаць і высокай маральнасцю, культурай. Бацькі вербалізуюць пастулаты грамадскай думкі: *“Чым кабета стражэй, тым яна даражэй і прыгажэй”, “Краса прыглядзіцца, а розум прыгадзіцца”* [157]. Праз выхаваўчыя падыходы сям’і дзіця набліжаецца да эстэтычнага ідэала народа.

*Выкарыстанне метадаў другой групы* ***мясцовай суполкай жыхароў:*** іспыт, спаборніцтва, грамадская думка, ухваленне, праца, вымова, ухваленне

Існаванне ў плыні роднай мовы, актыўнае карыстанне яе багаццямі вядзе да таго, што кожны чалавек можа стаць аўтарам ці сааўтарам твора. Авалоданне складанай сістэмай паэтычна-вобразнай сімволікі, прыёмамі вершаскладання, асаблівасцямі гукапісу народнай песнятворчасці – спачатку служыць развіццю эстэтычнага густу, а потым арганізуе эстэтычна значныя практычныя дзеянні.

І зноў звернемся да працы. Яна стварае святочнае адзенне, абрусы, дываны, керамічныя, пляцёныя вырабы, натхняе на ства-



Репозиторий ВГУ

рэнне фальклорных твораў. На працу абапіраецца грамадская думка; у ёй праходзяць спаборніцтвы лепшых майстроў і гаспадароў. Спаборніцтвы і не трэба аб'яўляць, бо кожны ведае, што 25 лютага выстаўляецца на мароз пража ("Пазараніш пражу пасля Уласа, будзеш з грашыма і на Масленіцу"), а 2 красавіка на Святлану выносяцца з "хаты на вуліцу ільняныя палотны", іх развешваюць "на платах, варотах ды брамах" [58, с. 64]. Кожны бачыць і ацэньвае прыгажосць вырабаў. А на многіх народных святах людзі спаборнічаюць у майстэрстве, розуме, спрыце [5]. Спаборніцтвы дапамагаюць вызначыць, хто добры гаспадар, гаспадыня, у каго залатыя рукі. Кожнаму хочацца, каб ішла пра яго добрая пагалоска, бо гэта паспрыяе добраму шлюбу, паважлівым адносінам аднавяскоўцаў. Дзеля гэтага любую работу імкнуцца зрабіць хутка, прыгожа і якасна. Дзяўчаты ведаюць, што за імі пільна наглядаюць у час жніва, каб выбраць найлепшую жонку ці нявестку. Вёска ацэньвае самы тонкі і мяккі лён, добрае палатно, прыгажосць вышыўкі. Параўноўваюць і хлопцаў: хто зробіць прыгажэйшы калаўрот, лепш узарэ зямлю, хутка і якасна скосіць траву і г.д.

Кожны член вясковай суполкі павінен паводзіць сябе такім чынам, каб прыемна было і яму, і яго суседзям. Сярод беларусаў распаўсюджаны звычай, па якім жыхары вёскі віталіся нават з незнаёмымі. На фарміраванне звычаю аказала ўплыў імкненне народа да прыгажосці чалавечых зносін і ўчынкаў. Можна казаць пра традыцыйную эстэтыку быту, бо "разнастайныя рэчы хатняга ўжытку, начынне, падсобны інвентар, мэбля, тканіны, харчовыя прыпасы займалі ў сістэме інтэр'ера сваё звыклае, уласцівае ім месца, змяшчаліся ў пэўнай паслядоўнасці і парадку, утвараючы пэўную функцыянальную і кампазіцыйную ўзаемасувязь" [6, с. 59]. І гэты парадак адзначаўся, ухваляўся вяскоўцамі.

Народ разумее, што эстэтычна выхоўвае не проста прыгожае наваколле, а самі людзі, іх праца, бо вучыць не толькі заўважаць і любіць прыгожае, але і актыўна клапаціцца пра яго. Праз народную педагогіку праходзіць думка, што выхавальнік павінен ведаць, што з'яўляецца прыгожым; што ўяўляе сабой эстэтычны ідэал і шляхі набліжэння да яго; нарэшце, ён сам, учынкі, быт павінны быць эстэтычнымі, інакш кажучы, аб'ядноўвае імкненні, словы і справы чалавека.

Народныя святы з'яўляюцца прыкладам таго, як сяляне фарміруюць актыўнасць, здольнасць ствараць прыгажосць, сцвярджаць яе ў жыцці. Напрыклад, вясельныя песні даюць характарыстыкі маладой, якія ўбіраюць не толькі знешнія прыкметы прывабнасці, ідэалізацыі, але і ўменні ствараць і захоўваць прыгажосць:



Репозиторий ВГУ

*Хваліўся Іванка сваёй жаною,*
*Што мая жоначка – рукадзельніца,*
*Што мая жоначка – рукадзельніца,*
*Выткала красёнцы трыма страямі,*
*Выткала красёнцы трыма страямі:*
*А першы страёчак – ясны месячык,*
*А першы страёчак – ясны месячык,*
*А другі страёчак – ясна зорачка,*
*А другі страёчак – ясна зорачка,*
*А трэці страёчак – дробны звёздачкі.*
*А трэці страёчак – дробны звёздачкі.*
*А ясен месячык – я сам малады,*
*А ясен месячык – я сам малады,*
*Ясная зорачка – мая жоначка,*
*Ясная зорачка – мая жоначка,*
*Дробныя звёздачкі – мае дзетачкі,*
*Дробныя звёздачкі – мае дзетачкі…* [19, с. 308–309]

Абавязкова на вяселлі гучалі жартоўныя песні, якія здымалі страх маладых перад пачаткам новага жыцця. Сапраўды, ці можна ж баяцца месца, дзе

*ў нас кошкі мыюць ложкі,*
*Галкі мыюць лаўкі,*
*Вецер хату мяце,*
*Месяц дзяжу месіць,*
*Сонейка пірагі пячэ,*
*А дожджык па ваду ідзе…* [Там жа, с. 308].

Альбо такі прыклад, які падсмейвае і цешчу, і яе зяця:

*Хвалілася цешча зяцем,*
*Што зяць маладзенькі.*
*Аж ён маладзенькі,*
*Аж ён маладзенькі –*
*Як дзядок старэнькі.*
*Барада лыкам сшыта,*
*Барада лыкам сшыта,*
*Галава абручом збіта* [Там жа, с. 304].

Репозиторий ВГУ

*Выкарыстанне метадаў другой групы **ў выхаваўчым уздзеянні равеснікаў:*** праца, сумеснае баўленне часу, гульні, пастаноўка перспектывы, супарадкі, вячоркі

***Праца*** выліваецца ў спаборніцтва паміж старэйшымі падлеткамі: хто з іх лепшы майстар. Дзяўчаты могуць пахваліцца натканым палатном, прыгажосцю вышыўкі, якасцю адзення. Дарэчы, аб гэтым можна меркаваць як па святочнай вопратцы, якая апраналася ў пэўны час, так і па паўсядзённай, а таксама па пасагу, які рыхтуецца рукамі будучай жонкі да вяселля. Хлопцы цэняцца за спрыт, майстэрства. Адна з праяў майстэрства – уласны выраб калаўрота. Вось як апісвае гэту традыцыю М.Я. Нікіфароўскі: "Вырабу калаўрота, стройнай апрацоўцы яго надаецца найлепшы час з жыцця юнака, да якога ён прымяняе ўвесь свой майстэрскі спрыт, таму што большасць калаўротаў ёсць самаробны дар жаніха нявесце, любімага брата – сястры" [5]. Акрамя таго, у беларусаў па традыцыі моладзь вырабляе прыгожыя, неабходныя ў гаспадарцы рэчы, ад рукавіц да пярсцёнкаў і падносяць іх у падарунак каханым, сябрам, сваякам, родным. Грамадская думка ацэньвае намаганні маладых, адзначае і ўхваляе тых, хто жыве і нясе прыгажосць, умее працаваць і адпачываць.

Падлеткі вазілі снапы, сена і імкнуліся быць сярод першых, бо апошняга называлі "цялёпай". Дзяўчынкі выконвалі свае справы. З 15 год пачыналі рыхтаваць пасаг, аздаблялі яго вышыўкай і карункамі, вучыліся рыхтаваць смачную ежу (каб прыемна елася, хапала ўсім і была падрыхтавана ў час, без нейкіх неспажыўных рэчаў (вугалька, пруціка). На іх плечы перакладаўся догляд за парадкам у хаце, яны ж прыглядалі за меншымі брацікамі і сястрычкамі, маглі іх супакоіць, зрабіць цацку.

Каб быць прыгожымі, дзяўчынкі рыхтавалі сабе пацеркі з ягад, вянкі з кветак. Усе справы заўважаліся не толькі бацькамі, але і равеснікамі, таму і выбіралася найпрыгажэйшая і найспрытнейшая дзяўчына на свята, для выканання нейкага абрада па выніках дзейнасці (на Тройцу роля Куста [99, с. 114], Русалка ў русальны тыдзень [Там жа, с. 119]).

Паўсюды на Беларусі пасля заканчэння сельскагаспадарчых работ адбываліся супрадкі, вячоркі, попрадкі. Дзяўчыны збіраліся разам з работай у адной хаце. Да іх прыходзілі хлопцы, і тады попрадкі суправаджаліся забавамі, спевамі. *"Выбірай жонку не ў карагодзе, а на рабоце"* – аб гэтым ведалі і хлопцы, і дзяўчаты, таму звычай быў вельмі папулярны.

Цікавымі з пункту гледжання прыстасаванасці для эстэтычна значнай практычнай дзейнасці падаюцца гульні драматыч-

нага характару. У іх дзеці набываюць узгодненасць дзеянняў, у гульнёвай форме атрымліваюць і замацоўваюць веды аб тыповых праявах характару людзей, жывёл, выдзяляюць эстэтычныя аспекты ў працоўных аперацыях. Ідзе развіццё тэатральных здольнасцей, падрыхтоўка да ўдзелу ў святах дарослых, дзеці вучацца разумець навакольны свет, дзейнічаць разам, мацнеюць фізічна:

"У працэсе працы, гульняў, сумеснага баўлення часу дзеці ўступалі ў пэўныя ўзаемныя адносіны. У іх выпрацоўваўся своеасаблівы фальклор, які значна адрозніваўся ад паэтычнай творчасці дарослых, складваліся свае звычаі і абрады, заключаліся дамоўленасці аб вечным сяброўстве і братэрстве" [2, с. 144].

*Выкарыстанне метадаў другой групы па* ***самавыхаванні:***
практыкаванні, праца, самапланаванне, гульня і г.д.

Гульнявая дзейнасць як маленькага дзіцяці, так і падлетка мела этап самапланавання. Каб распачаць гульню, трэба было зрабіць цацку: знайсці кветкі, галінкі, гародніну і г.д. Рэчы з дапамогай фантазіі пераносілі дзіця ў цудоўны фантастычны свет, дзе здзяйсняліся яго цудоўныя мары: пра багаты статак, незвычайны ўраджай, прыгажунь у незвычайнай вопратцы.

У гульні ўсе жыццёвыя сітуацыі абыгрываюцца і пераносяцца на сябе. Дзіця адбівае тое, што бачыць у навакольным свеце. Гэта імітацыя ўбачанага пераносіцца ва ўнутраны свет пачуццяў: *"Добры чалавек і сабакі не будзе дражніць", ""Які "здароў будзь", такі і "на здароўе", "Як вы нашым, так і мы вашым", "Як гукаюць, так і адгукаюцца", "Як пражывеш, так і праслывеш", "Як цябе бачаць, так цябе пішуць", "Яшчэ гэткі не спаткаўся, каб усім ён спадабаўся"* [157].

Даволі цяжка падрабязна разглядаць самапланаванне асобы, бо гэта працэс індывідуальны, аднак таму, што гаспадарка на Беларусі мала шмат рысаў натуральнай, можна меркаваць, што яно адбывалася бесперапынна і дазваляла чалавеку знаходзіць найлепшыя шляхі да асэнсаванай, эстэтычна значнай працы.

Кожны чалавек, што меў на ўвазе выраб нейкай рэчы, старанна рыхтаваўся да гэтай падзеі. Па-першае, ішла падрыхтоўка матэрыялу, па-другое, працоўнага месца, па-трэцяе – чалавек засвойваў шэраг аперацый і імкнуўся выканаць іх ў пэўным парадку і з найбольшай эфектыўнасцю. Так, пры змене сацыяльнага статусу, чалавек павінен быў карэктаваць свой вонкавы выгляд – трансфармаваць адзенне. Такім чынам, як дзяўчына, так і хлопец планавалі, рыхтавалі сабе пэўныя элементы адзення, якія ўваходзілі ў іх гардэроб пасля ўступлення ў шлюб. Каб не атрымаць вымовы



Репозиторий ВГУ

ад аднавяскоўцаў, трэба было спланаваць і вырабіць фартух, кашулю, ручнікі і інш. Майстрыца сама задумвала рэч і сама выконвала ўсе працоўныя аперацыі, прытрымліваючыся традыцыйных мясцовых эстэтычных канонаў.

Напрыклад, выраб абыдзённіка. Да гэтай справы звычайна звярталіся ў крызіснай сітуацыі. Рытуал яго вырабу наступны: у адной хаце за дзень ці за ноч жанчыны пралі кудзелі і ткалі ручнік. Гэтаму ручніку прыпісвалася ўласцівасць убіраць ў сябе рэальнае зло ці служыць перашкодай для яго пранікнення ў кола аднавяскоўцаў. Новы, зусім чысты, прыгожы ручнік разбіваў моц варожай нячыстай сілы. Пасля правядзення рытуалу абыхода сацыяльнай прасторы, ручнік спальвалі, каб магічна забяспечыць знішчэнне ўсяго нядобрага, што напаткала на яго шляху. Сіла рэчы магчыма ўзнікала ад псіхічнай энергіі калектыву, імкнення стварыч рэч разам як мага больш хутка і прыгожа [13].

Такім чынам, не прэтэндуючы на завершанасць, мы прапаноўваем сваё бачанне сістэмы метадаў эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы. Яны ўсе ўзаемазвязаныя і ўзаемна дапаўняюць адзін аднаго, аднак мы лічым магчымым вылучыць сярод іх дзве групы:

1. Метады, скіраваныя на ўспрыняцце і паразуменне прыгажосці (інтравертаванага накірунку): фарміраванне і развіццё ўмення бачыць, адчуваць, успрымаць, разумець, ацэньваць прыгожае, эстэтычна перажываць з'явы прыгажосці (непрыгажосці).

2. Метады, скіраваныя на фарміраванне і развіццё уменняў будаваць і захоўваць прыгажосць (экстравертаваныя метады): паводзін, зносін, працы, творчасці, прыроды і г.д.

Групы метадаў рэалізуюць сябе паслядоўна ў сямейным выхаванні, выхавальніцкіх намаганнях вясковай суполкі, групе равеснікаў, самавыхаванні.

Найбольш пашыраныя метады эстэтычнага выхавання наступныя: перакананне, праца, прыклад і аўтарытэт, назіранне, гульня, парада, прывучанне, унушэнне, тлумачэнне, гутарка, заахвочванне, запалохванне, ухваленне, вымова, зварот да эстэтычнага пачуцця, павага да старэйшых, грамадская думка, асуджэнне, ухваленне, расповед і гутарка, узаемная павага, практыкаванне, зварот да страху, бурклівасці, ухваленні, іспыт, спаборніцтва, сумеснае баўленне часу, пастаноўка перспектывы, супарадкі, вячоркі, саманазіранне, самааналіз, самаўнушэнне, самаперакананне, саматлумачэнне, самазапалохванне, самавымова, пачуццё павагі да старэйшых.



Рэпазіторый ВДУ

Найбольш адпаведнымі сродкамі эстэтычнага выхавання мы разглядаем працу, рамёствы, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, мову, вусную народную творчасць (калыханкі, пацешкі, лічылкі, казкі, загадкі, прымаўкі і прыказкі, галашэнні, паданні), гульні, песні, прыкметы, традыцыі, звычаі, святы, абрады, эстэтыку паводзін, быта, арганізацыю серады абітання, лазню, прыроду.

## 2.2. Рэалізацыя метадаў эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы

Чалавечае жыццё падзяляецца на асноўныя этапы: дзяцінства, сталасць і старасць. Выхаванне найбольш эфектыўнае ў дзяцінстве. Таму скіруем погляд на традыцыйны падыход да эстэтычнага выхавання чалавека менавіта ў гэты час, тым больш, згодна з пазіцыяй Л.С. Лапцёнка, "традыцыйныя формы выхавання дзяцей непазбежна нясуць пячатку этнічных асаблівасцей… Каштоўнасная сістэма этнасу звязана з уяўленнямі аб вобразе дасканалай асобы. Гэтаму вобразу адпавядае свой стыль выхавання" [112, с. 66].

Адзначым, што ўзроставыя этапы ў беларускай народнай педагогіцы адрозніваюцца ад перыядызацыі, прынятай у сучасных псіхолага-педагагічных даследаваннях. Мы прытрымліваемся пазіцыі Г.П. Арловай [5], Л.В. Ракавай [165; 166], якія выдзяляюць у дзяцінстве ў адпаведнасці з традыцыямі і народнымі поглядамі "чатыры ўзроставыя ступені: маленства – ад нараджэння да 6–8 гадоў; дзяцінства – ад 6–8 да 12–14 гадоў; падлеткавы ўзрост – ад 12–14 да 16–17 гадоў і юнацтва – ад 16–17 да 18–20 гадоў. Кожнай з іх адпавядалі змены ў біялагічным развіцці дзіцяці, пэўныя абавязкі дзяцей у сям'і і грамадстве, адносіны бацькоў да дзяцей розных узростаў, адносіны да іх іншых членаў сям'і і грамадства" [190, 10]. На наш погляд, можна гаварыць пра тое, што ў пэўным узроставым перыядзе прэвалююць тыя ці іншыя метады эстэтычнага выхавання, скіраваныя на фарміраванне адпаведна непасрэднага пачуццёвага адлюстравання рэчаіснасці, эстэтычных перажыванняў, эстэтычных густаў, ацэнак, арганізацыі эстэтычна значнай практычнай дзейнасці. Інакш кажучы, мы бачым прыярытэтную скіраванасць тых ці іншых метадаў у розныя ўзроставыя адрэзкі.

Згодна з прапанаваным падыходам да ўзроставай перыядызацыі, паспрабуем разгледзець метады фарміравання непасрэднага пачуццёвага адлюстравання рэчаіснасці ў маленстве, узроставых падгрупах "анёлкаў" (ад 0 да 2–3 год) і "блазнюкоў"



Рэпазіторый ВГУ

(ад 2–3 да 6–8). Гэта метады назірання, растлумачэння, перакanання. Яны знаходзяць выражэнне ў шматлікіх відах дзіцячага фальклору.

З пялёнак хлопчыкаў і дзяўчынак выхоўваюць калыханкі. Гэта час першага, эстэтычнага знаёмства з жывёламі і птушкамі, іх яркімі, маляўнічымі апісаннямі, учынкамі, прыгодамі. Праз калыханкі ідзе перакананне ў іх карыснасці і прыгажосці, прывучэнне да добрых адносін да жывой прыроды, назірання за ёю. Улюбёныя фальклорныя персанажы твораў: кот (лічылася, што ён можа перадаць свае звычкі дзіцяці), голуб (сімвал чысціні, лагоднасці, прыгожых чалавечых якасцей), курыная сямейка (сімвал клапатлівасці і ўтульнасці):

*Пайдзі, коця, на вулку,*
*А дзіця ў люльку.*
*На ката варкота,*
*А на дзіця дрымота…* [19, с. 615].

Прырода ў калыханках адухоўлена, птушкі і звяры надзелены чалавечымі якасцямі, што дапамагае дзіцяці адчуць прыгажосць навакольнага свету, садзейнічае эстэтычнаму ўспрыняццю рэчаіснасці.

Даследчыкі гавораць аб своеасаблівай "школе пешчання маленькіх, якія яшчэ толькі пачынаюць развівацца, фарміравацца, і ў іх зараджаецца асэнсаванае разуменне" [132, с. 13]. Добрыя звычаі, якія якраз замацоўваюцца ў гэтым ўзросце, лепш за ўсё фарміруюцца праз назіранні шляхам пераймання. У многім спрыяе гэтаму само жыццё, дзе кожны дзень дзіця з'яўляецца непасрэдным эмацыйным удзельнікам пэўных сітуацый, па-свойму ўспрымае і засвойвае іх.

"Школа пешчання" ўдасканальвала вобразнае мысленне і была першай школай музычнай адукацыі. Галоўным момантам яе было закалыхванне. У беларусаў здаўна склалася найбагацейшая песенная культура з вялікай разнастайнасцю калыханак, якія добра ведала кожная сялянка, дзякуючы трансмісіі народнага вопыту з пакалення ў пакаленне" [190, с. 34]. З ростам дзіцяці паступова ўскладняюцца песні маці. Яны пачынаюць распавядаць пра ідэальныя ўяўленні народа аб шчасці, прасякнуты жыццёвай мудрасцю. Меладычныя, ласкавыя, крыху тужлівыя і надзвычай пяшчотныя напевы калыханак ахопліваюць дзіця любоўю мацярынскага сэрца і прыгажосцю. З нараджэння, слухаючы калыханкі, лічылкі, забаўлянкі, казкі, атрымліваюць дзеці першыя ўрокі эстэтыкі: прывучаюцца да мілагучнасці роднай мовы,

Рэпазіторый ВДУ

адзначаюць яе рытм, рыфмы, пявучасць, паступова авалодваюць эстэтычным поглядам на жыццё. Калыханкі, а разам з імі пацешкі, забаўлянкі і лічылкі не толькі прыгожыя, але і багатыя ў рытмагукавых адносінах. У залежнасці ад жанру твора рытм мяняецца з павольнага і закалыхваючага ў калыханках да хуткага, арганізуючага ў забаўлянках і лічылках:

*Раз, два, тры, чатыры,*
*Кошку грамаце вучылі:*
*Не чытаць, не пісаць,*
*А за мышкамі скакаць* [19, с. 626].

Лічылкі маюць важную асаблівасць – выразны, яскравы рытм, які надае магчымасць не проста прагаворваць тэкст, а выразна амаль што крычаць, а гэта прыносіць дзецям асаблівае задавальненне. Кожны вершык мае сваё гучанне, памер. Дзеці прывучаюцца адчуваць і падсвядома асэнсоўваць гэтыя якасці твораў у гульні.

Дзіцячыя песенькі, лічылкі, гульні весяляць малых, бадзёраць, даюць урокі маральнасці, эстэтычнага светаўспрыняцця. З заклічкамі, кароценькімі вершыкамі, песенькамі пасталелыя дзеці эмацыйна звяртаюцца да сонца і дажджу, вясёлкі і ветру (захоўваючы з пакалення ў пакаленне рэшткі старажытнай магіі). Гэта свайго роду ўводзіны ў сістэму музыкальных жанраў. Пры слуханні ці выкананні простага напеву дзеці вучацца адрозніваць танальнасць слоў, інтанацыю, авалодваюць зместам песенек:

*Сонейка, сонца,*
*Выглянi ў аконца.*
*Пасвяці нам трошку,*
*Дам табе гарошку* [Там жа, с. 622].

Развіваецца эстэтычная ўспрымальнасць, дзеці вучацца адчуваць рытм, гармонію. Вобразы з'яў прыроды клічуць не проста глядзець, але і бачыць, не толькі слухаць, але і чуць. Бесперапынна назапашваюцца эстэтычныя ўражанні ад прыродных і моўных з'яў, наваколля, прыгожых чалавечых праяў. Гармонія і мэтанакіраванасць вядуць дзяцей да пошуку эстэтычага ва ўсёй рэчаіснасці. "Грыбок, выстаў лабок: я цябе пацалую [132, с. 83]", – прыгаворваюць дзеці. Паўстае паралель паміж грыбком (як ласкава!) і жывой істотай, прыемнай, добразычлівай, якую хочацца пацалаваць. Наогул, увесь свет апісваецца эмацыянальна, увага накіроўваецца ў пачуццёва-эстэтычны бок, таму перад вачыма паўстае не проста адзінкавы прадмет, а паэтычна-завершаны во-

Рэпазіторый ВГУ

браз. Эмацыйным зносінам са старэйшымі спрыяюць разнастайныя выявы жывых і нежывых аб'ектаў, адлюстраваныя ў дзіцячым фальклоры. Даволі часта яны ствараюць малому настрой, бо родная мова садзейнічае ўзнікненню і змяненню пачуццяў, што адлюстроўваюць псіхічны стан асобы, які звязаны з уздзеяннем слова, рытму. Такім чынам, выкарыстанне сродкаў моўнай выразнасці дапамагае працэсу эстэтычнага выхавання.

У жыццё "блазнюкоў" уваходзяць гульні, прыкладам для з'яўлення якіх становіцца працоўная дзейнасць. Першыя гульні будуюцца на аснове назіранняў. Абагульненыя вобразы свойскіх жывёл (бульба з пруткамі ўвасабляе кароў, коней, свіней), чалавека (саламяная лялька) даюць прастору для ўласнай дзіцячай фантазіі, творчасці, пошуку эстэтычных вырашэнняў. Потым надыходзіць чарга гульняў з дзецьмі. "Да дзеда ў госці", "У мак", "Воўк і авечкі", "А мы проса сеялі", "Рэдзька", "Мікіта", "Лянок або Лён" [16] і іншыя з вялікай падрабязнасцю адлюстроўваюць працоўныя працэсы, рыхтуюць да іх дзяцей, выклікаюць жаданне ўзяцца за сапраўдную справу – і ўсё гэта ахутана эстэтычна прыўзнятым настроем. Дзіця ў гульні перажывае эмацыйныя пачуцці ад выканання ва ўмоўнай форме дзеянняў, якія ў рэальным жыцці пакуль што немагчымы. Гульні ўзнікаюць кожны раз таму, што малы імкнецца адчуць задавальненне ад сваёй сілы, якая ідзе ў справу, паспаборнічаць з іншымі. Гэта дазваляе зведаць розныя пачуцці, атрымаць значнае эмацыянальнае ўзрушэнне, задавальненне, эстэтычнае перажыванне. Для гульні бяруць падзеі звычайнага жыцця, але прапушчаныя праз прызму эстэтычнага ўспрыняцця. Чалавек свабодна выбірае від дзейнасці, што садзейнічае задавальненню патрэбнасцей у прыемнасці, дае пачуццё радасці. Сучасныя даследчыкі дзіцячай гульні (Д.Б. Эльконін, Н.І. Бумажэнка, С.Н. Навасёлава і інш.) адзначаюць, што гульня мае высокую эмацыйную насычанасць; носіць актыўны творчы характар, дае моцны штуршок пабуджэнню да творчасці.

Разгледзім гульню "У млын". У сярэдзіну круга дзяцей выходзяць тры пары, якія становяцца адзін да аднаго спінай і моцна счэпліваюць рукі, сагнутыя ў локцях. Дзеці, што стаяць у крузе, павольна рухаюцца ў правы бок і спяваюць:

*Млынарня на горцы*
*Крыламі махае,*
*Крыламі махае,*
*Зерне працірае.*
*Сама не глытае,*
*Другі хлеб выпякае* [15, с. 16].



Репозиторий ВГУ

У час спеваў дзеці, што знаходзяцца ў сярэдзіне круга, імітуюць колы млына: адзін нахіляецца, другі ў гэты час абапіраецца на спіну таварыша і падымае ногі. Гульня працягваецца да таго часу, пакуль адна з пар не спыніцца [Там жа]. Прапанаваная гульня не проста знаёміць з работай млына, рыхтуе да дарослага жыцця. Напоўненасць спевамі, спаборніцтвам, эмацыянальнасцю садзейнічае пачуццёваму адлюстраванню рэчаіснасці, развіццю эстэтычных перажываняў, фізічнай вынослівасці, вучыць творчасці. Гэтая і іншыя гульні (“У рыбу”, “Стралец”, “Клубок”, “Лянок”) адлюстроўваюць спрадвечныя клопаты аб дабрабыце сям’і, славяць чалавека працы, вучаць быць уважлівымі да прыгажосці свету.

Дзякуючы працам А.К. Сержпутоўскага, М.Я. Нікіфароўскага, П.В. Шэйна і іншых даследчыкаў, мы можам адзначыць, што прывучаць дзяцей да працы, згодна з традыцыямі беларускай народнай педагогікі, трэба пачынаць з пяцігадовага ўзросту. Са сталеннем працоўныя заданні становяцца больш ёмістыя і складаныя. Нязменнымі застаюцца крытэрыі іх адзнакі – якасць і прыгажосць. У працоўных аперацыях развіваецца мысленне, а старанне зрабіць добрую, прыгожую, якасную рэч, нараджае эстэтычныя пачуцці і замацоўвае эстэтычныя густы.

Такім чынам, падыходзім да другога ўзроставага этапу, ад 6–8 да 12–14 гадоў, які адметны метадамі эстэтычнага выхавання, што скіраваныя на фарміраванне эстэтычных перажыванняў.

Актыўнае прывучэнне дзяцей да працы ідзе свядома з улікам узроставых і індывідуальных асаблівасцей не толькі ў гульнёвай, але і ў сапраўднай працоўнай дзейнасці. Як мага раней хлопчыкі і дзяўчынкі далучаюцца да сялянскіх і хатніх спраў, нават калі дарослыя не вельмі адчуваюць патрэбу ў іх дапамозе. Адпаведна з прынцыпам народнай педагогікі, дзеці ўмеюць рабіць і робяць усё. Толькі час вымушае некаторых стаць пчаляром ці рамеснікам. Асоба павінна быць усебакова развітай – вось патрабаванне народнай педагогікі. Таму дзеці і выконваюць разнастайныя заданні, адным з крытэрыяў выканання якіх з’яўляецца прыгажосць. Якасць складзенага стажка, прыбірання ў хаце, працы ў гародзе – усё вызначаецца гэтай меркай.

У далучэнні дзяцей да работ сваю ролю адыгрываюць казкі – прызнаныя скарбніцы паэзіі і эстэтычнага. Казкі, што паэтызуюць жыццё і працу, той эстэтызуючы арыенцір, які накіроўвае думкі хлопчыкаў і дзяўчынак на карысную дзейнасць, бо амаль кожны казачны герой – птушка, звер, чалавек – найчасцей паказваецца праз прызму працоўных спраў.



Репозиторий ВГУ

У казцы “Пшанічны каласок” мы бачым курачку Сакатушку – добрую гаспадыню, якая знайшла, змалаціла пшанічны каласок, зярняткі ў млын насіла, дровы секла, у печы паліла, пшанічныя булкі пякла. І як вывад, як павучанне гучаць яе словы: “Каму слава, таму і булкі!” [208, с. 17]. Тэме працы, якую трэба зрабіць, перш чым атрымаць хлеб, прысвячаецца і казка “Лёгкі хлеб” [Там жа, с. 72]. Смешны дурны воўк, што шукае лёгкага хлеба. А працаўнік-селянін падаецца прывабным, нават прыгожым. Эстэтычныя пачуцці ўзнікаюць, дзякуючы мастацкай выразнасці, завершанасці твора, суадносінам дзеянняў герояў эстэтычнаму ідэалу грамадства. Казкі прапануюць эстэтычна падмацаваны прыклад, якім быць. Ён падтрымліваецца аўтарытэтам бацькоў, родных, якія ўвесь час старанна працуюць.

Добрая праца не знікае марна, яна ўзвялічвае, набліжае да народнага эстэтычнага ідэала таго, хто яе рабіў. Гэтая думка падкрэсліваецца ў казцы “Каваль”: *“Яшчэ і сёння памятаюць пра яго людзі, якіх юнак навучыў каваць жалеза, выраблять плугі, бароны, павозкі. Гэта ад яго пайшла прымаўка, што ў каваля рукі па локаць у золаце”* [Там жа, с. 142]. Такія словы падштурхоўваюць да далейшай гутаркі аб сэнсе жыцця, крытэрыяў прыгажосці і шчасця.

Казкі садзейнічаюць стварэнню ў слухачоў станоўчых эмацыйна-каштоўнасных адносін да працы, пераконваюць у яе неабходнасці. Праца і толькі праца дае чалавеку дабрабыт, пашану, духоўную раўнавагу, эстэтычнае задавальненне. Як прыклад – казка “Крадзеным сыт не будзеш”. Першы сын у пабудаванай бацькам кузні займаецца кавальствам: “*І людзі хваляць яго, і сам ён сваёй працай задаволены*” [Там жа, с. 390]. Малодшы сын вырашыў… красці, аднак бацька здолеў даць яму наглядны ўрок, што “крадзеным… сыты не будзеш”. Гэты ўрок замацаваны нават вонкавым карыкатурна гіпербалізаваным змяненнем знешнасці бацькі і сына. Эстэтычны ідэал народа патрабуе для прыгожага чалавека добрага здароўя, што выражаецца ў фізічнай моцы: “*У бацькі шыя ў два разы патаўсцела, у сына – у два разы пахудзела*” [Там жа, с. 391].

Найбольш важная справа для людзей – земляробства, якое дае амаль усё неабходнае для жыцця. Адсюль ідзе асуджэнне людзей, якія займаюцца паляўнічтвам і рыбалоўствам, як у казцы “Стралец і рыбак”. Уся гаспадарка трымаецца на старым бацьку, а яго сыны бавяць час у лесе ці на рэчцы. Толькі калі гаспадарка застаецца без гаспадара, робяць хлопцы вывад, што асноўная праца чалавека на зямлі. Велічны малюнак іх самаадданай работы, бо менавіта аб такой гаспадарцы мараць людзі: “Шчыруюць



Репозиторий ВГУ

яго сыны на зямлі, на полі, у агародзе ўраджай спее, у хляве свінні, авечкі голас падаюць і ў хаце як быццам пасвятлела" [Там жа, с. 40].

Эстэтычную перавагу беларус заўжды аддае працаўніку. Ён своеасаблівы прыклад паводзін. Гэта можа выражацца ў тым, што фантазія казачніка вымушае героя выконваць шмат работ (найчасцей сялянскіх) за надзвычай кароткі час. За добрае сэрца яму імкнуцца дапамагчы незвычайныя памочнікі. У "Царкве васкавой" [80, с. 554–560] мышка, мурашка, пчолка садзейнічаюць у выкананні вялізных работ за адну ноч: перамалочваюць хлеб, складаюць у скірды, салому перамолваюць на палову і зграбаюць у кучы, робяць царкву з воску. У казцы шмат паэтычных апісанняў працоўных дзеянняў. Гультай, несумленны, завіснік проціпастаўляецца добраму, умеламу, спрытнаму, працавітаму. Апошніх народ надзяляе прыгажосцю, дае вялікую ўзнагароду ў выглядзе багацця ці ўдалага шлюбу, а іх антыподы атрымліваюць знешнія заганы, а часам і смерць. У казцы "Сірата" [Там жа, с. 223] працаўніца надзяляецца дарам: калі плача – з вачэй перлы сыплюцца, а замуж яна выходзіць за цара. Лянівая ж і нядобрая яе сястра пакарана тым, што калі "смяецца – сыплюцца жабы", і ўрэшце рэшт ёй сякуць галаву. "Казка пра падчарку" чымсьці падобная: добрая і прыгожая працаўніца выходзіць замуж, а лянівіца і гультайка трапляе ў смалу [Там жа, с. 226]. У казцы "Мал-малышок" [Там жа, с. 342] галоўны герой, працавіты і добры, прайшоўшы праз шматлікія выпрабаванні, бярэ шлюб з паненкай Валынкай.

Эстэтычная і практычна значная ўзнагарода працаўніка, сумленнага, міласэрнага чалавека, падкрэслівае думку, што ён абавязкова знойдзе сваё шчасце, замацоўвае яго высокае месца ў сістэме каштоўнасцей. Мы падтрымліваем пункт гледжання Л. Курбанмамедава: "Фальклорныя героі, што выражаюць эстэтычны ідэал працоўных мас, гуманныя, чалавечныя, справядлівыя, прыгожыя і ўзвышаныя, хаця іх імкненне да лепшага няясныя, неакрэсленыя, абстрактныя" [107, с. 7]. Чароўныя казкі прапускаюць праз прызму эстэтычнага светаўспрыняцця жыццёвыя з'явы, народныя жаданні, бездакорліва арганічна спалучаюць разнародныя несумяшчальныя ў звычайным жыцці элементы [21, с. 603]. Разам з чалавекам у гэтых творах дзейнічаюць Сонца, Змей, Мароз. Героі атрымліваюць дапамогу ад цудадзейных рэчаў: торбачкі, ражка, ручнічка ("Пра торбачку, ражок і рушнічок"), люлькі ("Іван-дурань") [80]. Думка аб перамозе дабра над злом, прыгожага над агідным сцвярджаецца ў чароўных казках і ўнушаецца чалавеку. Гэтыя надзіва мудрыя творы нясуць



Рэпазіторый ВДУ

стымулюючае эмацыянальнае ўздзеянне, выклікаюць жаданне шукаць і знаходзіць эстэтычнае ў сапраўдным жыцці.

У сацыяльна-бытавых казках, што вучаць дзелавым паводзінам, сямейным адносінам, праслаўляюцца, становяццаа прыкладам працавітасць, сціпласць простага чалавека, які выступае своеасаблівым эстэтычным ідэалам. Адначасова высмейваюцца і асуджаюцца зайздрасць, гультайства і іншыя чалавечыя заганы і недахопы. І хаця ўвогуле казкі прасякнуты добрым гумарам, жартам, там, дзе намаляваны агідны твар прыгнятальнікаў працоўнага народа, гумар пераходзіць у сатыру, унушае ўсімі даступнымі мастацкімі сродкамі непрыняцце антыгероя.

Моц беларускай народнай казкі ў сцвярджэнні праўды, дабра і прыгажосці, развянчанні зла. Менавіта ў гэтым мы бачым падмурак яе маральна-эстэтычнага сэнсу. Казкі беларускага народа з'яўляюцца выдатным матэрыялам для выхавання пачуццяў, развіцця фантазіі, фарміравання эстэтычных адносін да рэчаіснасці.

Такім чынам, у гутарках, гульнях, працы фарміруюцца эстэтычныя перажыванні. Кожны жадае атаясамліваць сябе з легендарным героем ці майстрам, паказаць казачныя спрыт і ўменні. Дарослыя абапіраюцца на гэтыя дзіцячыя асаблівасці, фарміруюць праз іх імкненне да прыгажосці.

Зыходзячы з цікаўнасці дзетак да свету, рэчаіснасці, ім прапануецца вялікае кола загадак, у многім пабудаваных на эстэтычным светаўспрыняцці. Загадкі – неад'емны атрыбут гутарак, казак, гульняў. Характэрная дэталь – яны ўзніклі з працоўнага вопыту і нясуць водбліск замілавання чалавека сваімі дзеяннямі і іх вынікамі. Загадкі абуджаюць фантазію, выклікаюць эстэтычныя перажыванні. Трэба быць вельмі назіральным, мець добрае пачуццё гумару, каб адгадаць, што за *"цар ходзіць па гародзе, носіць два бліны ў бародзе, а трэці на галаве"* /певень/. Прыгожая форма загадак, пабудаваных на, здавалася б, супрацьлеглых спалучэннях: *"Што ў вадзе сохне, а ў печы мокне?"* /воск/, *"Рота няма, а зубы маюцца"* /граблі/, дае штуршок да пільнай увагі да рэчаіснасці, мовы. Кожная загадка настолькі насычана паэтычнымі вобразамі, што яе можна назваць паэзіяй у чыстым выглядзе. Яны, як ні адзін іншы жанр вуснай народнай творчасці, уводзяць у свет паэзіі чалавека. Бо там "зманліва-прывідны свет заселены істотамі і рэчамі неверагодна дзіўнымі" [45, с. 29]. Менавіта эстэтычная ўстаноўка загадкі самая галоўная. Яе мэта – адкрыць чалавеку вочы на паэзію рэчаў, што зроблены ім самім, на паэтычнае ў працы, жывых і нежывых прыродных аб'ектах [45]. Загадкі дазваляюць знайсці прыгажосць у самых звычайных



Рэпазіторый ВДУ

рэчах і справах: *“Без ног, без крылаў, а ў неба ўзнімаецца”* /Дым/, *“Стаіць певень над вадою з чырвонаю барадою – хто ні ідзе, за бараду ўшчыпне”* /Каліна/ [12].

Загадка правярае кемлівасць і ўменне слухача адгукнуцца на паэтычнае ў прыродзе, убачыць, адчуць прыгажосць. Праз яе фарміруецца эстэтычны погляд асобы на жыццё, выклікаецца жаданне практычна ўздзейнічаць на рэчаіснасць з мэтай яе эстэтычнага змянення. Гэта – падручнік паэзіі, які вучыць новаму погляду на свет. Беларускія загадкі – дзіўна-паэтычны, эмацыянальна-афарбаваны малюнак прыроды. Так, неба – “сіняя посцілка”, “сіняе палатно”, “сіняя дзяружка”. (“*Сіняя дзяружка ўвесь свет пакрыла”, “Глянь праз акно, відаць сіняе палатно”* [19], сонца – чырвоная птушка *(“Вышэй аблокаў чырвоная птушка лятае*”), шар вярханскі (*“Па гары гаранскай каціўся шар вярханскі, ніхто яго не аб’едзе, не абыдзе”*), маланка – ліска з залатымі рожкамі (“*Бегла ліска каля лесу блізка: ні сцежкі, ні дарожкі, толькі залатыя рожкі”*), гром – вол (“*Рыкнуў вол на сто гор, на сто печак, на сто рэчак, на сто розных гарадоў”* [19]).

Дзеці любяць загадкі, вобразы якіх узяты са з’яў і прадметаў прыроды, блізкіх і знаёмых. Менавіта гэта робіць іх жывымі істотамі, выклікае эмацыянальную рэакцыю: прымушае здзіўляцца, захапляцца, параўноўваць загадкавае з добра знаёмым, заўважаць смешнае: *“Ляцелі сівыя галубкі, упалі на ваду, вады не скалацілі і самі не патанулі”* (снег), *“Рассыпаўся гарох на сто дарог, ніхто не падбярэ: ні цар, ні царыца, ні красная дзявіца”* (град). У народных загадках прырода ачалавечваецца. Вада – *“без ног бяжыць, без воч глядзіць”*, морква параўноўваецца з царыцай *(“У цямніцы сядзіць царыца, косы на дварэ”*), раса – з ключамі паненкі (“*Ішла паненка ўначы, пагубіла ключы”* [19]).

Нарэшце, выявы акаляючай рэчаіснасці ў загадках яркія, маляўнічыя, прадметы акрэсліваюцца выразна: *“На вадзе ляжыць, ды не тоне, па агні бяжыць, ды не гарыць”* /цень/, *“Сядзіць паненка ў чырвонай сукеначцы, хто ідзе, дык пакловіцца”* /суніца/. Усё гэта дазваляе загадкам актыўна ўваходзіць у свет дзяцеё, і праз адлюстраванне прыроды, яе з’яў, жыцця, весці па шляху эстэтычнага выхавання. Загадкі – тыя творы, якія хлопчыкі і дзяўчынкі імкнуцца скласці самастойна, праяўляючы розную ступень намаганняў. Найчасцей натхняе іх на гэту дзейнасць прыроднае наваколле.

Даследчыкі беларускай загадкі знаходзяць іх роднасную сувязь з прымаўкамі. У прыватнасці, адзначаецца, што загадка, страціўшы сваё канкрэтнае значэнне і набыўшы сэнс



Рэпазіторый ВДУ

пераносснасці, алегарычнасці, становіцца прымаўкай. І наадварот, прымаўка, вылучаная са свайго кантэксту, можа гучаць як загадка [45]. Магчыма таму карыстаюцца вялікай папулярнасцю і з'яўляюцца значным і дзейсным сродкам эстэтычнага выхавання беларускія народныя прыказкі і прымаўкі. Яны нясуць адвечную неўміручую жыццёвую мудрасць, поўную мастацкай красы, абаяльнасці, гумарыстычнага зместу. Прыказкі і прымаўкі збіралі і вывучалі вядомыя этнографы І.І. Насовіч, М. Федароўскі, Я.А. Ляцкі, А.К. Сержпутоўскі, даследчыкі А.А. Аксамітаў, М.Я. Грынблат, М.Р. Ларчанка, І.Я. Лепешаў, К.П. Кабашнікаў, М.А. Яноўскі, пісьменнікі К. Крапіва, П. Глебка. Маленькія творы беларускай культуры не толькі надзейна захоўваюць народную філасофскую мудрасць (“*На ўсякую рэч ёсць прыказка*” [17, с. 257]), але і нясуць вялікі эстэтычны запал, даюць эстэтычнае задавальненне [97].

Паколькі цэнтральнае месца ў прыказках і прымаўках займае чалавек з яго вартасцямі, то ўсё добрае, прыгожае, высакароднае ўхваляецца, заахвочваецца, паказваецца грамадскай думкай як прыклад, які павінен стаць нормай: *“Адвага гарады бярэ”, “Вока бачыць далёка, а чалавек яшчэ далей”.* Адмоўныя рысы чалавечага характару высмейваюцца і асуджаюцца: *“Як тоне – сякеру абяцае, а як выцягнуць – і тапарышча шкада”,“Не давай волі рукам: гэтая воля завядзе ў няволю”* [17; 158].

Прыказкі карысныя не толькі тым, пра што ў іх гаворыцца. Яны валодаюць прыгожай мастацкай формай, разнастайнымі і дасканалымі выяўленчымі сродкамі моўнай афарбоўкі, якія адпавядаюць глыбіні іх думкі і мудрасці. У прыказках і прымаўках шырока выкарыстоўваюцца гіпербала *“Такая зямля добрая – пасадзі аглоблі – калёсы вырастуць”, “У разумнага і вочы на патыліцы”,* параўнанне *“Гавораць, як у бубен б'юць”, “Шчабеча, як сарока на плоце” , “Бруд – хвароба, бруд – магіла, чысціня – здароўе, сіла”,* метафара *“Рамяство піць і есці не просіць, а само корміць”, “Без гаспадара гумно плача, без гаспадыні – хата”,* іронія *“Гляне – малако кісне”, “Гулі, гулі, будзеш хадзіць без кашулі”.* Дарэчы, па падліках К. Крапівы, “30–35% прыказак маюць у сабе пэўную ступень іроніі, якая даволі часта пераходзіць у сарказм” [97, с. 74]. Асуджаюцца розныя неэстэтычныя заганныя рысы: дурасць *“Скажы дурному паклоны біць, то ён і лоб разаб'е”, “Дурак дураком на векі вяком”, “Вырас да неба, а дурань, як трэба”, “Розум не ў барадзе, а ў галаве”;* лянота *“Працаваць не любіш – чалавекам не будзеш”, “Яму ўранку росна, удзень – млосна, а вечарам – камары заядаюць”,* скупасць *“Скупому рубель даражэйшы за душу”,* ілжывасць *“Праўду пахаваеш, і сам*

Рэпазіторый ВДУ

*з ямы не вылезеш", "Ілжываму добрая памяць патрэбна", "Няпраўдаю свет пройдзеш, а назад не вернешся", "Хлусня, як аліва, – заўсёды выйдзе наверх";* п'янства *"Як Мікіта цвярозы быў, то ў кажусе хадзіў, а як стаў гарэлку піць – мусіць абарванцам жыць", "Гарэлкай розуму не прамыеш", "Хмель не вада – чалавку бяда",* балбатлівасць *"Языком колькі ні мялі – багацей не станеш", "І шыла, і мыла, і прала, і ткала – і ўсё языком"* [157; 159].

Народныя прыказкі і прымаўкі даюць добрыя, карысныя, сучасныя парады, як жыць, ставіцца да людзей, займацца выхаваннем дзетак, і ўсё гэта ў эстэтычнай, афарыстычнай форме: *"Жыццё пражыць – не поле перайсці і не песеньку спець", "Сам добры – людзі добрыя", "Не даўшы слова – крапіся, а даўшы – дзяржыся", "Тады дзяцей вучаць, як каля лаўкі ходзяць", "Як дзе пяюць, прыстань хутчэй, бо песня спіць у злых людзей"* [158; 159]. Яны дапамагаюць прывіццю эстэтычнай ацэнкі рэчаіснасці, садзейнічаюць станаўленню эстэтычнага густу. Выслоўе "Сцісласць – сястра таленту" знаходзіць у іх сваё пацвярджэнне. Слоў мала, а думак, вобразаў – шмат. Можна казаць аб некалькіх узроўнях разумення адной і той жа прымаўкі. Першы ўзровень – калі дзіця, чалавек бачыць, разумее прамы сэнс сказанага. Другі, больш высокі, калі адбываецца своеасаблівы перанос паняццяў, пераход ад канкрэтыкі да абагульнення.

Нарэшце, чацвёрты ўзроставы этап, які мае ўмоўныя межы з 16–17 да 19–20 год. У гэты час юнакі і дзяўчаты ўжо валодаюць неабходнымі ўменнямі і навыкамі, стаяць на парозе самастойнага жыцця, рыхтуюцца стварыць сям'ю. Настае пара, якую мы назвалі "арганізацыяй эстэтычна значнай практычнай дзейнасці". Зразумела, галоўны метад – праца. Чалавек, здольны да працоўнай дасканаласці, да сяброўства, – эстэтычны ідэал беларускага народа. Ён дае дзецям прыклад паводзін у жыцці і ў працы. Акрамя таго, са штодзённай рэчаіснасці вядома, што ў вёсцы паважаюць толькі працаўнікоў, майстроў сваёй справы. Праца разглядаецца не толькі як сродак задавальнення матэрыяльных патрэб, але і як сродак маральнасці, эстэтычнасці, шчасця. Гэта сцвярджаецца і апорай вясельнай абраднасці на працу, уключэнне ў эстэтычны ідэал шматлікіх працоўных навыкаў. Пры выбары нявесты раяць: *"Дзеўка не бракоўна, як чорна, а бракоўна, як не праворна", "Выбірай нявесту не ў карагодзе, а на рабоце", "Дзеўка прыгожа, ды прасці нягожа"* [17]. Дзяўчыне давалі наступную параду *"З добрым гаспадаром – нажывешся, а з ліхім – гора набярэшся"*. Народная мудрасць адзначае непарыўную сувязь паміж працай, актыўнай дзейнасцю чалавека і прыгажосцю, гаворыць аб тым, што прыгажосць чалавека без працоўных

Репозиторий ВГУ

уменняў не мае сэнсу: *“Не той харош, хто тварам прыгож, а той харош, хто на справу гож”, “Не бяда, што чорна, абы была праворна”.* Толькі працаўніца магла быць названа прыгажуняй, лянівіцу ж народ так і зваў – гультайкай: *“У лянівай дочкі брудныя сарочкі”, “У няўмекі рукі – калекі”.* Гультайства гнеўна асуджаецца *“Курыца – не птушка, гультай – не чалавек, балбатун – не гаспадар”.* Прымаўкі і прыказкі, з’яўляючыся афарыстычнай скарбніцай народа, падкрэсліваюць значнасць, прыгажосць таго, хто працуе, як ён гэта робіць: “*Дзе шчырая праца, там густа, а дзе лянота, там пуста”, “Хто рана ўстаў, таму Бог дае”, “У добрай гаспадарцы ёсць і сала і масла ў скрыні”* [158; 159].

